# ПАСЛЯСІНАДАЛЬНАЯ

# АПОСТАЛЬСКАЯ АДГАРТАЦЫЯ

# *AMORIS LAETITIA*

# СВЯТОГА АЙЦА

# ФРАНЦІШКА

ПАСЛЯСІНАДАЛЬНАЯ

АПОСТАЛЬСКАЯ АДГАРТАЦЫЯ

# *AMORIS LAETITIA*

СВЯТОГА АЙЦА

## ФРАНЦІШКА

ДА БІСКУПАЎ, ПРЭЗБІТЭРАЎ І ДЫЯКАНАЎ,
ДА КАНСЭКРАВАНЫХ АСОБАЎ,
ДА ХРЫСЦІЯНСКІХ СУЖЭНЦАЎ
І ЎСІХ СВЕЦКІХ ВЕРНІКАЎ
ПРА ЛЮБОЎ У СЯМ'І

Мінск
«ПРО ХРЫСТО»
2016

УДК 272
ББК 86.375
П 19

Пераклад
Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў
і афіцыйных дакументаў Касцёла
Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў
пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

ISBN 978-985-7074-52-5

© Libreria Editrice Vaticana
© Канферэнцыя Каталіцкіх
Біскупаў у Беларусі
© Афармленне. УП «Выдавецтва
„Про Хрысто„», 2016

1. РАДАСЦЬ ЛЮБОВІ, якая жыве ў сем'ях, — гэта і радасць Касцёла. Як сцвярджалі айцы Сінода, нягледзячы на шматлікія прыкметы крызісу сужэнства, „імкненне да сям'і няспынна жыве, асабліва сярод маладых людзей, і матывуе Касцёл“[1]. Як адказ на гэтае імкненне, „хрысціянскае пасланне адносна сям'і сапраўды з'яўляецца добрай навіной“[2].

2. Праца Сінода дазволіла паразважаць над становішчам сем'яў у сучасным свеце, пашырыць наш погляд і ажывіць нашае разуменне адносна значэння сужэнства і сям'і. У той жа час складанасць гэтых тэм паказала нам неабходнасць далейшага адкрытага і больш глыбогакага даследавання некаторых дактрынальных, маральных, духоўных і пастырскіх пытанняў. Разважанне пастыраў і тэолагаў, калі яно вернае Касцёлу, калі шчырае, рэалістычнае і творчае, дапаможа нам унесці большую яснасць. Дыскусіі, якія адбываюцца ў СМІ або ў публікацыях і нават сярод людзей Касцёла, падыктаваны неўтаймаваным жаданнем неабдумана і неабгрунтавана змяніць усё, вырашыць усё з дапамогай агульных нормаў або зрабіць далёкія высновы з некаторых тэалагічных разважанняў.

[1] III Надзвычайны Агульны Сход Сінода Біскупаў, *Relatio Synodi* (18 кастрычніка 2014), 2.

[2] XIV Звычайны Агульны Сход Сінода Біскупаў, *Relatio finalis* (24 кастрычніка 2015), 3.

3. Нагадваючы, што „час важнейшы за прастору“, хачу падкрэсліць, што не ўсе дактрынальныя, маральныя або пастырскія дыскусіі павінны праходзіць з удзелам Настаўніцкага Інстытута Касцёла. Безумоўна, у Касцёле павінна быць еднасць дактрыны і дзеяння, але гэта не перашкаджае існаванню розных інтэрпрэтацый пэўных аспектаў вучэння або некаторых высноў, якія вынікаюць з яго. Так будзе адбывацца да таго часу, пакуль Дух не прывядзе нас да поўнай праўды (пар. *Ян* 16, 13), гэта значыць, пакуль цалкам не ўвядзе нас у таямніцу Хрыста, калі мы зможам бачыць усё Ягонымі вачыма. Акрамя таго, у кожнай краіне або рэгіёне можна шукаць рашэнні, больш звязаныя з інкультурацыяй, якая ўлічвае традыцыі і мясцовыя выклікі. Таму што „культуры істотна адрозніваюцца паміж сабой і кожны агульны прынцып [...] патрабуе інкультурацыі для таго, каб ён захоўваўся і прымяняўся ў жыцці“[3].

4. Ва ўсякім выпадку я павінен сказаць, што праца Сінода была вельмі прыгожай і ўнесла шмат святла. Я выказваю ўдзячнасць за ўвесь гэты ўклад, які дапамог мне ўсебакова прыглядзецца да праблем сем’яў у свеце. Усе выступленні айцоў, якіх я выслухаў з вялікай увагай, здаліся мне каштоўным шматграннікам, сфармаваным многімі слушнымі клопатамі і пытаннямі, якія ставіліся сумленна і шчыра. Таму я палічыў ад-

[3] *Прамова на заканчэнне XIV Звычайнага Агульнага Сходу Сінода Біскупаў* (24 кастрычніка 2015): *L’Osservatore Romano,* 26-27 ottobre 2015, p. 13. Пар. Папская Біблійная Камісія, *Fede e Cultura alla luce della Bibbia. Atti della Sessione Plenaria 1979 della Pontificia Commissione Biblica*, Torino, 1981; Другі Ватыканскі Сабор, Пастырская канстытуцыя пра Касцёл у сучасным свеце *Gaudium et spes*, 44; Ян Павел II, Энцыкліка *Redemptoris missio* (7 снежня 1990), 52: *AAS* 83 (1991), 300; Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 69.117.

паведным напісаць паслясінадальную апостальскую адгартацыю, якая сабрала б плён апошніх двух Сінодаў пра сям'ю, дадаючы іншыя развагі, якія маглі б задаць напрамак разважанням, дыялогу ці пастырскай дзейнасці, а таксама натхнілі б, стымулявалі і падтрымалі сем'і ў іх ахвярнасці і ў цяжкасцях.

5. Гэтая адгартацыя набывае асаблівае значэнне ў кантэксце Юбілейнага Года Міласэрнасці. Па-першае, я лічу яе прапановай для хрысціянскіх сем'яў, якая заахвоціць іх цаніць дары сужэнства і сям'і, а таксама падтрымае моцную і поўную любоў і такія каштоўнасці, як вялікадушнасць, зацікаўленасць, адданасць і цярплівасць. Па-другое, яна прагне заахвоціць кожнага быць знакам міласэрнасці і блізкасці там, дзе сямейнае жыццё рэалізуецца недасканала або не праходзіць у згодзе і радасці.

6. Прадстаўляючы тэкст, пачну з уводзін, натхнёных Святым Пісаннем, якія нададуць адпаведны тон. Зыходзячы з гэтага буду разважаць над актуальным становішчам сем'яў, каб цвёрда стаяць на зямлі. Потым нагадаю асноўныя пытанні вучэння Касцёла пра сужэнства і сям'ю, каб гэтак даць месца двум цэнтральным раздзелам, прысвечаным любові. Затым пакажу некаторыя пастырскія шляхі, якія паслужаць стварэнню грунтоўных і плённых сямейных асяродкаў паводле Божага плану, а адзін раздзел прысвячу выхаванню дзяцей. Далей затрымаюся на запрашэнні да міласэрнасці і пастырскага распазнавання сітуацый, якія не цалкам адпавядаюць таму, што нам прапануе Пан, а ў канцы коратка акрэслю духоўнасць сям'і.

7. Дзякуючы багаццю двухгадовага роздуму, які дала праца над сінодам, дадзеная адгартацыя

па-рознаму ахоплівае шматлікія і вельмі разнастайныя тэмы. Гэтым тлумачыцца яе аб'ём. Таму я не рэкамендую чытаць усё хутка. Найбольш яна паслужыць сем'ям і асобам, якія працуюць у пастырстве сем'яў, калі яны будуць паглыблена вывучаць яе чарговыя часткі або шукаць у ёй таго, што можа спатрэбіцца ў кожнай канкрэтнай сітуацыі. Магчыма, напрыклад, што сужэнствы будуць больш атаясамлівацца з чацвёртым і пятым раздзеламі, пастыры асабліва зацікавяцца шостым раздзелам, а ўсе будуць вельмі зацікаўлены восьмым раздзелам. Спадзяюся, што пры чытанні кожны адчуе пакліканне з любоўю клапаціцца пра жыццё сем'яў, паколькі яны „з'яўляюцца не праблемай, а ў першую чаргу магчымасцю“[4].

[4] *Прамова падчас сустрэчы з сем'ямі,* Сант'яга-дэ-Куба (22 верасня 2015): *L'Osservatore Romano,* 24 settembre 2015, p. 7.

РАЗДЗЕЛ I

# У СВЯТЛЕ СЛОВА

8. У Бібліі шмат гаворыцца пра сем'і, пакаленні, шмат там гісторый кахання і сямейных крызісаў, пачынаючы з першай старонкі, дзе прадстаўлена сям'я Адама і Евы з яе цяжарам насілля, але і з сілай жыцця, якое працягваецца (пар. *Быц* 4), аж да самай апошняй старонкі, дзе гаворыцца пра заручыны Абранніцы і Ягняці (пар. *Ап* 21, 2.9). Два дамы, апісаныя Езусам, пабудаваныя на скале і на пяску (пар. *Мц* 7, 24-27), ілюструюць многія сямейныя сітуацыі, створаныя ў свабодзе іх жыхароў, паколькі, як напісаў паэт, „кожны дом — гэта свечнік“[5]. Цяпер увойдзем у адзін з гэтых дамоў пад кіраўніцтвам псальміста і пад песню, якая і сёння гучыць як на габрэйскай, так і на хрысціянскай літургіі шлюбу:

„Шчаслівы кожны, хто баіцца Пана,
хто ходзіць Ягонымі шляхамі.
Плён працы рук сваіх будзеш спажываць,
будзеш шчаслівы і добра табе будзе.
Жонка твая, як урадлівая вінаградная лаза

[5] Jorge Luis Borges, „Calle desconocida“, у: *Fervor de Buenos Aires*, Buenos Aires 2011, 23.

ў сценах дому твайго.
Сыны твае, як аліўкавыя парасткі,
вакол стала твайго.
Вось так будзе благаслаўлёны чалавек,
які баіцца Пана.
Няхай благаславіць цябе Пан з Сіёна,
і ты ўбачыш дабрабыт Ерузалема
ва ўсе дні жыцця свайго.
Убачыш патомства сыноў сваіх.
Спакой над Ізраэлем“ (*Пс* 128 [127], 1-6).

## Ты і твая жонка

9. Вось, мы пераступаем парог гэтага бясклапотнага дому, дзе сям’я сядзіць за святочным сталом. У цэнтры мы бачым бацьку і маці з усёй іх гісторыяй кахання. У іх спаўняецца той першасны план, які сам Хрыстус цытуе з моцай: „Хіба вы не чыталі, што Стварыцель спачатку стварыў іх мужчынам і жанчынай?“ (*Мц* 19, 4). А кніга Быцця нагадвае: „Таму пакіне мужчына бацьку свайго і маці сваю і прылепіцца да жонкі сваёй; і стануць яны адным целам“ (2, 24).

10. Цудоўныя два першыя раздзелы кнігі Быцця прадстаўляюць нам чалавечую пару ў яе фундаментальнай рэальнасці. У тэксце на пачатку Бібліі бачны пэўныя вырашальныя сцверджанні. Першае, падагульненае Езусам, кажа: „Стварыў Бог чалавека на свой вобраз, на вобраз Божы стварыў яго: стварыў мужчынам і жанчынай“ (*Быц* 1, 27). Нечаканай паралеллю, якая тлумачыць „вобраз Бога“, з’яўляецца менавіта пара „мужчыны і жанчыны“. Ці гэта азначае, што сам Бог адораны цялеснымі рысамі або тое, што Яму спадарожнічае Божая спадарожніца, як верылі некаторыя

старажытныя рэлігіі? Зусім не, бо мы ведаем, як рашуча Біблія адкінула гэтыя ідалапаклонніцкія перакананні, пашыраныя сярод канаанцаў Святой Зямлі. Захоўваецца трансцэндэнтнасць Бога, але паколькі Ён адначасова з'яўляецца Стварыцелем, то плоднасць чалавечай пары з'яўляецца жывым і эфектыўным „вобразам", бачным знакам стваральнага акту.

11. Пара, якая любіць і нараджае жыццё, — гэта сапраўдны жывы „вобраз" (але не з каменю або золата, якія забараняе Дэкалог), здольны паказаць Бога-Стварыцеля і Збаўцу. Таму плодная любоў становіцца сімвалам інтымнай рэчаіснасці Бога (пар. *Быц* 1, 28; 9, 7; 17, 2-5.16; 28, 3; 35, 11; 48, 3-4). З гэтай прычыны апавяданне кнігі Быцця паводле так званай „святарскай традыцыі" прасякнута некалькімі генеалогіямі (пар. 4, 17-22.25-26; 5; 10; 11, 10-32; 25, 1-4. 12-17. 19-26; 36). Сапраўды, здольнасць чалавечай пары нараджаць — гэта шлях, па якім развіваецца гісторыя збаўлення. У гэтым святле плённыя адносіны сужэнцаў становяцца вобразам, які служыць адкрыццю і апісанню таямніцы Бога, якую сузіраюць хрысціяне, пазнаючы ў Святой Тройцы Бога Айца, Сына і Духа любові. Трыадзіны Бог — гэта камунія любові, а сям'я — яе жывое адлюстраванне. Святло праліваюць нам словы св. Яна Паўла II: „Наш Бог у сваёй найбольш інтымнай таямніцы не застаецца адзінокім, але ўтварае сям'ю, паколькі ў таямніцы ўтрымліваецца айцоўства, сыноўства і сама сутнасць сям'і, якой ёсць любоў. Любоўю ў гэтай Божай сям'і ёсць Дух Святы"[6]. Таму сям'я — гэта не штосьці чужое самой сутнасці Бога[7]. Гэты трынітарны аспект

[6] *Гамілія падчас св. Імшы ў Пуэбла дэ Лос-Анджэлес* (28 студзеня 1979), 2: *AAS* 71 (1979), 184.

[7] Пар. *тамсама*.

сужэнскай пары набывае новую форму ў тэалогіі Паўла, калі апостал звязвае яе з „таямніцай“ з’яднання паміж Хрыстом і Касцёлам (пар. *Эф* 5, 21-33).

12. Езус у сваім разважанні на тэму сям’і адсылае нас таксама да іншай старонкі кнігі Быцця, да другога раздзела, дзе з’яўляецца цудоўны партрэт сужэнскай пары з бліскучымі дэталямі. Разгледзім толькі дзве. Першая з іх — гэта неспакой мужчыны, які шукае сабе „адпаведнай дапамогі“ (2, 18. 20), здольнай вырашыць праблему яго адзіноты, якая непакоіць і якую не задавольвае прысутнасць жывёл і ўсяго стварэння. Габрэйскі выраз у арыгінале адсылае нас да непасрэдных адносінаў, амаль тварам у твар у маўклівым дыялогу, паколькі ў любові маўчанне часам больш красамоўнае за словы. Гэта сустрэча з абліччам, з канкрэтным „ты“, якое адлюстроўвае Божую любоў і з’яўляецца „пачаткам поспеху, дапамогай, падобнай да сябе, і калонай апоры“ (пар. *Сір* 36, 24), як кажа адзін біблійны мудрэц. Або, як усклікае каханая у Песні песняў у вялікім закліку любові і ў дары ўзаемнасці: „Мой каханы — мой, а я — ягоная [...]. Я належу майму каханаму, а мой каханы — мне“ (2, 16; 6, 3).

13. З гэтага спаткання, якое лечыць адзіноту, вынікае перадача жыцця і сям’я. Гэта другая дэталь, якую мы можам падкрэсліць: Адам, будучы чалавекам усіх часоў і ўсіх рэгіёнаў нашай планеты, разам са сваёй жонкай дае пачатак новай сям’і, як сказаў Езус, цытуючы кнігу Быцця: „злучыцца з жонкай сваёй, і будуць двое адным целам“ (*Мц* 19, 5; пар. *Быц* 2, 24). Дзеяслоў „злучыцца“ ў габрэйскім арыгінале азначае шчыльнае сугучча, фізічнае і ўнутранае прыліпанне да той ступені, якая выкарыстоўваецца для апісання еднасці з Богам: „да Цябе імкнецца душа мая“, спявае

псальміст (*Пс* 63 [62], 9). Такім чынам сужэнская еднасць мае не толькі сексуальнае і цялеснае вымярэнне, але з'яўляецца таксама добраахвотным адорваннем любоўю. Плёнам гэтай сувязі з'яўляецца тое, што „яны становяцца адным целам" у фізічных абдымках ці то ў еднасці сэрцаў і жыцця, а можа быць і ў дзіцяці, якое нараджаецца з абаіх, аб'ядноўваючы як генетычна, так і духоўна два „целы".

## Сыны твае, як аліўкавыя парасткі

14. Вернемся да спеву псальміста. У ім з'яўляюцца ў доме, дзе мужчына і яго жонка сядзяць за сталом, таксама дзеці, якія спадарожнічаюць ім „як аліўкавыя парасткі" (*Пс* 128 [127], 3), гэта значыць, поўныя энергіі і жыццёвых сіл. Калі бацькі — гэта падмурак дома, дзеці — „жывыя камяні" сям'і (пар. *1 П* 2, 5). Паказальна, што ў Старым Запавеце словам, якое найчасцей сустракаецца для азначэння Бога (*JHWH, Пан*), з'яўляецца „сын" (*ben*), тэрмін, які адсылае да габрэйскага дзеяслова „будаваць" (*banah*). Таму ў псальме 127 (126) дар дзяцей праслаўляецца з дапамогай вобразаў, якія адносяцца да будаўніцтва дома або да сацыяльнага і гандлёвага жыцця, якое адбывалася ў гарадской браме: „Калі Пан не будуе дом, то будаўнікі працуюць дарэмна. [...] Вось нашчадкі — спадчына ад Пана, а плод улоння — узнагарода. Быццам стрэлы ў руцэ асілка, так сыны маладыя. Шчаслівы той чалавек, які напоўніў імі свой калчан, ён не будзе саромецца, калі будуць яны размаўляць з ворагам у браме" (1. 3-5). Гэта праўда, што тыя вобразы адлюстроўваюць культуру старажытнага грамадства, але наяўнасць дзяцей — прыкмета паўнаты сям'і на працягу гісторыі збаўлення, з пакалення ў пакаленне.

15. У гэтай перспектыве мы можам пазнаць іншае вымярэнне сям'і. Ведаем, што ў Новым Запавеце гаворыцца пра „Касцёл, які збіраецца ў доме“ (пар. *1 Кар* 16, 19; *Рым* 16, 5; *Клс* 4, 15; *Філ* 2). Жыццёвая прастора сям'і можа ператварыцца ў хатні Касцёл, у месца праўдзення Эўхарыстыі, месца прысутнасці Хрыста, які сядзіць за адным сталом. Незабыўная сцэна намалявана ў Апакаліпсісе: „Вось стаю каля дзвярэй і стукаю. Калі хто пачуе Мой голас і адчыніць дзверы, увайду да яго і буду вячэраць з ім, а ён са Мною“ (3, 20). Такім чынам тут паказаны дом, у якім прысутнічае Бог, супольная малітва і праз гэта — бласлаўленне Пана. Уласна гэта сцвярджае псальм 128 (127), які мы ўзялі за зыходны пункт: „Вось так будзе благаслаўлёны чалавек, які баіцца Пана. Няхай благаславіць цябе Пан з Сіёна“ (4-5).

16. Біблія таксама разглядае сям'ю як месца катэхезы дзяцей. Гэта выразна бачна ў апісанні святкавання Пасхі (пар. *Зых* 12, 26-27; *Дрг* 6, 20-25), а потым — у юдэйскай хагадзе ці ў дыялагічным апавяданні, якое спадарожнічае абраду пасхальнай вячэры. У чарговы раз псальм праслаўляе сямейнае вызнанне веры: „Усё, што чулі мы і што пазналі, пра што распавядалі нам айцы, раскажам будучаму пакаленню пра хвалу Пана і Ягоную моц, пра цуды Ягоныя, якія здзейсніў. Абвясціў сведчанні ў Якубе і закон устанавіў у Ізраэлі, які перадаў айцам нашым, каб аб Ім павучалі дзяцей сваіх і каб ведалі гэта пазнейшыя пакаленні, сыны, якія народзяцца ў іх“ (*Пс* 78 [77], 3-6). Таму сям'я — гэта месца, дзе бацькі становяцца для сваіх дзяцей першымі настаўнікамі веры. Гэта тая задача, якую яны выконваюць сваімі сіламі, асоба вучыць асобу. „Калі ў будучым сын твой спытаецца ў цябе [...], адкажаш яму“ (*Зых* 13, 14). Такім чынам розныя пакаленні будуць

узносіць сваю песню Пану, „хлопцы і дзяўчаты, старцы і падлеткі“ (*Пс* 148, 12)

17. Бацькі маюць абавязак дакладна выконваць сваю адукацыйную місію, як часам вучаць біблійныя мудрацы (пар. *Прып* 3, 11-12; 6, 20-22; 13, 1; 22, 15; 23, 13- 14; 29, 17). Дзеці пакліканы прыняць і споўніць запаведзь: „Шануй бацьку свайго і маці сваю“ (*Зых* 20, 12), дзе дзеяслоў „шанаваць“ азначае поўнае выкананне сямейных і грамадскіх абавязкаў без рэлігійных апраўданняў іх занядбання (пар. *Мк* 7, 11-13). Бо па сутнасці: „Хто шануе айца, той чыніць уміласціўленне за грахі, а хто шануе маці сваю, той быццам скарбы збірае“ (*Сір* 3, 3-4).

18. Евангелле таксама нагадвае нам, што дзеці — гэта не ўласнасць сям'і, што яны маюць свой уласны жыццёвы шлях. Хоць Езус сапраўды паказаны нам як узор паслухмянасці сваім зямным бацькам, што Ён падпарадкоўваецца ім (пар. *Лк* 2, 51), але праўда і тое, што Ён указвае на жыццёвы выбар дзіцяці і на яго ўласнае хрысціянскае пакліканне, што можа патрабаваць адасаблення, каб ісці сваім шляхам да Божага Валадарства (пар. *Мц* 10, 34-37; *Лк* 9, 59-62). Больш за тое, ва ўзросце дванаццаці гадоў Ён адказаў Марыі і Юзафу, што Яму трэба выканаць яшчэ адну, больш узнёслую місію па-за сваёй гістарычнай сям'ёй (пар. *Лк* 2, 48-50). Таму трэба падкрэсліць патрэбу іншых, глыбокіх сувязяў таксама і ў сямейных адносінах: „Маці Мая і браты Мае — гэта тыя, хто слухае слова Божае і выконвае яго“ (*Лк* 8, 21). Акрамя таго, надаючы ўвагу дзецям, якія ў старажытных грамадствах Блізкага Усходу разглядаліся як прадметы, пазбаўленыя нейкіх асаблівых правоў, а нават як частка сямейнай маёмасці, Езус даходзіць да таго, што паказвае іх дарослым

амаль як настаўнікаў дзякуючы іх простаму і спантаннаму даверу да іншых: „Сапраўды кажу вам: Калі не навернецеся і не станеце як дзеці, не ўвойдзеце ў Валадарства Нябеснае. Таму кожны, хто прынізіць сябе, як дзіця гэтае, той будзе большым у Валадарстве Нябесным“ (*Мц* 18, 3-4).

## Шлях крыві і пакуты

19. Ідылія, якую паказвае псальм 128 (127), не адмаўляе горкай рэчаіснасці, прадстаўленай у Святым Пісанні. Гэта прысутнасць болю, зла, гвалту, якія руйнуюць сям'ю і яе інтымную супольнасць жыцця і кахання. Небеспадстаўна прамова Хрыста адносна сужэнства (пар. *Мц* 19, 3-9) уключана ў палеміку на тэму разводу. Божае слова — нястомны сведка гэтага цёмнага вымярэння, якое адкрываецца ўжо на пачатку, калі разам з грахом адносіны кахання і чыстасці паміж мужчынам і жанчынайператвараюцца ў дамінаванне: „да мужа твайго будзе скіравана прагненне тваё, а ён будзе панаваць над табою“ (*Быц* 3, 16).

20. Гэта шлях пакуты і крыві, якім прасякнута шмат старонак Бібліі, пачынаючы ад братазабойчага гвалту Каіна ў дачыненні да Абэля, а таксама розных спрэчак паміж дзецьмі і жонкамі патрыярхаў Абрагама, Ісаака і Якуба, да трагедый, якія перапаўнялі крывёй сям'ю Давіда пасля многіх сямейных цяжкасцяў, прысутнічалі ў гісторыі Тобія або ў горкім прызнанні пакінутага Ёва: „Браты ўцяклі ад мяне, староняцца мяне знаёмыя, найбліжэйшыя і хатнія расчаравалі. [...] Жонцы мой подых нямілы, і я — смурод для сваіх дзяцей“ (пар. *Ёў* 19, 13-14.17).

21. Сам Езус нарадзіўся ў сціплай сям'і, якая неўзабаве павінна была ўцякаць на чужыну. Ён увайшоў у дом Пятра, чыя цешча была хворай (пар. *Мк* 1, 30-31); дазволіў уцягнуць сябе ў драму смерці дома Яіра або дома Лазара (пар. *Мк* 5, 22-24. 35-44; *Ян* 11, 1-44); выслухаў крык роспачы ўдавы з Наіна перад абліччам смерці яе сына (пар. *Лк* 7, 11-15); адрэагаваў на крык бацькі эпілептыка ў малой вёсцы (пар. *Мк* 9, 17-27); сустракаўся з мытнікамі, як Мацвей і Закхей, у іх уласных дамах (пар. *Мц* 9, 9-13; *Лк* 19, 1-10), а таксама з грэшнікамі, як жанчына, якая ўвайшла ў дом фарысея (пар. *Лк* 7, 36-50). Ён ведаў турботы і канфлікты сем'яў, кажучы пра іх у сваіх прыпавесцях: пачынаючы ад сітуацыі, калі дзеці пакідаюць свае дамы, каб шукаць прыгод (пар. *Лк* 15, 11-32), да цяжкіх сыноў, чые паводзіны не паддаюцца тлумачэнню (пар. *Мц* 21, 28-31), або да ахвяр гвалту (пар. *Мк* 12, 1-9). Ён клапоціцца таксама пра вясельную гасціну, якая можа апынуцца пад пагрозай зрыву з-за адсутнасці віна (пар. *Ян* 2, 1-10) або адгаворак гасцей (пар. *Мц* 22, 1-10), а таксама адчувае смутак з прычыны страты манеты ў беднай сям'і (пар. *Лк* 15, 8-10).

22. У гэтым сціслым аглядзе мы можам убачыць, што Божае слова не з'яўляецца наборам абстрактных тэорый, але спадарожнікам сем'яў, якія перажываюць крызіс і розныя пакуты, яно ўказвае ім мэту дарогі, калі Бог „вытра кожную слязу з іх вачэй, і ўжо не будзе ні смерці, ні смутку, ні плачу, ні болю“ (*Ап* 21, 4).

## Праца рук тваіх

23. На пачатку псальма 128 (127) бацька паказаны як працаўнік, які справай сваіх рук можа падтрымлі-

ваць фізічны дабрабыт і душэўны спакой сваёй сям'і: „З працы рук сваіх будзеш спажываць, будзеш шчаслівы і добра табе будзе“ (*Пс* 128 [127], 2). Тое, што праца — гэта асноўны элемент годнасці чалавечага жыцця, вынікае з першых старонак Бібліі, дзе чытаем, што „Бог узяў чалавека і размясціў яго ў Эдэнскім садзе, каб яго апрацоўваў і даглядаў“ (*Быц* 2, 15). Гэта вобраз працаўніка, які,ператвараючы матэрыю і выкарыстоўваючы сілы стварэння, здабывае „цяжка зароблены хлеб“ (*Пс* 127 [126], 2), а таксама ўдасканальвае самога сябе.

24. Праца дазваляе адначасова развіваць грамадства, утрымліваць сям'ю і забяспечваць яе стабільнасць і пладнасць: „ты ўбачыш дабрабыт Ерузалема ва ўсе дні жыцця свайго! Убачыш патомства сыноў сваіх!“ (*Пс* 128 [127], 5-6). У кнізе Прыпавесцяў паказана таксама задача маці сям'і, праца якой апісана ва ўсіх штодзённых падрабязнасцях і выклікае пахвалу мужа і дзяцей (пар. 31, 10-31). Сам апостал Павел ганарыўся, што не быў цяжарам для іншых, бо працаваў сваімі рукамі і такім чынам забяспечваў сабе ўтрыманне (пар. *Дз* 18, 3; *1 Кар* 4, 12; 9, 12). Да той ступені ён быў перакананы ў неабходнасці працы, што ўсталяваў жалезны прынцып для сваіх супольнасцяў: „Хто не хоча працаваць, няхай таксама не есць“ (*2 Тэс* 3, 10; пар. *1 Тэс* 4, 11).

25. Кажучы гэта, мы разумеем, што беспрацоўе і няпэўнасць працы становяцца пакутай, як напісана ў невялікай кнізе Рут і як нагадвае Езус у прыпавесцях аб працаўніках, якія вымушаны бяздзейна сядзець на вясковым рынку (пар. *Мц* 20, 1-16), або што Ён сам зведаў прынамсі тады, калі яго акружылі няшчасныя і галодныя людзі. Менавіта гэта трагічна перажывае

грамадства ў многіх краінах, а недахоп крыніц працы па-рознаму закранае духоўны спакой сем'яў.

26. Мы не можам забываць пра зло, якое грэх нясе ў грамадства, калі чалавек паводзіць сябе як тыран у дачыненні да прыроды, калі знішчае яе, эгаістычна, а нават жорстка яе выкарыстоўвае. У выніку гэтага адбываецца спусташэнне глебы (пар. *Быц* 3, 17-19) і сацыяльна-эканамічная няроўнасць, супраць якой выразна ўзносіцца голас прарокаў, пачынаючы ад Іллі (пар. *1 Вал* 21) аж да словаў Езуса супраць несправядлівасці (пар. *Лк* 12, 12, 13-21; 16, 1-31).

## Чуласць абдымкаў

27. Хрыстус увёў перш за ўсё ў якасці распазнавальнага знака яго вучняў закон любові і самаахвярнасці дзеля іншых (пар. *Мц* 22, 39, *Ян* 13, 34), а замацаваў гэта ў прынцыпе, аб якім бацька ці маці часта даюць сведчанне ў сваім жыцці: „Ніхто не мае большай любові за тую, калі хто жыццё сваё аддае за сяброў сваіх“ (*Ян* 15, 13). Больш за тое, плёнам любові з'яўляецца міласэрнасць і прабачэнне. Вельмі сімвалічнай у гэтым сэнсе з'яўляецца сцэна, якая паказвае чужаложніцу на двары ерузалемскай святыні ў коле яе абвінаваўцаў, якая застаецца потым адна з Езусам, а Ён не асуджае яе і заклікае да больш годнага жыцця (пар. *Ян* 8, 1-11).

28. На гарызонце любові, якая з'яўляецца цэнтральнай для хрысціянскага досведу сужэнства і сям'і, вылучаецца яшчэ адна цнота, пра якую часта забываюць у цяперашні час бурлівых і неглыбокіх адносінаў, а менавіта чуласць. Звернемся да поўнага слодычы

і дынамікі псальма 131 (130). Як мы заўважаем таксама ў іншых тэкстах (пар. *Зых* 4, 22; *Іс* 49, 15; *Пс* 27 [26], 10), сувязь паміж верным і яго Панам выяўляецца ў рысах айцоўскай або матчынай любові. Тут з'яўляецца далікатная і чулая інтымнасць паміж маці і дзіцем. Немаўля спіць на руках сваёй маці, пасля чаго яна корміць яго грудзямі. Гэта (як выражае габрэйскае слова *gamul*) ужо абуджанае дзіця, якое свядома трымаецца маці, якая носіць яго на руках. Таму гэта свядомая, а не толькі біялагічная інтымнасць. Псальміст спявае: „Але суцяшаў і супакойваў маю душу, як немаўля, аднятае ад грудзей сваёй маці" (*Пс* 131 [130], 2). У той жа час, мы можам згадаць іншую сцэну, дзе прарок Осія ўкладвае ў вусны Бога як Айца наступныя ўзрушлівыя словы: „Калі Ізраэль быў дзіцём, Я палюбіў яго [...]. Я сам вучыў Эфраіма хадзіць [...]. Я прыцягваў яго повязямі чалавечнасці, повязямі любові, і быў для яго як той, хто зняў з ягоных сківіц ярмо, Я схіляўся над ім і карміў яго" (11, 1.3-4).

29. Зыходзячы з веры і любові, ласкі і зацікаўленасці чалавечай сям'і і Найсвяцейшай Тройцы, мы разважаем пра сям'ю, якую Божае слова перадае ў рукі мужчыны, жанчыны і дзяцей, каб яны ўтваралі супольнасць асобаў, якая была б вобразам еднасці паміж Айцом, Сынам і Духам Святым. Дзейнасць, якая выхоўвае і памнажае жыццё, у сваю чаргу з'яўляецца адлюстраваннем ствральнай справы Айца. Сям'я паклікана да супольнай штодзённай малітвы, чытання Божага слова і эўхарыстычнай камуніі, каб развіваць любоў і ўсё больш станавіцца святыняй, у якой жыве Дух Святы.

30. Кожная сям'я з'яўляецца іконай Сям'і з Назарэта, з яе штодзённай працай, а нават жахам, калі яна

вымушана была цярпець незразумелы гвалт Ірада — трагічны досвед, які паўтараецца таксама і сёння ў жыцці многіх сем'яў няшчасных уцекачоў і тых, хто церпіць голад. Падобна, як Мудрацы, сем'і запрошаныя разважаць пра Дзіця і Яго Маці, каб упасці ніцма і аддаць Яму паклон (пар. *Мц* 2, 11). Падобна, як Марыя, яны заахвочаныя адважна і ў спакоі духу спаўняць свае сямейныя абавязкі, сумныя і захапляльныя, берагчы Божыя цуды і разважаць пра іх (пар. *Лк* 2, 19. 51). У скарбніцы сэрца Марыі ёсць таксама ўсе справы кожнай з нашых сем'яў, якія Яна клапатліва захоўвае. Таму Яна можа нам дапамагчы інтэрпрэтаваць іх, каб распазнаць у сямейнай гісторыі Божы заклік.

РАЗДЗЕЛ II

# РЭАЛЬСНАСЦЬ І ПРАБЛЕМЫ СЯМ'І

31. Дабро сям'і мае ключавое значэнне для будучыні свету і Касцёла. Безліч разоў праводзіўся аналіз, прысвечаны сужэнству і сям'і, іх цяжкасцям і сучасным выклікам. Трэба звярнуць увагу на канкрэтную рэчаіснасць, паколькі „патрабаванні і заклікі Духа змяшчаюцца таксама ў саміх гістарычных падзеях", праз якія „Касцёл можа глыбей пазнаваць невычарпальную таямніцу сужэнства і сям'і"[8]. Я не маю намеру прадстаўляць тут усё, што можна сказаць на тэму розных праблем, звязаных з сям'ёй у сучаснай сітуацыі. Аднак, паколькі айцы Сінода выказалі пэўны погляд на становішча сем'яў ва ўсім свеце, лічу слушным падагуліць некаторыя пастырскія высновы, дадаючы іншыя прычыны для непакою, якія вынікаюць з майго ўласнага назірання.

## Сучасная сітуацыя сям'і

32. „Верныя вучэнню Хрыста мы глядзім на сітуацыю сучаснай сям'і ва ўсёй яе складанасці, у яе

[8] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 4: *AAS* 74 (1982), 84.

святле і ценях [...]. Антрапалагічна-культурныя змены ўплываюць сёння на ўсе аспекты жыцця і патрабуюць аналітычнага і дыферэнцыраванага падыходу“[9]. У кантэксце некалькіх мінулых дзесяцігоддзяў біскупы Іспаніі ўказалі на большую свабоду ў хатняй рэчаіснасці: „справядлівы падзел клопатаў, абавязкаў і задач, [...] большая ўвага да асабістых адносінаў паміж сужэнцамі можа спрыяць гуманізацыі ўсяго сямейнага жыцця. [...] Ні грамадства, у якім мы жывём, ні тое, у якім напрамку мы ідзём, не дазваляе нам неразважна трымацца формаў і ўзораў з мінулага“[10]. Аднак „мы ўсведамляем галоўны напрамак антрапалагічна-культурных зменаў, з прычыны якіх людзі менш, чым у мінулым, падтрымліваюцца грамадскімі структурамі у іх эмацыянальным і сямейным жыцці“[11].

33. З другога боку, „мы павінны таксама ўзяць пад увагу рост пагрозы з боку неўтаймаванага індывідуалізму, які скажае сямейныя сувязі і вядзе да трактавання кожнага члена сям'і як адзінокага вострава, і, як вынік, да таго, што ў некаторых выпадках дамінуе ідэя суб'екта, які развіваецца згодна з уласнымі жаданнямі, якія ўзводзяцца ў абсалют“[12]. „Напружанні, выкліканыя гіпербалізаванай індывідуалістычнай культурай валодання, і прыемнасці нараджаюць у межах сем'яў сітуацыю нецярпімасці і агрэсіі“[13]. Акрамя таго, я хацеў бы звярнуць увагу на тэмп сучаснага жыцця, стрэс, сацыяльную арганізацыю і арганізацыю працы, паколькі гэта культурныя фак-

[9] *Relatio Synodi* 2014, 5.

[10] Канферэнцыя Епіскапату Іспаніі, *Matrimonio y familia* (6 ліпеня 1979), 3.16.23.

[11] *Relatio finalis* 2015, 5.

[12] *Relatio Synodi* 2014, 5.

[13] *Relatio finalis* 2015, 8.

тары, якія ўскладняюць прыняцце трывалых рашэнняў. У той жа час мы сустракаемся з двухсэнсоўнымі з'явамі. Напрыклад, цэніцца такая персаналізацыя, якая звяртае ўвагу на сапраўднасць, а не на здзяйсненне прадпісаных паводзінаў. Гэта можа дапамагчы ў развіцці розных здольнасцяў і спантаннасці, але пры дрэннай накіраванасці можа весці да пастаяннага недаверу, уцёкаў ад абавязкаў, замкнёнасці ў камфорце, нахабства. Свабода выбару дазваляе планаваць сваё жыццё і развіваць тое, што ў нас найлепшае, але калі няма высакародных мэтаў і асабістай дысцыпліны, яна ператвраецца ў няздольнасць да велікадушнай самаахвярнасці. Сапраўды, у многіх краінах, у якіх зніжаецца колькасць шлюбаў, усё больш асобаў вырашае жыць у адзіноце або ў сужыцці. Мы можам таксама падкрэсліць вартае пахвалы пачуццё справядлівасці; але калі яго няправільна разумець, то яно ператварае грамадзян у кліентаў, якія дабіваюцца толькі аказання паслуг.

34. Калі гэтыя пагрозы ўплываюць на спосаб разумення сям'і, яна можа стаць пераходным месцам, да якога мы скіроўваемся, калі нам гэта зручна, або куды мы ідзём тады, калі маем намер дабівацца правоў, у той час як сувязі становяцца залежнымі ад няпэўных акалічнасцяў і капрызных жаданняў. Сапраўды, сёння лёгка пераблытаць сапраўдную свабоду з ідэяй, што кожны думае паводле ўласных уяўленняў, быццам акрамя індывідуальных асобаў няма ніякіх ісцін, каштоўнасцяў, прынцыпаў, якія задаюць нам кірунак, быццам усё аднолькавае і ўсё дазволена. У гэтым кантэксце ідэал сужэнства, з яго выключнасцю і стабільнасцю, руйнуецца прынагоднымі правіламі добрага тону або капрызнымі пачуццямі. Людзі баяцца адзіноты, прагнуць абароненасці

і вернасці, але ў той жа час паглыбляецца страх перад зняволеннем адносінамі, якія маглі б перашкодзіць дасягненню асабістых спадзяванняў.

35. Як хрысціяне, мы не можам адмовіцца ад прапанавання сужэнства толькі таму, што не хочам супярэчыць сучасным адчуванням, модзе або з-за пачуцця непаўнавартаснасці з увагі на маральны і чалавечы заняпад. Мы пазбавілі б свет каштоўнасцяў, якія можам і павінны аднавіць. Гэта праўда, што няма сэнсу спыняцца на рытарычным абвінавачанні сучаснага зла, нібы гэта нешта зменіць. Не служыць таксама ніякай мэце спроба навязваць нормы сілай улады. Ад нас чакаюць больш адпаведнага і шчодрага высілку, які грунтуецца на прадстаўленні прычын і матывацыі, каб наша абарона сужэнства і сям'і паспрыяла большай гатоўнасці людзей адказваць на ласку, якую ім дае Бог.

36. У той жа час, мы павінны быць пакорнымі і рэалістамі, прызнаючы, што часам наш спосаб прадстаўлення хрысціянскіх перакананняў і трактавання людзей выклікае сёння нараканні, таму нам патрэбна здаровая самакрытыка. З другога боку, мы часта прадстаўлялі сужэнства такім чынам, што яго мэта аб'яднання, заахвочванне да ўзрастання ў любові і ідэал узаемадапамогі заставаліся ў цяні з прычыны асаблівага падкрэслівання выключна абавязку пракрэацыі. Мы падтрымалі дастаткова маладых сем'яў у першыя гады іх жыцця, даючы ім прапановы, дастасаваныя да іх заняткаў, іх мовы, да больш канкрэтных праблем. Іншым разам мы прадстаўлялі занадта абстрактны тэалагічны ідэал сям'і, сканструяваны амаль штучна, далёкі ад канкрэтнай сітуацыі і рэальных магчымасцяў сем'яў, такіх, якімі яны ёсць.

Гэтая празмерная ідэалізацыя, асабліва калі мы не абуджалі даверу да дзеяння ласкі, не дазволіла на тое, каб сям'я стала больш жаданай і прывабнай, а зусім наадварот.

37. Доўгі час мы былі перакананыя, што акцэнтуючы толькі пытанні дактрыны, біяэтыкі і маралі, не абуджаючы адкрытасці на ласку, мы дастаткова падтрымлівалі сем'і, умацоўваючы сувязь сужэнцаў і напаўняючы сэнсам іх сумеснае жыццё. Нам складана ўявіць сужэнства як дынамічны працэс развіцця і рэалізацыі, а не як цяжар, які трэба несці ўсё жыццё. Нам складана даць месца для сумлення вернікаў, якія сярод сваіх абмежаванняў часта адказваюць на Евангелле найлепш, як толькі могуць, і здольныя самі зарыентавацца ў сітуацыі, калі ўсе сістэмы руйнуюцца. Мы пакліканыя фарміраваць сумленне, а не дабівацца яго замены.

38. Мы павінны быць удзячныя за тое, што большасць людзей цэніць сямейныя адносіны, якія дапамагаюць трываць у часе і забяспечваюць другой асобе павагу. Таму каштоўным з'яўляецца тое, што Касцёл прапаноўвае суправаджэнне і кансультацыі ў пытаннях, звязаных з развіццём любові, пераадолення канфліктаў і выхавання дзяцей. Шмат людзей цэніць моц ласкі, якую яны зведваюць у сакрамэнце паяднання і Эўхарыстыі, якая дазваляе ім спраўляцца з праблемамі сужэнства і сям'і. У некаторых краінах, асабліва ў розных частках Афрыкі, секулярызацыя не змагла аслабіць пэўныя традыцыйныя каштоўнасці, а кожнае сужэнства стварае моцную повязь паміж дзвюма пашыранымі сем'ямі, у якіх надалей захоўваецца выразна акрэсленая сістэма кіравання канфліктамі і цяжкасцямі. У сённяшнім свеце каштоўным

з'яўляецца таксама сведчанне сем'яў, якія не толькі вытрывалі ў часе, але і надалей развіваюць сумесны праект і захоўваюць узаемныя пачуцці. Гэта адчыняе дзверы для пазітыўнага і гасціннага пастырства, якое дазваляе паступова паглыбляць патрабаванні Евангелля. Аднак шмат разоў мы дзейнічалі з абарончай пазіцыі і марнавалі пастырскую энергію, памнажаючы атакі на дэкадэнцкі свет з невялікай прааткыўнай здольнасцю, каб паказаць шляхі да шчасця. Многія не заўважаюць, што пасланне Касцёла пра сужэнства і сям'ю — гэта выразнае і зразумелае адлюстраванне вучэння і пазіцыі Пана Езуса, які, прапаноўваючы патрабавальны ідэал, у той жа час ніколі не страціў спачувальнай блізкасці да слабых асобаў, як самаранка або чужаложніца.

39. Гэта не азначае, што можна не заўважаць заняпад культуры, якая не пашырае любоў і ахвярнасць. Кансультацыі напярэдадні двух апошніх сінодаў паказалі розныя праявы „культуры часовасці". Я маю на ўвазе, напрыклад, хуткасць, з якой людзі пераходзяць з адных пачуццёвых адносін да іншых. Мяркуюць, што любоў, як і ў сацыяльных сетках, можна падключыць або адключыць па жаданні спажыўца і гэтак жа хутка заблакаваць. Я думаю таксама пра страх, які абуджае перспектыва пастаяннай занятасці, апантанасць ідэяй вольнага часу, пра адносіны, якія падлічваюць выдаткі і выгаду і падтрымліваюцца толькі тады, калі з'яўляюцца сродкам ад адзіноты, каб забяспечыць абарону або атрымаць нейкую паслугу. На пачуццёвыя адносіны пераносіцца тое, што адбываецца з прадметамі і асяроддзем: усё можна выкінуць, кожны выкарыстоўвае і выкідае, марнуе і знішчае, выкарыстоўвае і выціскае, пакуль яму служыць. А потым: да пабачэння! Самаўлюбёнасць робіць людзей няздольнымі пагля-

дзець па-за сябе, па-за ўласныя жаданні і патрэбы. Але той, хто выкарыстоўвае іншых, раней ці пазней сам будзе выкарыстаны, зманіпуляваны і пакінуты паводле той жа логікі. Варта заўважыць, што разрыў сувязяў часта мае месца сярод дарослых асобаў, якія шукаюць своеасаблівай „аўтаноміі“ і адкідаюць ідэал сумеснага старэння, узаемнага клопату і падтрымкі.

40. „Рызыкуючы спрасціць многае, мы можам сказаць, што жывём у культуры, якая аказвае на маладых людзей ціск, каб яны не засноўвалі сем'і з увагі на адсутнасць перспектыў на будучыню. І тая ж культура прапаноўвае іншым так шмат, што яны адмаўляюцца ад заснавання сям'і“[14]. У некаторых краінах многія маладыя людзі „часта адкладаюць шлюб з прычыны эканамічных праблем, цяжкасцяў з працай або навучаннем. Часам гэта іншыя матывы, напрыклад, уплыў ідэалогій, якія памяншаюць значэнне сужэнства і сям'і, няўдалы досвед іншых сужэнстваў, якога яны хочуць пазбегнуць, страх перад нечым, што лічаць занадта вялікім і святым, сацыяльная дапамога і эканамічная выгада, якая вынікае з сужыцця, часта эмацыянальная і рамантычная канцэпцыя любові, страх перад стратай свабоды і незалежнасці, адкіданне чагосьці, што разумеецца як інстытуцыянальнае і бюракратычнае“[15]. Мы павінны знайсці словы, матывацыю і сведчанні, якія дапамаглі б нам закрануць тыя найглыбейшыя куткі сэрца моладзі, дзе знаходзяцца найбольш шчодрыя крыніцы іх вялікадушнасці, здольнасці да ўдзелу, любові і нават гераізму, каб заахвоціць іх да прыняцця з энтузіязмам і мужнасцю выкліку сужэнства.

[14] *Прамова ў Кангрэсе Злучаных Штатаў Амерыкі* (24 верасня 2015): *L'Osservatore Romano*, 26 settembre 2015, p. 7.
[15] *Relatio finalis* 2015, 29.

41. Айцы Сінода казалі пра сучасныя „культурныя тэндэнцыі, якія, здаецца, навязваюць неабмежаваную афектыўнасць, [...] нарцыстычную афектыўнасць, няўстойлівую і зменную, якая не заўсёды дапамагае дасягнуць большай сталасці“. Яны выказалі занепакоенасць „пашырэннем парнаграфіі і камерцыялізацыі цела, чаму спрыяе таксама вычварнае карыстанне інтэрнэтам“, а таксама „становішчам тых асобаў, якія вымушаны займацца прастытуцыяй“. У гэтым кантэксце „сужэнцы часам няўпэўненыя, нерашучыя і ім цяжка знайсці спосабы развіцця. Шмат тых, хто мае тэндэнцыю заставацца на ранейшых этапах эмацыянальнага і сексуальнага жыцця. Крызіс сужэнскай пары дэстабілізуе сям'ю і праз сепарацыю і развод можа прывесці да сур'ёзных наступстваў для дарослых, дзяцей і грамадства, аслабляючы адзінку і сацыяльныя сувязі“[16]. Нярэдка „мы маем справу з многімі сужэнскімі крызісамі, да якіх часта падыходзяць павярхоўна, не маючы адвагі цярплівасці, праверкі, узаемнага прабачэння, прымірэння, а таксама ахвярнасці. Такім чынам гэтыя паразы даюць пачатак новым адносінам, новым парам, новым сувязям і новым сужэнствам, што стварае складаныя сямейныя сітуацыі, праблемныя з хрысціянскага пункта гледжання“[17].

42. „Падзенне колькасці насельніцтва, выклікане антынаталістычным менталітэтам і прапагандаванне глабальнай палітыкай «рэпрадуктыўнага здароўя» не толькі прадвызначае сітуацыю, у якой ужо нельга забяспечыць пераемнасць пакаленняў, але з часам

[16] *Relatio Synodi* 2014, 10.

[17] III Надзвычайны Агульны Сход Сінода Біскупаў, *Пасланне*, 18 кастрычніка 2014.

пагражае прывесці да гаспадарчага збяднення і страты надзеі на будучае. Развіццё біятэхналогій таксама мае вялікі ўплыў на натуральны прырост“[18]. Да гэтага можна дадаць іншыя фактары, такія як „індустрыялізацыя, сексуальная рэвалюцыя, страх перад перанаселенасцю, эканамічныя праблемы [...]. Спажывецкае грамадства можа таксама знеахвочаць людзей мець дзяцей, каб толькі захаваць сваю свабоду і ўласны стыль жыцця“[19]. Праўда тое, што праведнае сумленне сужэнцаў, калі яны дагэтуль былі вельмі шчодрыя ў перадачы жыцця, можа прывесці да рашэння абмежаваць колькасць дзяцей з даволі сур’ёзных прычын, але праўда і тое, што „з прычыны любові да гэтай годнасці сумлення Касцёл з усіх сіл адкідае дзеянні дзяржавы, якія прымушаюць да кантрацэпцыі, стэрылізацыі ці нават абортаў“[20]. Гэтыя сродкі непрымальныя нават у месцах з высокім натуральным прыростам, але трэба звярнуць увагу, што палітыкі заахвочваюць да іх і ў некаторых краінах, якія перажываюць драму занадта нізкага паказчыка нараджальнасці. Як указалі біскупы Карэі, гэта „дзеянне спрэчнае і выяўляе пагарду да сваіх абавязкаў“[21].

43. Аслабленне веры і рэлігійных практык ў некаторых грамадствах уплывае на сем’і і робіць іх больш адзінокімі ў вырашэнні цяжкасцяў. Айцы Сінода сцвердзілі, што „адной з найбольшых бед сучаснай культуры з’яўляецца адзінота, як вынік адсутнасці Бога ў жыцці людзей і крохкасці адносінаў. Існуе таксама агульнае пачуццё бяссілля перад абліччам

[18] *Relatio Synodi* 2014, 10.
[19] *Relatio finalis* 2015, 7.
[20] *Тамсама*, 63.
[21] Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Карэі, *Towards a culture of life!* (15 сакавіка 2007).

сацыяльна-эканамічнай рэальнасці, якая часта вядзе да руйнавання сем'яў. [...] Нярэдка сем'і адчуваюць сябе пакінутымі з прычыны незацікаўленасці і малой увагі з боку ўстаноў. Негатыўныя вынікі з пункта гледжання арганізацыі грамадства відавочныя: ад дэмаграфічнага крызісу да адукацыйных цяжкасцяў, ад цяжкасцяў прыняцця зачатага жыцця, да ўспрыняцця прысутнасці старых людзей як цяжару, ажно да пашырэння пачуццёвых разладаў, што часам вядзе на насілля. Абавязкам дзяржавы з'яўляецца стварэнне заканадаўчых і працоўных умоў дзеля забеспячэння маладым людзям будучага і дапамогі ў рэалізацыі плана заснавання сям'і"[22].

44. Адсутнасць годнага або адпаведнага жылля часта вядзе да адтэрміноўкі афармлення саюзу. Трэба памятаць, што „сям'я мае права на жыллё, якое адпавядае сямейнаму жыццю і колькасці яе членаў, у месцы, якое забяспечвае асноўныя паслугі, неабходныя для жыцця сям'і і супольнасці"[23]. Сям'я і дом — гэта дзве рэчы, якія дапамагаюць адна адной. Таму мы павінны адстойваць правы сям'і, а не толькі правы адзінкі. Сям'я — гэта дабро, без якога грамадства не можа абысціся і якое павінна ахоўвацца[24]. Абарона гэтых правоў — гэта „прароцкі выклік на карысць інстытуту сям'і, якая патрабуе павагі і абароны ад любой узурпацыі"[25], асабліва сёння, калі яна звычайна займае нязначнае месца ў палітычных праграмах. Сярод шэрагу правоў сем'і маюць таксама права „чакаць ад

[22] *Relatio Synodi* 2014, 6.

[23] Папская Рада па справах сям'і, *Карта правоў сям'і* (22 кастрычніка 1983), 11.

[24] Пар. *Relatio finalis* 2015, 11-12.

[25] Папская Рада па справах сям'і, *Карта правоў сям'і* (22 кастрычніка 1983), Уступ.

грамадскіх уладаў належнай сямейнай палітыкі без якой-небудзь дыскрымінацыі ў прававых, гаспадарчых, грамадскіх і фінансавых пытаннях“[26]. Часам сем'і перажываюць драматычныя пакуты, калі перад абліччам хваробы блізкай асобы яны не маюць доступу да адпаведнай медыцынскай апекі або калі доўгі час не маюць доступу да годнай працы. „Эканамічнае становішча прымушае сем'і адмаўляцца ад адукацыі, культурнага і актыўнага грамадскага жыцця. Сучасная эканамічная сістэма стварае розныя формы грамадскага выключэння. Асабліва закранаюць сем'і праблемы з працай. У моладзі абмежаваны магчымасці працаўладкавання, а прапановы працы вельмі селектыўныя і часовыя. Працоўны дзень доўгі і нярэдка ўскладнены доўгім часам даезду. Гэта перашкаджае членам сям'і бачыцца паміж сабой і са сваімі дзецьмі, каб штодзённа ўмацоўваць свае сувязі“[27].

45. „Шмат дзяцей, асабліва ў некаторых краінах, нараджаецца па-за шлюбам, і шмат ёсць тых, хто потым выхоўваецца толькі адным з бацькоў або ў пашыраным ці пераватораным сямейным асяроддзі. [...] Сексуальнае выкарыстанне дзяцей — гэта яшчэ адна з найбольш абуральных і нізкіх рысаў сучаснага грамадства. Таксама грамадствы, якія зазнаюць гвалт з прычыны вайны, тэрарызму або арганізаванай злачыннасці, з'яўляюцца сведкамі дэградацыі сямейнага становішча. Асабліва ў буйных гарадах і іх прадмесцях нарастае з'ява так званых дзяцей вуліцы“[28]. Сексуальнае выкарыстанне дзяцей яшчэ больш шакуе, калі з'яўляецца ў месцах, дзе яны

[26] *Тамсама*, 9.
[27] *Relatio finalis* 2015, 14.
[28] *Relatio Synodi* 2014, 8.

павінны ахоўвацца, асабліва ў сем'ях, школах, хрысціянскіх супольнасцях і інстытутах[29].

46. Міграцыя „з'яўляецца тым знакам часу, які трэба разглядаць і разумець з усімі наступствамі для сямейнага жыцця“[30]. Апошні сінод надаваў вялікае значэнне гэтай з'яве, сцвярджаючы, што „яна па-рознаму закранае цэлыя насельніцтвы ў розных краінах свету. Касцёл адыграў у гэтай галіне першасную ролю. Неабходнасць захавання і развіцця гэтага евангельскага сведчання (пар. *Мц* 25, 35) здаецца цяпер больш пільнай, чым калі-небудзь. [...] Чалавечая мабільнасць, якая адпавядае натуральнаму гістарычнаму руху народаў, можа аказацца сапраўдным узбагачэннем як для сям'і, якая эмігруе, так і для краіны, якая яе прымае. Іншая справа — гэта прымусовая эміграцыя сем'яў у выніку вайны, пераследу, беднасці, несправядлівасці, пазначаная перыпетыямі пераезду, які часам пагражае жыццю, траўміруе і дэстабілізуе сем'і. Суправаджэнне мігрантаў патрабуе спецыяльнага пастырства, накіраванага на сем'і мігрантаў, а таксама на членаў сем'яў, якія засталіся ў месцы паходжання. Яно павінна ажыццяўляцца з шанаваннем іх культур, чалавечага і рэлігійнага выхавання, якое атрымалі, духоўнага багацця іх абрадаў і традыцый, а таксама праз уласцівае ім пастырства. [...] Міграцыя ўяўляецца асабліва драматычнай і катастрафічнай для сем'яў і асобаў, калі адбываецца па-за законам і падтрымліваецца міжнароднымі сеткамі гандлю людзьмі. Тое самае можна сказаць, калі яна датычыць жанчын і дзяцей без апекі, вымушаных доўгі час знаходзіцца ў часовых месцах, у лагерах для бежанцаў, у якіх нельга пачаць

[29] Пар. *Relatio finalis* 2015, 78.
[30] *Relatio Synodi* 2014, 8.

працэс інтэграцыі. Крайняя беднасць і іншыя сітуацыі распаду штурхаюць сем'і да продажу сваіх дзяцей на прастытуцыю або гандаль органамі“[31]. „Пераслед хрысціянаў, а таксама пераслед этнічных і рэлігійных меншасцяў у многіх частках свету, асабліва на Блізкім Усходзе, з'яўляецца вялікім выпрабаваннем не толькі для Касцёла, але і для ўсёй міжнароднай супольнасці. Трэба падтрымліваць кожнае намаганне на карысць пастаяннага знаходжання сем'яў і хрысціянскіх супольнасцяў у месцах іх паходжання“[32].

47. Айцы Сінода таксама звярнулі асаблівую ўвагу на „сем'і, у якіх ёсць асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, у якіх інваліднасць, урываючыся ў жыццё, нараджае глыбокую і нечаканую праблему, парушае раўнавагу, жаданні і чаканні. [...] Вялікай павагі заслугоўваюць сем'і, якія з любоўю прымаюць цяжкі досвед дзіцяці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Яны даюць Касцёлу і грамадству каштоўнае сведчанне вернасці дару жыцця. У працэсе прыняцця таямніцы слабасці і клопату аб ёй сям'я разам з хрысціянскай супольнасцю можа адкрыць новыя жэсты і мову, формы разумення і тоеснасці. Асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з'яўляюцца для сям'і дарам і нагодай узрастання ў любові, узаемадапамозе і еднасці. [...] Сям'я, якая прымае ў духу веры асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, зможа распазнаць і гарантаваць якасць і каштоўнасць кожнага жыцця з яго патрэбамі, правамі і магчымасцямі. Яна будзе пабуджаць да апекі і клопату, а таксама падтрымліваць

[31] *Relatio finalis* 2015, 23; пар. *Messaggio per la Giornata Mondiale del Migrante e del Rifugiato 2016* (12 верасня 2015): *L'Osservatore Romano*, 2 ottobre 2015, p. 8.

[32] *Relatio finalis* 2015, 24.

суправаджэнне і любоў на кожным этапе жыцця“[33]. Хачу падкрэсліць, што ўвага да імігрантаў і асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — гэта знак Духа Святога. Абедзве гэтыя сітуацыі парадыгматычныя: яны асаблівым чынам паказваюць, як сёння перажываецца логіка міласэрнага прыняцця і інтэграцыі слабейшых асобаў.

48. „Большасць сем'яў паважае пажылых людзей, атуляе іх любоўю і лічыць іх благаслаўленнем. Асаблівага прызнання заслугоўваюць сямейныя таварыствы і рухі, якія дзейнічаюць у абарону старэйшых асобаў на духоўным і сацыяльным узроўні [...]. У высока індустрыялізаваных грамадствах, дзе колькасць пажылых людзей расце, у той час як зніжаецца паказчык нараджальнасці, існуе пагроза, што іх будуць разглядаць як цяжар. Адначасова апека, якой патрабуюць старэйшыя людзі, ставіць іх непасрэдна перад цяжкім выпрабаваннем“[34]. „Цаніць апошнюю фазу жыцця сёння тым больш неабходна, чым больш спрабуюць па-рознаму аддаліць момант смерці. Слабасць і залежнасць старэйшых асобаў часам несправядліва выкарыстоўваецца для звычайнай эканамічнай выгады. Многія сем'і вучаць нас, што сустрэць заключныя этапы жыцця можна з пачуццём выкананага доўгу, уключаючы ўсё сваё існаванне ў велікодную таямніцу. Многімі старэйшымі асобамі апякуюцца касцёльныя інстытуты, дзе яны могуць жыць у спакойным і сямейным асяроддзі ў матэрыяльным і ў духоўным плане. Эўтаназія і падтрымка самагубства з'яўляюцца сур'ёзнай пагрозай для сем'яў ва ўсім свеце. У многіх краінах гэтыя практыкі легальныя. Касцёл, рашуча

[33] *Тамсама*, 21.
[34] *Тамсама*, 17.

выступаючы супраць такіх практык, адчувае абавязак дапамагаць сем'ям, якія клапоцяцца пра сваіх пажылых і хворых членаў“[35].

49. Хачу падкрэсліць складанае становішча сямей, якія жывуць у разнастайных сітуацыях беднасці, калі жыццёвыя абмежаванні ўспрымаюцца асабліва балюча. Усе сутыкаюцца з цяжкасцямі, але ў вельмі бедным доме яны становяцца яшчэ больш нязноснымі[36]. Напрыклад, калі жанчына павінна выхоўваць сваё дзіця адна з прычыны сепарацыі ці з іншых прычын і павінна працаваць, не маючы магчымасці пакінуць дзіця для апекі камусьці іншаму, то яно расце пакінутым, а гэта падвяргае яго самым розным пагрозам і перашкаджае яго асабістаму сталенню. Да найбольш патрабуючых асобаў, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы, Касцёл павінен праяўляць асаблівую ўвагу, каб зразумець, суцешыць, прыняць, без навязвання ім камплекту нормаў, быццам бы з каменя, у выніку чаго яны адчуваюць сябе асуджанымі і пакінутымі той Маці, якая паклікана несці ім Божую міласэрнасць. Такім чынам, замест таго, каб даваць ім аздараўленчую моц ласкі і святла Евангелля, некаторыя аддаюць перавагу дактрыне Евангелля, ператвараючы яго ў „мёртвы камень, каб кідацца ім у іншых“[37].

50. Адказы на дзве кансультацыі, праведзеныя падчас сінадальнага працэсу, нагадалі пра вельмі сур'ёзныя сітуацыі, якія ствараюць новыя праблемы.

[35] *Тамсама*, 20.

[36] Пар. *тамсама*, 15.

[37] *Прамова на заканчэнне XIV Звычайнага Агульнага Сходу Сінода Біскупаў* (24 кастрычніка 2015): *L'Osservatore Romano*, 26-27 ottobre 2015, p. 13.

Акрамя ўжо згаданых, многія казалі пра выхаваўчую функцыю, якая перажывае цяжкасці, паколькі бацькі, між іншым, вяртаюцца дадому стомленыя, не маюць ахвоты размаўляць, у многіх сем'ях няма нават звычаю супольнага спажывання ежы. Ёсць таксама ўсё больш разнастайных прапаноў адпачынку, акрамя залежнасці ад тэлебачання. Гэта ўскладняе бацькам перадачу веры сваім дзецям. Іншыя ўказваюць на сем'і, якія часта жывуць у вялізным непакоі. Здаецца, што яны больш заклапочаныя прафілактыкай будучых праблем, чым супольным перажываннем цяперашняга моманту. Гэта — пытанне культуры, якое ўзмацняецца няпэўнасцю прафесійнай перспектывы, адсутнасцю эканамічнай бяспекі або страхам за будучыню дзяцей.

## Некаторыя праблемы

51. Згадвалася таксама пра наркаманію як адну з праблем нашага часу, якая нясе пакуты многім сем'ям, а таксама вядзе да іх знішчэння. Нешта падобнае адбываецца і ў выпадку алкагалізму, азартных гульняў і іншых залежнасцяў. Сям'я магла б быць месцам прафілактыкі і ўкаранення добрых правіл, але грамадства і палітыка няспынна заўважаюць, што сям'я, якая знаходзіцца пад пагрозай, „страчвае здольнасць рэагаваць і дапамагаць сваім членам [...] Мы бачым сур'ёзныя наступствы гэтага разладу: зруйнаваныя сем'і, скалечаныя дзеці, пакінутыя пажылыя людзі, асірацелыя дзеці пры жывых бацьках, а таксама дэзарыентаваныя і пазбаўленыя правіл маладыя людзі“[38].

[38] Канферэнцыя Епіскапату Аргенціны, *Navega mar adentro* (31 мая 2003), 42.

Як адзначылі мексіканскія біскупы, існуюць сумныя сітуацыі сямейнага гвалту, якія з’яўляюцца логавам новых формаў сацыяльнай агрэсіі, паколькі „сямейныя адносіны таксама закладаюць у асобы схільнасць да гвалту. Асабліва падатлівыя на гэта сем’і, у якіх нестае зносін; тыя, у якіх дамінуе абарончая пазіцыя, а іх члены не падтрымліваюць адзін аднаго; дзе няма сямейных мерапрыемстваў, якія заахвочваюць да ўдзелу; дзе адносіны паміж бацькамі часта канфліктныя і гвалтоўныя, а адносіны паміж бацькамі і дзецьмі афарбаваныя варожасцю. Хатняе насілле — гэта школа траўмаў і нянавісці ў асноўных міжчалавечых адносінах“[39].

52. Ніхто не можа думаць, што аслабленне сям’і як натуральнай супольнасці, заснаванай на шлюбе, — гэта штосьці выгаднае для грамадства. Зусім наадварот: гэта прыносіць шкоду сталенню людзей, развіццю грамадскіх каштоўнасцяў і этычнаму развіццю гарадоў і народаў. Ужо не заўважаецца выразна, што толькі выключная і непарыўная сувязь паміж мужчынам і жанчынай цалкам рэалізуе грамадскую функцыю, будучы стабільнай зацікаўленасцю, якая забяспечвае плоднасць. Мы павінны прызнаць шмат розных сямейных сітуацый, якія могуць забяспечыць нейкае правіла жыцця, але нефармальныя сувязі або, напрыклад, сувязі паміж асобамі аднаго полу нельга лічыць роднаснымі сужэнству. Ніводзін няпэўны або закрыты на перадачу жыцця кантакт не забяспечыць нам будучага грамадства. Але хто ж сёння клапоціцца пра падтрымку сужэнцаў, дапамагае ім пераадольваць пагрозы, суправаджае іх у выхаванні, ва ўмацаванні стабільнай сужэнскай еднасці?

[39] Канферэнцыя Епіскапату Мексікі, *Que en Cristo nuestra paz México tenga vida digna* (15 лютага 2009), 67.

53. „У некаторых грамадствах надалей утрымліваецца практыка палігаміі, у іншых наадварот трывае практыка фіктыўных шлюбаў. [...] У многіх асяроддзях, і не толькі на Захадзе, пашыраецца практыка сумеснага жыцця перад шлюбам, а нават супольнага пражывання без намеру заключаць нейкую аформленую сувязь“[40]. У многіх краінах заканадаўства спрашчае развіццё многіх альтэрнатыў, так што сужэнства, якому характэрна выключнасць, непарыўнасць і адкрытасць на перадачу жыцця, урэшце прадстаўляецца як старамодная прапанова, адна сярод многіх іншых. У многіх краінах прагрэсіруе заканадаўчая дэканструкцыя сям'і, якая імкнецца прыняць формы, заснаваныя амаль выключна на парадыгме аўтаноміі волі. Хоць слушна і справядліва адкідаюцца тыя старыя формы „традыцыйнай“ сям'і, для якіх уласцівы аўтарытарызм і нават насілле, аднак гэта павінна весці не да адкідвання сям'і, але да новага адкрыцця яе сапраўднага значэння і да яе аднаўлення. Сіла сям'і „грунтуецца ў асноўным на тым, што яна здольная любіць і вучыць любові. Незалежна ад таго, як дадзеная сям'я можа быць параненая, яна заўсёды можа развівацца, зыходзячы з любові“[41].

54. У гэтым кароткім аналізе рэчаіснасці хачу падкрэсліць, што хоць істотна палепшылася прызнанне правоў жанчын і іх удзел у грамадскім жыцці, аднак у некаторых краінах яшчэ шмат трэба зрабіць. Бо яшчэ не цалкам ліквідаваны недапушчальныя практыкі. Перадусім ганебнае насілле, якое часам прымяняецца да жанчын, дамаганні ў сям'і і розныя формы рабства, якія не з'яўляюцца праявай мужчынскай сілы,

[40] *Relatio finalis* 2015, 25.
[41] *Тамсама*, 10.

але баязлівай дэградацыі. Слоўнае, фізічнае і сексуальнае насілле супраць жанчын у некаторых сем'ях супярэчыць самой прыродзе сужэнскай еднасці. Я маю на ўвазе сур'ёзнае калечанне палавых органаў жанчын у некаторых культурах, а таксама няроўнасць у доступе да годных месцаў працы і месцаў, дзе прымаюцца рашэнні. Гісторыя поўная слядоў эксцэсаў патрыярхальных культур, дзе жанчыны лічыліся людзьмі другога гатунку, але прыгадаем сурагатнае мацярынства і „інструментальнае трактаванне жаночага цела іператварэнне яго ў тавар у культуры сучасных СМІ“[42]. Некаторыя сцвярджаюць, што шмат актуальных праблем узнікла ў выніку эмансіпацыі жанчын. Але гэты аргумент несправядлівы, „гэта фальш, няпраўда, гэта форма сексізму“[43]. Роўная годнасць мужчыны і жанчыны вядзе нас да радасці, якая перамагае даўнія формы дыскрымінацыі, а таксама да таго, што ва ўлонні сем'яў развіваецца ўзаемадзеянне. Хоць з'яўляюцца формы фемінізму, якія мы не можам прызнаць адпаведнымі, аднак мы адзначаем таксама дзеянне Духа Святога ў больш выразным прызнанні годнасці жанчын і іх правоў.

55. Мужчына „таксама адыгрывае вырашальную ролю ў сямейным жыцці, асабліва ў абароне і падтрымцы жонкі і дзяцей. [...] Многія мужчыны ўсведамляюць значэнне сваёй ролі ў сям'і і рэалізуюць яе, праяўляючы адметныя ўласцівасці мужчынскага характару. Адсутнасць бацькі сур'ёзна шкодзіць сямейнаму жыццю, выхаванню дзяцей і іх інтэграцыі ў грамадскае жыццё. Яго адсутнасць можа быць фізічнай, эмацыйнай, пазнавальнай і духоўнай. Яго

[42] *Катэхеза* (22 красавіка 2015): *L'Osservatore Romano*, 23 aprile 2015, p. 7.
[43] *Катэхеза* (29 красавіка 2015): *L'Osservatore Romano*, 30 aprile 2015, p. 8.

адсутнасць пазбаўляе дзяцей адпаведнага ўзору айцоўскай пазіцыі“[44].

56. Іншая праблема вынікае з розных формаў ідэалогіі, агульна названай „гендарам“, якая „адмаўляе адрозненне і натуральную ўзаемадапаўняльнасць мужчыны і жанчыны. Яна паказвае грамадства без палавых адрозненняў і баналізуе антрапалагічныя асновы сям’і. Гэтая ідэалогія ўводзіць адукацыйныя праекты і заканадаўчыя дырэктывы, якія прасоўваюць тоеснасць асобы і эмацыйныя сувязі ў поўным адрыве ад біялагічных адрозненняў мужчыны і жанчыны. Тоеснасць чалавека залежыць ад індывідуальнага выбару, які таксама можа з часам змяняцца“[45]. Насцярожвае тое, што некаторыя ідэалогіі такога тыпу, даючы адказ на пэўныя, часам зразумелыя чаканні, стараюцца навязаць яго як галоўную думку, якая абумоўлівае нават адукацыю дзяцей. Не трэба забываць, што „біялагічны пол (*sex*) і сацыяльна-культурная роля полу (*gender*) можна адрозніваць, а не раздзяляць“[46]. Больш за тое, „біятэхналагічная рэвалюцыя ў галіне перадачы чалавечага жыцця дала магчымасць маніпуляваць актам зачацця, робячы яго незалежным ад палавога сужыцця паміж мужчынам і жанчынай. Такім чынам чалавечае жыццё і бацькоўства сталі чымсьці, што можна ствараць і знішчаць. Чымсьці ў вялікай ступені залежным ад жадання асобаў ці пар“[47]. Адно — гэта зразуменне чалавечай слабасці і складанасці жыцця, а нешта іншае — прыняцце ідэалогіі, якая дабіваецца аддзялення неадрыўных аспектаў рэчаіснасці. Не бу-

[44] *Relatio finalis* 2015, 28.
[45] *Тамсама*, 8.
[46] *Тамсама*, 58.
[47] *Тамсама*, 33.

дзем трапляць у грэх, спрабуючы замяніць Стварыцеля. Мы — стварэнне і не ўсемагутныя. Створаная рэчаіснасць апярэджвае нас, і трэба прымаць яе як дар. У той жа час, мы пакліканыя да захавання нашай чалавечнасці, а гэта азначае перадусім пашану да яе і прыняцце яе такой, якой яна была створана.

57. Дзякую Богу, бо шмат сем'яў, якія зусім не лічацца дасканалымі, жывуць у любові, рэалізуючы сваё пакліканне, развіваюцца, хоць многія з іх робяць памылкі на сваім шляху. На падставе сінадальных разважанняў нельга стварыць стэрэатып ідэальнай сям'і, а толькі калаж, які робіць выклік і складаецца з мноства розных рэальнасцяў, поўных радасці, трагедый і мар. Рэаліі, якія нас непакояць, — гэта выклікі. Не будзем трапляць у пастку знясілення ў самаабаронччых нараканнях, замест таго, каб абуджаць місійную крэатыўнасць. У кожнай сітуацыі „Касцёл заўважае патрэбу сказаць слова праўды і надзеі. [...] Вялікія каштоўнасці хрысціянскага сужэнства і сям'і адказваюць на пошук, які працінае чалавечае існаванне“[48]. Хоць мы заўважаем шмат цяжкасцяў, яны, як сказалі біскупы Калумбіі, заклікаюць нас „вызваліць энергію надзеі дзеля прароцкіх мараў, што змяняюць дзеянне і ўяўленне міласэрнасці“[49].

[48] *Relatio Synodi* 2014, 11.

[49] Канферэнцыя Епіскапату Калумбіі, *A tiempos difíciles colombianos nuevos* (13 лютага 2003), 3.

РАЗДЗЕЛ III

# ПОЗІРК, СКІРАВАНЫ НА ЕЗУСА: ПАКЛІКАННЕ СЯМ'І

58. Перад сем'ямі і сярод іх заўсёды першым павінна гучаць паслане, якое грунтуецца „на самым прыгожым, большым, найбольш прывабным і адначасова на найбольш неабходным“[50] прапаведаванні, якое „павінна займаць цэнтральнае месца ў евангелізацыйнай дзейнасці“[51]. Гэта тое асноўнае пасланне, „да якога трэба пастаянна вяртацца і слухаць рознымі спосабамі і якое трэба пастаянна абвяшчаць падчас катэхезы ў той ці іншай форме“[52]. Бо „няма нічога больш грунтоўнага, больш глыбокага, больш пэўнага, больш змястоўнага і больш мудрага за гэтае пасланне“, а „ўся хрысціянская фармацыя з'яўляецца перадусім паглыбленнем керыгмы“[53].

59. Наша вучэнне пра сужэнства і сям'ю павінна няспынна натхняцца і змяняцца ў святле гэтага пасланння любові і чуласці, каб не стала толькі абаронай

[50] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 35.
[51] *Тамсама*, 164.
[52] *Тамсама*.
[53] *Тамсама*, 165.

чыёйсьці халоднай і нежыццяздольнай дактрыны. Цалкам зразумець таямніцу хрысціянскай сям'і можна толькі ў святле бясконцай любові Айца, што аб'явілася ў Хрысце, які дарэшты аддаў сябе за нас і жыве сярод нас. Таму я хацеў бы паказаць Хрыста, прысутнага сярод нас у многіх гісторыях любові, і заклікаць агонь Духа Святога для ўсіх сем'яў на свеце.

60. У дадзеным кантэксце гэты кароткі раздзел змяшчае сінтэз вучэння Касцёла пра сужэнства і сям'ю. У святле, якое нам дае вера, працытую ў сувязі з гэтым таксама некалькі разваг, прадстаўленых айцамі Сінода. Яны зыходзяць з погляду Езуса і ўказваюць, што „Ён, абвяшчаючы патрабаванні Божага Валадарства, глядзеў на людзей, якіх сустракаў, з любоўю і чуласцю, спадарожнічаючы ім у праўдзе, цярпліва і з міласэрнасцю“[54]. Падобным чынам Пан суправаджае нас сёння ў нашых жыццёвых цяжкасцях і ў перадачы Евангелля сям'і.

## Езус прымае і даводзіць да паўнаты Божы план

61. У адрозненне ад тых, хто забараняў сужэнства, Новы Запавет вучыць, што „ўсё, што стварыў Бог, добрае, і нельга адкідаць нічога, што з удзячнасцю прымаецца“ (*1 Цім* 4, 4). Сужэнства — гэта „дар“ Бога (пар. *1 Кар* 7, 7). У той жа час з прычыны гэтай станоўчай ацэнкі вялікі націск кладзецца на дбайнасць пра гэты Божы дар: „У пашане няхай будзе шлюб беззаганны ў кожных адносінах і ложа беззаганнае“ (*Гбр* 13, 4). Гэты Божы дар ахоплівае таксама сексуальнасць: „Не ўхіляйцеся адно ад аднаго“ (*1 Кар* 7, 5).

[54] *Relatio Synodi* 2014, 12.

62. Айцы Сінода нагадалі, што Езус, „спасылаючыся на першапачатковы план адносна сужэнства, падкрэслівае непарыўную еднасць паміж мужчынам і жанчынай, кажучы, што «Майсей праз упартасць вашых сэрцаў дазволіў вам разводзіцца са сваімі жонкамі, аднак спачатку так не было» (*Мц* 19, 8). Непарыўнасць сужэнства («Што Бог злучыў, чалавек няхай не разлучае», *Мц* 19, 6), не трэба разумець як „ярмо“, накладзенае на людзей, але як «дар», дадзены асобам, злучаным у сужэнстве. [...] Самапрыніжэнне Бога няспынна спадарожнічае чалавеку на яго шляху, аздараўляе і перамяняе скамянелыя сэрцы ласкай, накіроўваючы іх да сваёй сутнасці праз крыжовы шлях. У Евангеллі выразна бачны прыклад Езуса, які [...] абвяшчаў сужэнства як паўнату аб'яўлення, якое вяртае першапачатковы план Бога (пар. *Мц* 19, 3)“[55].

63. „Езус, які прымірыў у сабе ўсё, прывёў сужэнства і сям'ю да іх першаснай формы (пар. *Мк* 10, 1-12). Сям'я і сужэнства былі адкупленыя Хрыстом (пар. *Эф* 5, 21-32), адноўленыя на вобраз Святой Тройцы. З гэтай таямніцы вынікае кожная сапраўдная любоў. Абранніцкі запает, які распачаўся ў момант стварэння і быў аб'яўлены ў гісторыі збаўлення, атрымлівае поўнае аб'яўленне свайго значэння ў Хрысце і ў Яго Касцёле. Ад Хрыста праз пасрэдніцтва Касцёла сужэнства і сям'я атрымліваюць неабходную ласку для сведчання пра любоў Бога і для жыцця ў еднасці. Евангелле сям'і працінае гісторыю свету ад стварэння чалавека на вобраз і падабенства Бога (пар. *Быц* 1, 26-27) да самага спаўнення таямніцы Прымірэння ў Хрысце на прыканцы часоў з вясельнай вячэрай Ягняці (пар. *Ап* 19, 9)“[56].

[55] *Тамсама*, 14.
[56] *Тамсама*, 16.

64. „Прыклад Езуса з’яўляецца для Касцёла парадыгмай. [...] Ён распачаў сваё публічнае жыццё, учыніўшы цуд на вяселлі ў Кане (пар. *Ян* 2, 1-11). [...] Ён праводзіў штодзённыя хвіліны сяброўства з сям’ёй Лазара і ягонымі сёстрамі (пар. *Лк* 10, 38), а таксама з сям’ёй Пятра (пар. *Мц* 8, 14). Ён выслухаў плач бацькоў, якія аплаквалі смерць сваіх дзяцей, і вярнуў іх да жыцця (пар. *Мк* 5, 41; *Лк* 7, 14-15), паказваючы такім чынам сапраўднае значэнне міласэрнасці, якая вядзе да аднаўлення Запавету (пар. Ян Павел II, *Dives in misericordia*, 4). Гэта выразна бачна ў спатканнях з самаранкай (пар. *Ян* 4, 1-30), а таксама з чужаложніцай (пар. *Ян* 8, 1-11), у якіх адчуванне граху нараджаецца перад абліччам бескарыслівай любові Езуса“[57].

65. Уцелаўленне Слова ў чалавечай сям’і ў Назарэце ўзрушвае сваёй навізной гісторыю свету. Мы павінны паглыбіцца ў таямніцу нараджэння Езуса, у „так“ Марыі, сказанае падчас нябеснага звеставання, калі ў Яе ўлонні было зачата Слова; таксама ў „так“ Юзафа, які даў імя Езусу і паклапаціўся пра Марыю; у радасць пастухоў пры яслях; у пакланенне трох Мудрацоў; у таямніцу ўдзелу Езуса ў пакутах свайго выгнанага, праследаванага і прыніжанага народу; у рэлігійнае чаканне Захарыі і радасць ад нараджэння Яна Хрысціцеля; у абяцанне, якое для Сімяона і Ганны споўнілася ў святыні; у здзіўленне вучоных у Законе, калі яны слухалі мудрасць Езуса-падлетка. Далей трэба паглыбіцца ў перыяд трыццаці доўгіх гадоў, калі Езус зарабляў на сваё жыццё, працуючы сваімі рукамі, узносячы малітвы і захоўваючы рэлігійныя традыцыі свайго народу, выхоўваючыся ў веры сваіх айцоў, клапоцячыся, каб яна дала плён ў таямніцы Валадарства. Гэта таямніца

[57] *Relatio finalis* 2015, 41.

Божага Нараджэння і таямніца Назарэта, поўная водару сям'і! Гэтая таямніца моцна захапіла Францішка Асізкага, Тэрэзу з Лізьё і Караля дэ Фуко, з яе таксама чэрпаюць прыклады хрысціянскія сем'і, каб аднавіць сваю надзею і радасць.

66. „Запавет любові і вернасці, якім жыве Святая Сям'я з Назарэта, пралівае святло на прынцып, які надае форму кожнай сям'і і дазваляе ёй лепш спраўляцца са зменлівасцю жыцця і гісторыі. На гэтым падмурку кожная сям'я таксама ў сваёй слабасці можа стаць святлом у змроку свету. «Тут мы разумеем спосаб жыцця ў сям'і. Няхай Назарэт сам нагадае, чым ёсць сям'я, чым ёсць еднасць любові, яе суровая і простая прыгажосць, яе святы і непарушны характар. Няхай ён дазволіць нам убачыць, якім салодкім і незаменным ёсць выхаванне ў сям'і, няхай навучыць нас, што ў грамадскай сферы яно мае першачарговае і непараўнальнае значэнне» (Павел IV, *Прамова ў Назарэце,* 5 студзеня, 1964)“[58].

## Сям'я ў дакументах Касцёла

67. Другі Ватыканскі Сабор у канстытуцыі *Gaudium et spes* займаецца „падтрымкай годнасці сужэнства і сям'і (пар. 47-52). Ён акрэслівае сужэнства як супольнасць жыцця і любові (пар. 48), ставячы любоў у цэнтры сям'і [...]. Сапраўдная любоў паміж мужам і жонкай (пар. 49) мае на ўвазе ўзаемны дар з сябе, уключае і змяшчае вымярэнне цялеснасці і пачуццёвасці, адказваючы на Божы план (пар. 48-49). Акрамя таго, яна падкрэслівае ўкараненне сужэнцаў

[58] *Тамсама*, 38.

у Хрысце: Хрыстус выходзіць насустрач хрысціянскім сужэнцам у сакрамэнце сужэнства і застаецца з імі (пар. 48). Ва ўцелаўленні Ён прымае чалавечую любоў, ачышчае яе, даводзіць да паўнаты і дае сужэнцам разам са сваім Духам здольнасць жыць ёю, працінаючы ўсё іх жыццё веры, надзеі і любові. Такім чынам сужэнцы з'яўляюцца як бы кансэкраванымі і праз уласцівую ім ласку будуюць цела Хрыста, утвараючы хатні Касцёл (пар. *Lumen gentium*, 11), таму Касцёл, каб цалкам зразумець сваю таямніцу, глядзіць на хрысціянскую сям'ю, якая паказвае сапраўдны шлях"[59].

68. Далей благаслаўлёны Павел VI, „ідучы следам за Другім Ватыканскім Саборам, паглыбіў вучэнне пра сужэнства і сям'ю. Асабліва ў энцыкліцы *Humanae vitae* ён падкрэсліў непарыўную сувязь паміж сужэнскай любоўю і перадачай жыцця: «Любоў сужэнцаў патрабуе, каб яны належным чынам пазналі сваю задачу ў справе адказнага бацькоўства. Паколькі сёння на яго ставіцца такі вялікі націск, яно павінна адпаведным чынам разумецца [...]. Задача адказнага бацькоўства заключаецца ў тым, каб сужэнцы прызналі свае абавязкі перад Богам, перад сабою, сям'ёй і грамадствам, належна захоўваючы парадак рэчаў і іерархію каштоўнасцяў» (10). У апостальскай адгартацыі *Evangelii nuntiandi* Павел VI падкрэсліў сувязь паміж сям'ёй і Касцёлам"[60].

69. „Св. Ян Павел II звярнуў асаблівую ўвагу на сям'ю праз свае катэхезы пра чалавечую любоў, Ліст да сем'яў *Gratissimam sane*, і асабліва праз апостальскую адгартацыю *Familiaris consortio*. У гэтых дакумен-

[59] *Relatio Synodi* 2014, 17.
[60] *Relatio finalis* 2015, 43.

тах Папа назваў сям'ю «дарогай Касцёла»; прадставіў комплекснае бачанне паклікання мужчыны і жанчыны да любові; прапанаваў асноўныя дырэктывы адносна пастырства сем'яў і прысутнасці сям'і ў грамадстве. У прыватнасці, пішучы пра сужэнскую любоў (пар. *Familiaris consortio*, 13), апісаў, якім чынам сужэнцы ў іх узаемнай любові атрымліваюць дар Духа Святога і жывуць сваім пакліканнем да святасці"[61].

70. „Бэнэдыкт XVI у энцыкліцы *Deus caritas est* закрануў тэму праўды пра любоў паміж мужчынам і жанчынай, якая цалкам тлумачыцца толькі ў святле любові ўкрыжаванага Хрыста (пар. 2). Ён падкрэсліваў, што сужэнства, заснаванае «на выключнай і канчатковай любові, становіцца вобразам адносінаў Бога з Яго народам і наадварот: тое, як любіць Бог, вызначае меру чалавечай любові» (11). Акрамя таго, у энцыкліцы *Caritas in veritate* ён паказаў значэнне любові як асновы жыцця ў грамадстве (пар. 44), месца засваення досведу супольнага дабра"[62].

## Сакрамэнт сужэнства

71. „Святое Пісанне і Традыцыя адкрываюць нам доступ да пазнання Святой Тройцы, якая аб'яўляецца з сямейнымі рысамі. Сям'я — гэта вобраз Бога, які [...] з'яўляецца еднасцю асобаў. Падчас хросту ў Ярдане голас Айца ўказвае на Езуса як на свайго ўмілаванага Сына, і ў гэтай любові нам дадзена пазнаць Духа Святога (пар. *Мк* 1, 10-11). Езус, які ўсё прымірыў у сабе і адкупіў чалавека ад граху, не толькі вярнуў

[61] *Relatio Synodi* 2014, 18.
[62] *Тамсама*, 19.

сужэнства і сям'ю да іх першаснай формы, але і падняў сужэнства да сакрамэнтальнага знаку сваёй любові да супольнасці Касцёла (пар. *Мц* 19, 1-12; *Мк* 10, 1-12; *Эф* 5, 21-32). У чалавечай сям'і, сабранай Хрыстом, аднаўляецца «вобраз і падабенства» Найсвяцейшай Тройцы (пар. *Быц* 1, 26) — таямніца, з якой вынікае кожная сапраўдная любоў. Праз Касцёл сужэнства і сям'я атрымліваюць ад Хрыста ласку Духа Святога, каб даваць сведчанне пра Евангелле Божай любові "[63].

72. Сакрамэнт сужэнства не з'яўляецца сацыяльнай дамовай, пустым рытуалам або толькі ўнутраным знакам заручын. Сакрамэнт — гэта дар для асвячэння і збаўлення сужэнцаў, паколькі „праз сакрамэнтальны знак, іх узаемную прыналежнасць ён з'яўляецца сапраўдным вобразам стаўлення Хрыста да Касцёла. Таму сужэнцы — гэта няспынны напамін Касцёлу пра тое, што адбылося на крыжы; адно для аднаго і для дзяцей яны з'яўляюцца сведкамі збаўлення, удзельнікамі якога сталі праз сакрамэнт"[64]. Сужэнства — гэта пакліканне, паколькі яно з'яўляецца адказам на спецыфічны заклік перажываць сужэнскую любоў як недасканалы знак любові паміж Хрыстом і Касцёлам. У сувязі з гэтым, рашэнне пра заключэнне шлюбу і заснаванне сям'і павінна быць плёнам пазнанага пакліканне.

73. „Узаемны дар, устаноўчы для сакрамэнтальнага сужэнства, мае свае карані ў ласцы хросту, які ўсталёўвае фундаментальны запавет кожнай асобы з Хрыстом у Касцёле. Прымаючы адно аднаго і з ласкі

[63] *Relatio finalis* 2015, 38.

[64] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 13: *AAS* 74 (1982), 94.

Хрыста, нарачоныя абяцаюць адно аднаму поўную ўзаемную адданасць, вернасць і адкрытасць на жыццё. Канструктыўнымі элементамі сужэнства яны прызнаюць дары, якімі адорвае іх Бог, сур'ёзна беручыся ў Яго імя і перад Касцёлам за свае ўзаемныя абавязкі. Таму ў веры можна прыняць даброты сужэнства як абавязак, які лягчэй несці дзякуючы ласцы сакрамэнту. [...] Таму позірк Касцёла скіроўваецца на сужэнцаў як на сэрца ўсёй сям'і, якая таксама скіроўвае свой позірк на Езуса"[65]. Сакрамэнт не з'яўляецца „чымсьці" або нейкім „прымусам", бо ў рэальнасці сам Хрыстус праз сакрамэнт сужэнства „застаецца з імі, дае ім моц пайсці за Ім і ўзяць на сябе свой крыж, устаць пасля падзення, прабачаць адно аднаму, узаемна несці свой цяжар"[66]. Хрысціянскае сужэнства — гэта знак, які не толькі паказвае, як моцна Хрыстус палюбіў Касцёл у запавеце, замацаваным пячаткай на крыжы, але рэалізуе гэтую любоў у еднасці сужэнцаў. Праз аб'яднанне іх у адно цела яно прадстаўляе заручыны Божага Сына з чалавечай прыродай. Таму „ў радасцях іх любові і сямейнага жыцця ўжо дае ім прадчуванне гасціны Ягняці"[67]. Хоць „аналогія паміж парамі: муж-жонка і Хрыстус-Касцёл" з'яўляецца „недасканалай аналогіяй"[68], яна заахвочвае прасіць Бога, каб Ён праліў сваю любоў на абмежаванні сужэнскіх адносінаў.

74. Сексуальнае з'яднанне, якое перажываецца па-чалавечы і асвячаны сакрамэнтам, у сваю чаргу з'яўляецца для сужэнцаў шляхам узрастання ў ласцы.

[65] *Relatio Synodi* 2014, 21.
[66] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 1642.
[67] *Тамсама*.
[68] *Катэхеза* (6 мая 2015): *L'Osservatore Romano* (7 maggio 2015), p. 8.

Гэта „таямніца сужэнства“[69]. Каштоўнасць з'яднання цел выяўляецца ў словах згоды, у якіх сужэнцы ўзаемна прынялі і аддалі сябе, каб быць разам усё жыццё. Гэтыя словы надаюць сэнс сексуальнасці і пазбаўляюць яе ўсялякай двухсэнсоўнасці. Аднак у рэальнасці ўсё сумеснае жыццё сужэнцаў, усё перапляценне іх адносінаў паміж сабой, з дзецьмі і са светам будзе прасякнутая і ўмацаваная ласкай сакрамэнту, якая вынікае з таямніцы Уцелаўлення і Пасхі, у якой Бог выявіў сваю любоў да чалавецтва і цесна з ім злучыўся. Яны ніколі не будуць адныя, каб уласнымі сіламі вырашаць новыя праблемы. Яны пакліканыя адказаць на дар Бога праз свой удзел, сваю крэатыўнасць, трываласць і штодзённае змаганне, але заўсёды могуць заклікаць Духа Святога, які асвяціў іх саюз, каб атрыманая ласка праяўлялася нанова ў кожнай новай сітуацыі.

75. Згодна з лацінскай традыцыяй Касцёла распарадчыкамі сакрамэнту сужэнства з'яўляюцца мужчына і жанчына[70], якія заключаюць шлюб і якія, выказваючы ўзаемную згоду і выяўляючы яе ва ўзаемным дары цел, атрымліваюць вялікі дар. Іх згода і еднасць цела — гэта інструменты Божага дзеяння, якое робіць іх адным целам. У хросце была асвячана іх здольнасць да аб'яднання ў сужэнстве як слуг Пана, каб адказаць на Божае пакліканне. З гэтай прычыны, калі двое сужэнцаў, якія не з'яўляюцца хрысціянамі, прымаюць хрост, не абавязкова аднаўляць іх шлюбнае абяцанне і дастаткова, што яны не адкідаюць яго, паколькі сілай атрыманага хросту іх сувязь сама па сабе становіцца

[69] Леў Вялікі, *Epistola Rustico narbonensi episcopo*, inquis. IV: *PL* 54, 1205A; пар. Incmaro di Reims, *Epist.* 22: *PL* 126, 142.

[70] Пар. Пій XII, Энц. *Mystici Corporis Christi* (29 чэрвеня 1943): *AAS* 35 (1943), 202: «*Matrimonio enim quo coniuges sibi invicem sunt ministri gratiae*».

сакрамэнтальнай. Кананічнае права прызнае таксама сапраўднасць некаторых шлюбаў, якія адбываюцца без суправаджэння пасвячанага распарадчыка[71]. Натуральны парадак настолькі прасякнуты адкупленнем Езуса Хрыста, што „паміж ахрышчанымі не можа існаваць сапраўдная сужэнская дамова, якая не была б сакрамэнтам“[72]. Касцёл можа патрабаваць, каб гэта быў публічны акт у прысутнасці сведак і пры выкананні іншых умоў, якія змяняліся цягам гісторыі, але гэта не пазбаўляе нарачоных іх статусу як распарадчыкаў сакрамэнту сужэнства і не змяншае ролю згоды мужчыны і жанчына, якая сама па сабе ўсталёўвае сакрамэнтальную сувязь. Трэба, каб мы глыбей усвядомілі дзеянне Бога ў абрадзе сужэнства, якое вельмі выразна падкрэсліваецца ва ўсходніх Касцёлах праз наданне асаблівага значэння благаслаўленню маладых як знаку дару Духа Святога.

## Зярняты Слова і недасканалыя сітуацыі

76. „Евангелле сям'і сілкуе таксама тыя зярняты, якія надалей чакаюць паспявання, а таксама павінна клапаціцца пра тыя дрэвы, якія засохлі і не могуць заставацца без догляду“[73], каб, зыходзячы з дару Хрыста ў сакрамэнце, „іх цярпліва вялі далей, ад таго, што яны ўжо прынялі з таямніцы Хрыста, да ўсё больш багатага пазнання і паўнейшага ўключэння гэтай Таямніцы ў іх жыццё“[74].

[71] Пар. *Codice di Diritto Canonico*, cc. 1116; 1161-1165; *Codice dei Canoni delle Chiese Orientali,* 832; 848-852.

[72] *Codice di Diritto Canonico*, c. 1055 § 2.

[73] *Relatio Synodi* 2014, 23.

[74] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 9: *AAS* 74 (1982), 90.

77. Пачынаючы біблійнае навучанне, згодна з якім усе рэчы былі створаны Хрыстом і для Хрыста (пар. *Клс* 1, 16), айцы Сінода нагадалі, што „парадак адкуплення асвятляе і дапаўняе парадак стварэння. Таму натуральнае сужэнства можна да канца зразумець у святле яго сакрамэнтальнай паўнаты: толькі ўглядаючыся ў Хрыста, можна больш глыбока пазнаць праўду пра міжчалавечыя адносіны. «Па сутнасці таямніца чалавека па-сапраўднаму тлумачыцца толькі ў таямніцы Уцелаўлёнага Слова. [...] Хрыстус, новы Адам, уласна ў аб'яўленні таямніцы Айца і Яго любові аб'яўляе чалавека цалкам самому чалавеку і адкрывае перад ім яго найвышэйшае пакліканне» (*Gaudium et spes*, 22). Асабліва адпаведным з'яўляецца разуменне ў хрысталагічным ключы натуральных уласцівасцяў сужэнства, што ўтвараюць дабро сужэнцаў (*bonum coniugum*)“[75], якое ахоплівае еднасць, адкрытасць на жыццё, вернасць і непарыўнасць, а ў межах хрысціянскага сужэнства таксама ўзаемадапамогу на шляху як мага паўнейшага сяброўства з Панам. „Пазнанне прысутнасці *зярнят Слова* ў іншых культурах (пар. *Ad gentes*, 11) можа таксама прымяняцца да рэальнасці сужэнства і сям'і. Станоўчыя элементы існуюць таксама па-за сапраўдным натуральным сужэнствам, у формах сужэнства, уласцівых іншым рэлігійным традыцыям“[76], хоць ёсць і няяснасці. Можна сказаць, што „кожны, хто хоча ў гэтым свеце заснаваць сям'ю, якая будзе вучыць дзяцей радавацца кожнаму дзеянню, накіраванаму на пераадоленне зла — сям'ю, якая паказвае, што Дух Святы жыве і дзейнічае, —

[75] *Relatio finalis* 2015, 47.
[76] *Тамсама.*

сустрэне нашу ўдзячнасць і прызнанне незалежна ад таго, да якой сям'і, народа ці рэгіёна належыць!"[77].

78. „Погляд Хрыста, святло якога асвятляе кожнага чалавека (пар. *Ян* 1, 9; *Gaudium et spes*, 22), натхняе пастырства Касцёла адносна вернікаў, якія проста жывуць разам або заключылі толькі грамадзянскі шлюб, а таксама разведзеных, якія жывуць у новых саюзах. У перспектыве боскай педагогікі Касцёл звяртаецца з любоўю да тых, хто ўдзельнічае ў яго жыцці недасканалым чынам: разам з імі моліцца аб ласцы навяртання, заахвочвае іх рабіць дабро, натхняе на ўзаемны клопат з любоўю і на ўдзел у служэнні супольнасці, у якой яны жывуць і працуюць. [...] Калі саюз дасягае значнай стабільнасці праз публічную повязь (і характарызуецца глыбокім пачуццём, адказнасцю перад нашчадкамі, здольнасцю пераадольваць горкі досвед), яго можна разглядаць як шанец, каб у тых выпадках, калі гэта магчыма, прывесці да сакрамэнту сужэнства"[78].

79. „Перад абліччам цяжкіх сітуацый і зраненых сем'яў трэба заўсёды памятаць пра агульны прынцып: «Няхай пастыры ведаюць, што дзеля любові праўды яны маюць абавязак правільна ацаніць сітуацыю» (*Familiaris consortio*, 84). Ступень адказнасці розная ў кожным выпадку, і могуць існаваць фактары, якія абмяжоўваюць здольнасць да прыняцця рашэння. Таму трэба выразна прадстаўляць вучэнне, але і пазбягаць высноў, якія не ўлічваюць складанасць розных

[77] *Гамілія падчас св. Імшы на заканчэнне VIII Сусветнай сустрэчы сем'яў*, Філадэльфія (27 верасня 2015): *L'Osservatore Romano*, 28-29 settembre 2015, p. 7.

[78] *Relatio finalis* 2015, 53-54.

сітуацый, і абавязкова звяртаць увагу на тое, як людзі жывуць і пакутуюць з прычыны становішча, у якім яны знаходзяцца“[79].

## Перадаванне жыцця і выхаванне дзяцей

80. Сужэнства — гэта перадусім „глыбокая супольнасць жыцця і сужэнскай любові“[80], якая з’яўляецца дабром для саміх сужэнцаў[81], а сексуальнасць „падпарадкаваная сужэнскай любові мужчыны і жанчыны“[82]. Таму таксама „сужэнцы, якім Бог не даў патомства, могуць нягледзячы на гэта весці глыбокае сужэнскае жыццё з чалавечага і хрысціянскага пункта гледжання“[83]. Тым не менш, гэтая сувязь „з натуры“[84] накіраваная на пракрэацыю. Новае дзіця не прыбывае „звонку як дадатак да ўзаемнай любові сужэнцаў; яно нараджаецца ў самым цэнтры гэтага ўзаемнага дару, плёнам і спаўненнем якога з’яўляецца“[85]. Яно не з’яўляецца пад канец працэсу, але прысутнічае ад пачатку любові, як істотная рыса, якую нельга адмаўляць без шкоды для самой любові. Ад пачатку любоў адкідае ўсе імпульсы да замкнёнасці ў сабе і адкрываецца на плоднасць, якая яе працягвае, выходзячы па-за межы ўласнага існавання. Таму кожны палавы акт сужэнцаў мае гэтае значэнне[86], хоць з розных прычын не заўсёды можа сапраўды весці да зачацця новага жыцця.

[79] *Тамсама*, 51.

[80] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 48.

[81] Пар. *Codice di Diritto Canonico*, c. 1055 § 1: «*Ad bonum coniugum atque ad prolis generationem et educationem ordinatum*».

[82] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2360.

[83] *Тамсама*, 1654.

[84] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 48.

[85] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2366.

[86] Пар. Павел VI, Энц. *Humanae vitae* (25 ліпеня 1968), 11-12: *AAS* 60 (1968), 488-489.

81. Дзіця патрабуе нараджэння з гэтай любові, а не якімсьці іншым чынам, паколькі „яно не з'яўляецца чымсьці належным, але дарам“[87], які „ёсць плёнам, уласцівым акту сужэнскай любові сваіх бацькоў“[88]. Таму „згодна з парадкам стварэння сужэнская любоў паміж мужчынам і жанчынай і перадача жыцця падпарадкаваныя адно аднаму (пар. *Быц* 1, 27-28). Такім чынам Стварыцель учыніў мужчыну і жанчыну сваімі супрацоўнікамі ў стварэнні і адначасова інструментамі сваёй любові, ускладаючы на іх адказнасць за будучыню чалавечай сям'і праз перадаванне чалавечага жыцця“[89].

82. Айцы Сінода сцвердзілі, што „няцяжка заўважыць пашырэнне менталітэту, які зводзіць нараджэнне жыцця да зменнага індывідуальнага планавання або планавання сужэнскай пары“[90]. Вучэнне Касцёла „дапамагае перажываць згодна і свядома супольнасць паміж сужэнцамі ва ўсіх яе вымярэннях, уключна з адказнасцю за нараджэнне. Трэба адкрыць нанова заклік энцыклікі *Humanae vitae* Паўла VI, якая падкрэслівае патрэбу шанавання годнасці асобы пры маральнай ацэнцы спосабаў рэгулявання нараджальнасці [...]. Выбар усынаўлення і апека выражае асаблівую плоднасць сужэнскага досведу“[91]. З асаблівай удзячнасцю Касцёл „падтрымлівае сем'і, якія прымаюць, выхоўваюць і акружаюць любоўю спецыфічных дзяцей“[92].

[87] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2378.

[88] Кангрэгацыя Веравучэння, Інстр. *Donum vitae* (22 лютага 1987), II, 8: *AAS* 80 (1988), 97.

[89] *Relatio finalis* 2015, 63.

[90] *Relatio Synodi* 2014, 57.

[91] *Тамсама*, 58.

[92] *Тамсама*, 57.

83. У гэтым кантэксце я не магу не сказаць пра тое, што калі сям'я — гэта святыня жыцця, месца, дзе жыццё нараджаецца і атачаецца клопатам, то страшэннай супярэчнасцю з'яўляецца ператварэнне яе ў месца, дзе жыццё адкідаюць і знішчаюць. Каштоўнасць чалавечага жыцця настолькі вялікая, настолькі непазбыўным з'яўляецца права на жыццё нявіннага дзіцяці, якое развіваецца ва ўлонні сваёй маці, што ніякім чынам нельга ўявіць магчымасць прымаць рашэнні адносна гэтага жыцця, нібы гаворка ішла аб праве на ўласнае цела. Жыццё — гэта мэта сама па сабе, таму яно ніякім чынам не можа быць прадметам дамінавання з боку іншай чалавечай асобы. Сям'я ахоўвае жыццё на ўсіх яго этапах, а таксама напрыканцы яго. Такім чынам, „тым, хто працуе ў асяродках аховы здароўя, нагадваецца пра маральны абавязак супраціву сумлення. Гэтак жа Касцёл не толькі адчувае пільную патрэбу пацвярджаць права на натуральную смерць, пазбягаючы інвазіўных метадаў лячэння і эўтаназіі“, але і „рашуча адкідае смяротнае пакаранне“[93].

84. Айцы таксама пажадалі падкрэсліць, што „адным з асноўных выклікаў, якія сёння стаяць перад сем'ямі, безумоўна з'яўляецца справа выхавання, якая стала яшчэ больш цяжкай і складанай у сучаснай культурнай рэчаіснасці і на якую вялікі ўплыў аказваюць СМІ“[94]. „Касцёл адыгрывае каштоўную ролю ў падтрымцы сямей, пачынаючы з хрысціянскага ўтаямнічання праз гасцінныя супольнасці“[95]. Аднак вельмі важна памятаць, што выхаванне дзяцей — гэта найважнейшы абавязак і ў той жа час самае першае

[93] *Relatio finalis* 2015, 64.
[94] *Relatio Synodi* 2014, 60.
[95] *Тамсама*, 61.

права бацькоў[96]. Для іх гэта не толькі цяжар, але таксама істотнае і непазбыўнае права, абараняць якое яны пакліканы і якога ніхто не павінен у іх забіраць. Дзяржава прапаноўвае адукацыйную паслугу ў якасці дапамогі, падтрымліваючы неперадавальную іншым ролю бацькоў, якія маюць права на свабодны выбар тыпу адукацыі (даступнай і якаснай), якую хочуць даць сваім дзецям згодна са сваімі перакананнямі. Школа не замяняе бацькоў, а дапаўняе іх. Гэта асноўны прынцып: „Усе іншыя ўдзельнікі выхаваўчага працэсу дзейнічаюць як бы ад імя бацькоў, абапіраючыся на іх згоду, а ў пэўнай ступені нават на іх замову“[97]. У той жа час „дайшло да падзелу паміж сям'ёй і грамадствам, паміж сям'ёй і школай, выхаваўчы пакт сёння разарваны; тым самым выхаваўчы запавет грамадства і сям'і апынуўся сёння ў стане крызісу“[98].

85. Касцёл праз адпаведную пастырскую дзейнасць пакліканы да супрацоўніцтва, каб бацькі самі маглі выконваць сваю адукацыйную місію. Ён павінен гэта рабіць, заўсёды дапамагаючы ім ацэньваць іх спецыфічную ролю і прызнаваць, што тыя, хто атрымаў сакрамэнт сужэнства, становяцца сапраўднымі слугамі выхавання, паколькі праз выхаванне сваіх дзяцей яны будуюць Касцёл[99] і прымаюць пакліканне, якое прапаноўвае ім Бог[100].

[96] Пар. *Codice di Diritto Canonico*, c. 1136; пар. *Codice dei Canoni delle Chiese Orientali*, 627.

[97] Папская Рада па справах сям'і, *Sessualità umana: verità e significato* (8 снежня 1995), 23.

[98] *Катэхеза* (20 мая 2015): *L'Osservatore Romano*, 21 maggio 2015, p. 8.

[99] Пар. Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 38: *AAS* 74 (1982), 129.

[100] Пар. *Discorso all'Assemblea diocesana di Roma* (14 чэрвеня 2015): *L'Osservatore Romano*, 15-16 giugno 2015, p. 8.

86. „З сардэчнай і глыбокай радасцю Касцёл глядзіць на сем'і, якія захоўваюць вернасць вучэнню Евангелля, дзякуе ім і заахвочвае іх даваць сведчанне. Дзякуючы ім здзяйсняецца прыгажосць непарыўнага сужэнства, вернага назаўсёды. У сям'і, якую можна назваць «хатнім Касцёлам» (*Lumen gentium*, 11), сталее першы эклезіяльны досвед еднасці паміж асобамі, у якой адлюстроўваецца дзякуючы ласцы таямніца Святой Тройцы. «Гэта тут мы вучымся трываласці і радасці працы, братэрскай любові, велікадушнаму і нават шматразоваму прабачэнню, а асабліва вучымся аддаваць пашану Богу праз малітву і ахвярнасць свайго жыцця» (*Катэхізіс Каталіцкага Касцёла*, 1657)“[101].

87. Касцёл — гэта сям'я сем'яў, якая няспынна ўзбагачае жыццё ўсіх хатніх касцёлаў. У сувязі з гэтым „моцай сакрамэнту сужэнства кожная сям'я становіцца дабром для Касцёла з усімі наступствамі. З гэтай перспектывы каштоўным дарам для Касцёла будзе сёння разважанне пра ўзаемадзеянне сям'і і Касцёла: Касцёл — гэта дабро для сям'і, сям'я — гэта дабро для Касцёла. Канцэнтрацыя сакрамэнтальнага дару Пана спачывае не толькі на паасобнай сям'і, але на ўсёй хрысціянскай супольнасці“[102].

88. Любоў, якая існуе ў сем'ях, — гэта няспынная моц для жыцця Касцёла. „Мэта сужэнскага паяднання заключаецца ў няспынным закліку развіваць і паглыбляць гэтую любоў. З'яднаныя ў любові сужэнцы

[101] *Relatio Synodi* 2014, 23
[102] *Relatio finalis* 2015, 52.

спазнаюць прыгажосць бацькоўства і мацярынства; падзяляюць планы і цяжкасці, жаданні і смутак; вучацца ўзаемнаму клопату і ўзаемнаму прабачэнню. У гэтай любові яны святкуюць свае моманты шчасця і падтрымліваюць адно аднаго ў цяжкія хвіліны свайго жыцця. [...] Бескарыслівая прыгажосць узаемнага дару, радасць з прычыны новага жыцця і поўная любові апека ўсіх членаў сям'і ад малых дзяцей да старых — гэта толькі некаторыя з плёнаў, якія робяць выключным і незаменным адказ на пакліканне сям'і“[103] як для Касцёла, так і для ўсяго грамадства.

[103] *Тамсама*, 49-50.

РАЗДЗЕЛ IV

# ЛЮБОЎ У СУЖЭНСТВЕ

89. Усяго сказанага будзе недастаткова, каб выразіць евангелле сужэнства і сям'і, асабліва калі мы не прысвяцім крыху часу для таго, каб падрабязна распавесці пра любоў. Мы не можам заахвочваць да вернасці і ўзаемнага дару з сябе, калі не будзем заклікаць да развіцця, умацавання і паглыблення сужэнскай і сямейнай любові. Ласка сакрамэнту сужэнства па сутнасці павінна ў першую чаргу „ўдасканальваць любоў сужэнцаў“[104]. Таксама і ў гэтым выпадку маюць слушнасць словы: калі я маю „паўнату веры, каб перастаўляць горы, а любові не маю, то я — нішто. І калі раздам усю маёмасць сваю і аддам цела сваё на спаленне, а любові не маю, няма мне з гэтага ніякай карысці“ (*1 Кар* 13, 2-3). Больш за тое, слова „любоў“ стала адным з найчасцей ужываных, а таксама злоўжываных[105].

[104] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 1641.
[105] Пар. БЭНЭДЫКТ XVI, Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 2.

90. У так званым „Гімне любові“, напісаным св. Паўлам, мы бачым пэўныя рысы сапраўднай любові:

„Любоў доўгацярплівая,
любоў ласкавая,
не зайздросціць,
любоў не пыхлівая,
не ганарыцца,
не бессаромная,
не шукае свайго,
не гневаецца,
не памятае зла,
не радуецца несправядлівасці,
але радуецца разам з праўдай.
Усё зносіць,
усяму верыць,
на ўсё спадзяецца,
усё церпіць“ (*1 Кар* 13, 4-7).

Гэта існуе і ўдасканальваецца ў жыцці, якое сужэнцы штодзённа падзяляюць адно з адным і са сваімі дзецьмі. Таму трэба спыніцца і высветліць значэнне слоў гэтага тэксту, каб спрабаваць прымяніць іх да канкрэтнага жыцця кожнай сям'і.

### *Цярплівасць*

91. Першы выраз — гэта *makrothymei*. Гэтае слова нельга перакладаць толькі як „доўгацярплівая“, паколькі гэтая ідэя выказана ў канцы сёмага верша. Яго значэнне мы можам зразумець з грэцкага перакладу Старога Запавету, калі гаворка ідзе пра тое, што Бог „няскоры да гневу“ (*Зых* 34, 6; *Лев* 14, 18). Гэта мае

месца тады, калі асоба не дазваляе ахапіць сябе імпульсам і пазбягае нападак. Гэта рыса Бога запавету, які заклікае наследаваць Яго таксама ў сямейным жыцці. Тэксты, у якіх св. Павел выкарыстоўвае гэты тэрмін, трэба чытаць у кантэксце кнігі Мудрасці (пар. 11, 23; 12, 2. 15-18): праз праслаўленне памяркоўнасці Бога, і даючы месца скрусе, Пісанне адначасова падкрэслівае Яго моц, якая праяўляецца ў дзеянні міласэрнасці. Цярплівасць Бога — гэта спаўненне міласэрнасці да грэшнікаў і праява сапраўднай моцы.

92. Быць цярплівымі не азначае, што мы дазволім няспынна здзеквацца над сабой, што мы можам цярпець фізічную агрэсію або згаджацца на стаўленне да нас як да прадметаў. Праблема нараджаецца тады, калі мы патрабуем, каб адносіны былі ідылічныя або каб людзі былі дасканалымі, ці калі мы ставім сябе ў цэнтр і чакаем, каб адбывалася выключна тое, чаго мы хочам. У выніку ўсё выводзіць нас з раўнавагі, усё вядзе нас да агрэсіўных рэакцый. Калі мы не клапоцімся пра цярплівасць, то заўжды будзем апраўдваць свой гнеў і ўрэшце станем людзьмі, якія не змогуць жыць разам з іншымі, асацыяльнымі тыпамі, няздольнымі апанаваць імпульсы, а сям’я ператворыцца ў поле бітвы. Таму Божае слова заахвочвае нас: „Усякая горыч і раздражненне, і гнеў, і крык, і блюзнерства няхай будуць выдалены ад вас разам з усякай злосцю“ (*Эф* 4, 31). Гэтая цярплівасць умацоўваецца, калі я прызнаю, што і другая асоба, такая, якой яна ёсць, мае права на жыццё на гэтай зямлі як і я. Незалежна ад таго, што яна замінае мне, змяняе мае планы ці нервуе мяне, што яе спосаб існавання або яе ідэі, або нават яна сама не зусім такая, як я спадзяваўся. Любоў заўсёды мае пачуццё глыбокага спачування, якое вядзе да прыняцця іншай асобы як часткі гэтага свету, нават калі яна дзейнічае не так, як мне хацелася б.

*Ласкавасць*

93. Наступнае слова — гэта *chresteuetai*, унікальнае ва ўсёй Бібліі, паходзіць ад *chrestos* (добры чалавек, які праяўляе сваю дабрыню ва ўчынках). Аднак беручы пад увагу, у якім кантэксце стаіць гэтае слова, у цесным паралелізме з папярэднім дзеясловам, яно становіцца яго дапаўненнем. Таму св. Павел хоча растлумачыць, што „цярплівасць“, названая першай, гэта не зусім пасіўная пазіцыя, але спадарожнічае ёй актыўнасць, дынамічная і крэатыўная рэакцыя на іншых. Ён паказвае, што любоў робіць дабро іншым і пашырае яго. Таму перакладаецца як „ласкавая“.

94. Ва ўсім тэксце відаць, што св. Павел падкрэслівае: любоў — гэта не толькі пачуццё, але яе трэба разумець у тым сэнсе, які слова „любоў“ мае ў габрэйскай мове, а значыць „рабіць дабро“. Як сказаў св. Ігнацы Лаёла: „Любоў павінна грунтавацца больш на ўчынках, чым на словах“[106]. Такім чынам яна можа паказаць усю сваю плённасць і дазваляе нам зазнаваць радасць ад давання, высакароднасці і цудоўнасці прынясення сябе ў дар шчодра, без меры, без патрабавання адплаты, толькі дзеля прыемнасці аддавання і служэння.

*Аздараўленне ад зайздрасці*

95. Далей адкідаецца як супярэчная любові пазіцыя, выказаная словам *zeloi* (зайздрасць). Гэта азначае, што ў любові няма месца на шкадаванне дабра для іншай асобы (*Дз* 7, 9; 17, 5). Зайздрасць — гэта засмучанасць дабром іншых, якая паказвае, што мы не

[106] *Esercizi spirituali*, Сузіранне дзеля дасягнення любові, 230.

зацікаўленыя ў шчасці іншых, паколькі засяроддзіліся выключна на сваім поспеху. У той час як любоў дазваляе нам выйсці з нашых абмежаванняў, зайздрасць вядзе нас да канцэнтрацыі на сабе. Сапраўдная любоў цэніць дасягненні іншых, не ўспрымае іх як пагрозу, яна свабодная ад горкага смаку зайздрасці. Яна прымае тое, што кожны мае розныя дары і розны жыццёвы шлях. Таму імкнецца адкрыць свой шлях да шчасця, дазваляючы іншым знайсці сваё шчасце.

96. Урэшце гаворка ідзе пра спаўненне таго, чаго патрабуюць дзве апошнія запаведзі Божага закону: „Не пажадай дому бліжняга свайго; не пажадай ні жонкі яго, ні ягонага нявольніка, ні ягонай нявольніцы, ні вала ягонага, ні асла ягонага — нічога, што належыць яму“ (*Зых* 20, 17). Любоў прымушае нас шчыра цаніць кожнага чалавека, прызнаючы яго права на шчасце. Я люблю іншую асобу, гляджу на яе вачыма Бога Айца, які „дае нам усё для карыстання“ (*1 Цім* 6, 17), а значыць прымаю, што яна можа карыстацца добрым момантам. У кожным выпадку, гэта той самы корань любові, які вядзе мяне да адкідання несправядлівасці, у выніку якой некаторыя маюць занадта шмат, а іншыя нічога, або які пабуджае мяне да дзеяння, каб адрынутыя грамадствам людзі таксама маглі мець крыху радасці. Гэта не зайздрасць, але жаданне роўнасці.

*Без пыхлівасці і гонару*

97. Чарговы выраз — *perpereuetai,* які азначае ганарыстасць, жаданне паказаць сваю вышэйшасць, робячы ўражанне на іншых педантычнай і крыху агрэсіўнай пазіцыяй. Той, хто любіць, не толькі пазбягае зашмат гаварыць пра сябе, але мае здольнасць быць на сваім месцы, не спрабуе ставіць сябе

ў цэнтры, бо засяроджваецца на іншых. Наступнае слова — *physioutai* — вельмі блізкае, бо яно паказвае, што любоў не нахабная. Яно літаральна выражае тое, каб „не ўзвышацца“ над іншымі, і ўказвае на штосьці больш далікатнае. Гаворка не толькі пра манію дэманстраваць свае станоўчыя рысы, але пра штосьці, што прыводзіць да страты пачуцця рэчаіснасці. Мы лічым сябе больш цудоўнымі, чым мы ёсць на самай справе, бо мяркуем, што мы больш „духоўныя“ або больш „мудрыя“. Св. Павел выкарыстоўвае гэта слова з рознай нагоды, каб, напрыклад, сказаць, што „пазнанне робіць ганарыстым, а любоў будуе“ (*1 Кар* 8, 1b). Гэта азначае, што некаторыя лічаць сябе вялікімі, бо ведаюць больш, чым іншыя, і намагаюцца кантраляваць іх, у той час як у сапраўднасці тое, што робіць нас вялікімі, — гэта любоў, якая разумее, клапоціцца, прымае слабых і чулая да іх. У іншым вершы св. Павел выкарыстоўвае гэта азначэнне, каб раскрытыкаваць тых, хто „заганарыўся“ (пар. *1 Кар* 4, 18), а ў сапраўднасці ў іх больш пустаслоўя, чым сапраўднай „моцы“ Духа Святога (пар. *1 Кар* 4, 19).

98. Важна, каб хрысціяне не былі высакамернымі ў сваім падыходзе да родных, слабых у веры, слабых або менш упэўненых у сваіх перакананнях. Часам адбываецца наадварот: тыя, хто ў сваёй сям’і мусілі быць больш сталымі ў веры, становяцца нязносна нахабнымі. Пастава пакоры ўяўляецца тут як неад’емная частка любові, бо каб зразумець, прабачыць або служыць іншым усім сэрцам, неабходна вылечыцца ад пыхі і рупіцца пра пакору. Езус нагадваў вучням, што ў свеце ўлады кожны стараецца панаваць над іншым, і таму сказаў ім: „Няхай не так будзе сярод вас“ (*Мц* 20, 26). Логіка хрысціянскай любові — гэта не логіка людзей, якія адчуваюць сваю перавагу над іншымі

і імкнуцца дэманстраваць сваю ўладу, але: „хто хоча быць большым сярод вас, няхай будзе вам слугою“ (*Мц* 20, 27). У сямейным жыцці не можа дамінаваць логіка панавання адных над другімі або суперніцтва, каб паглядзець, хто больш разумны і моцны, бо гэтая логіка забівае любоў. Таксама да сям'і адносіцца парада: „Апраніцеся ўсе ва ўзаемную пакору, таму што Бог супраціўляецца ганарыстым, а пакорным дае ласку“ (*1 П* 5, 5).

*Не бессаромная*

99. Любоў азначае таксама жаданне, каб цябе любілі іншыя, і тут знаходзіць свой сэнс выраз *aschemonei*. Ён хоча паказаць, што любоў не дзейнічае жорстка і нязветліва, не абыходзіцца груба. Яе спосаб існавання, яе словы, яе жэсты ветлівыя, а не грубыя ці жорсткія. Яна не любіць раніць іншых. Ветлівасць — гэта „школа ўражлівасці і бескарыслівасці“, якая патрабуе ад яе прыхільніка „фарміраваць свой розум і пачуцці і навучыцца адчуваць, казаць, а часам — маўчаць“[107]. Быць мілым — гэта не стыль, які хрысціянін можа выбраць або адкінуць. У межах асноўных патрабаванняў любові „кожны чалавек абавязаны рабіць ветлівымі свае адносіны з іншымі“[108]. Кожны дзень „уваходжанне ў жыццё іншага чалавека, таксама тады, калі ён належыць да нашага жыцця, патрабуе далікатных і неінвазіўных паводзін, што азначае давер і пашану. [...] А любоў, чым больш інтымная і глыбокая, тым больш патрабуе шанавання свабоды і здольнасці чакаць, пакуль другі адчыніць дзверы свайго сэрца“[109].

[107] OCTAVIO PAZ, *La llama doble*, Barcelona 1993, 35.
[108] TOMMASO D'AQUINO, *Summa Theologiae* II-II, q. 114, a. 2, ad 1.
[109] *Катэхеза* (13 мая 2015): *L'Osservatore Romano*, 14 maggio 2015, p. 8.

100. Каб быць настроеным на сапраўдную сустрэчу з іншымі, неабходна скіраваць на іх ветлівы позірк. Гэта немагчыма, калі пануе песімізм, які падкрэслівае іх недахопы і памылкі, быць можа, каб кампенсаваць уласныя комплексы. Ветлівы позірк дазваляе нам не зацыкліваццa на абмежаваннях іншага, і такім чынам мы можам быць да яго цярплівымі, можам быць супрацоўнікамі ў супольным праекце, хоць мы і розныя. Ветлівая любоў стварае еднасць, рупіцца пра адносіны, стварае новыя сеткі інтэграцыі, будуе моцныя грамадскія сувязі. Такім чынам яна абараняе сама сябе, бо нельга падтрымліваць ахвярнасць дзеля іншых без пачуцця прыналежнасці, без якога кожны ўрэшце пачынае шукаць толькі сваёй карысці, і сумеснае жыццё становіцца немагчымым. Асацыяльная асоба верыць, што іншыя існуюць для задавальнення яе патрэбаў, а калі гэта робяць, то яны толькі выконваюць свой абавязак. Таму няма месца на ветлівую любоў і яе мову. Той, хто любіць, здольны сказаць словы падтрымкі, якія гояць, умацоўваюць, суцяшаюць і заахвочваюць. Возьмем, напрыклад, некаторыя словы, якія Езус сказаў людзям: „Будзь адважным, сыне!“ (*Мц* 9, 2). „Вялікая вера твая!“ (*Мц* 15, 28). „Устань!“ (*Мк* 5, 41). „Ідзі ў спакоі!“ (*Лк* 7, 50) „Не бойцеся!“ (*Мц* 14, 27). Гэтыя словы не прыніжаюць, не засмучаюць, не раздражняюць, не выказваюць пагарду. У сям’і мы павінны навучыцца гэтай ветлівай мове Езуса.

*Шчодрасць*

101. Мы шмат разоў казалі, што, каб любіць іншых, трэба найперш палюбіць самога сябе. Аднак „Гімн любові“ кажа, што любоў „не шукае свайго“, або „не шукае таго, што яго“. Гэты выраз таксама выкарыстоўваецца ў іншым тэксце: „Не клапаціцеся кожны толькі пра

сваё, але і пра іншых!“ (*Флп* 2, 4). Перад абліччам такога выразнага сцверджання Святога Пісання трэба пазбягаць прызнання першынства любові да саміх сябе, нібы яна больш высакародная, чым прынясенне сябе ў дар іншым. Пэўны прыярытэт любові да саміх сябе можа разумецца толькі як псіхалагічная ўмова, бо той, хто не можа любіць самога сябе, сутыкаецца з цяжкасцямі ў любові да іншых: „Хто злы да сябе, ці будзе добры да іншых? [...] Няма горшага чалавека, чым той, хто сквапны да самога сябе“ (*Сір* 14, 5-6).

102. Так св. Тамаш Аквінскі тлумачыць, што „любові больш уласціва жаданне любіць, чым быць любімым“[110], і сапраўды „маці, у якіх мы сустракаем найвялікшую любоў, больш стараюцца любіць, чым быць любімымі“[111]. Таму любоў можа выходзіць па-за справядлівасць і раздавацца задарма, „нічога за гэта не чакаючы“ (*Лк* 6, 35), аж да вяршыні любові, „калі хтосьці жыццё сваё аддае за сяброў сваіх“ (*Ян* 15, 13). Ці магчымая яшчэ такая шчодрасць, якая дазваляе дарма даваць і даваць да самага канца? Безумоўна, гэта магчыма, бо гэтага патрабуе Евангелле: „Задарма атрымалі, задарма давайце!“ (*Мц* 10, 8).

*Без унутранага гвалту*

103. Калі першыя словы „Гімна любові“ заахвочвалі нас да цярплівасці, якая дазваляе пазбегнуць рэзкай рэакцыі на слабасць і памылкі іншых, то цяпер з’яўляецца іншае слова — *paroxynetai*, якое датычыць унутранай рэакцыі абурэння на штосьці вонкавае. Гэта ўнутраны гвалт, схаваная раздражнёнасць, якая

[110] *Summa Theologiae* II-II, q. 27, a. 1, ad 2.
[111] *Тамсама*, a. 1.

ставіць нас у абарончую пазіцыю супраць іншых, быццам яны з'яўляюцца непрыемнымі ворагамі, якіх трэба пазбягаць. Стан такой унутранай агрэсіі не прыносіць ніякай карысці, а толькі паказвае нашую слабасць і вядзе да нашай ізаляцыі. Абурэнне з'яўляецца здаровым, калі пабуджае нас рэагаваць на сур'ёзную несправядлівасць, але становіцца шкодным, калі ўплывае на кожнае нашае стаўленне да іншых.

104. Евангелле заахвочвае нас хутчэй заўважаць бервяно ў сваім воку (пар. *Мц* 7, 5). Як хрысціяне мы не можам быць абыякавымі да няспыннага закліку Божага слова не распальваць гнеў: „Не будзь пераможаны злом, але перамагай зло дабром!“ (*Рым* 12, 21). „Не пераставайце рабіць дабро“ (*Гбр* 6, 9). Адчуванне сілы выбуховай агрэсіі — гэта адно, а згода на яе, дазвол, каб яна стала пастаяннай — гэта нешта іншае: „Гневайцеся, але не грашыце, няхай сонца не заходзіць у гневе вашым!“ (*Эф* 4, 26). Таму ніколі не трэба завяршаць дзень без прымірэння ў сям'і. „А як мне мірыцца? На каленях? Не! Дастаткова малога жэсту, дробнай рэчы, і ў сям'ю вяртаецца згода. Дастаткова пяшчоты, без слоў. Але няхай ніколі дзень сям'і не заканчваецца без прымірэння“[112]. Унутранай рэакцыяй на непрыемнасць, выкліканую іншымі, павінна быць перадусім благаслаўленне ў сэрцы, жаданне дабра іншай асобе, просьба, скіраваная да Бога, каб Ён вызваліў яе і аздаравіў: „Благаслаўляйце, бо дзеля гэтага вы пакліканы, каб унаследаваць благаслаўленне“ (*1 П* 3, 9). Калі мы павінны змагацца са злом, то будзем рабіць гэта, але заўсёды кажучы „не“ ўнутранаму гвалту.

[112] *Катэхеза* (13 мая 2015): *L'Osservatore Romano*, 14 maggio 2015, p. 8.

## *Прабачэнне*

105. Калі мы дазволім дрэнным пачуццям напаўняць нас, то створым месца для крыўды, якая паселіцца ў нашым сэрцы. Выраз *logizetai to kakon* азначае „зважаць на зло“, „натаваць яго“, г. зн. памятаць крыўды. Процілегласцю з’яўляецца прабачэнне, якое грунтуецца на станоўчым стаўленні, якое спрабуе зразумець слабасць іншых і стараецца шукаць апраўданне іншай асобы, падобна як Езус, які сказаў: „Ойча, прабач ім, бо не ведаюць, што робяць“ (*Лк* 23, 34). Аднак часта мы схільныя шукаць усё больш правінаў, уяўляць сабе ўсё больш беззаконняў, дадумваць разнастайныя дрэнныя намеры. Такім чынам крыўды нарастаюць і ўкараняюцца. Тады кожная памылка або падзенне сужэнца можа знішчыць сувязь любові і сямейную стабільнасць. Праблема ў тым, што часам усяму прыпісваецца аднолькавае значэнне, а гэта пагражае тым, што мы будзем жорсткія да кожнай памылкі іншай асобы. Слушнае адстойванне сваіх правоў ператвараецца ва ўпартае і пастаяннае жаданне помсты, а не ў здаровую абарону сваёй годнасці.

106. Калі мы былі абражаныя або расчараваныя, прабачэнне магчымае і пажаданае, але ніхто не кажа, што гэта лёгка. Праўда ў тым, што „сямейная еднасць можа захоўвацца і ўдасканальвацца толькі ў вялікім духу ахвяры. Яна патрабуе высакароднай гатоўнасці кожнага і ўсіх да зразумення, талерантнасці, прабачэння і прымірэння. Кожная сям’я разумее, як напружанне і канфлікты, эгаізм, нязгода моцна ўдараюць у гэтую еднасць, а часам смяротна раняць яе. Адсюль і паходзяць разнастайныя і шматлікія формы распаду сямейнага жыцця“[113].

[113] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 21: *AAS* 74 (1982), 106.

107. Сёння мы ведаем, што каб мець здольнасць прабачаць, трэба прайсці праз вызваляючы досвед разумення і даравання сабе. Шмат разоў нашы памылкі або крытычныя погляды людзей, якіх мы любім, прыводзілі да таго, што мы трацілі любоў да саміх сябе. Урэшце гэта вяло нас да цурання іншых, уцёкаў ад пачуццяў і напаўнення страхам у міжасабовых адносінах. Таму магчымасць абвінавачання іншых становіцца фальшывай палёгкай. Трэба маліцца з нашай уласнай гісторыяй, прыняць сябе, умець жыць з уласнымі абмежаваннямі, а таксама дараваць сабе, каб мы маглі мець такую ж пазіцыю ў дачыненні да іншых.

108. Але для гэтага неабходны досвед Божага прабачэння, апраўдання, дадзенага задарма, а не дзякуючы нашым заслугам. Мы былі ахопленыя любоўю, якая апярэджвае ўсякі наш твор, якая заўсёды дае новыя магчымасці, вядзе наперад і натхняе. Калі мы прымем, што Божая любоў — безумоўная, што любоў Айца не трэба купляць або плаціць за яе, тады зможам любіць, нягледзячы ні на што, прабачаць іншым, нават калі яны былі несправядлівыя да нас. У адваротным выпадку наша сямейнае жыццё ўжо не будзе месцам разумення, падтрымкі і заахвочання, але месцам пастаяннага напружання або ўзаемных пакут.

*Радавацца з іншымі*

109. Выраз *chairei epi te adikia* азначае нешта негатыўнае, што знаходзіцца ў тайніках чалавечага сэрца. Гэта атручаная пазіцыя людзей, якія радуюцца, калі нехта церпіць несправядлівасць. Гэта фраза дапаўняецца наступнай, пазітыўнай: *sygchairei te aletheia* — „радавацца з праўдай“. Гэта азначае радавацца дабру іншай асобы, калі прызнана яе годнасць, калі цэняцца

яе здольнасці і добрыя справы. Гэта недасягальна для таго, хто заўсёды параўноўвае сябе з кімсьці або спаборнічае з іншымі, нават са сваім сужэнцам або сужонкай, аж да патаемнай радасці з прычыны яго ці яе параз.

110. Калі любячая асоба можа зрабіць дабро іншаму або калі бачыць, што іншаму шчасціць, і радуецца гэтаму, то аддае хвалу Богу, бо „радаснага даўцу любіць Бог“ (*2 Кар* 9, 7), а наш Пан асабліва цэніць таго, хто радуецца шчасцю іншых. Калі мы не ўмацоўваем нашую здольнасць радавацца дабру іншых, а засяроджваемся перадусім на нашых уласных патрэбах, мы асуджаныя на жыццё з мінімальнай радасцю, бо, як сказаў Езус, „Больш шчасця ў тым, каб даваць, чым у тым, каб браць!“ (*Дз* 20, 35). Сям'я заўсёды павінна быць месцам, дзе будуць радавацца разам з кожным, хто зробіць у жыцці нешта добрае.

*Усё прабачае*

111. Пералік дапаўняюць чатыры выразы, якія кажуць пра пэўную татальнасць „усяго“. Усё зносіць, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць. Гэтак моцна падкрэсліваецца контркультурны дынамізм любові, здольнай выступіць супраць ўсяго, што магло б ёй пагражаць.

112. Па-першае, тут гаворка пра тое, што любоў „усё зносіць“ (*panta stegei*). Гэта не тое самае, што „не зважае на зло“, бо гэты выраз звязаны з выкарыстаннем мовы і можа азначаць „захаванне маўчання“ аб тым, што можа быць негатыўным у іншай асобе. Гэта цягне за сабой абмежаванне ацэнкі, стрыманне схільнасці кідацца суровымі і абсалютнымі асуджэннямі: „не

асуджайце, і не будуць асуджаць вас“ (*Лк* 6, 36). Божае слова хоць і скіраванае на наша штодзённае выкарыстанне мовы, заклікае нас: „Браты, не абражайце адзін аднаго“ (*Як* 4, 11). Згода на знішчэнне вобразу іншага чалавека — гэта спосаб умацавання нашага ўласнага вобразу, разрадка ад крыўдаў і зайздрасці без перажывання за выкліканае намі зло. Мы часта забываем, што паклёп, калі ён значна псуе рэпутацыю іншых, прычыняе ім шкоду, якую вельмі цяжка направіць, можа быць вялікім грахом, сур'ёзным злачынствам супраць Бога. Таму Божае слова вельмі суровае да грахоў языка, кажучы, што гэта „свет несправядлівасці“, якая „апаганьвае ўсё цела“ (*Як* 3, 6) як „нястрымнае зло, поўнае смяротнай атруты“ (*Як* 3, 8). Калі „ім праклінаем людзей, створаных на падабенства Божае“ (*Як* 3, 9), то любоў клапоціцца пра вобраз другой асобы, далікатна ведучы нават да захавання добрага імя ворагаў. Абараняючы Божы закон, нельга забываць пра гэта патрабаванне любові.

113. Сужэнцы, якія любяць адно аднаго і належаць адно аднаму, добра кажуць пра сябе, стараюцца паказаць добры бок сужэнца, а не толькі яго слабасці і памылкі. У кожным выпадку яны захоўваюць маўчанне, каб не знішчыць яго вобраз. Аднак гэта не толькі знешні жэст, ён вынікае з унутранай пазіцыі. Гэта таксама не наіўнасць чалавека, які ўдае, што не бачыць цяжкасцяў і слабасцяў іншага чалавека, але гэта глыбіня погляду таго, хто бачыць гэтыя слабасці і памылкі ў шырэйшым кантэксце. Ён памятае, што недахопы — гэта толькі пэўная частка, а не цэлае існаванне іншай асобы. Непрыемны факт у дадзеных адносінах — гэта не ўсе адносіны. Таму можна прыняць з прастатой, што мы ўсе спалучаем у сабе святло і цень. Другі чалавек з'яўляецца не толькі тым, хто

мяне раздражняе. Ён штосьці значна большае. Таму я не патрабую ад яго ідэальнай любові, каб яго ацаніць. Ён любіць мяне такім, якім я ёсць і як можа, са сваімі абмежаваннямі, але тое, што яго любоў недасканалая, не азначае, што яна фальшывая ці несапраўдная. Яна сапраўдная, але абмежаваная і часовая. Таму калі я патрабую занадта шмат, ён нейкім чынам дасць мне зразумець гэта, паколькі не можа і не згодзіцца граць ролю боскай істоты або абслугоўваць усе мае патрэбы. Любоў суіснуе з недасканаласцю, прабачэннем і можа замаўчаць, сутыкнуўшыся з абмежаваннямі каханай асобы.

*Давер*

114. *Panta pisteuei*: „усяму верыць“. З улікам кантэксту трэба разумець гэту „веру“ не ў тэалагічным сэнсе, а ў звычайным разуменні „даверу“. Гаворка ідзе не толькі пра тое, каб пазбыцца падазрэнняў, што другі хлусіць або падманвае. Гэты базавы давер пазнае святло, запаленае Богам, якое хаваецца за цемрай, або жар, які надалей палае над попелам.

115. Такі давер робіць магчымымі адносіны свабоды. Не трэба кантраляваць другога, сачыць за кожным яго крокам, каб прадухіліць уцёкі з нашых рук. Любоў сілкуе давер, пакідае свабоду, адракаецца ад татальнага кантролю, ад валодання і дамінавання. Гэтая свабода, якая забяспечвае існаванне сфераў аўтаноміі, а таксама адкрытасць на свет і новы досвед, дазваляе абагаціць адносіны, каб яны не станавіліся бесперспектыўнай эндагаміяй. Такім чынам сужэнцы, знаходзячы сябе, могуць радасна дзяліцца тым, што яны атрымалі і чаму навучыліся па-за сямейным колам. У той жа час, свабода дазваляе на шчырасць і празрыстасць,

бо, калі хтосьці ведае, што іншыя яму давяраюць і цэняць яго дабрыню, тады ён будзе такім, які ёсць, без утойвання. Той, хто ведае, што яго заўсёды падазраюць, бязлітасна асуджаюць, што яго не любяць, будзе намагацца захоўваць свае сакрэты, хаваць свае падзенні і слабасці, прыкідвацца кімсьці, кім не з'яўляецца. Але сям'я, у якой пануе глыбокі давер, поўны любові, і дзе ён ніколі нягледзячы ні на што не знікае, дазваляе яе членам паказаць сваю праўдзівую сутнасць і дапамагае ім спантанна адкідаць падман, фальш і хлусню.

*Спадзяецца*

116. *Panta elpizei*: „не баіцца будучыні". У спалучэнні з папярэднім слова указвае на кагосьці, хто ведае, што другі можа змяніцца. Заўсёды верыць у магчымасць сталення, у нечаканы выбух прыгажосці, у тое, што найбольш укрытыя магчымасці яго сутнасці калісьці дадуць першыя парасткі. Гэта не азначае, што ўсё ў гэтым жыцці зменіцца. Гэта вядзе да прыняцця таго, што нешта здарыцца не так, як бы мы хацелі, але, магчыма, Бог піша прама па крывых лініях гэтай асобы і здабудзе нейкае дабро са зла, якога не ўдаецца перамагчы на гэтай зямлі.

117. Тут узнікае надзея ў яе поўным сэнсе, паколькі змяшчае ўпэўненасць у жыцці пасля смерці. Гэтая асоба, з усімі сваімі слабасцямі, пакліканая да паўнаты неба. Там яна цалкам пераменіцца праз уваскрасенне Хрыста, і ўжо не будзе яе слабасці, цемнаты або паталогіі. Там праўдзівая сутнасць гэтай асобы будзе ясьнець на ўсю сваю моц дабрынёй і прыгажосцю. Сярод нядоляў гэтай зямлі гэта дазваляе нам таксама глядзець на гэтую асобу з захапленнем, надпрыродным

позіркам, у святле надзеі, і чакаць той паўнаты, якой цяпер нельга заўважыць, але якую аднойчы яна атрымае ў Нябесным Валадарстве.

*Усё церпіць*

118. *Panta hypomenei* азначае, што яна з пазітыўным стаўленнем перамагае ўсе перашкоды. Азначае вытрываласць у непрыязным асяроддзі. Азначае не толькі талерантнасць да пэўных рэчаў, якія раздражняюць, але і да чагосьці шырэйшага: дынамічную і сталую ўстойлівасць, здольную перамагаць усе выклікі. Гэтая любоў існуе нягледзячы ні на што, нават тады, калі ўсё навокал заахвочвае да чагосьці іншага. Мае ў сабе нейкую дозу ўпартага гераізму, сілу перад усімі негатыўнымі плынямі, выбар на карысць дабра, які нішто не можа знішчыць. Гэта нагадвае мне словы Марціна Лютэра Кінга, калі ён падкрэсліваў ролю братняй любові нават сярод найгоршага пераследу і прыніжэнняў: „Асоба, якая ненавідзіць цябе найгорш, мае ў сабе нейкае дабро. Таксама народ, які ненавідзіць вас найбольш, мае ў сабе нейкае дабро. Таксама раса, якая ненавідзіць вас найбольш, мае ў сабе нейкае дабро. А калі ты дойдзеш да таго, што паглядзіш у аблічча кожнага чалавека і ўбачыш ў яго глыбіні тое, што рэлігія называе «вобразам Бога», то пачынаеш любіць яго нягледзячы ні на што. Незалежна ад таго, што ён робіць, ты бачыш у ім вобраз Бога. Існуе элемент дабра, якога ніколі нельга пазбыцца. [...] Іншы спосаб любіць непрыяцеляў з'явіцца тады, калі будзе нагода перамагчы ворага, а гэта час, калі табе нельга будзе гэта зрабіць. [...] Калі дасягнеш узроўню любові, яе вялікай прыгажосці і моцы, то хочаш толькі перамагчы дрэнныя сістэмы. Ты любіш людзей, уцягнутых у гэтую сістэму, любіш, але стараешся перамагчы

гэтую сістэму. [...] Нянавісць дзеля нянавісці толькі ўмацоўвае існаванне нянавісці і зла ў сусвеце. Калі я ўдару цябе, а ты мяне, калі дам табе здачы і ты зноў ударыш мяне, і так па чарзе, відавочна, што гэта будзе трываць бясконца. Гэта проста ніколі не скончыцца. Дзесьці, хтосьці павінен мець крыху розуму, і тады чалавек будзе моцным. Чалавек моцны — гэта асоба, якая здольная разарваць ланцуг нянавісці, ланцуг зла [...]. Хтосьці павінен мець дастаткова веры і маральнасці, каб перарваць яго і прыўнесці ў структуру сусвету гэты моцны і магутны элемент любові“[114].

119. У сямейным жыцці трэба берагчы тую сілу любові, якая дапамагае пераадольваць зло, якое ёй пагражае. Любоў не паддаецца крыўдам, пагардзе да людзей, жаданням параніць або абцяжарыць іншага. Хрысціянскі ідэал, асабліва ў сям’і, — гэта любоў нягледзячы ні на што. Я захапляюся, напрыклад, стаўленнем людзей, якія вымушаныя былі разысціся са сваім сужэнцам, каб абараніцца ад фізічнага насілля, але з увагі на сужэнскую любоў, якая можа выйсці па-за пачуцці, былі ў стане дзейнічаць на карысць іх дабра, хоць і праз пасрэдніцтва іншых, у часе хваробы, пакуты або цяжкасцяў. Гэта таксама любоў нягледзячы ні на што.

## Узрастаць у сужэнскай любові

120. Разгледжаны намі гімн св. Паўла дазваляе нам перайсці да сужэнскай любові. Гэта тая любоў, якая

[114] *Sermone tenuto nella chiesa Battista di Dexter Avenue*, Montgomery, Alabama, 17 лістапада 1957.

аб’ядноўвае сужэнцаў[115], асвячаная, узбагачаная і асветленая ласкай сакрамэнту сужэнства. Гэта „аб’яднанне волі“[116], духоўнае і ахвярнае, якое, аднак, змяшчае ў сабе пяшчоту сяброўства і эратычную страсць, хоць можа трываць нават тады, калі пачуцці і страсць слабеюць. Папа Пій XI вучыць, што любоў напаўняе ўсе абавязкі сужэнскага жыцця і „мае пэўную перавагу высакароднасці“[117]. Бо гэтая моцная любоў, пралітая Духам Святым, з’яўляецца адлюстраваннем непарыўнага запавету паміж Хрыстом і чалавецтвам, кульмінацыяй якога з’яўляецца ахвяраванне сябе аж да канца на крыжы: „Дух, якога ўдзяляе Пан, аднаўляе сэрцы і дае мужчыне і жанчыне здольнасць любіць адно аднаго так, як Хрыстус палюбіў нас. Сужэнская любоў дасягае той паўнаты, якой унутрана падпарадкавана, г. зв. сужэнскую «caritas»“[118].

121. Сужэнства — гэта каштоўны знак, бо „калі мужчына і жанчына заключаюць сакрамэнт сужэнства, Бог як бы «адлюстроўваецца» ў іх, надзяляе іх уласнымі рысамі і непазбыўным характарам сваёй любові. Сужэнства — гэта ікона любові Бога да нас. Бог таксама з’яўляецца камуніяй: тры асобы — Айцец, Сын і Дух Святы — жывуць спрадвеку і назаўжды ў дасканалай еднасці. І гэта ўласна ёсць таямніцай сужэнства: Бог стварае з дваіх сужэнцаў адно існаванне“[119]. Гэта цягне за сабой вельмі канкрэтныя

[115] Св. Тамаш Аквінскі называе любоў «*vis unitiva*» (*Summa Theologiae* I, q. 20, a. 1, ad 3), пазычыўшы гэты выраз ад Дыянізія Псеўда-Арэапагіта (*De divinis nominibus*, IV, 12: *PG* 3, 709).

[116] TOMMASO D’AQUINO, *Summa Theologiae* II-II, q. 27, a. 2.

[117] Энц. *Casti connubii* (31 снежня 1930): *AAS* 22 (1930), 547-548.

[118] ЯН ПАВЕЛ II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 13: *AAS* 74 (1982), 94.

[119] *Катэхеза* (2 красавіка 2014): *L’Osservatore Romano*, 3 aprile 2014, p. 8.

і штодзённыя наступствы, паколькі сужэнцы „сілай сакрамэнту атрымліваюць аўтэнтычную місію рабіць відавочнай, пачынаючы ад простых і звычайных рэчаў, тую любоў, якой Хрыстус любіць свой Касцёл, надалей аддаючы жыццё за яго“[120].

122. Аднак не трэба блытаць розныя ўзроўні: не трэба скідаць на дзве асобы, якія маюць свае абмежаванні, вялізны цяжар неабходнасці аднаўлення дасканалай сувязі паміж Хрыстом і Касцёлам, паколькі сужэнства азначае „дынамічны працэс, які праходзіць паволі праз паступовае ўключэнне Божых дароў“[121].

*Усё жыццё, усё супольнае*

123. Поруч з любоўю, якая аб'ядноўвае нас з Богам, сужэнская любоў з'яўляецца „найвялікшым сяброўствам“[122]. Гэта сувязь, якая мае ўсе рысы добрага сяброўства: яна імкнецца да дабра другой асобы, узаемнасці, інтымнасці, чуласці, стабільнасці і падабенства паміж сябрамі, якія будуюцца праз супольнае жыццё. Аднак сужэнства дадае да ўсяго гэтага непарыўную выключнасць, якая выяўляецца ў стабільным праекце сумеснага жыцця і супольнага будавання ўсяго жыцця. Будзем шчырымі і пастараемся распазнаць знакі рэчаіснасці: закаханая асоба не плануе, што гэтая сувязь можа быць толькі на некаторы час; хто інтэнсіўна перажывае радасць заручын, не думае пра штосьці часовае; асобы, якія спадарожнічаюць цэлебрацыі саюзу, поўнага любові,

[120] *Тамсама.*
[121] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 9: *AAS* 74 (1982), 90.
[122] Tommaso d'Aquino, *Summa contra Gentiles*, III, 123; пар. Aristotele, *Etica Nic.*, 8, 12 (ed. Bywater, Oxford 1984, 174).

хоць яна і крохкая, маюць надзею, што ён будзе трываць; дзеці не толькі хочуць, каб іх бацькі кахалі адно аднаго, але і каб былі вернымі і заўсёды былі разам. Гэтыя і іншыя знакі сведчаць, што ў самой прыродзе сужэнскай любові ёсць адкрытасць на канчатковае вымярэнне. Саюз, які крышталізуецца ў сужэнскім абяцанні назаўсёды, — гэта штосьці большае за грамадскую фармальнасць або нейкую традыцыю, бо яна мае свае карані ў спантанных схільнасцях чалавека. А для вернікаў гэта запавет, які заключаецца перад Богам і патрабуе вернасці: „Пан — сведка паміж табой і жонкай, з якой ты ажаніўся ў маладосці і якой быў няверны. Яна — твая спадарожніца, і з ёй ты звязаў сябе запаветам: [...] няхай ніхто не здраджвае жонцы, з якой ажаніўся ў маладосці, бо хто ненавідзіць і аддаляе яе, пакрывае сябе жорсткасцю, быццам плашчом“ (пар. *Мал* 2, 14-16).

124. Слабая або хворая любоў няздольная прыняць сужэнства як выклік, які патрабуе барацьбы, адраджэння і пастаяннага распачацця нанова, да самай смерці, не можа падтрымліваць высокі ўзровень зацікаўленасці. Яна саступае культуры часовасці, якая робіць немагчымым няспынны працэс развіцця. Але „абяцанне любові назаўсёды становіцца магчымым, калі мы адкрываем большы за нашыя праекты план, які нас падтрымлівае і дазваляе нам ахвяраваць каханай асобе ўсю будучыню“[123]. Каб такая любоў магла вытрываць усе выпрабаванні і застацца вернай па-над усё, патрэбны дар ласкі, які б яе ўмацаваў і ўзвысіў. Як сказаў св. Раберт Белармін, „тое, што адзін мужчына і адна жанчына злучаюцца выключным і непарыўным

[123] Энц. *Lumen fidei* (29 чэрвеня 2013), 52.

вузлом так, што не могуць аддзяліцца нягледзячы на цяжкасці, нават калі страчана надзея мець патомства, не можа здарыцца без удзелу вялікай таямніцы“[124].

125. Сужэнства з’яўляецца таксама сяброўствам, якое змяшчае рысы, уласцівыя страсці, але заўсёды накіравана на ўсё больш моцную і інтэнсіўную еднасць. Бо „не было ўстаноўлена толькі з мэтай нараджэння дзяцей“, але каб „узаемная любоў сужэнцаў, якая праяўляецца ва ўласцівым парадку, развівалася і сталела“[125]. Гэтае асаблівае сяброўства паміж мужчынам і жанчынай набывае характар, які ахоплівае ўсяго чалавека, еднасць гэтая таксама выключная, верная і адкрытая на прыняцце патомства. Усё супольнае, у тым ліку сексуальнасць з захаваннем ўзаемнай павагі. Другі Ватыканскі Сабор выказаў гэта, кажучы, што „такая любоў, якая спалучае ў сабе чалавечыя і Боскія каштоўнасці, вядзе сужэнцаў да свабоднага і ўзаемнага дару з саміх сябе, пацверджанага як далікатнасцю пачуццяў, так і ўчынкам, і напаўняе ўсё іх жыццё“[126].

*Радасць і прыгажосць*

126. У сужэнстве неабходна клапаціцца аб радасці любові. Калі імкненне да задавальнення становіцца дакучлівым, яно замыкаецца толькі на адной сферы і не дазваляе знайсці іншыя віды задавальнення. Затое радасць пашырае здольнасць атрымліваць асалоду і дазваляе пасмакаваць розных рэчаў таксама на тых

[124] *De sacramento matrimonii*, I, 2: у: ТОЙ ЖА, *Disputationes*, III, 5, 3 (ed. Giuliano, Napoli 1858, 778).

[125] ДРУГІ ВАТ. САБОР, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 50.

[126] *Тамсама*, 49.

этапах жыцця, калі задавальненне прыгасае. Таму св. Тамаш сказаў, што слова „радасць“ (*laetitia*) выкарыстоўваецца ў дачыненні да велікадушнасці сэрца[127]. Сужэнская радасць, якую можна спазнаць нават у пакуце, азначае прыняцце таго, што сужэнства з'яўляецца неабходным аб'яднаннем радасці і цяжараў, напружання і адпачынку, пакут і свабоды, задавальнення і пошукаў, клопатаў і прыемнасцяў заўсёды на шляху сяброўства, якое пабуджае сужэнцаў клапаціцца адно аб адным, „аказваючы адно аднаму ўзаемадапамогу і паслугу“[128].

127. Любоў сяброўства называецца „любоўю“ (*caritas*), калі мы разумеем і цэнім „каштоўнасць“, якую мае другая асоба[129]. Прыгажосць („каштоўнасць“ другога чалавека, якая не заключаецца ў яго фізічнай або псіхалагічнай прывабнасці) дазваляе нам зведаць сакральнасць яго асобы без вострай неабходнасці валодаць ім. У спажывецкім грамадстве збядняецца эстэтычны сэнс, і таму гасне радасць. Усё існуе для таго, каб набыць, авалодаць і выкарыстаць, у тым ліку і людзі. У сваю чаргу чулы клопат з'яўляецца праявай любові, свабоднай ад гэтага эгаістычнага жадання валодаць. Яна абуджае ў нас трапяткое стаўленне да іншай асобы, з вялізнай пашанай, з пэўным страхам, каб не прычыніць ёй шкоды і не адабраць у яе ўласцівую ёй свабоду. Любоў дзеля другога дае асаблівую асалоду захаплення, яна цэніць тое, што прыгожае і святое ў яго асабістай сутнасці, якая існуе незалежна ад маіх патрэбаў. Гэта дазваляе мне клапаціцца аб яго дабры, нават калі я ведаю, што ён не можа быць маім

[127] Пар. *Summa Theologiae* I-II, q. 31, a. 3, ad 3.
[128] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 48.
[129] Tommaso d'Aquino, *Summa Theologiae* I-II, q. 26, a. 3.

або калі стаў фізічна непрыемным, агрэсіўным або раздражняльным. Таму „ад любові, дзякуючы якой для кагосьці прыемнай становіцца іншая асоба, залежыць тое, што я бескарысліва дам ёй штосьці“[130].

128. Эстэтычны досвед любові выяўляецца ў такім позірку, які захапляецца другой асобай як мэтай самой па сабе, нават калі яна хворая або пазбаўленая пачуццёвай прывабнасці. Позірк, які цэніць, мае вялікае значэнне, а яго адсутнасць звычайна прычыняе шкоду. Як шмат робяць часам сужэнцы і дзеці, каб іх заўважалі і бралі пад увагу! Шмат крыўдаў і крызісаў з'яўляецца тады, калі мы перастаём імі захапляцца. Менавіта аб гэтым сведчаць пэўныя прэтэнзіі і нараканні, якія можна пачуць у сям'і: „Мой муж на мяне не глядзіць, здаецца, што я нябачная для яго“, „Глядзі на мяне, калі ласка, калі я размаўляю з табой“. „Мая жонка на мяне ўжо не глядзіць, цяпер яна глядзіць толькі на сваіх дзяцей“. „У маім доме я нікога не цікаўлю, наогул на мяне не глядзяць, быццам мяне няма“. Любоў адкрывае вочы і дазваляе бачыць па-над усім, як шмат значыць чалавек.

129. Трэба чуйна клапаціцца пра гэтую захапляльную радасць. Паколькі мы створаныя для любові, мы ведаем, што няма большай радасці, чым дзяліцца дабром: „Давай, бяры і дабівайся адпачынку для сябе“ (*Сір* 14, 16). Найбольш інтэнсіўная радасць жыцця нараджаецца тады, калі можна прынесці шчасце іншым, у прадчуванні неба. Згадаем радасную сцэну з фільма *Гасціна Бабэты*, дзе шчодрая кухарка атрымлівае абдымкі ўдзячнасці і пахвалу: „Ах, як жа ты здзівіш анёлаў!“ Радасць прывабная і суцяшальная, калі нам

[130] *Тамсама*, q. 110, a. 1.

удаецца здзівіць іншых і калі мы бачым, як яны радуюцца. Такая радасць, як вынік братэрскай любові, не з'яўляецца радасцю пустога чалавека, які клапоціцца пра сябе, але радасцю таго, хто любіць і цешыцца дабру каханай асобы, якое ўліваецца ў жыццё іншых і становіцца плённым.

130. З другога боку, радасць аднаўляецца ў пакуце. Як сказаў св. Аўгустын, „чым больш сур'ёзнай была небяспека ў баі, тым больш ясная цяпер радасць трыумфу“[131]. Сужэнцы пасля супольных пакут і змаганняў могуць адчуць іх вартасць, бо праз іх яны здабылі штосьці добрае, чаму разам навучыліся або таму, што могуць больш цаніць тое, што маюць. Няшмат ёсць такіх глыбокіх і святочных радасцяў чалавека, асабліва тады, калі двое людзей, якія кахаюць адно аднаго, разам здабылі штосьці, што каштавала ім многіх супольных намаганняў.

*Сужэнства з любові*

131. Хачу сказаць маладым людзям: нішто не губляецца, калі любоў прымае форму інстытуту сужэнства. Саюз знаходзіць у ім спосаб кіравання сваёй стабільнасцю, сапраўдным і канкрэтным развіццём. Гэта праўда, што любоў з'яўляецца чымсьці большым за ўнутраную згоду або пэўную форму сужэнскай дамовы. Праўда і тое, што рашэнне надаць сужэнству бачную форму ў грамадстве з канкрэтнымі абавязкамі падкрэслівае яго значэнне: паказвае важнасць атаясамлення з другой асобай, указвае на пераадоленне юнацкага індывідуалізму і выражае станоўчае прынянцце ўзаемнай прыналежнасці. Заручыны — гэта

[131] *Confessioni*, VIII, 3, 7: *PL* 32, 752.

спосаб выказаць, што мы сапраўды пакінулі матчына гняздо, каб наладзіць моцную сувязь і прыняць новую адказнасць перад іншай асобай. Гэта азначае нашмат больш, чым толькі спантаннае аб'яднанне для ўзаемнага задавальнення, якое было б толькі прыватызацыяй сужэнства. Сужэнства як грамадскі інстытут з'яўляецца абаронай і інструментам узаемнага абавязку дзеля сталення любові, каб рашэнне пра абранне другой асобы ўмацоўвала сваю трываласць, канкрэтнасць і глыбіню і ў той жа час магло выконваць сваю місію ў грамадстве. Таму сужэнства выходзіць па-за межы любой часовай моды і трывае. Яго сутнасць заключана ў самой прыродзе чалавечай асобы, а таксама ў яе сацыяльным характары. Вядзе да шэрагу абавязкаў, якія, аднак, вынікаюць з самой любові, з любові настолькі шчодрай і акрэсленай, што яна здольная рызыкаваць ў будучым.

132. Такім чынам, выбар сужэнства выказвае сапраўднае і эфектыўнае рашэнне аб з'яднанні двух шляхоў у адзін, што б ні адбывалася і нягледзячы ні на якія магчымыя выклікі. Улічваючы сур'ёзнасць гэтага публічнага абавязацельства любові, гэта рашэнне не можа быць паспешлівым, але з той жа прычыны яго нельга адкладаць на неакрэслены час. Узаемадзеянне з другой асобай выключным і канчатковым чынам заўсёды цягне за сабой пэўную рызыку і адважны выклік. Непрыняцце такой адказнасці з'яўляецца чымсьці эгаістычным, карыслівым, нікчэмным, няздольным заўважыць правы другой асобы і прадставіць яе грамадству як кагосьці вартага безумоўнай любові. З другога боку, закаханыя па-сапраўднаму асобы імкнуцца паказаць сваю любоў іншым. Любоў, пацверджаная ў сужэнскім саюзе ў прысутнасці іншых асобаў, з усімі абавязкамі, якія вынікаюць

з гэтай інстытуцыі, — гэта праява і абарона таго „так“, якое выказваецца без агаворак і без умоў. Гэтае „так“, сказанае другой асобе, азначае, што яна заўжды можа давяраць, што яна не застанецца адна, калі згубіць прывабнасць, калі сустрэнецца з цяжкасцямі або калі з’явяцца новыя магчымасці атрымання асалоды або эгаістычныя інтарэсы.

### *Любоў, якая адкрывае і ўзрастае*

133. Любоў сяброўства спалучае ўсе аспекты сужэнскага жыцця і дапамагае членам сям’і ісці наперад на ўсіх яго этапах. Таму жэсты, якія выяўляюць гэтую любоў, павінны пастаянна шчодра падтрымлівацца поўнымі велікадушнасці словамі. У сям’і „трэба выкарыстоўваць тры словы. Хачу гэта паўтарыць. Тры словы: калі ласка, дзякуй і прабач. Гэта тры ключавыя словы!“[132]. „Калі ў сям’і мы не дакучаем і просім дазволу, калі ў сям’і мы не эгаісты і вучымся казаць «дзякуй» і калі ў сям’і хтосьці разумее, што зрабіў нешта дрэннае і ўмее перапрасіць, то ў такой сям’і пануе спакой і радасць“[133]. Не будзем шкадаваць гэтых слоў, будзем шчодрымі, паўтараючы іх штодзённа, бо „цяжкім бывае такое маўчанне, часам нават у сям’і, паміж мужам і жонкай, паміж бацькамі і дзецьмі, паміж братамі“[134]. Але адпаведныя словы, сказаныя ў патрэбны час, ахоўваюць і падмацоўваюць любоў дзень за днём.

[132] *Разважанне падчас малітоўнай сустрэчы з сем’ямі з нагоды Года Веры* (26 кастрычніка 2013): *AAS* 105 (2013), 980.

[133] *Анёл Панскі* (29 снежня 2013): *L’Osservatore Romano*, 30-31 dicembre 2013, p. 7.

[134] *Разважанне падчас малітоўнай сустрэчы з сем’ямі з нагоды Года Веры* (26 кастрычніка 2013): *AAS*105 (2013), 978.

134. Усё гэта адбываецца на шляху няспыннага развіцця. Тая асаблівая форма любові, якой з'яўляецца сужэнства, паклікана да няспыннага сталення, бо адносна яе мы заўсёды павінны прымяняць тое, што св. Тамаш Аквінскі кажа пра любоў: „Любоў дзякуючы свайму характару не мае нічога такога, што абмяжоўвала б яе развіццё, паколькі яна — гэта частка бясконцай любові, якой ёсць Дух Святы. [...] З боку суб'екта нельга акрэсліць мяжу ўзрастання ў любові, бо кожны раз, калі ўзрастае любоў, усё больш узрастае таксама здольнасць да яшчэ большага яе развіцця“[135]. Св. Павел рашуча заклікае: „Пан няхай памножыць вас і перапоўніць любоўю адзін да аднаго і да ўсіх“ (*1 Тэс* 3, 12), і дадае: што датычыць „братняй любові, [...] заахвочваем вас, браты: узрастайце ў гэтым яшчэ больш“ (*1 Тэс* 4, 9. 11). Усё больш і больш. Сужэнская любоў зберагаецца перадусім не словамі аб непарыўнасці як абавязку або паўтарэннем нейкай дактрыны, але ўмацоўвае сталае развіццё пад уплывам ласкі. Любоў, якая не развіваецца, знаходзіцца ў небяспецы, а мы можам развівацца, адказваючы на Божую ласку большай колькасцю актаў любові, больш частымі жэстамі любові, больш інтэнсіўнымі, больш шчодрымі, больш далікатнымі і больш радаснымі. Муж і жонка „зведваюць сэнс сваёй еднасці і ўсё паўней яе дасягаюць“[136]. Дар Божай любові, праліты на сужэнцаў, — гэта адначасова заклік да сталага развіцця гэтага дару ласкі.

135. Ніякай карысці не даюць мары пра ідылічную і дасканалую любоў, пазбаўленую такім чынам усіх стымулаў да развіцця. Нябесная ідэя зямной любові

[135] *Summa Theologiae* II-II, q. 24, a. 7.
[136] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 48.

забывае, што найлепшае тое, чаго яшчэ не дасягнулі, віно, якое даспявае з цягам часу. Як нагадвалі біскупы Чылі, „няма дасканалых сямей, якія прапаноўвае нам ілюзорная спажывецкая прапаганда. Няма ў іх бегу гадоў, няма хваробы, болю і смерці [...]. Спажывецкая прапаганда паказвае ілюзію, якая не мае нічога агульнага з рэальнасцю, з якой сутыкаюцца кожны дзень айцы і маці сямей“[137]. Карысней будзе рэалістычна прымаць абмежаванні, выклікі і недасканаласці, а таксама пачуць заклік да сумеснага развівацца, каб даспявала любоў і ўмацоўвалася саліднасць саюзу, што б ні здаралася.

*Дыялог*

136. Дыялог — гэта прывілеяваны і неабходны спосаб існавання, развіцця і выказвання любові ў сужэнстве і сямейным жыцці. Аднак ён патрабуе працяглай і нялёгкай практыкі. Мужчыны і жанчыны, старыя і маладыя маюць розныя спосабы зносін, размаўляюць рознымі мовамі і карыстаюцца рознымі кодамі. Спосаб пастаноўкі пытанняў, адказы, тон, час і шмат іншых фактараў могуць абумовіць зносіны. Больш за тое, трэба развіваць пэўныя пазіцыі, якія з’яўляюцца выразам любові і робяць магчымым сапраўдны дыялог.

137. Патрэбны час, добры час, прысвечаны цярплівому і ўважліваму слуханню, пакуль другая асоба не выкажа ўсё, што хацела сказаць. Неабходна аскеза, каб не пачынаць гаварыць, пакуль не настане адпаведны час. Замест таго, каб даваць ацэнкі або парады, трэба ўпэўніцца, што я пачуў усё, што хацела сказаць другая

[137] Канферэнцыя Епіскапату Чылі, *La vida y la familia: regalos de Dios para cada uno de nosotros* (21 ліпеня 2014).

асоба. Гэта звязана з унутранай цішынёй, каб без шуму слухаць сэрцам і розумам: стварыць прастору, вольную ад усякай паспешлівасці, адкласці ўбок свае ўласныя патрэбы і прыярытэты. Іншы павінен пераканацца, што была заўважана яго пакута, яго расчараванне, страх, гнеў, надзея, яго мары. Аднак часта ёсць такія нараканні: „Ён не слухае мяне. Калі здаецца, што гэта робіць, насамрэч думае пра нешта іншае“. „Гавару і адчуваю, што толькі чакае, калі я скончу“. „Калі кажу, спрабуе змяніць тэму або дае мне хуткія адказы, каб закончыць размову“.

138. Трэба развіваць уменне надаваць другой асобе сапраўдную вартасць. Гаворка ідзе пра тое, каб цаніць другога, пра тое, што ён мае права існаваць, самастойна мысліць і быць шчаслівым. Ніколі нельга недаацэньваць тое, што можа сказаць або чаго можа дабівацца, хоць і неабходна выказаць свой пункт гледжання. У аснове гэтага ляжыць перакананне, што кожны мае, што даць, бо мае іншы жыццёвы досвед, глядзіць з іншага пункта гледжання, мае іншыя праблемы і набыў іншыя ўменні і веды. Можна прызнаць праўду другой асобы, значэнне яе найглыбейшых страхаў і змест таго, што яна кажа, нават калі выказваецца агрэсіўна. Таму трэба старацца паставіць сябе на яе месцы і зазірнуць у глыб яе сэрца, заўважыць тое, чым захапляецца, і прыняць гэтую страсць як зыходны пункт для далейшага дыялогу.

139. Патрэбная шырыня мыслення, каб не замыкацца на некалькіх дакучлівых ідэях, а таксама эластычнасць, каб можна было змяніць або дапоўніць уласнае меркаванне. Магчыма, што з маёй думкі і з думкі другой асобы можа паўстаць новы сінтэз, які ўзбагаціць нас абаіх. Еднасць, да якой трэба імкнуцца,

азначае не маналітнасць, але „еднасць у разнастайнасці“ або „ўзгодненую разнастайнасць“. У гэтым духу братэрскай еднасці сустракаюцца розныя асобы, узаемна паважаюць адна адну і цэняць, захоўваючы пры гэтым розныя адценні і акцэнты, што павялічвае супольнае дабро. Трэба вызваліцца ад імкнення быць роўнымі. Неабходна таксама прадбачлівасць, каб своечасова ўсвядоміць магчымую „інтэрферэнцыю“, каб яна не знішчыла дыялог. Напрыклад, трэба распазнаваць дрэнныя пачуцці, якія могуць узнікнуць, і стрымліваць іх, каб яны не руйнавалі камунікацыю. Важна ўмець выказваць свае пачуцці, не ранячы другую асобу; выкарыстоўваць такую мову і спосаб маўлення, які мог бы лягчэй успрымацца, быў бы прымальны для другой асобы, хоць і змяшчаў бы патрабаванні; прадстаўляць сваю крытыку без абуджэння ў сабе гневу як формы помсты, а таксама пазбягаць маралізатарства, якое імкнецца толькі да нападу, іроніі, абвінавачання, нанясення крыўды. Шмат сужэнскіх канфліктаў не датычаць вельмі сур’ёзных праблем. Часамі гаворка ідзе пра дробныя справы, якія няшмат значаць, але настрой або пазіцыя, прынятыя ў дыялогу, змяняюць спосаб іх выражэння.

140. Неабходны жэсты чуласці да другой асобы і праяўленне пачуццяў. Любоў пераадольвае найгоршыя перашкоды. Калі мы можам кагосьці любіць або калі адчуваем, што ён нас любіць, мы павінны лепш разумець, што ён хоча выразіць гэтым, і зрабіць так, каб нас зразумелі. Трэба перамагчы слабасць, якая вядзе да страху перад другой асобай, быццам бы яна з’яўляецца „канкурэнтам“. Вельмі важна будаваць сваю абарону на глыбокіх рашэннях, перакананнях і каштоўнасцях, а не на жаданні выйграць дыскусію або на тым, каб за намі прызналі праўду.

141. Урэшце, трэба прызнаць, што для таго, каб дыялог быў карысны, трэба мець, што сказаць. А гэта патрабуе ўнутранага багацця, якое сілкуецца чытаннем, асабістым разважаннем, малітвай і адкрытасцю на грамадства. У адваротным выпадку размовы становяцца сумнымі і беспрадметнымі. Калі кожны з сужэнцаў не клапоціцца пра сваю духоўнасць і абмяжоўвае свае адносіны з іншымі людзьмі, сямейнае жыццё становіцца замкнёным, а дыялог збядняецца.

## Гарачая любоў

142. Другі Ватыканскі Сабор навучаў, што сужэнская любоў „ахоплівае дабро ўсяго чалавека і таму можа адорваць асаблівай годнасцю магчымасць экспрэсіі цела і духу, і рабіць іх высакароднымі як элементы і асаблівыя знакі сужэнскага сяброўства“[138]. Павінна быць прычына таго, што любоў без задавальнення і страсці становіцца недастатковай, каб сімвалізаваць еднасць чалавечага сэрца з Богам: „Усе містыкі сцвярджалі, што звышпрыродную і нябесную любоў найбольш, чым сяброўства, сыноўскія пачуцці або ахвярнае служэнне сімвалізуе сужэнская любоў. Прычына заключаецца менавіта ў яе ўсеахопнасці“[139]. Дык чаму ж не сказаць пра пачуцці і сексуальнасць у сужэнстве?

### *Свет пачуццяў*

143. Жаданні, пачуцці, эмоцыі — тое, што класікі называлі „страсцямі“, маюць важнае месца ў сужэнстве.

[138] Паст. канст. *Gaudium et spes*, 49.
[139] A. SERTILLANGES, *L'amour chrétien*, Paris 1920, 174.

Яны нараджаюцца, калі „іншы“ з’яўляецца і прысутнічае ў нашым жыцці. Усім жывым істотам уласціва імкнуцца да чагосьці іншага, а гэтая схільнасць заўсёды мае асноўныя эмацыянальныя рысы: задавальненне або боль, радасць або сум, чуласць або страх. Гэта асноўныя элементы псіхалагічнай актыўнасці. Чалавек — гэта зямная істота, а ўсё, што ён робіць і чаго шукае, поўнае страсці.

144. Езус, як сапраўдны чалавек, перажываў падзеі з пэўнай доляй пачуццёвасці. Ён смуткаваў з прычыны адкідвання Ерузалема (пар. *Мц* 23, 37), што прымусіла Яго заплакаць (пар. *Лк* 19, 41). Зліт аваўся над пакутамі людзей (пар. *Мк* 6, 34). Узрушыўся і ўсхваляваўся, гледзячы на плач іншых людзей (пар. *Ян* 11, 33), і сам аплакваў смерць сябра (пар. *Ян* 11, 35). Гэтыя праявы Яго ўражлівасці паказвалі, наколькі Яго чалавечае сэрца было адкрытае на іншых.

145. Пачуцці самі па сабе не з’яўляюцца чымсьці маральна добрым ці дрэнным[140]. Калі мы пачынаем адчуваць жаданне або непрыняцце, гэта не грэх і не заслугоўвае вымовы. Добрым або дрэнным ёсць здзейснены ўчынак, пабуджаны або спалучаны са страсцямі. Аднак, калі пачуцці ўмацоўваюцца, калі іх шукаюць, і яны становяцца прычынай дрэнных учынкаў, то зло заключаецца ў рашэнні іх умацоўваць і ў дрэнных учынках, якія з іх вынікаюць. У тым жа духу адчуванне да кагосьці сімпатыі само па сабе не абавязкова добрае. Калі праз такую сімпатыю я знявольваю гэтую асобу, то гэтае пачуццё служыць майму эгаізму. Перакананне, што мы добрыя толькі таму, што „маем пачуцці“, — гэта вялізны падман. Ёсць людзі, якія

[140] Пар. TOMMASO D’AQUINO, *Summa Theologiae* I-II, q. 24, a. 1.

адчуваюць сябе здольнымі да вялікай любові толькі таму, што патрабуюць моцнага пачуцця, але не ў стане змагацца за шчасце іншых і жывуць замкнёныя ў сваіх жаданнях. У гэтым выпадку пачуцці адварочваюць увагу ад усіх каштоўнасцяў і хаваюць эгацэнтрызм, які робіць немагчымым жыццё у здаровай і шчаслівай сям'і.

146. З другога боку, калі страсць спалучаецца са свабодным учынкам, гэта можа ўказваць на глыбіню гэтага выбару. Сужэнская любоў спрыяе таму, каб усё эмацыянальнае жыццё станавілася дабром для сям'і і служыла сумеснаму жыццю. Сям'я дасягае сталасці, калі эмацыйнае жыццё яе членаў становіцца ўражлівасцю, якая не дамінуе і не засланяе цудоўныя магчымасці і каштоўнасці, а падтрымлівае іх добраахвотнасць[141], вынікае з яе, узбагачае яе, упрыгожвае і робіць больш гарманічнай дзеля дабра ўсіх.

*Бог любіць радасць сваіх дзяцей*

147. Патрабуе гэта педагогікі, працэсу, які ўключае вырачэнні. Такое перакананне Касцёла часта адкідаюць, быццам ён з'яўляецца ворагам чалавека. Бэнэдыкт XVI падымаў гэта пытанне вельмі выразна: „Ці Касцёл выпадкова сваімі наказамі і забаронамі не робіць горкім самае прыгожае ў жыцці? Ці не ставіць знак забароны як раз там, дзе радасць, створаная для нас Стварыцелем, нясе нам шчасце, якое дазваляе пакаштаваць нешта Боскае?“[142]. Але ён адказаў, што хоць у хрысціянстве і хапала перабольшання або скажонага аскетызму, аднак Касцёл, верны Святому Пісанню,

[141] Пар. *тамсама*, q. 59, a. 5.
[142] Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 3.

„не адкінуў самога *эрасу* як такога, але аб'явіў вайну яго скажонай і знішчальнай форме, таму што фальшывае яго абагаўленне, якое тут маецца на ўвазе, пазбаўляе яго сваёй годнасці і робіць нечалавечым“[143].

148. Выхаванне пачуццёвасці і інстынкту неабходна, і з гэтай мэтай часам неабходна сябе ў гэтым абмяжоўваць. Перабольшанне, адсутнасць кантролю, апантанасць адным толькі відам задавальнення — усё гэта вядзе ўрэшце да аслаблення і знішчае само задавальненне[144], прычыняючы шкоду сям'і. Па сутнасці са страсцямі можна пражыць прыгожае жыццё, калі ўсё больш накіроўваць іх на праект дару з сябе і поўнай самарэалізацыі, які ўзбагачае міжасабовыя адносіны ў межах сям'і. Гэта азначае не адмову ад момантаў інтэнсіўнай радасці[145], а перажыванне іх у перапляценні з іншымі момантамі велікадушнай адданасці, цярплівай надзеі, непазбежнай стомленасці, намагання імкнуцца да ідэалу. Сямейнае жыццё ёсць усім гэтым, і яно заслугоўвае, каб яго перажывалі ў паўнаце.

149. Некаторыя плыні духоўнасці настойваюць на ліквідацыі пажадлівасці, каб вызваліцца ад пакуты. Аднак мы верым, што Бог любіць радасць чалавека і „шчодра дае ўсё нам для карыстання“ (пар. *1 Цім* 6, 17). Дазволім жа, каб радасць выплывала перад абліччам Яго чуласці, калі Ён заахвочвае нас: „Дзіця [...], клапаціся пра сябе [...]. Не пазбаўляй сябе шчаслівага дня“ (*Сір* 14, 11. 14). Сужэнская пара таксама адказвае

[143] *Тамсама*, 4.
[144] Пар. TOMMASO D'AQUINO, *Summa Theologiae* I-II, q. 32, a. 7.
[145] Пар. *тамсама*, II-II, q. 153, a. 2, ad 2: «*Abundantia delectationis quae est in actu venereo secundum rationem ordinato, non contrariatur medio virtutis*».

на Божую волю, выконваючы наступную біблійную параду: „Калі шчасціць табе, радуйся гэтаму“ (*Экл* 7, 14). Трэба свабодна прыняць тое, што задавальненне мае розныя формы ў розныя моманты жыцця згодна з патрэбамі ўзаемнай любові. У гэтым сэнсе можна прыняць прапанову некаторых настаўнікаў Усходу, якія настойваюць на больш шырокім усведамленні таго, каб не быць вязнямі вельмі абмежаванага досведу, які закрываў бы перад намі перспектывы. Такое пашырэнне свядомасці не з'яўляецца адмаўленнем або знішчэннем пажадлівасці, але яе больш шырокім разуменнем і ўдасканаленнем.

*Эратычнае вымярэнне любові*

150. Усё гэта прымушае нас закрануць пытанне сексуальнага жыцця сужэнства. Сам Бог стварыў цялеснасць, якая з'яўляецца цудоўным дарам для Яго стварэнняў. Калі мы рупліва клапоцімся пра яе, каб яна не выйшла з-пад кантролю, то робім гэта для таго, каб пазбегнуць „недаацэнкі ўласнай каштоўнасці“[146]. Св. Ян Павел II адкінуў погляд, быццам бы вучэнне Касцёла вяло да „адмаўлення каштоўнасці чалавечага цела“ або проста цярпела яго з прычыны „неабходнасці пракрэацыі“[147]. Сексуальная патрэба сужэнцаў не з'яўляецца аб'ектам пагарды і „зусім не ідзе гаворка аб тым, каб аспрэчваць гэту патрэбу“[148].

151. Тым, хто баіцца, што выхаванне пачуццяў і сексуальнасці паменшыць спантаннасць любові,

[146] Ян Павел II, *Катэхеза* (22 кастрычніка 1980), 5: *Insegnamenti* III, 2 (1980), 951.

[147] *Тамсама*, 3.

[148] Той жа, *Катэхеза* (24 верасня 1980), 4: *Insegnamenti* III, 2 (1980), 719.

св. Ян Павел II сказаў, што чалавек „пакліканы таксама да поўнай і сталай спантаннасці адносін“, і што „яна паступова становіцца плёнам распазнання ўзрушэнняў уласнага сэрца“[149]. Гэта штосьці, што здабываецца, паколькі кожны чалавек „павінен трывала і паслядоўна вучыцца значэнню цела“[150]. Сексуальнасць не з'яўляецца багаццем, якое служыць узнагародай, або забавай, паколькі гэта міжасабовая мова, дзе другая асоба разглядаецца сур'ёзна, з яе святой і непарушнай каштоўнасцю. Такім чынам „лёсам чалавечага сэрца становіцца як бы іншая спантаннасць“[151]. У гэтым кантэксце эратызм уяўляецца як асаблівa чалавечая праява сексуальнасці. У ім можна знайсці „абранніцкі сэнс цела і сапраўдную годнасць дару“[152]. У сваёй катэхезе на тэму тэалогіі чалавечага цела св. Ян Павел II вучыў, што палавая цялеснасць — „гэта не толькі крыніца плоднасці і пракрэацыі“, але яна мае таксама „здольнасць выяўляць любоў, менавіта тую любоў, у якой чалавек-асоба становіцца дарам“[153]. Здаровы эратызм, нават злучаны з пошукам задавальнення, мае на ўмове захапленне, а таму можа зрабіць імпульсы гуманнымі.

152. Таму ні ў якім выпадку мы не павінны лічыць эратычнае вымярэнне любові дазволеным злом або цяжарам, які трэба цярпець дзеля дабра сям'і, але дарам Бога, які ўпрыгожвае сустрэчы сужэнцаў. Як страсць, ачышчаная любоўю, якая захапляецца годнасцю другога, гэтае вымярэнне становіцца „рэалізацыяй чыстай, выключнай афірмацыі“, якая паказвае

[149] *Катэхеза* (12 лістапада 1980), 2: *Insegnamenti* III, 2 (1980), 1133.
[150] *Тамсама*, 4.
[151] *Тамсама*, 5.
[152] *Тамсама*, 1: 1132.
[153] *Катэхеза* (16 чэрвеня 1980), 1: *Insegnamenti* III, 1 (1980), 151.

нам, да якіх цудаў здольнае чалавечае сэрца, і праз момант „адчуваецца, што чалавечае існаванне ўдалае і шчаслівае“[154].

*Гвалт і маніпуляцыя*

153. Гэтую тэму ў яе інтэгральнасці і са здаровым рэалізмам трэба разглядаць у межах станоўчага бачання сексуальнасці. Мы не можам ігнараваць тое, што сексуальнасць часта падлягае дэперсаналізацыі і поўнай паталогіі, у выніку чаго становіцца „ва ўсё большай ступені магчымасцю і прыладаю сцвярджэння ўласнага «я» і эгаістычнага задавальнення ўласных жаданняў і інстынктаў“[155]. Сёння існуе вялікая пагроза, што сексуальнасць таксама будзе апанаваная атрутным духам „скарыстай і выкінь“. Целам другой асобы часта маніпулююць як прадметам, якім карыстаюцца так доўга, пакуль ён забяспечвае задавальненне, але пагарджаюць ім, калі яно страчвае сваю прывабнасць. Ці можна праігнараваць або схаваць пастаянныя формы дамінавання, грубасці, выкарыстання, паталогіі і сексуальнага гвалту, што з'яўляецца вынікам скажонага разумення сексуальнасці і закрываюць годнасць іншых асобаў і заклік да любові змрочным пошукам саміх сябе?

154. Не трэба нагадваць, што і ў сужэнстве сексуальнасць можа стаць крыніцай пакуты і маніпуляцыі. Таму трэба выразна падкрэсліць, што „палавое сужыццё, навязанае сужэнцу без уліку ягонага стану і яго абгрунтаваных жаданняў, не з'яўляецца сапраўдным актам любові і супярэчыць таму, чаго слушна

[154] JOSEF PIEPER, *Über die Liebe*, München 2014, 174.
[155] ЯН ПАВЕЛ II, Энц. *Evangelium vitae* (25 сакавіка 1995), 23.

патрабуе маральны парадак ва ўзаемнай сувязі паміж сужэнцамі“[156]. Акты, уласцівыя сексуальнаму злучэнню сужэнцаў, адпавядаюць прыродзе сексуальнасці, якой хацеў Бог, калі яны здзяйсняюцца „па-чалавечы“[157]. Таму св. Павел нагадваў: „Няхай ніхто не крыўдзіць і не выкарыстоўвае брата свайго ў гэтай справе“ (*1 Тэс* 4, 6). Хоць ён пісаў у часы, калі дамінавала патрыярхальная культура, калі жанчыну лічылі цалкам падпарадкаванай мужчыне, тым не менш ён вучыў, што сексуальнасць павінна быць прадметам дыялогу паміж сужэнцамі: закранаў магчымасць адкладання сексуальных сувязяў на пэўны перыяд, але „па згодзе“ (*1 Кар* 7, 5).

155. Св. Ян Павел II вельмі трапна выказаў перасцярогу, што мужчыне і жанчыне „пагражае ненасытнасць“[158]. Гэта азначае, што яны імкнуцца да ўсё больш інтэнсіўнага з’яднання, але небяспека заключаецца ў спробах знішчыць адрозненні і тую непазбежную дыстанцыю, якая існуе паміж імі. Бо кожны з іх мае сваю ўласцівую ролю і непаўторную годнасць. Калі прыгажосць узаемнай прыналежнасці пераўтвараецца ў панаванне, то „прынцыпова змяняецца камунійная структура асабовых адносін“[159]. Праз логіку панавання таксама той, хто дамінуе, урэшце даходзіць да адмаўлення сваёй уласнай годнасці[160] і канчаткова перастае „атаясамлівацца са сваім целам“[161], паколькі пазбаўляе яго ўсякага значэння. Ён успрымае секс як уцёкі ад самога сябе і як адмаўленне ад прыгажосці сужэнства.

[156] Павел VI, Энц. *Humanae vitae* (25 ліпеня 1968), 13: *AAS* 60 (1968), 489.

[157] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 49.

[158] *Катэхеза* (18 чэрвеня 1980), 5: *Insegnamenti* III, 1 (1980), 1778.

[159] *Тамсама*, 6.

[160] Пар. *Катэхеза* (30 ліпеня 1980), 1: *Insegnamenti* III, 2 (1980), 311.

[161] *Катэхеза* (8 красавіка 1981), 3: *Insegnamenti* IV, 1 (1981), 904.

156. Важна выразна адкінуць усе формы сексуальнага падпарадкавання. Таму трэба пазбягаць памылковай інтэрпрэтацыі тэксту з Паслання да Эфесцаў, у якім ёсць заклік: „Жонкі, падпарадкоўвайцеся мужам сваім“ (5, 22). Св. Павел выказваецца тут у культурных катэгорыях, уласцівых той эпосе, аднак мы не павінны прымаць тую культурную абалонку, але заклік аб'яўлення, які вынікае з усяго фрагмента. Звернемся да мудрага тлумачэння св. Яна Паўла II: „Любоў выключае любы від падпарадкавання, праз які жонка станавілася б слугой або нявольніцай мужа [...]. Супольнасць і еднасць, якую дзякуючы сужэнству яны павінны ўтвараць, рэалізуецца ва ўзаемнай адданасці, якая з'яўляецца таксама ўзаемным падпарадкаваннем“[162]. Таму гаворыцца таксама, што „так павінны мужы любіць сваіх жонак, як сваё цела“ (*Эф* 5, 28). Па сутнасці, кожны біблійны тэкст заахвочвае да пераадолення зручнага індывідуалізму, каб жыць дзеля іншых: „Падпарадкоўвайцеся адно аднаму“ (*Эф* 5, 21). Гэтая ўзаемная „падпарадкаванасць“ паміж сужэнцамі набывае асаблівае значэнне і разумеецца як дабравольна выбраная ўзаемная прыналежнасць, якая характарызуецца комплексам такіх рысаў, як вернасць, пашана і клопат. Сексуальнасць неадрыўна служыць такому сужэнскаму сяброўству, бо яна мае на мэце забеспячэнне таго, каб другая асоба жыла ў паўнаце.

157. Аднак адкідванне сексуальных і эратычных скажэнняў ніколі не павінна весці да пагарды або недаацэнкі сексуальнасці і эротыкі. Ідэал сужэнства не можа фарміравацца толькі як шчодры і поўны па-

[162] *Катэхеза* (11 жніўня 1982), 4: *Insegnamenti* V, 3 (1982), 205-206.

свячэння дар, дзе кожны выракаецца ўсіх асабістых патрэбаў і клапоціцца толькі пра дабро іншага без ніякага задавальнення. Трэба памятаць, што сапраўдная любоў умее таксама прымаць ад другога, яна здольная прымаць сябе як крохкую асобу, якой патрэбна дапамога, не адмаўляецца ад прыняцця са шчырай і радаснай удзячнасцю цялесных праяў любові ў пяшчоце, абдымках, пацалунку і сексуальным злучэнні. Бэнэдыкт XVI зразумела выказваўся на гэты конт: „Калі чалавек імкнецца да таго, каб быць толькі духам, і хоча адкінуць цела як толькі жывёльную спадчыну, тады дух і цела страчваюць сваю годнасць“[163]. Таму „чалавек не можа жыць толькі ахвярнай, сыходзячай любоўю. Не можа заўсёды толькі даваць, але павінен таксама і атрымліваць. Хто хоча даваць любоў, сам павінен таксама атрымліваць яе як дар“[164]. Аднак для гэтага трэба памятаць, што чалавечая раўнавага крохкая, што заўсёды застаецца нешта, што супраціўляецца гуманізацыі, і што ў кожны момант можа выбухнуць нанова, вяртаючы свае найбольш прымітыўныя і эгаістычныя схільнасці.

*Сужэнства і цнатлівасць*

158. „Многія асобы, якія не заключылі шлюб, не толькі ахвяруюць сябе сем’ям, з якіх паходзяць, але часта аказваюць вялізную дапамогу сваім сябрам, супольнасці Касцёла і ў прафесійным жыцці. [...] Больш за тое, многія з іх прысвячаюць свае таленты на служэнне хрысціянскай супольнасці ў паслузе міласэрнасці і валанцёрстве. Ёсць і такія, хто не заключае сужэнства, бо прысвяцілі сваё жыццё любові Хрыста і блізкага.

[163] Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 5.
[164] *Тамсама*, 7.

Дзякуючы іх зацікаўленню сям'я вельмі ўзбагачаецца ў Касцёле і ў грамадстве“[165].

159. Цнатлівасць — гэта форма любові. Яна нагадвае нам пра клопат аб Божым Валадарстве і пільнай неабходнасці цалкавітага прысвячэння сябе служэнню евангелізацыі (пар. *1 Кар* 7, 32), а таксама адлюстроўвае паўнату неба, дзе „ні жэняцца, ні выходзяць замуж“ (*Мц* 22, 30). Св. Павел рэкамендаваў цнатлівасць, бо спадзяваўся на хуткае паўторнае прыйсце Езуса Хрыста і хацеў, каб усе засяродзіліся выключна на евангелізацыі: „заканчваецца час“ (*1 Кар* 7, 29). Тым не менш, было зразумела, што гэта было яго асабістае меркаванне і яго жаданне (пар. *1 Кар* 7, 25). У той жа час ён прызнаваў каштоўнасць іншых пакліканняў: „Кожны мае свой дар ад Бога, адзін так, другі гэтак“ (*1 Кар* 7, 7). У сувязі з гэтым св. Ян Павел II сказаў, што біблійныя тэксты „не даюць падстаў да разумення «ніжэйшасці» сужэнства або да разумення «вышэйшасці» цнатлівасці або цэлібату“[166] з прычыны сексуальнай абстыненцыі. Замест таго, каб казаць пра вышэйшасць цнатлівасці ва ўсіх адносінах, належыць паказаць, што розныя станы жыцця ўзаемадапаўняюцца, так што хтосьці можа быць дасканалы ў адных адносінах, а іншы можа быць больш дасканалы з іншага пункта гледжання. Аляксандр Гэльскі сцвярджаў, напрыклад, што ў пэўным сэнсе сужэнства можна прызнаць лепшым за іншыя сакрамэнты, паколькі яно сімвалізуе нешта настолькі вялікае, як „аб'яданне Хрыста з Касцёлам або аб'яднанне боскай і чалавечай прыроды“[167].

[165] *Relatio finalis* 2015, 22.

[166] *Катэхеза* (14 красавіка 1982), 1: *Insegnamenti* V, 1 (1982), 1176.

[167] *Glossa in quatuor libros sententiarum Petri Lombardi*, IV, XXVI, 2 (Quaracchi 1957, 446).

160. Таму „тут не ідзе гаворка пра памяншэнне сужэнства на карысць стрыманасці“[168] і „мы не знаходзім падстаў для супрацьпастаўлення. [...] Калі паводле пэўнай тэалагічнай традыцыі гаворыцца пра стан дасканаласці (*status perfectionis*), то не з прычыны самой бясшлюбнасці, але дзеля самой формы жыцця паводле евангельскіх парад“[169]. Аднак замужняя асоба можа жыць любоўю у найвышэйшай ступені. Тады „яна дасягае той дасканаласці, якая вынікае з любові праз вернасць духу парадаў, а яна магчымая і даступная для кожнага“[170].

161. Цнатлівасць мае значэнне сімвалічнай любові, якая не патрабуе валодання другой асобай і тым самым адлюстроўвае свабоду Божага Валадарства. Гэта заахвочанне для сужэнцаў, каб яны ўспрымалі сваю сужэнскую любоў у перспектыве канчатковай любові Хрыста, як супольны шлях да паўнаты Божага Валадарства. У сваю чаргу, любоў сужэнцаў мае іншыя сімвалічныя значэнні: з аднаго боку, гэта своеасаблівае адлюстраванне Святой Тройцы. Бо Святая Тройца — гэта поўная еднасць, у якой, аднак, ёсць і адрозненне. Больш за тое, сям’я ёсць хрысталагічным знакам, паколькі ўказвае на блізкасць Бога, які ўваходзіць у жыццё чалавека, яднаючыся з ім праз Уцелаўленне, Крыж і Уваскрасенне: кожны з сужэнцаў становіцца „адным целам“ з другой асобай і прыносіць сябе ў ахвяру, каб цалкам падзяляць жыццё з другой асобай да самага канца. У той час, калі цнатлівасць з’яўляецца „эсхаталагічным“ знакам уваскрослага Хрыста, сужэнства —

[168] Ян Павел II, *Катэхеза* (7 красавіка 1982), 2: *Insegnamenti* V, 1 (1982), 1127.
[169] Той жа, *Катэхеза* (14 красавіка 1982), 3: *Insegnamenti* V, 1 (1982), 1177.
[170] *Тамсама.*

гэта „гістарычны“ знак для тых, хто крочыць па зямлі, знак зямнога Хрыста, які згадзіўся злучыцца з намі і аддаў самога сябе да праліцця сваёй крыві. Цнатлівасць і сужэнства ёсць і павінны быць рознымі формамі любові, бо „чалавек не можа жыць без любові. Чалавек застаецца для самога сябе незразумелай істотай, яго жыццё пазбаўленае сэнсу, калі яму не адкрыецца Любоў“[171].

162. Існуе небяспека, што цэлібат стане выгоднай адзінотай, якая дае свабоду незалежнага перамяшчэння, змены месца знаходжання, задач і рашэнняў, распараджэння ўласнымі грашыма, сустрэч з рознымі людзьмі ў залежнасці ад іх прывабнасці ў дадзены момант. У такім выпадку яснее сведчанне сужэнцаў. Асобы, пакліканыя да цнатлівасці, могуць знайсці ў некаторых сужэнствах выразны знак велікадушнай і непахіснай вернасці Бога свайму запавету, што можа пабуджаць іх сэрцы да больш канкрэтнай і ахвярнай гатоўнасці. Бо ёсць сужэнцы, якія захоўваюць вернасць, калі сужэнец становіцца фізічна непрывабным або калі не спаўняе іх патрэбаў, калі ёсць шмат нагодаў, каб не захоўваць яму вернасць або пакінуць яго. Жанчына можа апекавацца хворым мужам і там, пры крыжы, нанова кажа „так“ любові да самай смерці. У такой любові вельмі выразна выяўляецца годнасць асобы, годнасць як адлюстраванне любові, паколькі ахвярнай любові ўласціва больш любіць, чым быць любімым[172]. У многіх сем’ях мы можам таксама заўважыць здольнасць да ахвярнага і чулага служэння цяжкім і нават няўдзячным дзецям. Гэта робіць

[171] Той жа, Энц. *Redemptor hominis* (4 сакавіка 1979), 10: *AAS* 71 (1979), 274.

[172] Пар. Tommaso d’Aquino, *Summa Theologiae* II-II, q. 27, a. 1.

такіх бацькоў знакам бескарыслівай і добраахвотнай любові Езуса. Усё гэта становіцца для людзей, якія жывуць у цэлібаце, заахвочваннем перажываць сваё прысвячэнне Божаму Валадарству з большай шчодрасцю і гатоўнасцю. Сёння секулярызацыя прынізіла каштоўнасць з'яднання на ўсё жыццё і паменшыла багацце сужэнскага пасвячэння, таму „трэба паглыбіць пазітыўныя аспекты сужэнскай любові“[173].

## Трансфармацыя любові

163. Павелічэнне працягласці чалавечага жыцця прыводзіць да таго, што мы маем дачыненне з чымсьці, што не было распаўсюджана ў мінулым: інтымныя адносіны і ўзаемная прыналежнасць павінны захоўвацца чатыры, пяць або шэсць дзесяцігоддзяў, а гэта патрабуе шматразова выбіраць нанова. Быць можа, сужэнец ужо не мае інтэнсіўнага сексуальнага жадання, якое прыцягвала б яго да другой асобы, але адчувае задавальненне ад прыналежнасці да яе і ад таго, што яна належыць яму, усведамляе, што ён не адзін, што мае „супольніка“, які ўсё ведае пра яго жыццё і яго гісторыю і які ўсё падзяляе з ім. З'яўляецца спадарожнікам на жыццёвым шляху, з якім можна разам пераадольваць цяжкасці і радавацца прыгожым рэчам. І гэта таксама нараджае пэўнае задавальненне, якое сапутнічае жаданню, уласціваму сужэнскай любові. Мы не можам абяцаць, што ўсё жыццё будзем мець тыя самыя пачуцці. Аднак мы напэўна можам мець стабільны супольны праект, абавязацца любіць адно аднаго і жыць разам, пакуль смерць не разлучыць

[173] Папская Рада па справах сям'і, *Famiglia, matrimonio e „unioni di fatto“* (26 ліпеня 2000), 40.

нас, і заўсёды перажываць багатую інтымнасць. Любоў, якую мы ўзаемна абяцаем, выходзіць па-за ўсялякія эмоцыі, пачуцці або стан духу, хоць можа іх змяшчаць. Такім чынам, у цэнтры нявырашанага канфлікту, хоць шмат змешаных пачуццяў кружыцца ў сэрцы, кожны дзень прымаецца рашэнне наконт любові, прыналежнасці, сумеснага жыцця і далейшай узаемнай любові і прабачэння. Кожны з дваіх праходзіць шлях асабістага развіцця і перамены. Падчас гэтага шляху любоў адзначае кожны крок і кожны новы этап.

164. У гісторыі такога сужэнства змяняецца фізічны аспект, але гэта не падстава для знікнення любоўнай зацікаўленасці. Мы пачынаем кахаць цэлую асобу, якая мае сваю ўласную тоеснасць, а не толькі цела, якое нягледзячы на знішчальнае дзеянне часу ніколі не перастае неяк выражаць асабістую тоеснасць, якая заваявала сэрца. Калі іншыя ўжо не могуць распазнаваць прыгажосць гэтай тоеснасці, закаханы сужэнец надалей здольны заўважаць яе з інстынктам любові, а закаханасць не слабее. Ён пацвярджае сваё рашэнне аб прыналежнасці да яе, выбірае яе зноў і выказвае гэты выбар праз верную і поўную чуласці блізкасць. Высакароднасць яго рашэння на карысць яго выбару, будучы інтэнсіўнай і глыбокай, абуджае новую форму пачуцця падчас выканання сужэнскай місіі. Бо „адно ўзрушэнне другім чалавекам як асобай [...] само па сабе не скіроўваецца да сужэнскага акту“[174]. Яно набывае іншыя пачуццёвыя формы выражэння, бо „любоў з’яўляецца адной рэчаіснасцю, але мае розныя вымярэнні; то адно, то другое вымярэнне можа больш праяўляц-

[174] Ян Павел II, *Катэхеза* (31 кастрычніка 1984), 6: *Insegnamenti* VII, 2 (1984), 1072.

ца“[175]. Сувязь знаходзіць новыя спосабы выражэння і патрабуе, каб яе няспынна ўсталёўвалі нанова. Аднак не толькі для таго, каб захаваць, але і каб развіваць. Гэта працэс будавання з дня ў дзень. Усё гэта немагчыма, калі не заклікаць Духа Святога, штодзённа просячы Яго аб ласцы, калі не шукаць Яго звышпрыроднай моцы, калі не прасіць Яго палка, каб Ён спаслаў свой агонь на нашую любоў, каб яе ўмацаваць, скіраваць і перамяніць у кожнай новай сітуацыі.

[175] Бэнэдыкт XVI, Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 8.

## РАЗДЗЕЛ V

# ЛЮБОЎ, ЯКАЯ СТАНОВІЦЦА ПЛЁННАЙ

165. Любоў заўсёды адорвае жыццём, таму „сужэнская любоў не вычэрпваецца сярод іх дваіх, [...] сужэнцы, узаемна аддаючы сябе, ствараюць новую рэчаіснасць — дзіця, жывое адлюстраванне іх любові, трывалы знак сужэнскай еднасці, а таксама жывы і неразлучны сінтэз бацькоўства і мацярынства“[176].

### Прыняць новае жыццё

166. Сям'я — гэта не толькі асяроддзе нараджэння, але і прыняцця жыцця як дару, які паходзіць ад Бога. Кожнае новае жыццё „дазваляе нам адкрыць найбольш бескарыслівае вымярэнне любові, якое няспынна здзіўляе нас. Найперш, гэта прыгажосць быць каханымі: дзеці каханыя, перш чым з'явяцца на свет“[177]. Гэта адлюстроўвае першынство любові Бога, які заўсёды выходзіць з ініцыятывай, бо „дзеці каханыя, перш чым зробяць нешта, каб заслужыць на

[176] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 14: *AAS* 74 (1982), 96.

[177] *Катэхеза* (11 лютага 2015): *L'Osservatore Romano*, 12 febbraio 2015, p. 8.

гэта“[178]. Аднак „многія дзеці з самага пачатку адкідаюцца, застаюцца без апекі, пазбаўляюцца дзяцінства і будучыні. Некаторыя, быццам у апраўданне, асмельваюцца казаць, што іх нараджэнне было памылкай. Гэта ганебна! [...] Навошта нам урачыстая дэкларацыя правоў чалавека і правоў дзіцяці, калі потым дакараем дзяцей за памылкі дарослых?“[179]. Калі дзіця прыходзіць на свет у непажаданых абставінах, бацькі або іншыя члены сям'і павінны рабіць усё, што ў іх сілах, каб прыняць яго як дар Бога, адказна, адкрыта і з любоўю. Бо „калі гаворка ідзе пра дзяцей, якія прыходзяць на свет, ніякая ахвярнасць дарослых не будзе лічыцца занадта каштоўнай або занадта вялікай у прадухіленні таго, каб нейкае дзіця думала, што яно — памылка, што яно нічога не вартае і было выдадзена на жыццёвыя крыўды і людское насілле“[180]. Дар новага дзіцяці, якое Пан даручае бацьку і маці, бярэ пачатак у прыняцці і працягваецца праз апеку падчас часовага жыцця, а яго канчатковая мэта — гэта радасць вечнага жыцця. Спакойны падыход да канчатковага спаўнення чалавечай асобы зробіць бацькоў больш свядомымі даручанага ім каштоўнага дару: Бог па сутнасці дазваляе ім выбраць імя, якім Ён пакліча кожнае са сваіх дзяцей да вечнасці[181].

167. Шматдзетныя сем'і з'яўляюцца для Касцёла радасцю. У іх любоў выражае сваю шчодрую пладнасць. Гэта не азначае, што мы забываемся пра слуш-

[178] *Тамсама.*

[179] *Катэхеза* (8 красавіка 2015): *L'Osservatore Romano*,9 aprile 2015, p. 8.

[180] *Тамсама.*

[181] Пар. Другі Ват. Сабор, Паст. канстыт. *Gaudium et spes*, 51: «Няхай усе ведаюць, што чалавечае жыццё і задача пракрэацыі не абмяжоўваюцца толькі перспектывамі часовымі і не толькі ў часе знаходзяць сваё вымярэнне і спасціжэнне, але заўсёды маюць аднясенне да вечнага прызначэння чалавека».

ную перасцярогу св. Яна Паўла II, калі ён тлумачыў, што адказнае бацькоўства — „гэта не пытанне неабмежаванай пракрэацыі або неразуменне значэння выхавання дзяцей, а хутчэй магчымасць, дадзеная сужэнствам, каб яны мудра і адказна карысталіся сваёй непарушнай свабодай, беручы пад увагу сацыяльныя і дэмаграфічныя рэаліі, а таксама ўласнае становішча і абгрунтаваныя жаданні“[182].

*Любоў у чаканні, тыповым для цяжарнасці*

168. Цяжарнасць — гэта цяжкі, але ў той жа час і цудоўны перыяд. Маці супрацоўнічае з Богам, каб адбыўся цуд новага жыцця. Мацярынства вынікае з „асаблівай патэнцыяльнасці ўсяго жаночага арганізма, які з сапраўды творчай дакладнасцю служыць зачаццю і нараджэнню чалавека“[183]. Кожная жанчына ўдзельнічае ў „таямніцы стварэння, якая аднаўляецца ў чалавечым нараджэнні“[184]. Як кажа псальм: „Ты выткаў мяне ва ўлонні маёй маці“ (139 [138], 13). Кожнае дзіця, якое фармуецца ва ўлонні сваёй маці, з’яўляецца плёнам плана Бога Айца і Яго вечнай любові: „Раней, чым сфармаваў цябе ва ўлонні, Я пазнаў цябе, і раней, чым ты выйшаў з улоння, Я асвяціў цябе“ (*Ер* 1, 5). Кожнае дзіця спрадвеку ў сэрцы Бога, а ў момант яго зачацця спаўняецца адвечная мара Стварыцеля. Падумаем, як шмат значыць эмбрыён ад моманту свайго зачацця. Трэба глядзець на яго тым позіркам любові Бога, які бачыць больш, чым нашыя вочы.

[182] *Lettera alla Segretaria generale della Conferenza internazionale dell’Organizzazione delle Nazioni Unite su popolazione e sviluppo* (18 сакавіка 1994): *Insegnamenti* XVII, 1 (1994), 750-751.

[183] Ян Павел II, *Катэхеза* (12 сакавіка 1980), 3: *Insegnamenti* III, 1 (1980), 543.

[184] *Тамсама.*

169. Цяжарная жанчына можа ўдзельнічаць у Божым праекце, будуючы мары пра сваё дзіця: „Усе маці і ўсе таты марылі пра сваё дзіця на прягягу дзевяці месяцаў. [...] Сям'я немагчымая без мараў. Калі ў нейкай сям'і страчваецца здольнасць да мараў, дзеці не ўзрастаюць, а любоў не расце, жыццё слабее і згасае"[185]. У хрысціянскім сужэнстве ў гэтай мары абавязкова прысутнічае хрост. Бацькі рыхтуюць яго сваёй малітвай, даручаючы сваё дзіця Езусу яшчэ да яго нараджэння.

170. Дзякуючы прагрэсу ў навуцы сёння можна раней даведацца, які колер валасоў можа мець дзіця і на якія хваробы будзе ў будучым хварэць, паколькі ўсе саматычныя рысы гэтай асобы запісаныя ў яе генетычным кодзе ўжо на эмбрыянальнай стадыі. Аднак толькі Айцец, які яго стварыў, ведае яго цалкам. Толькі Ён ведае, што самае каштоўнае, што самае важнае, бо Ён ведае, кім ёсць гэтае дзіця, якая яго найглыбейшая тоеснасць. Маці, якая носіць яго ў сваім улонні, павінна прасіць у Бога святла, каб глыбей пазнаць сваё дзіця і чакаць, якім яно будзе на самай справе. Калі некаторыя бацькі лічаць, што іх дзіця прыходзіць не ў найлепшы момант, то павінны прасіць Пана аздаравіць іх і ўмацаваць, каб яны маглі цалкам прыняць гэта дзіця і чакаць яго ўсім сэрцам. Важна, каб дзіця адчувала сябе чаканым. Гэта не дадатак і не гарантыя асабістага спакою. Гэта чалавечая істота з вялізнай каштоўнасцю, і яе нельга выкарыстоўваць для асабістай выгады. Таму неістотна, ці гэта новае жыццё адпавядае табе, ці мае рысы, якія табе падабаюцца або не, ці адпавядае тваім планам і марам. „Дзеці — гэта дар. Кожнае з іх выключ-

[185] *Прамова падчас сустрэчы з сем'ямі ў Маніле* (16 студзеня 2015): *AAS* 107 (2015), 176.

нае і непаўторнае [...]. Дзіця любяць за тое, што гэта дзіця — не таму, што яно прыгожае, такое ці іншае; а таму што гэта дзіця!“[186]. Любоў бацькоў — гэта інструмент любові Бога Айца, які чула чакае нараджэння кожнага дзіцяці, безумоўна і бескарысліва прымае яго.

171. Кожную цяжарную жанчыну хачу з любоўю прасіць: клапаціся пра сваю радасць, няхай нішто не пазбаўляе цябе духоўнай радасці мацярынства. Гэтае дзіця заслугоўвае тваёй радасці. Не дазволь, каб боязь, страх, каментары іншых людзей ці праблемы зацьмілі шчасце быць прыладаю Бога ў нараджэнні на свет новага жыцця. Паклапаціся аб тым, што трэба зрабіць або падрыхтаваць, не паддавайся дакучлівым думкам і любі, як Марыя: „Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцу, бо глянуў Бог на пакору сваёй слугі“ (*Лк* 1, 46-48). Май гэты радасны энтузіязм сярод сваіх цяжкасцяў і прасі Пана, каб Ён ахоўваў тваю радасць, а ты каб магла перадаць яе свайму дзіцяці.

*Любоў маці і бацькі*

172. „Адразу пасля нараджэння дзеці пачынаюць атрымліваць як дар, разам з ежай і апекай, пацвярджэнне духоўных якасцяў любові. Акты любові выяўляюцца ў дары ўласнага імя, у выкарыстанні той самай мовы, у інтэнцыях позіркаў, у прамяністых усмешках. Праз гэта яны пазнаюць, што прыгажосць міжчалавечых повязяў фарміруе нашую душу, будуе нашую свабоду, прымае непаўторнасць іншага, прызнае яго і шануе як суразмоўцу. [...] Гэтая любоў мае

[186] *Катэхеза* (11 лютага 2015): *L'Osservatore Romano*, 12 febbraio 2015, p. 8.

ў сабе іскру любові Бога!“[187]. Кожнае дзіцё мае права атрымліваць любоў маці і бацькі, бо яны абое неабходныя для поўнага і гарманічнага сталення. Як сказалі біскупы Аўстраліі, абое „прычыняюцца, кожны па-свойму, да выхавання дзіцяці. Шанаванне годнасці дзіцяці азначае пацвярджэнне яго або яе патрэбаў, а таксама натуральнага права мець маці і бацьку“[188]. Маецца на ўвазе не толькі любоў бацькі і маці, узятых па-асобку, але таксама любоў паміж імі, якая ўспрымаецца як крыніца ўласнай экзістэнцыі, як гняздо, якое прымае, і як фундамент сям’і. У адваротным выпадку, дзіця як бы зводзіцца да капрызнага валодання. Абое, мужчына і жанчына, бацька і маці з’яўляюцца „супрацоўнікамі любові Бога Стварыцеля і як бы выяўляюць яе“[189]. Яны паказваюць сваім дзецям мацярынскае і айцоўскае аблічча Пана. Акрамя таго, разам вучацца цаніць узаемнасць, сустрэчы з рознымі асобамі, дзе кожны з іх дзеліцца сваёй самабытнасцю, а таксама здольны прымаць яе ад іншага. Калі па нейкай непазбежнай прычыне няма аднаго з двух бацькоў, то важна шукаць які-небудзь спосаб кампенсацыі гэтага недахопу, каб садзейнічаць правільнаму сталенню дзіцяці.

173. Адчуванне сіроцтва, якое ўласціва сёння многім дзецям і маладым людзям, з’яўляецца значна глыбейшым, чым нам здаецца. Сёння мы прызнаем цалкам абгрунтаваным, а нават пажаданым, каб жанчыны жадалі вучыцца, працаваць, развіваць свае здольнасці і мець свае мэты. Але не можам замоўчваць той факт,

[187] *Катэхеза* (14 кастрычніка 2015): *L’Osservatore Romano*, 15 ottobre 2015, p. 8.

[188] Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў Аўстраліі, Паст. пасл. *Don’t Mess with Marriage* (24 лістапада 2015), 11.

[189] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 50.

што дзеці патрабуюць прысутнасці маці, асабліва ў першыя месяцы жыцця. Па сутнасці „жанчына тады прадстае перад мужчынам як маці, як суб’ект чалавечага жыцця, якое распачынаецца ў ёй і развіваецца, і з яе нараджаецца на свет“[190]. Усё большая адсутнасць маці з іх жаночымі рысамі з’яўляецца сур’ёзнай небяспекай для нашай зямлі. Я цаню фемінізм, калі ён не патрабуе аднастайнасці або адмовы мацярынства. Бо непаўторнасць жанчын звязана з правамі, якія вынікаюць з іх неад’емнай чалавечай годнасці, а таксама з іх жаночым геніем, неабходным для грамадства. Іх спецыфічна жаночыя здольнасці — асабліва мацярынства — вызначаюць таксама іхнія абавязкі, бо быць жанчынай, значыць мець канкрэтную місію на зямлі, якую грамадства павінна абараняць і ахоўваць дзеля дабра ўсіх[191].

174. Па сутнасці, „маці з’яўляюцца наймацнейшым супрацьяддзем ад пашырэння эгаістычнага індывідуалізму. [...] Яны сведчаць аб прыгажосці жыцця!“[192]. Несумненна, „грамадства без маці было б бесчалавечным, бо маці заўсёды, таксама ў найгоршыя моманты, могуць даваць сведчанне чуласці, ахвярнасці, маральнай моцы. Маці часта перадаюць таксама найглыбейшы сэнс рэлігійных практык: першыя малітвы, першыя жэсты пабожнасці, якім вучыцца дзіця [...]. Без маці не толькі не было б новых вернікаў, але вера страціла б значную частку свайго простага і глыбокага цяпла. [...] Дарагія мамы, дзякую вам,

[190] Ян Павел II, *Катэхеза* (12 сакавіка 1980), 2: *Insegnamenti* III, 1 (1980), 542.

[191] Пар. той жа, Апост. ліст *Mulieris dignitatem* (15 жніўня 1988), 30-31: *AAS* 80 (1988), 1727-1729.

[192] *Катэхеза* (7 студзеня 2015): *L’Osservatore Romano*, 7-8 gennaio 2015, p. 8.

дзякую за тое, чым вы з'яўляецеся ў сям'і, і за тое, што даеце Касцёлу і свету“[193].

175. Маці, якая з чуласцю і спачуваннем аберагае сваё дзіця, дапамагае яму абудзіць давер, адчуць, што свет з'яўляецца добрым месцам, якое яго прымае. Гэта ў сваю чаргу дазваляе яму развіваць пачуццё ўласнай годнасці, што абуджае здольнасць да інтымнасці і эмпатыі. З другога боку, постаць бацькі дапамагае нам зразумець межы рэальнасці і адзначаецца большай зарыентаванасцю, выйсцем да больш шырокага свету, поўнаму выклікаў, а таксама заахвочвае да намаганняў і барацьбы. Бацька, з выразнай і шчаслівай мужчынскай тоеснасцю, які ў сваю чаргу спалучае ў сабе любоў і прызнанне яго жонкі, неабходны гэтак жа, як і яе мацярынскі клопат. Гэтыя эластычныя функцыі і заданні адаптуюцца да канкрэтнай сітуацыі кожнай сям'і, але выразная і добра акрэсленая прысутнасць абаіх, мужчыны і жанчыны, стварае найбольш адпаведнае асяроддзе для сталення дзіцяці.

176. Гаворыцца, што нашае грамадства - гэта „грамадства без айцоў“. У заходняй культуры постаць бацькі нібы сімвалічна адсутнічае, скажаецца, губляецца. Здаецца, мужнасць ставіцца пад сумніў. Адбываецца зразумелае замяшанне, бо „спачатку гэта ўспрымалася як вызваленне: вызваленне ад бацькі-гаспадара і ўладара, ад бацькі, як прадстаўніка закону, які навязвае звонку сваю волю, бацькі як цэнзара шчасця дзяцей і перашкоды на шляху да эмансіпацыі і незалежнасці маладых людзей. Часам у некаторых дамах у мінулым панаваў дэспатызм, а ў некаторых выпадках нават

[193] *Тамсама.*

гвалт“[194]. Аднак, „што часта здараецца, з адной крайнасці трапляем у другую. Здаецца, праблема нашых дзён заключаецца не столькі ў празмерна настойлівай апецы айцоў, але ў іх адсутнасці, ухіленні ад абавязкаў. Айцы нярэдка настолькі засяроджаныя на сабе і на сваёй працы, а часам і на сваёй самарэалізацыі, што нават забываюць пра сям'ю. Яны пакідаюць дзяцей і моладзь адных“[195]. Прысутнасць бацькі, а таксама яго аўтарытэт змяншаецца за кошт павелічэння колькасці часу, які мы адводзім СМІ і тэхналогіям забаў. Акрамя таго, сам аўтарытэт сёння ўспрымаецца з падазронасцю, а дарослыя моцна аспрэчваюцца. Гэта яны самі пакідаюць тое, што з'яўляецца бясспрэчным, і таму не даюць дзецям надзейных і добра абгрунтаваных указанняў. Дрэнна, што даходзіць да замены роляў паміж бацькамі і дзецьмі, бо парушаецца правільны працэс сталення дзяцей, і не даецца ім любоў, здольная накіроўваць іх і дапамагаць ім у сталенні[196].

177. Бог змяшчае бацьку ў сям'і, каб ён з каштоўнымі рысамі сваёй мужнасці „быў побач з жонкай, падзяляў усё: радасць і боль, цяжары і надзеі. Каб быў таксама побач з дзецьмі, калі яны растуць: калі гуляюць і працуюць, калі бесклапотныя і заклапочаныя, калі гавораць і маўчаць, калі смелыя і калі баяцца, калі робяць памылкі і калі вяртаюцца на добры шлях; бацька павінен быць прысутным, заўсёды. Быць прысутным — гэта не значыць кантраляваць! Бацька, які зашмат кантралюе, знішчае асабовасць дзяцей“[197]. Некаторыя айцы адчуваюць сябе бескарыснымі

[194] *Катэхеза* (28 студзеня 2015): *L'Osservatore Romano,* 29 gennaio 2015, p. 8.

[195] *Тамсама.*

[196] Пар. *Relatio finalis* 2015, 28.

[197] *Катэхеза* (4 лютага 2015): *L'Osservatore Romano*, 5 febbraio 2015, p. 8.

і непатрэбнымі, але праўда таксама, што „дзеці патрабуюць таты, які чакае іх, калі яны вяртаюцца пасля сваіх паражэнняў. Яны робяць усё, каб не прызнацца ў гэтым, каб не паказаць гэтага, але яны гэтага патрабуюць“[198]. Дрэнна, калі дзеці пазбаўлены айцоў і такім чынам заўчасна перастаюць быць дзецьмі.

## Больш шырокае разуменне плоднасці

178. Многія сужэнскія пары не могуць мець дзяцей. Мы ведаем, колькі цярпення звязана з гэтым. З другога боку, ведаем таксама, што „сужэнства не ўстаноўлена выключна для нараджэння патомства [...]. Таму сужэнства трывае як лучнасць і супольнасць усяго жыцця і захоўвае сваю каштоўнасць і непарыўнасць нават тады, калі няма жаданага патомства“[199]. Больш за тое, „мацярынства — гэта незвычайная біялагічная рэчаіснасць, але выяўляецца па-рознаму“[200].

179. Усынаўленне з’яўляецца адным з найбольш велікадушных спосабаў мацярынства і айцоўства. Таму хачу заахвоціць тых, хто не мае дзяцей, пашырыць і ўчыніць адкрытай сваю сужэнскую любоў, каб прыняць тых, хто пазбаўлены належнага сямейнага асяроддзя. Яны ніколі не пашкадуюць, што былі шчодрымі. Усынаўленне — гэта поўны любові акт адорвання сям’ёй тых, хто яе не мае. Трэба настойваць на тым, каб заканадаўства магло аблегчыць працэдуры па ўсынаўленні, асабліва ў выпадку нежаданых дзяцей, каб прадухіліць аборт ці адмову. Тыя, хто згаджаецца

[198] *Тамсама.*
[199] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 50.
[200] V Агульная Канферэнцыя Епіскапату Лацінскай Амерыкі і Карыбаў, *Documento di Aparecida* (29 чэрвеня 2007), 457.

на ўсынаўленне і прымаюць асобу безумоўна і бескарысліва, становяцца пасрэднікамі любові Бога, які кажа: „Але калі нават [маці] і забудзе, Я не забуду пра цябе“ (*Іс* 49, 15).

180. „Рашэнне аб усынаўленні, а таксама апека над прыёмнымі дзецьмі выяўляе асаблівую плоднасць сужэнства, што шырока здзяйсняецца нават па-за выпадкамі балюча перажыванай няплоднасці [...]. У сітуацыях, калі сужэнцы імкнуцца мець дзіця ўсялякім коштам у імя самарэалізацыі, адпаведна зразуметае ўсынаўленне і апека над прыёмнымі дзецьмі падкрэслівае важны аспект бацькоўства і наяўнасці патомства, бо дапамагае прызнаць, што дзеці, ці народжаныя, ці ўсыноўленыя, ці даручаныя апецы, не такія як мы, і трэба іх прыняць, любіць, клапаціцца аб іх, а не толькі нарадзіць іх на свет. Рашэнне наконт усынаўлення і апекі над прыёмнымі дзецьмі заўсёды павінна прадугледжваць дабро дзіцяці“[201]. З другога боку, „з дапамогай адпаведных заканадаўчых мер і кантролю з боку дзяржавы трэба спыніць гандаль дзецьмі паміж краінамі і кантынентамі“[202].

181. Трэба таксама памятаць, што пракрэацыя ці ўсынаўленне не з’яўляюцца адзінымі спосабамі перажывання плоднай любові. Шматдзетныя сем’і пакліканы таксама пакідаць след сваёй прысутнасці ў грамадстве, у якім жывуць, каб развіваліся іншыя формы плоднасці, якія з’яўляюцца нібы працягам любові, якая іх падтрымлівае. Няхай хрысціянскія сем’і не забываюць, што „вера не адштурхоўвае нас ад свету, але яшчэ глыбей прышчэплівае нас да яго. [...] Бо

[201] *Relatio finalis* 2015, 65.
[202] *Тамсама*.

кожны з нас выконвае асаблівую ролю ў падрыхтоўцы да таго, каб настала ў нашым свеце Божае Валадарства“[203]. Сям’я не павінна думаць пра сябе як пра замкнёны абшар, пакліканы бараніцца ад грамадства. Няхай не затрымліваецца на чаканні, але выходзіць у салідарным пошуку па-за свае межы. Так яна станецца месцам інтэграцыі асобы ў грамадстве і цэнтрам, які яднае публічную і прыватную сферу. Сужэнцы павінны мець выразнае і матываванае разуменне сваіх грамадскіх абавязкаў. Калі так станецца, пачуццё, якое іх яднае, не знікне, але напоўніцца новым святлом, як кажуць пра гэта наступныя словы:

„Твае рукі — мая пяшчота,
мае штодзённыя акорды,
люблю цябе, бо твае рукі
чыняць справядлівасць.
Люблю цябе, бо ты —
мая любоў, супольнік і ўсё маё,
а на вуліцы плячо ў плячо
мы значна больш, чым двое“[204].

182. Ніводная сям’я не можа быць плоднай, калі лічыць, што вельмі адрозніваецца ці з’яўляецца „аддзеленай“. Каб прадухіліць гэтую небяспеку, трэба памятаць, што сям’я Езуса, поўная ласкі і мудрасці, не лічылася „дзіўнай“ сям’ёй, чужым і далёкім ад людзей домам. Менавіта таму людзі з цяжкасцю распазнавалі мудрасць Езуса і казалі: „Адкуль у Яго гэта? [...] Ці ж гэта не цясляр, сын Марыі?“(*Мк* 6, 2-3). „Ці ж гэта не сын

[203] *Прамова падчас сустрэчы з сем’ямі ў Маніле* (16 студзеня 2015): *AAS* 107 (2015), 178.

[204] Mario Benedetti, „Te quiero“, у: *Poemas de otros,* Buenos Aires 1993, 316.

цесляра?“ (*Мц* 13, 55). Гэта пацвярджае, што была гэта простая сям’я, блізкая ўсім, звычайна звязаная з народам. І Езус таксама не рос у закрытых і выключных адносінах з Марыяй і Юзафам, але ахвотна прабываў у больш шырокай сям’і, у якой былі родныя і сябры. Таму зразумела, чаму, вяртаючыся з Ерузалема, яго бацькі думалі, што згубілі ў караване на працягу дня дванаццацігадовага хлопчыка, які мог слухаць аповеды і падзяляць клопаты ўсіх: „Думаючы, што Ён ідзе з пілігрымамі, прайшлі дзень дарогі“ (*Лк* 2, 44). Аднак часам здараецца, што некаторыя хрысціянскія сем’і з прычыны сваёй мовы, свайго спосабу гаварыць пра розныя рэчы, з прычыны свайго стаўлення, з прычыны пастаяннага паўтарэння двух ці трох пытанняў успрымаюцца як далёкія, аддзеленыя ад грамадства, і нават іх родныя адчуваюць на сабе іх пагарду і асуджэнне.

183. Сужэнства, якое адчувае моц любові, ведае, што такая любоў паклікана лячыць раны пакінутых, будаваць культуру сустрэчы, змагацца за справядлівасць. Бог даручыў сям’і праект „ператварэння свету ў дом“[205], каб усе маглі адчуваць, што кожны чалавек з’яўляецца братам: „Уважлівы позірк на штодзённае жыццё сённяшніх мужчын і жанчын адразу выяўляе паўсюдную неабходнасць моцнага ўколу сямейнага духу. [...] Не толькі арганізацыя супольнага жыцця штораз больш сустракаецца з перашкодамі бюракратыі, для якой цалкам чужымі з’яўляюцца асноўныя чалавечыя повязі, але псуюцца нават грамадскія і палітычныя звычаі“[206].

[205] Пар. *Катэхеза* (16 верасня 2015): *L’Osservatore Romano*, 17 settembre 2015, p. 8.
[206] *Катэхеза* (7 кастрычніка 2015): *L’Osservatore Romano*, 8 ottobre 2015, p. 8.

Аднак адкрытыя і салідарныя сем'і адводзяць месца для бедных, яны здольныя наладзіць сяброўства з тымі, каму жывецца горш. Калі іх сапраўды цікавіць Евангелле, то яны не могуць забыць аб тым, што кажа Езус: „тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі" (*Мц* 25, 40). Карацей кажучы, яны жывуць тым, чаго ад нас так выразна патрабуе гэты тэкст: „Калі наладжваеш абед ці вячэру, не кліч сяброў тваіх, ні братоў тваіх, ні родных тваіх, ні суседзяў багатых, каб і яны не паклікалі цябе ў адказ, і ты атрымаў бы адплату. Але калі наладжваеш гасціну, кліч убогіх, калек, кульгавых, сляпых, і будзеш шчаслівы" (*Лк* 14, 12-14). Будзеш шчаслівы! Вось таямніца шчаслівай сям'і.

184. Сваім сведчаннем і словам сем'і кажуць іншым пра Езуса, перадаюць веру, абуджаюць прагненне Бога і паказваюць прыгажосць Евангелля і стылю жыцця, які яно нам прапануе. Такім чынам хрысціянскае сужэнства размалёўвае шэрасць, напаўняючы публічную прастору колерамі братэрства, сацыяльнай падтрымкай, абаронай слабых асобаў, а таксама ззяннем веры і дзейснай надзеі. Іх пладнасць пашыраецца і прапануе тысячы спосабаў праяўлення любові Бога ў грамадстве.

*Распазнанне цела*

185. У гэтым духу трэба вельмі сур'ёзна ўспрымаць біблійны тэкст, які часта інтэрпрэтуецца ў адарванні ад кантэксту ці вельмі агульна, і таму можна не заўважыць яго больш непасрэдны і просты сэнс, які мае выключна грамадскі характар. Маецца на ўвазе тэкст *1 Кар* 11, 17-34, дзе св. Павел сутыкнуўся з няёмкім становішчам супольнасці. Некаторыя багатыя

людзі намагаліся дыскрымінаваць убогіх. І гэты падзел здараўся нават падчас святочнай гасціны, якая спадарожнічала Эўхрыстыі. Тады як багатыя цешыліся сваімі цудоўнымі стравамі, бедныя выконвалі ролю гледачоў і былі галодныя: „кожны бярэцца раней з'есці ўласны спажытак. І адзін застаецца галодным, а другі п'янее. Хіба не маеце дамоў, каб есці і піць? Ці вы пагарджаеце Касцёлам Божым і прыніжаеце тых, хто не мае? Што сказаць вам? Ці пахваліць вас? За гэта не пахвалю!" (*1 Кар* 11, 21-22).

186. Эўхарыстыя патрабуе далучэння да аднаго цела Касцёла. Асоба, якая прымае Цела і Кроў Хрыста, не можа адначасова зневажаць тое самае цела, робячы скандальныя падзелы паміж яго членамі і здзяйсняючы дыскрымінацыю. Па-сутнасці, гаворка ідзе пра „распазнанне" Цела Пана, прыняцце яго з верай і любоўю ў сакрамэнтальных знаках і ў супольнасці. У адваротным выпадку мы спажываем і п'ём сваё ўласнае асуджэнне (пар. *1 Кар* 11, 29). Гэты біблійны тэкст з'яўляецца сур'ёзнай перасцярогай для сем'яў, якія замыкаюцца ў сваім уласным камфорце і адасабляюцца, але асабліва для сем'яў, абыякавых да цярпенняў бедных і больш патрабуючых сем'яў. Такім чынам эўхарыстычная цэлебрацыя становіцца няспынным заклікам для кожнага: „зважай на самога сябе" (пар. *1 Кар* 11, 28), каб адкрыць брамы свайго дому дзеля большай еднасці з тымі, хто адкінуты грамадствам, а значыць для сапраўднага прыняцця сакрамэнту эўхарыстычнай любові, якая робіць нас адным целам. Не забывайма, што „«містыка» гэтага сакрамэнту мае грамадскі характар"[207]. Калі асобы, якія прымаюць св. Камунію, не адгукаюцца на заахвочванне

[207] БЭНЭДЫКТ XVI, Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 14.

дапамагаць бедным і церпячым ці згаджаюцца на розныя формы падзелаў, пагарды і несправядлівасці, то Эўхарыстыя прымаецца нягодна. Сем'і ж, якія прымаюць Эўхарыстыю з адпаведным настаўленнем, умацоўваюць сваё жаданне братэрства, свой грамадскі змест і дзейнасць на карысць патрабуючых.

## Жыццё ў больш шырокай сям'і

187. Малое сямейнае кола не павінна ізалявацца ад больш шырокай сям'і, у якой ёсць бацькі, дзядзі і цёці, пляменнікі, а нават суседзі. У гэтай вялікай сям'і могуць быць асобы, патрабуючыя дапамогі, а прынамсі суправаджэння і жэстаў сімпатыі, але могуць быць таксама вялікія цярпенні, якія патрабуюць суцяшэння[208]. Індывідуалізм нашага часу нярэдка вядзе да замкнёнасці ў бяспечным малым гняздзе і да ўспрыняцця іншых як цяжкога цярпення. Аднак такая ізаляцыя не прыносіць большага спакою і шчасця, але замыкае сэрца сям'і і пазбаўляе яе шырокай перспектывы жыцця.

### *Быць дзецьмі*

188. Спачатку паразмаўляем пра нашых бацькоў. Езус нагадаў фарысеям, што адыход ад бацькоў супярэчыць Божаму закону (пар. *Мк* 7, 8-13). Страта ўсведамлення быць дзіцём нікому не прыносіла карысці. У кожнай асобе, „нават, калі хтосьці становіцца дарослым або з'яўляецца пажылым чалавекам, нават, калі сам становіцца бацькам або маці, калі займае адказнае садовішча, ва ўсім гэтым захоўваецца тоеснасць дзіцяці. Мы ўсе чыесьці дзеці. А гэта заўсёды

[208] Пар. *Relatio finalis* 2015, 11.

нагадвае нам пра тое, што не мы самі далі сабе жыццё, але атрымалі яго. Вялікі дар жыцця з'яўляецца першым падарункам, які мы атрымалі“[209].

189. Таму: „Чацвёртая запаведзь абавязвае дзяцей [...] шанаваць бацьку і маці (пар. *Зых* 20, 12). Гэтая запаведзь ідзе адразу пасля тых, якія датычаць Бога. Утрымлівае яна штосьці святое, боскае, штосьці, што з'яўляецца крыніцай усялякай пашаны сярод людзей. І ў біблійнай фармуліроўцы чацвёртай запаведзі ёсць дадатак: «каб доўга жыць на зямлі, якую Пан, Бог твой, дае табе». Праўдзівая сувязь паміж пакаленнямі — гэта заўсёды гарантыя будучыні і гарантыя сапраўды чалавечай гісторыі. Грамадства, якое складаецца з дзяцей, якія не шануюць сваіх бацькоў, — гэта грамадства без пашаны [...]. Такое грамадства напаўняецца новымі бессардэчнымі і хціўымі маладымі“[210].

190. Аднак ёсць другі бок медаля: „мужчына пакідае бацьку свайго і маці сваю“ (*Быц* 2, 24), — кажа Божае слова. Часам гэтага не адбываецца, і сужэнства да канца не прымаецца, бо не было такога вырачэння і такой ахвярнасці. Бацькі не павінны быць пакінутымі або забытымі, але для таго, каб з'яднацца ў сужэнстве, трэба пакінуць іх так, каб новы дом стаў месцам прыстанішча, абароны, падставай і праектам, і каб можна было быць „адным целам“. У некаторых сужэнствах здараецца, што многія рэчы ўкрываюцца ад мужа ці жонкі, але абмяркоўваюцца з бацькамі, да такой ступені, што большае значэнне мае меркаванне бацькоў, а не пачуцці і меркаванні сужэнца або сужонкі. Нялёгка вытрымліваць доўгі час такую сітуацыю.

[209] *Катэхеза* (18 сакавіка 2015): *L'Osservatore Romano*, 19 marzo 2015, p. 8.
[210] *Катэхеза* (11 лютага 2015): *L'Osservatore Romano*, 12 febbraio 2015, p. 8.

Яна можа быць толькі часовай, пакуль не створацца ўмовы для развіцця даверу і дыялогу. Сужэнства — гэта выклік знайсці новы спосаб быць дзецьмі.

*Пажылыя людзі*

191. „Не пакідай мяне ў старасці, не пакідай мяне, калі мае сілы аслабнуць!“ (*Пс* 71 [70], 9). Гэта крык старога чалавека, які баіцца, што яго забудуць і будуць ім пагарджаць. Так, як заахвочвае нас Бог быць Яго прыладамі і чуць мольбы бедных, так спадзяецца, што мы пачуем крых пажылых людзей[211]. Гэта выклік для сям'і і супольнасцяў, бо „Касцёл не можа і не жадае прыстасоўвацца да менталітэту нецярпімасці, а тым больш абыякавасці і пагарды да старасці. Мы павінны абудзіць агульнае пачуццё ўдзячнасці, прызнання, гасціннасці, дзякуючы якім пажылая асоба адчуе сябе жывой часткай супольнасці. Пажылыя — гэта мужчыны і жанчыны, айцы і маці, якія перад намі апынуліся на той самай дарозе, што і мы, у нашым доме, яны ўдзельнічалі ў нашым штодзённым змаганні за годнае жыццё“[212]. Таму, „як бы я хацеў, каб Касцёл зрабіў выклік культуры адкідвання, яднаючы з вялікай радасцю ў новых абдымках маладых і пажылых!“[213].

192. Св. Ян Павел II заахвоціў нас звярнуць увагу на месца старэйшых асобаў у сям'і, бо існуюць культуры, якія „ў выніку неўпарадкаванага прамысловага і ўрбаністычнага развіцця прывялі і надалей вядуць да недапушчальнага спіхвання старэйшых на абочыны

[211] Пар. *Relatio finalis* 2015, 17-18.
[212] *Катэхеза* (4 сакавіка 2015): *L'Osservatore Romano*, 5 marzo 2015, p. 8.
[213] *Катэхеза* (11 сакавіка 2015): *L'Osservatore Romano*, 12 marzo 2015, p. 8.

жыцця“[214]. Старэйшыя асобы дапамагаюць заўважыць „пераемнасць пакаленняў“ праз „харызму запаўняць прамежкі паміж пакаленнямі“[215]. Менавіта дзяды часта перадаюць вялікія каштоўнасці сваім унукам, а „многія могуць пацвердзіць, што дзякуючы сваім дзядам яны былі ўведзены ў хрысціянскае жыццё“[216]. Іх словы, абдымкі ці сама іхняя прысутнасць дапамагаюць дзецям распазнаць, што гісторыя не пачынаецца з іх, што яны з'яўляюцца спадкаемцамі доўгай дарогі і што трэба прымаць гісторыю, якая была да нас. Асобе, якая разрывае сувязь з гісторыяй, цяжка будзе наладжваць трывалыя адносіны і прызнаць, што яна не з'яўляецца гаспадаром рэальснасці. Таму „чуласць да пажылых людзей — гэта істотная рыса цывілізацыі. Ці ў сучаснай цывілізацыі бяруцца пад увагу пажылыя асобы? Ці ёсць у ёй месца для пажылых? Цывілізацыя будзе развівацца, калі зможа шанаваць разважлівасць, мудрасць пажылых людзей“[217].

193. Адсутнасць гістарычнай памяці — гэта сур'ёзны недахоп нашага грамадства. Гэта нясталы менталітэт: „было і мінула!“ Веды і здольнасць ацэньваць мінулыя падзеі з'яўляецца адзіным спосабам для будавання змястоўнай будучыні. Нельга выхоўваць без звароту да памяці: „Згадайце мінулыя дні“ (*Гбр* 10, 32). Апавяданні старэйшых асобаў даюць шмат дабра дзецям і моладзі, бо лучаць іх з мінулай гісторыяй ці то праз сям'ю, дадзены рэгіён ці таксама праз айчыну.

[214] Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 27: *AAS* 74 (1982), 113.

[215] Ян Павел II, *Discorso ai partecipanti al Forum internazionale sull'invecchiamento attivo* (5 верасня 1980), 5: *Insegnamenti* III, 2 (1980), 539.

[216] *Relatio finalis* 2015, 18.

[217] *Катэхеза* (4 сакавіка 2015): *L'Osservatore Romano*, 5 marzo 2015), p. 8.

Сям'я, якая не шануе і не клапоціцца пра сваіх дзядоў, якія з'яўляюцца жывой памяццю, — гэта разбітая сям'я. Але сям'я, якая памятае, — гэта сям'я, якая мае будучыню. Таму „цывілізацыя, у якой няма месца старэйшым асобам або яны адкідваюцца, як прычына праблем, з'яўляецца носьбітам віруса смерці"[218], бо „адрываецца ад сваіх каранёў"[219]. Феномен сучаснага сіроцтва, з пункта гледжання адсутнасці пераемнасці, выкараненне і заняпаду асноўных элементаў, якія фарміруюць жыццё, заклікае нас рабіць нашыя сем'і месцам, дзе дзеці могуць укараніцца ў глебе агульнай гісторыі.

*Быць братам*

194. Адносіны паміж братамі паглыбляюцца з часам, а „братэрская повязь, якая ўзнікла ў сям'і паміж роднымі, сталее ў атмасферы выхавання адкрытасці на іншых, з'яўляецца вялікай школай свабоды і спакою. У сям'і родныя вучацца чалавечай падтрымцы [...]. Магчыма, не заўсёды мы гэта разумеем, але менавіта сям'я нясе ў свет братэрства! Пачынаючы з гэтага першага досведу братэрства, якое ўмацоўваецца праз любоў і выхаванне ў сям'і, братэрскі стыль выпраменьвае як абяцанне на ўсё грамадства"[220].

195. Узрастанне сярод родных гарантуе прыгожы вопыт узаемнай апекі, дапамогі і атрымання падтрымкі. Таму таксама „братэрства ў сям'і ззяе асабліва, калі бачым клапатлівасць, цярплівасць, любоў, якімі

[218] *Тамсама.*
[219] *Прамова падчас сустрэчы з пажылымі людзьмі на плошчы св. Пятра* (28 верасня 2014): *L'Osservatore Romano*, 29-30 settembre 2014, p. 7.
[220] *Катэхеза* (18 лютага 2015): *L'Osservatore Romano*, 19 febbraio 2015, p. 8.

атачаюць слабейшых брацікаў і сястрычак, хворых або інвалідаў“[221]. Мы павінны пагадзіцца з тым, што „мець брата, сястру, якія цябе любяць, — гэта глыбокі, каштоўны, незаменны вопыт“[222], таму мы павінны цярпліва вучыць дзяцей гэтаму братэрству. Такая практыка, часам стамляючая, з'яўляецца сапраўднай школай грамадскага жыцця. У некаторых краінах існуе моцная тэндэнцыя мець толькі адно дзіця, і тады пачуццё братэрства становіцца чымсьці рэдкім. У выпадку, калі няма магчымасці мець больш за адно дзіця, трэба знайсці спосаб, каб дзіцё не расло ў самоце ці ізалявана.

*Вялікае сэрца*

196. Па-за малым колам, якое ствараюць муж і жонка са сваімі дзецьмі, існуе таксама большая сям'я, пра якую нельга маўчаць. „Каханне паміж мужчынам і жанчынай у сужэнстве і, такім чынам, у больш шырокім сэнсе, любоў паміж членамі той самай сям'і — паміж бацькамі і дзецьмі, паміж братамі і сёстрамі, паміж роднымі і хатнімі — ажыўляе і падтрымлівае ўнутраны, няспынны дынамізма, які вядзе сям'ю да больш глыбокай і мацнейшай еднасці, якая з'яўляецца фундаментам і прынцыпам сужэнскай і сямейнай супольнасці“[223]. Далучаюцца да гэтай сям'і яе сябры і прыяцелі, а таксама сямейныя супольнасці, якія ўзаемна падтрымліваюць сябе ў цяжкасцях, у грамадскай дзейнасці і ў сваёй веры.

[221] *Тамсама.*
[222] *Тамсама.*
[223] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 18: *AAS* 74 (1982), 101.

197. Гэтая пашыраная сям’я павінна прыняць з вялікай любоўю маці-падлеткаў, пакінутых бацькамі дзяцей, адзінокіх жанчын, якія павінны займацца выхаваннем сваіх дзяцей, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія патрабуюць шмат цяпла і блізкасці, маладых людзей, якія змагаюцца з нейкімі залежнасцямі, незамужніх і нежанатых асобаў, якія жывуць у сепарацыі або з’яўляюцца ўдовамі і ўдаўцамі, якія адчуваюць самоту, старэйшых і хворых асобаў, якія не маюць дапамогі ад сваіх дзяцей, аж да ўключэння ў сваё кола „нават найбольш скалечаных сваім жыццёвым выбарам“[224]. Яна можа таксама дапамагчы кампенсаваць слабасці бацькоў або выявіць і сказаць пра магчымыя сітуацыі гвалту ці нават выкарыстання дзяцей, даючы ім здаровую любоў і сямейную падтрымку, калі іх бацькі няздольныя даць ім гэта.

198. Урэшце, нельга забываць, што ў такой шырокай сям’і ёсць таксама цесць, цешча і іншыя родныя сужэнцаў. Далікатнасць, уласцівая любові, не дазваляе глядзець на іх, як на канкурэнтаў, як на небяспечных асобаў, агрэсараў. Сужэнская еднасць патрабуе шанавання іх традыцый і звычаяў, намагання зразумець іх мову, абмежавання крытыкі, патрабуе клопату аб іх і адшукання для іх месца ў сваім сэрцы, нават калі трэба захаваць справядлівую незалежнасць і інтымнасць сужэнскай пары. Такое стаўленне з’яўляецца таксама дасканалым спосабам выказаць шчодрасць, гатовую на ахвярнасць дзеля свайго сужэнца ці сужонкі.

[224] *Катэхеза* (7 кастрычніка 2015): *L’Osservatore Romano*, 8 ottobre 2015, p. 8.

РАЗДЗЕЛ VI

# НЕКАТОРЫЯ ПАСТЫРСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

199. Дыялогі ў працэсе Сіноду паказалі неабходнасць выпрацаваць новыя шляхі пастырства, якія цяпер пастараюся абагуліць. Паасобныя супольнасці павінны будуць апрацаваць больш практычныя і эфектыўныя прапановы, беручы пад увагу як вучэнне Касцёла, так і мясцовыя патрэбы і праблемы. Не маю намеру прадстаўляць тут пастырства сем'яў, але хачу акрэсліць толькі сукупнасць некаторых галоўных выклікаў для пастырства.

## Сённяшняе абвяшчэнне Евангелля сям'і

200. Айцы Сінода падкрэслілі, што хрысціянскія сем'і, дзякуючы ласцы сакрамэнту сужэнства, з'яўляюцца галоўнымі суб'ектамі сямейнага пастырства, даючы перадусім „радаснае сведчанне сужэнстваў і сем'яў, хатніх Касцёлаў"[225]. У сувязі з гэтым падкрэслілі, што гаворка ідзе „пра тое, што Евангелле сям'і — гэта радасць, якая «напаўняе сэрца і ўсё жыццё», бо мы

[225] *Relatio Synodi* 2014, 30.

дазваляем Хрысту «вызваліць сябе ад граху, смутку, унутранай пусткі ды адасобленасці» (*Evangelii gaudium*, 1). У святле прыпавесці пра сейбіта (пар. *Мц* 13, 3-9) мы маем заданне ўдзельнічаць у сяўбе: усё астатняе — гэта справа Бога. Нельга таксама забываць, што Касцёл, які кажа пра сям'ю, — гэта знак супраціву"[226], але сужэнцы ўдзячны пастырам за прадстаўленне ім матывацый для адважнага спадзявання на моцную, грунтоўную, трывалую любоў, здольную супрацьстаяць усяму, што паўстае на іхнім шляху. Касцёл хоча данесці сем'ям сваё пакорнае разуменне і жаданне „спадарожнічаць кожнай сям'і і ўсім сем'ям дзеля адкрыцця найлепшага спосабу пераадолення цяжкасцяў, з якімі яны сустракаюцца"[227]. Недастаткова ўключыць агульны клопат аб сям'і ў вялікія пастырскія праекты. Каб сем'і штораз больш прымалі актыўны ўдзел у пастырстве сем'яў, неабходны „евангелізацыйны і катэхетычны высілак, які закранае сутнасць сям'і"[228], які б даваў ім арыенціры ў гэтай галіне.

201. „Такім чынам, увесь Касцёл патрабуе місійнага навяртання: нельга спыняцца на чыста тэарэтычным абвяшчэнні, ізаляваным ад праблем людзей"[229]. Пастырства сем'яў „павінна дазволіць адчуць, што Евангелле сям'і з'яўляецца адказам на самыя глыбокія прагненні чалавека: на яго годнасць і поўную рэалізацыю ва ўзаемнасці, еднасці і плоднасці. Не ідзе гаворка толькі аб прадстаўленні нейкіх нормаў, але аб прапанове каштоўнасцяў у адказ на іх патрабаванні, якія бачым сёння таксама ў найбольш свецкіх краінах"[230].

[226] *Тамсама*, 31.
[227] *Relatio finalis* 2015, 57.
[228] *Тамсама*, 81.
[229] *Relatio Synodi* 2014, 32.
[230] *Тамсама*, 33.

Больш за тое, „падкрэслівалася неабходнасць такой евангелізацыі, якая адкрыта звярнула б увагу на культурныя, грамадскія, палітычныя і эканамічныя абставіны, такія як празмерная роля рынкавай логікі, якая ўскладняе сямейнае жыццё, вядзе да дыскрымінацыі, беднасці, выключэння і гвалту. Таму трэба развіваць дыялог і сапраўднае супрацоўніцтва з грамадскімі структурамі, а таксама заахвочваць і падтрымліваць свецкіх асобаў, каб яны як хрысціяне ўдзельнічалі ў культурным і грамадска-палітычным жыцці“[231].

202. „Галоўны ўклад у пастырства сем'яў робіць парафія, якая з'яўляецца сям'ёй сем'яў, у якой гарманічна ўдзельнічаюць малыя супольнасці, рухі і касцёльныя таварыствы“[232]. Разам з адмыслова скіраваным на сем'і пастырствам мы бачым таксама неабходнасць „больш адпаведнай фармацыі прэзбітэраў, дыяканаў, законнікаў і законніц, катэхетаў, а таксама іншых працаўнікоў пастырства“[233]. У адказах на пытанні, якія былі разасланыя па ўсім свеце, падкрэслівалася, што святарам часта не хапае адпаведнай фармацыі для вырашэння сённяшніх складаных сямейных праблем. У гэтым можа таксама быць карысным вопыт усходняй традыцыі жанатых святароў.

203. Семінарысты павінны мець доступ да больш шырокай міждысцыплінарнай фармацыі, якая датычыць заручынаў і сужэнства, а не толькі дактрыны. Больш за тое, фармацыя не заўсёды дазваляе ім развіваць сваю псіхіку і пачуцці. Некаторыя жывуць досведам сваёй скалечанай сям'і, у якой бацькі

[231] *Тамсама*, 38.
[232] *Relatio finalis* 2015, 77.
[233] *Тамсама*, 61.

адсутнічалі, і з пачуццём эмацыянальнай нестабільнасці. Падчас фармацыі трэба гарантаваць працэс сталення, каб будучыя святары мелі неабходную для іх паслугі псіхічную раўнавагу. Сямейныя повязі маюць асноўнае значэнне для ўмацавання ўласнай самаацэнкі семінарыстаў. Таму важна, каб сем'і спадарожнічалі ўсяму семінарыйнаму працэсу і на шляху да святарства, бо яны насамрэч умацоўваюць іх. Вырашальнае значэнне ў гэтым мае спалучэнне жыцця ў семінарыі з момантамі жыцця парафіі, што дазволіць глыбей пазнаёміцца з канкрэтнай рэальнасцю сем'яў. Тым больш, што на працягу ўсяго пастырскага жыцця святары сустракаюцца перадусім з сем'ямі. „Прысутнасць свецкіх асобаў і сем'яў, асабліва прысутнасць жанчын у святарскай фармацыі дапамагае ацаніць разнароднасць і камплементарнасць розных пакліканняў у Касцёле“[234].

204. Адказы на пытанні анкеты станоўча сведчаць таксама пра неабходнасць фармацыі свецкіх працаўнікоў пастырства пры дапамозе псіхолагаў і педагогаў, сямейных лекараў, лекараў хуткай медыцынскай дапамогі, сацыяльных работнікаў, куратараў сем'яў і непаўналетніх, гатовых прыняць вопыт псіхалогіі, сацыялогіі, сексалогіі, а таксама кансультацый. Спецыялісты, асабліва тыя, хто мае вопыт суправаджэння, дапамагаюць прымяняць пастырскія прапановы да рэальных сітуацый і канкрэтных сямейных клопатаў. „Праграмы і фармацыйныя курсы для асобаў, якія працуюць у пастырстве, павінны дапамагчы ім уключыць саму праграму падрыхтоўкі да сужэнства ў больш шырокую дынаміку касцёльнага жыцця“[235].

[234] *Тамсама.*
[235] *Тамсама.*

Добрая пастырская падрыхтоўка з'яўляецца вельмі важнай „асабліва ў святле спецыфічных надзвычайных сітуацый, якія вынікаюць з хатняга насілля і сексуальных злоўжыванняў“[236]. Усё гэта ніякім чынам не змяншае, а наадварот дапаўняе асноўную каштоўнасць духоўнага кіраўніцтва побач з каштоўным духоўным багаццем Касцёла і сакрамэнтальнага паяднання.

## Суправаджэнне нарачоных на шляху падрыхтоўкі да сужэнства

205. Айцы Сінода шматразова казалі, што трэба дапамагчы маладым людзям адкрыць каштоўнасці і багацце сужэнства[237]. Яны павінны мець магчымасць адкрыць прывабнасць поўнай еднасці, якая ўзвышае і ўдасканальвае грамадскае вымярэнне жыцця, якая прызнае найцудоўнейшае значэнне сексуальнасці і адначасова падтрымлівае дабро дзяцей, забяспечвае найлепшыя ўмовы для іх сталення і выхавання.

206. „Складаная сацыяльная рэчаіснасць і праблемы, з якімі цяпер сустракаецца сям'я, патрабуюць большага ўдзелу ўсёй хрысціянскай супольнасці ў падрыхтоўцы нарачоных да сужэнства. Трэба нагадаць пра значэнне цнотаў. Сярод іх — чыстасць, якая з'яўляецца каштоўнай умовай сапраўднага развіцця міжасабовай любові. Айцы Сінода былі згодныя, што існуе неабходнасць большага ўдзелу ўсёй супольнасці, аднак асабліва значэнне мае сведчанне саміх сем'яў, а таксама ўключэнне падрыхтоўкі да сужэнства

[236] *Тамсама.*
[237] Пар. *Relatio Synodi* 2014, 26.

ў працэс хрысціянскага ўтаямнічання з падкрэсліваннем сувязі сужэнства з хростам і іншымі сакрамэнтамі. Адзначалася таксама неабходнасць адмысловых праграм падрыхтоўкі да сужэнства, якія давалі б сапраўдны ўдзел у касцёльным жыцці і паглыблялі б розныя аспекты сямейнага жыцця“[238].

207. Заахвочваю хрысціянскія супольнасці прызнаць, што суправаджэнне нарачоных па шляху іх любові карысна для іх. Італьянскія біскупы справядліва пацвердзілі, што асобы, якія заключаюць сужэнства, з'яўляюцца для хрысціянскай супольнасці „каштоўным багаццем, бо шчыра ўключаюцца ва ўзрастанне ў любові і ва ўзаемны дар і могуць прычыніцца да адновы ўсёй тканкі касцёльнага арганізма: асаблівая форма сяброўства, якой яны жывуць, можа ўплываць на іншых і развіваць сяброўства і братэрства хрысціянскай супольнасці, да якой яны належаць“[239]. Існуе шмат аўтарызаваных спосабаў арганізацыі непасрэднай падрыхтоўкі да сужэнства, і кожны мясцовы Касцёл вырашае, які з іх найлепшы, каб даць адпаведную фармацыю, якая пры гэтым не знеахвоціць маладых да сакрамэнту. Не маецца тут на ўвазе прадстаўленне ім усяго катэхізісу або насычэнне іх празмернымі праблемамі, бо і ў гэтым выпадку праўдай ёсць тое, што „не аб'ём ведаў, але ўнутранае настаўленне і смакаванне рэчаў задавольвае і насычае душу“[240]. Галоўнае не колькасць, але якасць, і ў першую чаргу трэба падаць — адначасова з адноўленым прапаведаваннем *керыгмы* — тое, што перааказваецца прывабна і па-ся-

[238] *Тамсама*, 39.

[239] Канферэнцыя Епіскапату Італіі, Commissione Episcopale per la famiglia e la vita, *Orientamenti pastorali sulla preparazione al matrimonio e alla famiglia* (22 кастрычніка 2012), 1.

[240] Ignazio di Loyola, *Esercizi Spirituali*, annotazione 2.

броўску, і дапаможа ім распачаць „велікадушна і свабодна“[241] працэс, які будзе трываць усё жыццё. Гэта нешта накшталт „ініцыяцыі“ у сакрамэнт сужэнства, які дасць ім неабходныя элементы для прыняцця яго з найлепшай гатоўнасцю і распачацця сямейнага жыцця на трывалых падмурках.

208. Акрамя гэтага, трэба знайсці спосабы, дзякуючы місійным сем’ям, сем’ям нарачоных і розным пастырскім сродкам, каб прапанаваць далейшую падрыхтоўку, якая б умацавала іх каханне дзякуючы суправаджэнню, напоўненаму блізкасцю і сведчаннем. Карыснымі часта становяцца групы нарачоных, а таксама прапанова прыняць дабравольны ўдзел у канферэнцыях на розныя тэмы, сапраўды актуальныя для маладых. Неабходнымі, аднак, з’яўляюцца некаторыя індывідуалізаваныя падзеі, беручы пад увагу, што іх галоўная мэта — дапамагчы кожнаму навучыцца любіць гэтую канкрэтную асобу, з якой мае намер быць усё жыццё. Вучэнне любові не з’яўляецца нейкай імправізацыяй, і не можа абмяжоўвацца кароткімі перадсужэнскімі курсамі. На самай справе кожны рыхтуецца да сужэнства з моманту свайго нараджэння. Усё тое, чым адарыла яго сям’я, павінна навучыць уласнай гісторыі і зрабіць здольным да прыняцця поўнага і канчатковага абавязацельства. Верагодна, найлепш падрыхтаванымі да заключэння сужэнскага саюзу з’яўляюцца людзі, якія атрымалі ад сваіх бацькоў прыклад хрысціянскага сужэнства, у якім абое выбралі адно аднаго безумоўна і пастаянна аднаўляюць гэтае рашэнне. Таму ўсе пастырскія ініцыятывы, накіраваныя на тое, каб дапамагчы сужэнцам узрастаць у любові і ажыццяўляць Евангелле ў сям’і,

[241] *Тамсама*, annotazione 5.

з'яўляюцца неацэннымі ў падрыхтоўцы іх дзяцей да будучага сужэнскага жыцця. Нельга таксама забываць пра каштоўны ўклад публічнага пастырства. У якасці простага прыкладу нагадваю пра дзень св. Валянціна, які ў некаторых краінах лепш выкарыстоўваецца гандлярамі, чым натхняе на творчае дзеянне пастыраў.

209. Падрыхтоўка ўжо заручаных асобаў, калі парафіяльная супольнасць можа іх суправаджаць, павінна даць ім магчымасць пазнаць несумяшчальнасць і пагрозы. Дзякуючы гэтаму можна ўбачыць неразважлівасць такіх адносінаў і прадухіліць прадбачанае расчараванне, якое будзе мець вельмі балючыя наступствы. Складанасць заключаецца ў тым, што першаснае захапленне намагаецца не заўважаць гэтага або па-іншаму глядзець на многія рэчы, пазбягаць нязгодаў і такім чынам адкладаць цяжкасці на будучыню. Трэба заахвоціць нарачоных і дапамагчы ім выявіць тое, чаго кожны чакае ад патэнцыяльнага сужэнства, свой спосаб разумення, чым з'яўляецца любоў і яе прыняцце, чаго чакае ад іншай асобы, які тып сумеснага жыцця хоча планаваць. Такія размовы дазволяць заўважыць, што на самай справе няшмат ёсць агульнага і што недастаткова аднаго толькі ўзаемнага захаплення для захавання саюзу. Няма нічога больш зменнага, няпэўнага і непрадказальнага за пажадлівасць, і ніколі нельга падштурхоўваць да заключэння сужэнства, калі няма іншых больш глыбокіх матывацый, якія даюць гэтым нарачоным рэальную стабільнасць.

210. У любым выпадку, калі будуць выразна пазнаныя слабасці іншай асобы, то трэба рэальна спадзявацца, што можна ёй дапамагчы развіць найлепшыя якасці, каб ураўнаважыць цяжар яе слабасці становічай

зацікаўленасцю ў падтрыманні яе як чалавека. Гэта звязана з прыняццем і моцнай воляй згадзіцца на некаторыя вырачэнні, цяжкія хвіліны і канфліктныя сітуацыі, а таксама дэтэрмінацыю, каб да гэтага падрыхтавацца. Трэба ўмець заўважыць сігналы перасцярогі перад пагрозай для адносінаў, каб перад шлюбам знайсці сродкі для іх паспяховага прадухілення. На жаль, многія прыходзяць да шлюбу, не ведаючы добра адно аднаго. Яны толькі разам весяліліся, мелі агульны досвед, але яны не сутыкнуліся з праблемамі, каб ўзаемна паказаць саміх сябе і даведацца, кім насамрэч з'яўляецца другая асоба.

211. Як бліжэйшая падрыхтоўка, так і больш доўгае суправаджэнне павінны пераканаць нарачоных, што заключэнне сужэнства — гэта не канец дарогі. Яны павінны зразумець, што сужэнства — гэта пакліканне, якое патрабуе станоўчага і рэальнага рашэння разам прайсці праз усе выпрабаванні і цяжкія хвіліны. Пастырства падрыхтоўкі да сужэнства і сужэнскае пастырства павінны быць найперш пастырствам саюзу, у які ўносяцца элементы, што дапамагаюць не толькі ў сталенні любові, але таксама ў пераадоленні цяжкіх хвілінаў. Гэтым укладам з'яўляюцца не толькі дактрынальныя перакананні. Не можа яно абмяжоўвацца толькі паказваннем каштоўных духоўных багаццяў, якія заўсёды прапануе Касцёл, але трэба паказваць таксама практычныя шляхі, парады, укаранёныя ў рэаліях, стратэгіі, узятыя з досведу, псіхалагічныя кансультацыі. Усё гэта стварае педагогіку любові, якая не можа быць абыякавай да сённяшніх пачуццяў маладых людзей, каб духоўна мабілізаваць іх. Пры падрыхтоўцы нарачоных трэба было б таксама паказаць ім месцы і людзей, кансультантаў або сем'і, гатовыя ім дапамагчы, калі з'явяцца цяжкасці. Аднак ніколі нельга

забываць пра сакрамэнт паяднання, які дазваляе абмыць грахі і памылкі папярэдняга жыцця і гэтых адносінаў у міласэрнасці Бога, які прабачае, і ў Яго аздараўляльнай моцы.

*Падрыхтоўка ўрачыстасці*

212. Бліжэйшая падрыхтоўка да сужэнства засяроджваецца на запрашэннях, адзенні, вяселлі і безлічы дэталяў, якія паглынаюць не толькі шмат эканамічных сродкаў, але таксама энергіі і радасці. Нарачоныя прыходзяць на шлюб задыханыя і вычарпаныя, замест таго, каб прысвяціць найлепшыя сілы на падрыхтоўку зрабіць разам як пара вялікі крок. Такі менталітэт можна сустрэць таксама ў некаторых нефармальных саюзах, якія не могуць рашыцца заключыць сакрамэнтальнае сужэнства, бо думаюць пра выдаткі на арганізацыю сужэнства замест таго, каб аддаць перавагу ўзаемнай любові і яе фармалізацыі перад іншымі. Дарагія нарачоныя, майце мужнасць быць іншымі, не падпарадкоўвайцеся спажывецкаму грамадству і фальшу, бо важнае толькі каханне, якое лучыць вас, умацаванае і асвячанае ласкай. Вы здольныя выбраць сціплае і простае вяселле, каб паставіць каханне панад усім. Працаўнікі пастырства і ўся супольнасць могуць дапамагчы, каб такі прыярытэт стаў нормай, а не выключэннем.

213. У непасрэднай падрыхтоўцы важна растлумачыць нарачоным сэнс кожнага жэсту падчас літургічнай цэлебрацыі, каб дапамагчы ім зразумець і адчуць яе. Нагадаем, што такое вялікае абавязацельства, якое выяўляецца ў сужэнскай згодзе і з’яднанні цела, што дапаўняе сужэнства, калі маюцца на ўвазе двое ахрышчаных, можа інтэрпрэтавацца толькі як

знак любові Божага Сына, які стаўся целам і з'яднаўся са сваім Касцёлам у запавеце любові. У ахрышчаных словы і жэсты пераменяюцца ў мову, якая паказвае веру. Цела ў сваёй сутнасці, закладзенай Богам падчас яго стварэння, „становіцца моваю распарадчыкаў, якія разумеюць, што ў сужэнскім саюзе мужчыны і жанчыны менавіта праз «мову цела» выяўляецца і рэалізуецца таямніца“[242].

214. Здараецца, што нарачоныя не заўважаюць тэалагічнага і духоўнага значэння згоды, якая раскрывае сэнс усіх наступных жэстаў. Варта падкрэсліць, што гэтыя словы не могуць быць абмежаваныя цяперашнім часам. Яны вядуць да пэўнай татальнасці, якая ахоплівае будучыню: „пакуль смерць нас не разлучыць“. Сэнс згоды ў тым, што „свабода і вернасць не супярэчаць сабе, наадварот падтрымліваюцца ўзаемна, як у міжасабовых адносінах, так і ў грамадскіх. Падумаем пра шкоду, якую ў цывілізацыях глабальнай інфармацыі выклікае інфляцыя нястрыманых абяцанняў у розных сферах і паблажкі для тых, хто не захоўвае дадзенага слова і не выконвае прынятыя абавязацельствы! [...] Стрыманне дадзенага слова, абяцання нельга купіць ці прадаць. Нельга прымусіць да гэтага сілай, але і выканаць іх без ахвярнасці немагчыма“[243].

215. Біскупы Кеніі падкрэслілі, што „многія маладыя засяроджваюцца на дні свайго шлюбу, забываючы пра адданне на ўсё жыццё, што праз хвіліну выкажуць“[244].

[242] Ян Павел II, *Катэхеза* (27 чэрвеня 1984), 4: *Insegnamenti* VII, 1 (1984), 1941.
[243] *Катэхеза* (21 кастрычніка 2015): *L'Osservatore Romano*,22 ottobre 2015, p. 12.
[244] Канферэнцыя Епіскапату Кеніі, *Messaggio di Quaresima* (18 лютага 2015).

Трэба дапамагчы ім зразумець, што сакрамэнт — гэта не толькі нейкі момант, які потым стане часткай мінулага і ўспамінаў, але момант, які мае трывалы ўплыў на ўсё сужэнскае жыццё[245]. Пракрэацыйнае значэнне сексуальнасці, мова цела і жэсты любові, якія маюць месца ў гісторыі сужэнскай пары, становяцца „пастаянным працягам мовы літургіі“, а „сужэнскае жыццё ў сваю чаргу становіцца літургіяй“[246].

216. Можна таксама пры дапамозе біблійных чытанняў разважаць і ўзбагачаць значэнне перадаваемых шлюбных пярсцёнкаў або іншых знакаў, якія з'яўляюцца часткай абраду. Дрэнна таксама, калі нарачоныя прыходзяць на шлюб, не памаліўшыся разам адно за аднаго і не папрасіўшы Бога аб дапамозе быць вернымі і шчодрымі, калі разам не пытаюцца ў Бога, чаго Ён чакае ад іх, а таксама не даручаюць сваё каханне перад абразом Марыі. Тыя, хто суправаджае іх у падрыхтоўцы да сужэнства, павінны так іх накіраваць, каб яны ўмелі перажываць гэтыя хвіліны малітвы, якія могуць ім даць вельмі шмат добрага. „Літургія сакрамэнту сужэнства — гэта непаўторная падзея, якая адзначаецца ў атмасферы сямейнага і супольнага святкавання. Першы цуд, здзейснены Езусам, адбыўся ў Кане Галілейскай: добрае віно цуду Пана, якое напаўняе радасцю нараджэнне новай сям'і, — гэта новае віно Запавету Хрыста з мужчынамі і жанчынамі ўсіх часоў. [...] Часта цэлебрант мае магчымасць звярнуцца да супольнасці, у якой ёсць людзі, якія рэдка ўдзельнічаюць у касцёльным жыцці або належаць да іншай

[245] Пар. Пій XI, Энц. *Casti connubii* (31 снежня 1930): *AAS* 22 (1930), 583.
[246] Ян Павел II, *Катэхеза* (4 ліпеня 1984), 3.6: *Insegnamenti* VII, 2 (1984), 9.10.

хрысціянскай ці рэлігійнай супольнасці. Гэта каштоўная магчымасць для абвяшчэння Евангелля Хрыста“[247].

## Суправаджэнне ў першыя гады сужэнскага жыцця

217. Вялікае значэнне мае разуменне, што сужэнства — гэта справа кахання, што могуць злучыцца толькі асобы, якія адно аднаго выбіраюць і кахаюць. Але, калі каханне становіцца толькі пажадлівасцю або невыразным пачуццём, тады сужэнцы адчуваюць незвычайную слабасць, калі заканчваюцца эмоцыі і фізічная цяга. Паколькі гэтыя непаразуменні здараюцца часта, неабходным становіцца суправаджэнне сужэнцаў у першыя гады сумеснага жыцця, каб узбагаціць і паглыбіць свядомы і свабодны выбар прыналежнасці адно аднаму і кахання аж да канца. Часта перыяду заручынаў недастаткова, рашэнне заключыць саюз з розных прычын прыспешваецца, у той час як сталенне маладых людзей запавольваецца. Таму маладыя павінны працягнуць гэты працэс, які не быў завершаны ў перыяд заручынаў.

218. З другога боку хачу падкрэсліць, што выклікам для пастырства сем’яў з’яўляецца дапамога ў разуменні таго, што сужэнства не можа ўспрымацца як штосьці завершанае. Саюз з’яўляецца рэальным, яго нельга адклікаць, ён пацверджаны і асвячаны ў сакрамэнце сужэнства. Аднак сужэнцы праз з’яднанне становяцца творцамі ўласнай гісторыі і праекту, які трэба сумесна развіваць. Позірк скіроўваецца *ў будучыню,* якую трэба будаваць дзень за днём з дапамогаю Божай ласкі,

[247] *Relatio finalis* 2015, 59.

і менавіта таму ад сужэнца не патрабуецца дасканаласці. Мы павінны адкласці ў бок ілюзіі і прыняць яго такім, якім ён ёсць. Няспынная крытыка сужэнца кажа пра тое, што сужэнства не разглядаецца як праект, які трэба развіваць разам з цярплівасцю, зразуменнем, талерантнасцю і велікадушнасцю. У выніку любоў паступова замяняецца інквізітарскім і бязлітасным позіркам, кантролем заслугаў і правоў кожнага, прэтэнзіямі, канкурэнцыяй і самаабаронай. Такім чынам сужэнцы становяцца няздольнымі падтрымліваць адно аднаго дзеля ўзаемнага сталення і развіцця саюзу. Маладым сужэнствам трэба паказаць гэта з самага пачатку ў рэальным святле, каб зразумелі, што „яны толькі пачынаюць“. Сказанае разам „так“ — гэта пачатак супольнай дарогі, мэта якой можа перавышаць тое, што дыктуецца абставінамі і магчымымі перашкодамі. Атрыманае благаслаўленне з’яўляецца ласкай і імпульсам на гэтым адкрытым шляху. Часта дапамагае, калі сужэнцы разам сядаюць, каб паразмаўляць і выпрацаваць канкрэтны план з яго мэтамі, прыладамі і дэталямі.

219. Нагадваю прыказку, якая кажа, што стаячая вада псуецца, становіцца тухлай. Так здараецца, калі жыццё любові ў першыя гады сужэнства знаходзіцца ў стане стагнацыі, губляе дынамізм, не мае таго неспакою, які вядзе яе наперад. Супольны танец з энергіяй маладой любові, той танец з зачараванымі вачыма, танец да надзеі, не можа спыняцца. У час заручын і ў першыя гады сужэнства надзея мае ў сабе моц закваскі, з’яўляецца тым, што змушае глядзець шырэй за супярэчлівасці, канфлікты, кан’юнктуру; што заўсёды дазваляе бачыць перспектыву. Яна запускае ў рух кожны неспакой, каб трываць у развіцці. Сама надзея заахвочвае нас жыць у поўні цяперашняй хвіліны, каб

усім сэрцам увайсці ў сямейнае жыццё, бо найлепшым спосабам падрыхтоўкі і ўмацавання будучыні з'яўляецца добрае жыццё ў сапраўдны момант.

220. Распачаць супольную дарогу — гэта значыць прайсці праз розныя этапы, якія патрабуюць велікадушнага асабістага дару: ад пачатковага захаплення, якому характэрна выключна пачуццёвая пажадлівасць, да адчування патрэбы ў іншай асобе, якая ўспрымаецца як частка асабістага жыцця. Так здзяйсняецца пераход ад смакавання ўзаемнай прыналежнасці да разумення ўсяго жыцця як супольнага праекта, да здольнасці ставіць на першае месца шчасце іншай асобы, а не свае патрэбы і радасці, да разумення, што ўласнае сужэнства з'яўляецца дабром для грамадства. Сталенне любові спалучана таксама з тым, каб навучыцца „весці перамовы". Гэта не карыслівая пастава ці гульня камерцыйнага тыпу, але спаўненне ўзаемнай любові, бо гэтыя перамовы з'яўляюцца перапляценнем узаемных дароў і выракчэнняў дзеля дабра сям'і. На кожным новым этапе сужэнскага жыцця мы павінны рабіць перагляд дамоўленасцяў, каб не было пераможцаў і пераможаных, але каб абое перамаглі. Рашэнні ў доме не павінны прымацца аднабакова, бо абое адказваюць за сям'ю, хоць кожны дом з'яўляецца непаўторным і кожнае сужэнства іншае.

221. Адна з прычын распаду сужэнства — празмерна высокія чаканні, якія датычаць сужэнскага жыцця. Калі настае рэчаіснасць, больш абмежаваная і праблематычная за тую, аб якой былі мары, выйсцем становіцца не хуткае прыняцце рашэння і безадказныя думкі пра сепарацыю, але распачацце сужэнства як працэсу сталення, у якім кожны з сужэнцаў з'яўляецца прыладаю Бога, дапамагаючы іншаму ва ўзрастанні. Магчымай

становіцца перамена, узрастанне, развіццё добрых магчымасцяў, якія кожны мае ў сабе. Кожнае сужэнства — гэта „гісторыя збаўлення“, якая ўлічвае тое, што сужэнства нараджаецца ў слабасці, якая дзякуючы Божаму дару, а таксама творчай і шчодрай рэакцыі пастунова саступае месца штораз больш сур'ёзнай і прыгожай рэчаіснасці. Магчыма, найбольшым заданнем мужчыны і жанчыны ў любові з'яўляецца тое, каб кожны з іх станавіўся больш мужчынам і больш жанчынай, а таксама, каб дапамагалі адно аднаму ў развіцці і ўмацаванні ў сваёй тоеснасці. Таму любоў рэалізуецца праз асабісты ўдзел. Калі чытаем фрагмент Бібліі пра стварэнне мужчыны і жанчыны, бачым спачатку Бога, які стварае мужчыну (пар. *Быц* 2, 7), а затым заўважае, што не хапае чагосьці істотнага, і фармуе жанчыну. Толькі тады бачыць здзіўленне мужчыны: „Ах так, гэта нарэшце..!“ Пасля чаго мы як бы чуем цудоўны дыялог, у якім мужчына і жанчына адкрываюцца адно перад адным. Нават у цяжкія хвіліны другі чалавек надалей здзіўляе, так адчыняюцца новыя дзверы для сустрэчэ, быццам бы гэта было першы раз. На кожным новым этапе яны пастаянна ўзаемна фарміруюцца наноў. У выніку любові хтосьці чакае другога і трэніруе сваю цярплівасць рамесніка, якую ўнаследаваў ад Бога.

222. Суправаджэнне павінна заахвочваць сужэнцаў быць шчодрымі ў перадаванні жыцця. „Згодна з асабовым і цалкам чалавечым характарам сужэнскай любові, адпаведным спосабам планавання сям'і з'яўляецца ўзаемны дыялог паміж сужэнцамі, які дазваляе ўзгодніць рашэнні, трымацца перыядаў пладнасці, а таксама шанаваць годнасць сужэнца і сужонкі. У гэтым сэнсе павінны быць прачытаныя наноў энцыкліка *Humanae vitae* (пар. 10-14) і апостальская адгартацыя *Familiaris consortio* (пар. 14; 28-35), каб абу-

дзіць гатоўнасць да пракрэацыі насуперак менталітэту, часта варожага жыццю [...]. Адказнае бацькоўства прадугледжвае фарміраванне сумлення, якое з'яўляецца таемным асяродкам чалавека і яго святыняй, дзе ён знаходзіцца сам-насам з Богам, голас якога гучыць у глыбіні яго душы (пар. *Gaudium et spes*, 16). Чым больш сужэнцы стараюцца слухаць у сваім сумленні Бога і Яго наказы (пар. *Быц* 2, 15) і падпарадкоўваюцца духоўнаму суправаджэнню, тым больш іх рашэнне будзе свабодным ад суб'ектыўнага меркавання і ад прыстасавання да паводзінаў іх асяроддзя"[248]. Застаецца актуальным сцвярджэнне Другога Ватыканскага Сабору, што сужэнцы „павінны ва ўзаемнай згодзе і супольнымі намаганнямі фарміраваць у сабе правільны погляд наконт гэтага, улічваючы як сваё ўласнае дабро, так і дабро ўжо народжаных ці чаканых дзяцей і распазнаючы як матэрыяльныя, так і духоўныя ўмовы часу і жыццёвага становішча; урэшце, улічваючы дабро сямейнай супольнасці, грамадства і самога Касцёла. Канчаткова гэтае рашэнне сужэнцы павінны самі прымаць перад Богам"[249]. З другога боку, Касцёл „заахвочвае карыстацца метадамі, якія абапіраюцца на «натуральных цыклах плоднасці» (*Humanae vitae*, 11). Трэба звярнуць увагу, што «гэтыя метады ўшаноўваюць цела сужэнцаў, заахвочваюць да ўзаемнай чуласці і спрыяюць выхаванню да сапраўднай свабоды» (*Катэхізіс Каталіцкага Касцёла*, 2370). Заўсёды трэба падкрэсліваць, што дзеці з'яўляюцца цудоўным дарам Бога, радасцю для бацькоў і для Касцёла. Праз іх Пан аднаўляе свет"[250].

[248] *Тамсама*, 63.
[249] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 50.
[250] *Relatio finalis* 2015, 63.

223. Айцы Сінода падкрэслілі, што „першыя гады сужэнства з’яўляюцца надзвычай істотным і важным перыядам, падчас якога сужэнцы больш усведамляюць выклікі і значэнне сужэнства. Таму неабходна пастырскае суправаджэнне, якое б працягвалася пасля цэлебрацыі сакрамэнту (пар. *Familiaris consortio*, частка III). Аказваецца, вельмі вялікае значэнне мае ў гэтым пастырстве прысутнасць дасведчаных сужэнстваў. Парафія — гэта тое месцам, дзе дасведчаныя пары могуць служыць малодшым, з магчымым саўдзелам таварыстваў, касцёльных рухаў і новых супольнасцяў. Трэба заахвочваць сужэнцаў да фундаментальнага прыняцця вялікага дару дзяцей. Трэба падкрэсліць значэнне духоўнасці сям’і, малітвы і ўдзелу ў нядзельнай Эўхарыстыі, заахвочваючы пары рэгулярна сустракацца дзеля падтрымкі ў развіцці духоўнага жыцця і салідарнасці ў канкрэтных жыццёвых патрэбах. Згадвалася, што літургія, набажэнствы і Эўхарыстыя, якія адбываюцца для сем’яў, асабліва ў гадавіну шлюбу, маюць істотнае значэнне для таго, каб сям’я падтрымлівала евангелізацыю“[251].

224. Гэтая дарога ёсць пытаннем часу. Любоў патрабуе часу бескарыслівасці і гатоўнасці, які іншыя рэчы ставіць на другім плане. Неабходны час, каб размаўляць, каб абняцца, не спяшаючыся, каб дзяліцца сваімі планамі, каб выслухоўваць адно аднаго, паглядзець у вочы, пахваліць, каб умацаваць адносіны. Нярэдка праблемай з’яўляецца шалёны тэмп грамадства або час, які забіраюць працоўныя абавязацельствы. Яшчэ адна праблема заключаецца ў тым, што час, які пра-

[251] *Relatio Synodi* 2014, 40.

водзім разам, пусты. Мы маем толькі адну фізічную прастору і не звяртаем увагі адно на аднаго. Працаўнікі пастырства і сямейныя групы павінны дапамагчы маладым або слабым сужэнцам навучыцца сустракацца ў такія моманты, тварам у твар, а таксама дзяліць хвіліны маўчання, якія патрабуюць адчування прысутнасці свайго сужэнца або сужонкі.

225. Сужэнцы, якія маюць вялікі вопыт у „набыцці навыкаў" у гэтай сферы, могуць прапанаваць практычныя сродкі, якія дапамаглі ім: планаванне часу, каб бескарысліва быць разам, час рэкалекцый з дзецьмі, розныя спосабы святкавання важных мерапрыемстваў, агульныя сферы духоўнасці. Яны могуць таксама дапамагчы напоўніць гэтыя хвіліны зместам і значэннем, каб навучыцца лепшым адносінам. Гэта мае вялікае значэнне, калі знікае свежасць шлюбу. Бо калі не ведаем, што рабіць з агульным часам, адзін з сужэнцаў можа ў выніку шукаць сховішча ў тэхналогіі, выдумае іншыя абавязкі, будзе шукаць іншай падтрымкі або будзе пазбягаць непрыемнай інтымнасці.

226. Трэба таксама заахвочваць маладыя сужэнствы ствараць свае звычаі, якія даюць здаровае пачуццё стабільнасці і абароны, якія будуюцца як серыя штодзённых рытуалаў. Варта заўсёды раніцай пацалавацца, благаславіць адно аднаго вечарам, чакаць іншага і прывітаць яго, калі ён вяртаецца, часам выйсці разам, сумесна рабіць хатнюю працу. Аднак, калі наступае свята, варта перарваць звычаі, каб не згубіць магчымасць святкавання ў сям'і, каб радавацца і атрымліваць прыгожыя перажыванні. Маладое сужэнства патрабуе супольнага захаплення Божымі дарамі і супольнага ўмацавання запалу да жыцця. Калі мы ўмеем святкаваць, то гэтая здольнасць аднаўляе энергію любові,

вызваляе ад манатоннасці і напаўняе колерамі і надзеяй штодзённыя звычаі.

227. Мы, пастыры, павінны заахвочваць сем'і ўзрастаць у веры. Таму карысным будзе заклікаць іх да частай споведзі, духоўнага кіраўніцтва, удзелу ў рэкалекцыях. Трэба не забываць запрашаць іх праводзіць штотыднёвыя сямейныя малітвы, бо сям'я, якая сумесна моліцца, трывае разам. У сваю чаргу, калі мы наведваем дамы, то павінны запрасіць усіх членаў сям'і на хвіліну малітвы адзін за аднаго, а таксама даручыць сям'ю ў рукі Пана. Адначасова належала б заахвоціць кожнага з сужэнцаў да малітвы ў самоце перад Богам, бо кожны мае свае таемныя крыжы. Чаму не сказаць Богу пра тое, што непакоіць сэрца, чаму не прасіць Яго аб аздараўленні сваіх ранаў і аб святле, якога мы патрабуем для выканання сваіх абавязкаў? Айцы Сінода падкрэслілі, што „Божае слова з'яўляецца для сям'і крыніцаю жыцця і духоўнасці. Усё пастырства сем'яў павінна фарміравацца знутры і фарміраваць членаў хатняга Касцёла праз малітву і эклезіяльнае чытанне Святога Пісання. Божае слова з'яўляецца не толькі добрай навінай для асабістага жыцця асобаў, але таксама крытэрыем ацэнкі і святлом у распазнаванні розных праблем, з якімі сутракаюцца сужэнствы і сем'і"[252].

228. Можа здарыцца, што адзін з сужэнцаў неахрышчаны або не хоча жыць абавязацельствамі, якія вынікаюць з веры. У такім выпадку жаданне аднаго з сужэнцаў жыць і развівацца як хрысціянін, выклікае абыякавасць другога, што балюча перажываецца. Аднак нягледзячы на гэта можна знайсці некаторыя агульныя каштоўнасці, якія можна з энтузіязмам па-

[252] *Relatio Synodi* 2014, 44.

дзяляць і развіваць. У любым выпадку, любоў да няверуючага сужэнца, адорванне яго шчасцем, злагоджванне яго цярпенняў і дзяленне з ім жыцця з'яўляецца сапраўднай дарогай асвячэння. З іншага боку, любоў з'яўляецца дарам Бога, і там, дзе яна пашыраецца, дазваляе адчуць сваю пераўтваральную сілу, часамі таямнічым чынам, да такой ступені, што „няверуючы муж асвячаецца праз жонку, і жонка няверуючая асвячаецца праз мужа“ (*1 Кар* 7, 14).

229. Парафіі, рухі, школы і іншыя інстытуцыі Касцёла розным чынам могуць быць пасрэднікамі ў клопаце аб сям'і і ў яе ажыўленні. Напрыклад, пры выкарыстанні такіх сродкаў як: сустрэча сяброўскіх сужэнстваў ці па суседству, кароткія рэкалекцыі для сужэнстваў, канферэнцыі спецыялістаў на тэму вельмі канкрэтных праблемаў, звязаных з сямейным жыццём, цэнтры сужэнскай кансультацыі, дзейнасць місійных працаўнікоў, падрыхтаваных да размовы з сужэнцамі на тэму іх цяжкасцяў і надзей, месца развіцця духоўнасці, кансультацыя па розных сямейных сітуацыях (залежнасці, здрада, насілле ў сям'і), фармацыйныя курсы для бацькоў, якія маюць праблемных дзяцей, сямейныя сустрэчы. Парафіяльная канцылярыя павінна сардэчна прымаць і займацца тэрміновымі сямейнымі пытаннямі або арганізаваць сустрэчу з тым, хто можа дапамагчы ў вырашэнні гэтых пытанняў. Існуе таксама пастырская падтрымка, якую аказваюць сужэнскія групы, не толькі тыя, якія служаць, але і місійныя, малітоўныя, фармацыйныя і ўзаемадапамогі. Гэтыя групы ствараюць магчымасць для таго, каб даваць, дзяліцца вераю, каб сям'я была адкрытай для іншых. Адначасова гэтыя групы з'яўляюцца сродкам умацавання сужэнцаў і падтрымліваюць іх развіццё.

230. Гэта праўда, што многія сужэнствы знікаюць з хрысціянскай супольнасці пасля шлюбу, але мы часта марнуем некаторыя новыя нагоды, калі можам прапанаваць ім яшчэ раз прывабным спосабам ідэал хрысціянскага сужэнства і падрыхтаваць іх да суправаджэння. Маю на ўвазе, напрыклад, хрост дзіцяці, першую св. Камунію альбо ўдзел у пахаванні або шлюбе кагосьці з родных ці сябра. Амаль усе сужэнствы зноў з'яўляюцца пры гэтых нагодах, якія можна выкарыстаць лепш. Іншым спосабам кантакту з'яўляецца пастырскае наведванне сем'яў або перэгрынацыя абраза Маці Божай, якія дапамагаюць развіць пастырскі дыялог на тэму сямейнай сітуацыі. Карысным можа быць таксама даручэнне сталым сем'ям задання суправаджаць маладыя сужэнствы, якія жывуць па суседству, каб яны сустракаліся з імі, спадарожнічалі ім на пачатку іх сумеснага жыцця і прапаноўвалі шлях развіцця. Разам з тэмпам сучаснага жыцця большасць сужэнстваў не гатовыя часта сустракацца, але мы не можам абмяжоўвацца пастырствам нешматлікай эліты. Сёння пастырства сем'яў павінна быць асабліва місійным, ісці насустрач і быць блізка да людзей, а не абмяжоўвацца канвеерам курсаў, у якіх удзельнічае некалькі чалавек.

## Развеяць крызісы, трывогі і цяжкасці

231. Слова даецца тым, хто ў любові ўжо дасягнуў сталасці новага віна заручынаў. Калі віно састарэе разам з гэтым досведам, тады з'явіцца, расквітнее ва ўсёй паўнаце вернасць кожнай хвіліны жыцця. Гэта вернасць чакання і цярплівасці. Поўная вырачэнняў і радасці такая вернасць быццам бы пачынае квітнець ва ўзросце, калі ўсё становіцца „старым", а вочы блі-

шчаць, захапляючыся дзецьмі сваіх дзяцей. Так было спачатку, але цяпер гэта абдумана, з'яднана і стала, у штодзённым захапляльным адкрыцці дзень за днём, год за годам. Як вучыў св. Ян ад Крыжа, „ветэраны любові ўжо падрыхтаваныя і выпрабаваныя“. Таму не падлягаюць „ні бурлівым пачуццям, ні якому-небудзь знешняму запалу страсці і гарэння, але ў глыбіні душы каштуюць слодыч віна любові ў самой яго сутнасці, ужо спелага“[253]. Гэта азначае, што яны здольныя разам перамагаць крызісы і цяжкія хвіліны, не ўцякаючы ад праблемаў і не хаваючы цяжкасцяў.

*Праблема крызісаў*

232. Гісторыя сям'і нясе на сабе адбітак усіх відаў крызісаў, якія таксама з'яўляюцца часткай яе драматычнай прыгажосці. Трэба дапамагчы зразумець, што пераадолены крызіс не вядзе да менш інтэнсіўных адносінаў, але ўдасканальвае іх, кансалідуе і ўмацоўвае еднасць. Разам жывуць не для таго, каб быць штораз менш шчаслівымі, але каб навучыцца быць шчаслівымі па-новаму, зыходзячы з магчымасцяў, якія дае новы этап. Кожны крызіс вучыць, дазваляе паглыбіць інтэнсіўнасць сумеснага жыцця або адкрыць новае значэнне сужэнскага вопыту. Ні ў якім выпадку нельга пакорна мірыцца з лёсам і згаджацца на падзенне, непазбежнае пагаршэнне, пасрэднасць. Наадварот, калі сужэнства разумеецца як заданне, з якім звязана таксама пераадоленне перашкодаў, то кожны крызіс успрымаецца як магчымасць сустрэцца і разам піць найлепшае віно. Добрая рэч — дапамагаць сужэнцам, каб яны былі ў стане прыняць крызісы, якія могуць паўстаць, прыняць выклікі і ўбачыць іх ролю

[253] *Cantico spirituale* B, XXV, 11.

ў сямейным жыцці. Вопытныя і адукаваныя сужэнцы павінны быць гатовыя суправаджаць іншых у гэтым адкрыцці, каб крызісы іх не палохалі і не вялі да паспешлівых рашэнняў. У кожным крызісе ёсць добрая навіна, якую трэба ўмець пачуць, напружваючы слых сэрца.

233. Хуткая рэакцыя з'яўляецца супрацьстаяннем праблемам крызісу, заняццем абароны, калі мы адчуваем, што ён выходзіць з-пад нашага кантролю, бо паказвае недахоп нашага ладу жыцця, і гэта нам перашкаджае. Таму выкарыстоўваецца механізм адмаўлення праблем, укрывання іх, змяншэння іх значэння і разлічванне толькі на хаду часу. Аднак гэта адцягвае іх вырашэнне і вядзе да марнавання значнай часткі энергіі на непатрэбнае іх хаванне, што яшчэ больш ускладняе справу. Сувязь слабне, і ўзмацняецца адасабленне, якое наносіць шкоду інтымнасці. Крызіс, які не прымаецца, наймацней б'е па ўзаемаадносінах. Такім чынам, крок за крокам, „чалавек, якога люблю,“ становіцца „тым, хто заўсёды суправаджае мяне ў жыцці“, пасля толькі „айцом ці маці маіх дзяцей“, і, нарэшце, кімсьці чужым.

234. Для пераадолення крызіса патрэбна прысутнасць. Складанасць у тым, што людзі часам адасабляюцца, каб не паказваць таго, што адчуваюць, замыкаюцца ў нікчэмным і лжывым маўчанні. У такія моманты трэба імкнуцца да таго, каб гаварыць ад сэрца да сэрца. Праблема заключаецца ў тым, што намнога цяжэй так размаўляць у крызіснай сітуацыі, калі раней мы ніколі не вучыліся гэтаму. Гэта сапраўднае мастацтва, якому мы вучымся ў спакойныя моманты, каб у цяжкія хвіліны прымяніць гэта ў жыцці. Трэба дапамагчы адкрыць найбольш схаваныя ў сэрцах сужэнцаў прычыны і аднесціся да іх як да родаў, якія

мінуць і пакінуць пасля сябе новы скарб. Аднак адказы, атрыманыя ў выніку кансультацый, паказваюць, што ў цяжкіх ці крытычных сітуацыях большасць не звяртаецца за пастырскай дапамогай, бо не лічыць яе ўсебаковай, поўнай спачування, дзейснай і звязанай з жыццём. Таму цяпер пастараемся падысці да сужэнскіх крызісаў з такім настаўленнем, каб не ігнараваць іх цяжар болю і цярпення.

235. Існуюць паўсюдныя крызісы, якія зазвычай здараюцца ва ўсіх сужэнствах: крызіс пачатку, калі мы павінны навучыцца прымаць адрозненні і аддзяліцца ад бацькоў; або крызіс, звязаны з прыходам дзіцяці, з яго новымі эмацыянальнымі выклікамі; крызіс выхавання дзіцяці, якое змяняе звычкі бацькоў; крызіс падлеткавага ўзросту дзіцяці, якое патрабуе шмат энергіі, дэстабілізуе бацькоў, а часам канфліктуе з імі; крызіс „пустога гнязда“, які змушае сужэнцаў па-новаму паглядзець на сябе; крызіс, выкліканы старасцю бацькоў, якія патрабуюць большай прысутнасці, дагляду і прыняцця цяжкіх рашэнняў. Такія сітуацыі ставяць патрабаванні, выклікаюць страх, пачуццё віны, дэпрэсію або стомленасць і могуць значна паўплываць на сужэнства.

236. Да іх далучаюцца асабістыя крызісы, якія ўплываюць на сужэнства і звязаны з гаспадарчымі, прафесійнымі, эмацыянальнымі, грамадскімі і духоўнымі цяжкасцямі. Здараюцца таксама нечаканыя абставіны, якія могуць парушыць сямейнае жыццё і патрабуюць прабачэння і паяднання. У хвіліну, калі мы імкнемся зрабіць крок да прабачэння, кожны павінен задумацца ў ціхай пакоры, ці не спрычыніўся ён да нейкіх памылковых дзеянняў іншай асобы. Некаторыя сем’і пацярпелі паразу, калі сужэнцы ўзаемна абвінавачвалі

сябе, але „вопыт паказвае, што пры адпаведнай дапамозе і з паяднаўчым дзеяннем ласкі значны працэнт сужэнскіх крызісаў можна ў дастатковай ступені перамагчы. Асноўным вопытам у сямейным жыцці з’яўляецца ўменне прабачаць і атрымліваць прабачэнне“[254]. „Цяжкое мастацтва паяднання, для якога неабходна ласка, патрабуе велікадушнага супрацоўніцтва родных і знаёмых, а часам таксама знешняй і прафесійнай дапамогі“[255].

237. Частым стала, калі хтосьці адчувае, што не атрымаў жаданага або калі не спаўняюцца яго мары, то гэта здаецца яму дастатковай падставай для таго, каб сужэнства перастала існаваць. У выніку не будзе трывалага сужэнства. Часам для таго, каб сцвердзіць, што ўсё скончылася, дастаткова расчаравання, адсутнасці другой асобы ў хвіліну, калі была патрэбнай, дастаткова абражанага гонару або незразумелай боязі. Існуюць сітуацыі, уласцівыя непазбежнай чалавечай слабасці, якім адводзіцца занадта шмат эмоцый. Напрыклад, адчуванне, што нам недастаткова аддзячылі за нашыя пачуцці, зайздрасць, разыходжанні паміж дзвюма асобамі, прывабнасць іншых асобаў, новыя інтарэсы, якія авалодваюць сэрцам, фізічныя змены сужэнца або сужонкі, а таксама шмат іншых рэчаў, якія з’яўляюцца не толькі замахам на любоў, але магчымасцю, якая заахвочвае чарговы раз адкрыць яе.

238. У такіх абставінах некаторыя маюць дастатковую сталасць для аднаўлення выбару іншай асобы як спадарожніка жыцця нягледзячы на абмежаванне адносінаў і згаджаюцца з тым, што яна не можа выка-

[254] *Relatio Synodi* 2014, 44.
[255] *Relatio finalis* 2015, 81.

наць усіх жаданых мараў. Не лічаць сябе выключнымі мучанікамі, цэняць малыя ці абмежаваныя магчымасці, якія ім дае сямейнае жыццё, і імкнуцца ўмацаваць саюз, не шкадуючы часу і намаганняў. Бо ў душы прызнаюць, што кожны крызіс з'яўляецца як бы новым „так" і дапамагае ў адраджэнні любові ўмацаванай, пераменenай, сталай, больш мудрай. Выходзячы з крызісу мы маем адвагу шукаць глыбокія прычыны таго, што адбываецца, паўторна ўзгадніць асноўныя дамоўленасці, знайсці новую раўнавагу і разам распачаць новы этап. Дзякуючы такому стаўленню можна пераадолець многія цяжкія сітуацыі! Больш за тое, прызнаючы, што паяднанне з'яўляецца магчымым, мы сёння разумеем, што „асабліва неабходнай з'яўляецца служэнне тым, чыё сужэнства распалася"[256].

*Старыя раны*

239. Зразумела, што існуе шмат цяжкасцяў у сям'ях, калі адзін з яе членаў не пасталеў для наладжвання адносінаў, бо не аздаравіў раны з нейкага этапу свайго жыцця. Дрэннае дзяцінства і юнацтва з'яўляюцца прычынай асабістых крызісаў, якія ў выніку ўплываюць на сужэнства. Калі б усе людзі прайшлі нармальны працэс сталення, крызісы былі б менш частымі і менш балючымі. Аднак застаецца фактам, што часам людзі, нават у саракагадовым узросце, перажываюць працэс спозненага палавога сталення, якое павінны былі дасягнуць напрыканцы перыяду юнацтва. Здараецца, што мы любім эгацэнтрычнай любоўю, якая ўласціва дзіцяці, і тады скажаецца рэальнасць, капрызы кіруюць жыццём, і ўсё павінна канцэнтравацца вакол уласнага „я". Гэтую любоў немагчыма насыціць, яна

[256] *Тамсама*, 78.

крычыць і плача, калі не атрымлівае таго, чаго хоча. Іншым разам любяць любоўю, якая затрымалася на этапе падлеткавага ўзрастання, якое адзначаецца канфрантацыяй, з'едлівай крытыкай, звычкай вінаваціць іншых, логікай пачуццяў і фантазій, калі іншыя павінны запоўніць нашую пустку або падтрымліваць нашыя капрызы.

240. Многія людзі развітваюцца з дзяцінствам, ніколі не спазнаўшы безумоўнай любові, а гэта раніць іх здольнасць давяраць і быць самаадданымі. Дрэнныя адносіны з бацькамі і роднымі пакідаюць невылечны след, што выяўляецца зноў і шкодзіць сужэнскаму жыццю. Таму трэба прайсці працэс вызвалення, які ніколі раней не быў распачаты. Калі адносіны паміж сужэнцамі дрэнныя, то перад прыняццем важных рашэнняў трэба пераканацца, ці кожны прайшоў гэты працэс аздараўлення сваёй гісторыі. Для гэтага трэба прызнаць неабходнасць аздараўлення, пастаяннай просьбы аб ласцы прабачэння і даравання сабе, прыняцця дапамогі, адкрыцця станоўчых матывацый і спробы распачынаць заўсёды спачатку. Каб прызнаць, што яго спосаб перажывання любові мае рысы нясталасці, кожны павінен быць вельмі шчырым перад сабою. Нават, калі здаецца відавочным, што ўся віна ляжыць на іншай асобе, ніколі не ўдасца справіцца з крызісам, калі будзем чакаць, што зменіцца толькі другая асоба. Трэба таксама задаць сабе пытанне наконт таго, што кожны мог бы асабіста развіць або аздаравіць дзеля пераадолення канфлікту.

*Суправаджаць пасля распаду і разводу*

241. У некаторых выпадках захаванне сваёй годнасці і дабра дзяцей патрабуе рашэння пакласці рашучы

канец празмерным патрабаванням іншай асобы, вялікай несправядлівасці, насіллю або пастаянным знявагам. Трэба прызнаць, што „ёсць выпадкі, у якіх сепарацыя непазбежна. Часам яна можа стаць нават неабходнай з маральнага пункта гледжання, калі маецца на ўвазе менавіта абарона слабейшага сужэнца ці малых дзяцей ад больш сур’ёзных ранаў, выкліканых здзекамі і гвалтам, прыніжэннем і выкарыстаннем, адчужанасцю і абыякавасцю“[257]. Аднак „трэба лічыць яе апошнім сродкам, калі ўжо розныя разумныя ўздзеянні становяцца безвыніковымі“[258].

242. Айцы падкрэслілі, што „асаблівая развага неабходна для пастырскага суправаджэння асобаў, якія жывуць у сепарацыі, разведзеных ці пакінутых. У першую чаргу трэба выслухаць і ацаніць цярпенне тых, хто несправядліва пацярпеў ад сепарацыі, разводу або пакінутасці ці быў вымушаны, у выніку здзекаў з боку сужэнца, спыніць сумеснае жыццё. Прабачэнне несправядлівасці прыходзіць нялёгка, але з’яўляецца магчымым дзякуючы ласцы. Адсюль вынікае неабходнасць пастырства паяднання і пасрэдніцтва таксама пры дапамозе спецыялізаваных цэнтраў кансультацый, якія павінны з’явіцца ў дыяцэзіях“[259]. У той жа час, „разведзеных асобаў, якія, аднак, не заключылі новы сужэнскі саюз і часта з’яўляюцца сведкамі сужэнскай вернасці, трэба заахвочваць знаходзіць у Эўхарыстыі спажытак, які іх падтрымае. Мясцовая супольнасць і пастыры павінны клапатліва спадарожнічаць такім асобам, асабліва дзецям,

[257] *Катэхеза* (24 чэрвеня 2015): *L’Osservatore Romano,*25 giugno 2015, p. 8.

[258] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 83: *AAS* 74 (1982), 184.

[259] *Relatio Synodi* 2014, 47.

пераважна тады, калі яны знаходзяцца ў становішчы крайняй беднасці“[260]. Распад сужэнства становіцца больш траўматычным і балючым ва ўмовах беднасці, бо значна менш сродкаў маецца для пераарыентацыі жыцця. Бедны чалавек, які губляе ахоўнае сямейнае асяроддзе, удвая падвяргаецца пакінутасці і розным відам пагроз для сваёй цэласнасці.

243. Важна, каб разведзеныя асобы, якія жывуць у новых саюзах, адчувалі, што з'яўляюцца часткай Касцёла, што яны „не экскамунікаваныя“ і не ўспрымаюцца такімі, бо заўсёды ствараюць касцёльную супольнасць[261]. Гэтыя сітуацыі „патрабуюць уважлівага распазнавання і суправаджэння іх з вялікай павагай, пазбягаючы ўсялякай мовы і стаўлення, якія б далі ім адчуць, што іх прыцясняюць, а таксама падтрымання іх удзелу ў жыцці супольнасці. Клопат пра такіх асобаў не аслабляе веру хрысціянскай супольнасці і яе сведчання аб непарыўнасці сужэнства, але наадварот — праз гэты клопат яна выяўляе сваю любоў“[262].

244. З другога боку, многія айцы „падкрэслілі неабходнасць зрабіць яшчэ больш даступнымі і хуткімі, магчыма цалкам бясплатнымі, працэдуры сцвярджэння выпадкаў несапраўднасці [сужэнства]“[263]. Зацягванне працэсу раздражняе і стамляе людзей. Мае нядаўнія два дакументы на гэтую тэму[264] прывялі да спра-

[260] *Тамсама*, 50.

[261] Пар. *Катэхеза* (5 жніўня 2015): *L'Osservatore Romano*, 6 agosto 2015, p. 7.

[262] *Relatio Synodi* 2014, 51; пар. *Relatio finalis* 2015, 84.

[263] *Relatio Synodi* 2014, 48.

[264] Пар. Motu proprio *Mitis Iudex Dominus Iesus* (15 жніўня 2015): *L'Osservatore Romano*, 9 settembre 2015, pp. 3-4; Motu proprio *Mitis et Misericors Iesus* (15 жніўня 2015): *L'Osservatore Romano*, 9 settembre 2015, pp. 5-6.

шчэння працэдур для магчымай дэкларацыі несапраўднасці сужэнства. Пры іх дапамозе я хацеў таксама „выразна сцвердзіць, што біскуп асабіста ў сваім Касцёле, у якім устаноўлены пастырам і галавою, з'яўляецца суддзёю адносна даручаных яму верных“[265]. „Такім чынам, выкарыстанне гэтых дакументаў з'яўляецца вялікай адказнасцю для дыяцэзіяльных ардынарыяў, пакліканых асабіста вырашаць некаторыя справы і ў любым выпадку гарантаваць больш лёгкі доступ вернікаў да касцёльнага вымярэння справядлівасці. Гэта звязана з падрыхтоўкай дастатковай колькасці працаўнікоў, духавенства і свецкіх, якія б прысвяцілі сябе пераважна гэтаму касцёльнаму служэнню. Неабходна таксама запэўніць асобам, якія жывуць у сепарацыі ці ў сужэнстве, якое перажывае крызіс, паслугу інфармавання, кансультацыі і пасрэдніцтва, звязаную з пастырствам сем'яў, якой маглі б карыстацца таксама асобы перад дасудовым расследаваннем сужэнскага працэсу (пар. *Mitis Iudex*, арт. 2-3)“[266].

245. Айцы Сінода падкрэслілі таксама „наступствы сепарацыі або разводу для дзяцей, якія ў любым выпадку з'яўляюцца нявіннымі ахвярамі такой сітуацыі“[267]. Па-за ўсімі разважаннямі, якія хацелася б зрабіць, яны з'яўляюцца першым клопатам, які не можа пераўзысці ніякі іншы інтарэс або мэта. Бацькоў, якія жывуць у сепарацыі, прашу: „ніколі, ніколі, ніколі не стаўцеся да дзяцей як да закладнікаў! Вы разышліся з-за шматлікіх цяжкасцяў і прычын, жыццё паставіла перад вамі

[265] Motu proprio *Mitis Iudex Dominus Iesus* (15 жніўня 2015), preambolo, III: *L'Osservatore Romano*, 9 settembre 2015, p. 3.

[266] *Relatio finalis* 2015, 82.

[267] *Relatio Synodi* 2014, 47.

такія выпрабаванні, але няхай цяжар гэтай сепарацыі не падае на дзяцей, не выкарыстоўвайце іх як закладнікаў супраць другога сужэнца, няхай яны растуць, чуючы, што мама добра кажа пра тату, хоць яны не разам, і што тата добра кажа пра маму“[268]. Чымсьці безадказным з’яўляецца знішчэнне вобраза бацькі ці маці дзеля здабывання сімпатый дзіцяці, каб адпомсціць або абараніцца, бо гэта знішчыць духоўнае жыццё гэтага дзіцяці і нанясе раны, якія цяжка будзе вылечыць.

246. Касцёл, хоць і разумее канфліктныя сітуацыі, праз якія павінны прайсці сужэнцы, не можа перастаць быць голасам самых слабых, якімі з’яўляюцца церпячыя, часта ў маўчанні, дзеці. Я пытаюся, ці сёння „нягледзячы на нашую ўяўна развітую адчувальнасць і ўсе вытанчаныя псіхалагічныя аналізы мы не сталі абыякавымі да ранаў у душы дзяцей? [...] Ці адчуваем цяжар, які прыгнятае душу дзіцяці ў сем’ях, у якіх асобы дрэнна адносяцца адзін да аднаго і прычыняюць крыўды, і ў выніку разрываюць сувязь сужэнскай вернасці?“[269]. Гэты адмоўны вопыт не дапамагае дзецям сталець, каб у будучым мець здольнасць прымаць канчатковыя абавязацельствы. У гэтым сэнсе хрысціянскія супольнаці не павінны пакідаць у самоце разведзеных бацькоў, якія жывуць у новым саюзе. Наадварот, павінны іх уключаць і суправаджаць іх у іхняй выхаваўчай ролі. Бо „як бы мы маглі раіць гэтым бацькам рабіць усё, што ў іх сіле, дзеля выхавання дзяцей да хрысціянскага жыцця праз прыклад моцнай і жывой веры, калі б мы трымалі іх здалёк ад жыцця

[268] *Катэхеза* (20 мая 2015): *L’Osservatore Romano*, 21 maggio 2015, p. 8.
[269] *Катэхеза* (24 чэрвеня 2015): *L’Osservatore Romano,* 25 giugno 2015, p. 8.

супольнасці, быццам бы яны былі экскамунікаваныя? Трэба паступаць такім чынам, каб не дадаваць іншых цяжараў да тых, якія дзеці ў такіх сітуацыях ужо вымушаны зносіць!“[270]. Дапамога бацькам у лячэнні іх ранаў, а таксама іх духоўнае прыняцце з'яўляюцца карыснымі таксама для дзяцей, якія жадаюць бачыць сямейнае аблічча Касцёла, які прымае іх з гэтым балючым досведам. Развод — гэта зло, таму вельмі непакоіць узрастанне лічбы разводаў. Несумненна нашым самым важным пастырскім заданнем адносна сем'яў з'яўляецца ўмацаванне любові і дапамога ў залечванні ранаў, каб мы маглі прадухіліць пашырэнне гэтай драмы нашага часу.

*Некаторыя складаныя сітуацыі*

247. „Пытанні, звязаныя са змешанымі сужэнствамі, патрабуюць асаблівай увагі. Сужэнствы паміж католікамі і іншымі ахрышчанымі «ўжо дзякуючы сваёй спецыфіцы маюць шмат элементаў, якія трэба цаніць і развіваць як з прычыны іх унутранай каштоўнасці, так і з прычыны магчымай карысці, якую яны могуць прыўнесці ў экуменічны рух». Для гэтага «трэба імкнуцца [...] да сардэчнага супрацоўніцтва паміж каталіцкімі і некаталіцкімі духоўнымі, пачынаючы з падрыхтоўкі да сужэнства і шлюбу» (*Familiaris consortio*, 78). Што датычыць супольнага ўдзелу ў Эўхарыстыі, нагадваем, што «рашэнне аб дапушчэнні ці недапушчэнні некаталіцкага боку сужэнства да эўхарыстычнай камуніі павінна прымацца згодна з агульнымі нормамі, якія існуюць па гэтаму пытанню адносна ўсходніх хрысціянаў, а таксама іншых хрысціянаў, зважаючы пры гэтым на спецыфічную сітуацыю пры-

[270] *Катэхеза* (5 жніўня 2015): *L'Osservatore Romano,* 6 agosto 2015, p. 7.

няцця сакрамэнту хрысціянскага сужэнства дзвюма ахрышчанымі асобамі. Хоць сужэнцы ў змяшаным сужэнстве маюць тыя ж сакрамэнты хросту і сужэнства, удзел у Эўхарыстыі можа быць толькі ў выключных сітуацыях, і ў кожным выпадку трэба захоўваць нормы, пададзеныя ніжэй» (Папская Рада Адзінства Хрысціянаў, *Дырэкторый па ажыццяўленні прынцыпаў і нормаў экуменізму*, 25 сакавіка 1993, 159-160)“[271].

248. „Сужэнствы, дзе ёсць розніца рэлігій, займаюць прывілеяванае месца ў міжрэлігійным дыялогу [...]. Звязана гэта з канкрэтнымі цяжкасцямі, як у дачыненні хрысціянскай тоеснасці сям'і, так і ў рэлігійным выхаванні дзяцей [...]. Узрастаючая ў місійных краінах, а нават у краінах з даўняй хрысціянскай традыцыяй, лічба сем'яў, якія складаюцца з сужэнцаў, паміж якімі ёсць розніца рэлігіі, патрабуе тэрміновага гарантавання ім разнастайнай пастырскай апекі ў залежнасці ад розных грамадскіх і культурных кантэкстаў. У некаторых краінах, дзе няма рэлігійнай свабоды, хрысціянскі сужэнец дзеля шлюбу вымушаны перайсці на іншую рэлігію і не можа заключыць кананічнае сужэнства з захаваннем розніцы рэлігіі і ахрысціць дзяцей. Таму мы павінны падкрэсліць неабходнасць захавання рэлігійнай свабоды ўсіх“[272]. „Каб канструктыўна спраўляцца з разнастайнасцю ў веры, трэба звярнуць асаблівую ўвагу на асобаў, якія лучацца ў такіх сужэнствах, не толькі ў перыяд перад шлюбам. З асаблівымі цяжкасцямі сустракаюцца сужэнствы і сем'і, у якіх адзін з бакоў з'яўляецца каталікам, а другі — няверуючай асобай. У такіх выпадках трэба сведчыць пра здольнасць Евангелля ўвайсці ў такія

[271] *Relatio finalis* 2015, 72.
[272] *Тамсама*, 73.

сітуацыі, каб зрабіць магчымым выхаванне дзяцей у хрысціянскай веры“[273].

249. „Асаблівую цяжкасць выклікаюць сітуацыі, якія датычаць хросту асобаў, якія знаходзяцца ў складанай сужэнскай сітуацыі. Маюцца на ўвазе асобы, якія заключылі пастаянны сужэнскі саюз у перыяд, калі адзін з бакоў не ведаў хрысціянскай веры. У гэтых выпадках біскупы павінны правесці пастырскае распазнаванне, сувымернае духоўнаму дабру гэтых асобаў“[274].

250. Касцёл засвойвае паставу Пана Езуса, які ў бязмежнай любові ахвяраваў самога сябе кожнаму без выключэння чалавеку[275]. Разам з айцамі Сінода я звярнуў увагу на сітуацыю сем'яў, у якіх ёсць асобы з гомасексуальнымі схільнасцямі — гэта нялёгкі і для бацькоў, і для дзяцей досвед. Таму хочам найперш пацвердзіць, што кожная асоба, незалежна ад сваёй сексуальнай схільнасці, павінна шанавацца з увагі на сваю годнасць і прымацца з пашанаю і клопатам, каб пазбегнуць „розных праяў несправядлівай дыскрымінацыі“[276], асабліва розных форм агрэсіі і насілля. Што датычыць сем'яў, то трэба ім гарантаваць поўнае пашаны суправаджэнне, каб асобы з гомасексуальнымі схільнасцямі мелі неабходную дапамогу ў зразуменні і поўнай рэалізацыі волі Бога ў іх жыцці[277].

251. У ходзе дыскусіі на тэму годнасці і місіі сям'і, айцы Сінода падкрэслілі, што „адносна праектаў, якія

[273] *Тамсама*, 74.
[274] *Тамсама*, 75.
[275] Пар. Булла *Misericordiae Vultus*, 12.
[276] *Catechismo della Chiesa Cattolica,* 2358; пар. R*elatio finalis* 2015, 76.
[277] Пар. *тамсама*.

ўраўноўваюць гомасексуальныя саюзы з сужэнствам, няма ніякіх падстаў для параўноўвання ці правядзення аналогіі, нават далёкай, паміж гомасексуальнымі саюзамі і Божым планам наконт сужэнства і сям'і". Недапушчальна, „каб мясцовыя Касцёлы адчувалі ціск у гэтай справе, а таксама каб міжнародныя ўстановы абумоўлівалі фінансавую дапамогу для бедных краін увядзеннем права, якое ўзаконьвае аднаполыя шлюбы"[278].

252. Няпоўная сям'я часта вынікае з сітуацыі, калі „біялагічныя бацька ці маці ніколі не жадалі злучыцца ў сямейным жыцці; з сітуацый гвалту, калі адзін з бацькоў вымушаны ўцякаць разам з дзецьмі; у выніку смерці аднаго з сужэнцаў; калі адзін з сужэнцаў пакідае сям'ю, а таксама ў выніку іншых сітуацый. Незалежна ад прычыны, адзін з бацькоў, які жыве з дзіцём, павінен атрымаць дапамогу і падтрымку з боку іншых сем'яў, якія ўтвараюць хрысціянскую супольнасць, а таксама з боку парафіяльных пастырскіх структур. Часта гэтыя сем'і дадаткова церпяць з прычыны сур'ёзных эканамічных праблем, непастаяннай працы, з-за цяжкасцяў ва ўтрыманні дзяцей, з-за адсутнасці жылля"[279].

## Калі смерць выпускае сваё джала

253. Часам сем'і сутыкаюцца з праблемай смерці блізкага сваяка. Мы абавязаныя прапанаваць ім святло веры, каб суправаджаць сем'і, якія пакутуюць

[278] *Relatio finalis* 2015, 76; пар. Кангрэгацыя Веравучэння, *Considerazioni circa i progetti di riconoscimento legale delle unioni tra persone omosessuali* (3 чэрвеня 2003), 4.
[279] *Relatio finalis* 2015, 80.

у такія моманты[280]. Пакіданне сям'і, калі яе закранае смерць, было б адсутнасцю міласэрнасці, марнаваннем пастырскай магчымасці, а такая пастава закрыла б нам дзверы для кожнага іншага евангелізацыйнага дзеяння.

254. Я разумею цярпенне тых, хто страціў моцна каханую асобу, сужэнца, з якім падзяляў многае. Сам Езус узрушыўся і заплакаў падчас жалобнага чування пасля смерці сябра (*Ян* 11, 33.35). І як жа не разумець жалю тых, хто страціў дзіця? Бо страта „быццам затрымлівае час: адкрывае адхлань, якая паглынае мінулае, а таксама будучыню. [...] Часам нават абвінавачваецца Бог. Колькі асобаў — я разумею іх — злуецца на Бога"[281]. „Удаўство з'яўляецца асабліва цяжкім выпрабаваннем [...]. Некаторыя, калі сустракае іх гэтае выпрабаванне, знаходзяць у сабе здольнасць сканцэнтраваць сваю энергію з яшчэ большай ахвярнасцю на сваіх дзецях і ўнуках, знаходзячы ў гэтым праяўленні любові новую выхаваўчую місію. [...] Тыя, хто не можа разлічваць на прысутнасць членаў сям'і, якім бы маглі ахвярна служыць і ад якіх маглі б атрымаць любоў і блізкасць, павінны мець вельмі чулую і актыўную падтрымку хрысціянскай супольнасці, асабліва калі яны знаходзяцца ва ўмовах беднасці"[282].

255. Звычайна жалоба па памерлым трывае даstatкова доўга, а калі пастыр жадае спадарожнічаць у гэтым працэсе, павінен прыстасавацца да кожнага яе этапу. Увесь працэс працяты пытаннямі наконт прычын смерці, што можна было б зрабіць, што

[280] Пар. *тамсама*, 20.
[281] *Катэхеза* (17 чэрвеня 2015): *L'Osservatore Romano*, 18 giugno 2015, p. 8.
[282] *Relatio finalis* 2015, 19.

адчувала гэтая асоба ў хвіліны перад смерцю. Шляхам шчырай і цярплівай малітвы і ўнутранага вызвалення вяртаецца спакой. У пэўны момант жалобы трэба дапамагчы адкрыць, што мы, якія страцілі ўмілаваную асобу, яшчэ павінны выканаць канкрэтную місію і што нявартa падоўжваць цярпенне, нібы яно — сведчанне пашаны. Умілаваная асоба не патрабуе нашага цярпення і не будзе ёй прыемным разбурэнне нашага жыцця. Не з'яўляецца таксама найлепшым праяўленнем любові пастаянны ўспамін і згадванне пра яе, бо гэта сведчыць аб прывязанасці да нейкага мінулага, якое ўжо не існуе, а не аб любові да рэальнай асобы, якая знаходзіцца цяпер на іншым баку. Яе фізічная прысутнасць ужо немагчымая, аднак, калі смерць ёсць чымсьці магутным, то „каханне магутнае, як смерць“ (*Пп* 8, 6). Любоў мае інтуіцыю, якая дазваляе чуць яе без гукаў і бачыць у нябачным. Гэта не азначае ўяўленне сабе ўмілаванай асобы, такой, якой яна была, але ўменне прыняць яе перамененай, такой, якой з'яўляецца цяпер. Уваскрослы Езус, якога сяброўка Марыя хацела затрымаць сілай, папрасіў, каб яна не дакраналася да Яго (пар. *Ян* 20, 17), бо хацеў прывесці яе да іншай сустрэчы.

256. Нас суцяшае ўсведамленне таго, што не сыходзяць у нябыт тыя, хто памірае, а вера пераконвае, што ўваскрослы Пан ніколі нас не пакіне. Такім чынам, мы можам не дапусціць, каб смерць „атруціла нашае жыццё, знішчыла нашыя пачуцці, кінула нас у найцямнейшую адхлань“[283]. Біблія кажа пра Бога, які стварыў нас з любові і ўчыніў нас такімі, што нашае жыццё не заканчваецца смерцю (пар. *Мдр* 3, 2-3). Св. Павел кажа пра сустрэчу з Хрыстом непасрэдна пасля смерці: „маю жаданне памерці і быць з Хрыс-

[283] *Катэхеза* (17 чэрвеня 2015): *L'Osservatore Romano*, 18 giugno 2015, p. 8.

том“ (*Флп* 1, 23). З Ім пасля смерці чакае нас тое, што падрыхтаваў Бог тым, хто Яго любіць (*1 Кар* 2, 9). Прыгожа кажа пра гэта літургічная прэфацыя за памерлых: „хоць нас засмучае непазбежнасць смерці, мы знаходзім суцяшэнне ў абяцанні будучай несмяротнасці. Бо жыццё Тваіх верных, Пане, змяняецца, але не заканчваецца“. Бо „нашыя блізкія не зніклі ў цемры небыцця: надзея дае нам упэўненасць, што яны знаходзяцца ў добрых і моцных руках Бога“[284].

257. Адным са спосабаў зносін з блізкімі людзьмі, якія памерлі, з'яўляецца малітва за іх[285]. Біблія кажа, што „малітва за памерлых“ з'яўляецца „думкай святой і пабожнай“ (*2 Мак* 12, 44-45). Малітва за памерлых „не толькі можа ім дапамагчы, але ўчыніць іх заступніцтва за нас плённым“[286]. Апакаліпсіс прадстаўляе мучанікаў, якія заступаюцца за тых, хто несправядліва церпіць на зямлі (пар. *Ап* 6, 9-11), у салідарнасці з гэтым пілігрымуючым светам. Некаторыя святыя перад смерцю суцяшалі сваіх блізкіх, абяцаючы ім, што будуць знаходзіцца побач, каб ім дапамагаць. Св. Тэрэза з Лізьё абяцала, што будзе надалей чыніць дабро з Неба[287]. Св. Дамінік сцвярджаў, што „будзе больш карысным пасля смерці [...], будзе больш плённа дапамагаць, чым пры жыцці“[288]. Гэта повязі любові[289], бо „еднасць

[284] *Тамсама.*

[285] Пар. *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 958.

[286] *Тамсама.*

[287] Пар. „Quaderno giallo“. Апошнія размовы св. Тэрэзы ад Дзіцятка Езус, сабраныя Маткай Агнешкай, 17 luglio 1897: *Opere complete*, Città del Vaticano - Roma 1997, 1028. Значным з'яўляецца сведчанне сясцёр наконт абяцання св. Тэрэзы, што яе адыход з гэтага свету будзе як „дождж з ружаў“ (*тамсама*, 9 чэрвеня).

[288] GIORDANO DI SASSONIA, *Libellus de principiis Ordinis prædicatorum*, 93: *Monumenta Historica Sancti Patris Nostri Dominici*, XVI, Roma 1935, 69.

[289] Пар. *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 957.

пілігрымуючых з тымі братамі, якія спачылі ў спакоі Хрыста, не перарываецца цалкам. Наадварот, [...] умацоўваецца дзякуючы ўзаемаабмену духоўнымі дабротамі“[290].

258. Калі прымем смерць, то можам падрыхтавацца да яе на шляху ўзрастання ў любові да тых, хто ідзе разам з намі да дня, калі „ўжо не будзе ні смерці, ні смутку, ні плачу, ні болю“ (*Ап* 21, 4). Так мы падрыхтуемся таксама да сустрэчы з нашымі блізкімі, якія памерлі. Езус вярнуў маці памерлага сына (пар. *Лк* 7, 15), і тое самае Ён зробіць для нас. Не будзем марнаваць сілы, трываючы цэлымі гадамі ў мінулым. Чым лепш мы жывём на зямлі, тым большым шчасцем зможам дзяліцца з нашымі самымі блізкімі ў небе. Чым больш атрымаецца ў нас пасталець і развіцца, тым больш прыгожых рэчаў мы зможам прынесці на гасціну ў небе.

[290] Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. *Lumen gentium*, 49.

## РАЗДЗЕЛ VII

# УМАЦАВАЦЬ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ

259. Добра ці дрэнна, бацькі заўсёды ўплываюць на маральнае развіццё сваіх дзяцей. Таму найлепш, калі яны прымуць гэтую непазбежную адказнасць і выканаюць яе свядома, з энтузіязмам, разважліва і належным чынам. Хачу падрабязна затрымацца над гэтым пытаннем, бо такая выхаваўчая функцыя сям'і з'яўляецца важнай і стала вельмі складанай.

### ДЗЕ ЗНАХОДЗЯЦЦА ДЗЕЦІ?

260. Сям'я не можа адмовіцца ад таго, каб быць месцам падтрымкі, суправаджэння, вядзення, але павінна нанова адкрыць свае метады і знаходзіць новыя сродкі. Яна павінна ўлічваць тое, што можа пагражаць дзецям. Таму не можа ігнараваць пытанняў аб тым, кім з'яўляюцца тыя, хто арганізоўвае для іх забавы і адпачынак, хто ўваходзіць у іх дом праз экраны, каму яны даяраюць іх дзеля правядзення вольнага часу. Толькі хвіліны, якія мы праводзім з імі, размаўляючы ў прастаце і любові пра важныя рэчы, ствараючы годныя магчымасці для запаўнення іхняга вольнага часу, дазваляюць пазбегнуць шкоднага ўмяшання.

чуванне заўсёды неабходна. Няма ніякага дабра ў тым, калі мы пакідаем іх адных. Бацькі павінны накіроўваць і асцерагаць дзяцей і моладзь, каб яны ўмелі справіцца з сітуацыямі, у якіх могуць апынуцца, напрыклад, у небяспецы агрэсіі, выкарыстання або наркаманіі.

261. Аднак празмерная апека не выхоўвае і не можа кантраляваць усе сітуацыі, у якіх можа апынуцца дзіця. Тут захоўвае сваё значэнне прынцып, што „час пераўышае прастору“[291]. Гэта азначае, што больш важным за дамінаванне прасторы з'яўляецца генерацыя працэсаў. Калі адзін з бацькоў жыве маніяй ведаць, дзе знаходзіцца дзіцё, і хоча кантраляваць кожны яго рух, то будзе намагацца толькі панаваць над яго прасторай. Гэтым не выхавае яго і не ўмацуе, не падрыхтуе да супрацьстаяння выклікам. Мае значэнне толькі тое, каб з вялікай любоўю распачаць у дзіцяці працэсы сталення ў свабодзе, навучанні, усебаковым развіцці, у падрыхтоўцы да сапраўднай самастойнасці. Толькі такім чынам дзіця набудзе патрэбныя рысы для таго, каб умець абараняцца і дзейнічаць разумна і хітра ў цяжкіх абставінах. Таму большым за пытанне, дзе фізічна знаходзіцца дзіця, з кім яно ў дадзены момант, з'яўляецца пытанне дзе яно знаходзіцца ў экзістэнцыяльным сэнсе, паводле сваіх перакананняў, сваіх мэтаў, сваіх жаданняў, сваіх жыццёвых планаў. Таму пытаюся ў бацькоў: „Ці імкнемся мы разумець, «дзе» сапраўды знаходзяцца дзеці ў сваёй вандроўцы? Ці ведаем, дзе на самай справе іх душа? А найперш, ці мы хочам гэта ведаць?“[292].

[291] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 222.
[292] *Катэхеза* (20 мая 2015): *L'Osservatore Romano,* 21 maggio 2015, p. 8.

262. Калі б сталасць была развіццём чагосьці, што ўжо прысутнічае ў генетычным кодзе, не было б прычын для клопату. Але развадлівасць, добрая ацэнка сітуацыі і здаровы сэнс не залежаць ад выключна колькасных элементаў узросту, але ад цэлага шэрагу элементаў, якія выпрацоўваюцца ўнутры асобы, а дакладней — у цэнтры яе свабоды. Кожнае дзіця непазбежна здзіўляе нас планамі, якія вынікаюць з гэтай свабоды і парушаюць нашыя схемы, і добра, што так адбываецца. Выхаванне звязана з заданнем пашырэння адказнай свабоды, якая ў ключавыя моманты можа прымаць развадлівыя і разумныя рашэнні. Гэта выхаванне асобаў, якія без агаворак разумеюць, што іх жыццё і жыццё іх супольнасцяў знаходзіцца ў іх руках і што гэтая свабода з'яўляецца велізарным дарам.

## ЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ

263. Хоць бацькам патрэбна школа, каб даць сваім дзецям базавую адукацыю, аднак яны не могуць цалкам даручыць іншым іхняе маральнае выхаванне. Эмацыянальнае і этычнае развіццё асобы патрабуе фундаментальнага досведу: упэўненасці, што нашыя бацькі годныя даверу. Гэта з'яўляецца абавязкам выхавання: нараджэнне ў дзецях даверу пры дапамозе любові і сведчання, абуджэнне ў іх павагі з любові. Калі дзіця не адчувае, што з'яўляецца каштоўнасцю для сваіх бацькоў нягледзячы на недасканаласць, і не заўважае, што яго атачаюць сапраўдным клопатам, тады ўзнікаюць у ім глыбокія раны, якія выклікаюць шмат цяжкасцяў у працэсе яго сталення. Гэтая адчужанасць, гэтае эмацыянальнае занядбанне нясе значна большае цярпенне, чым напамін, які дзіця магло атрымаць з прычыны дрэннага дзеяння.

264. Заданне бацькоў ахоплівае выхаванне волі, а таксама развіццё добрых звычак і эмацыянальных схільнасцяў да дабра. Гэта азначае, што фарміруюцца жаданыя паводзіны, якім трэба вучыць, і здольнасці, якія патрабуюць сталасці. Аднак заўсёды гэта працэс, які ідзе ад недасканаласці да большай паўнаты. Жаданне прыстасавацца да грамадства ці здольнасць адмовіцца ад імгненнага задавальнення, каб прыстасавацца да нейкай нормы і забяспечыць сабе добрае суіснаванне, ужо само па сабе з'яўляецца пачатковай каштоўнасцю, якая рыхтуе да больш высокіх каштоўнасцяў. Маральнае выхаванне павінна адбывацца заўсёды пры дапамозе актыўных метадаў і выхаваўчага дыялогу, уключаючы адчувальнасць і ўласцівую дзецям мову. Акрамя таго, гэтае выхаванне павінна адбывацца індукцыйна, каб дзіця самастойна магло адкрыць значэнне некаторых каштоўнасцяў, прынцыпаў і нормаў, а не праз навязванне іх як бясспрэчных праўдаў.

265. Каб добра дзейнічаць, недастаткова „адпаведна ацэньваць“ ці дакладна ведаць, што трэба рабіць, але неабходна ўсведамляць, што мае прыярытэт. Мы часта непаслядоўныя ў нашых асабістых перакананнях, нават калі яны пастаянныя. Сумленне дыктуе нам канкрэтнае маральнае суджэнне, аднак большую ўладу часам маюць іншыя рэчы, якім мы аддаем перавагу, калі дабро, прынятае розумам, яшчэ не ўкаранілася ў нас як трывалая эмацыянальная схільнасць, як умілаванне дабра, якое мае большае значэнне за іншыя прывабнасці і дазваляе нам заўважыць, што пэўная рэч, прынятая намі як дабро, з'яўляецца дабром таксама „для нас“ тут і цяпер. Этычнае выхаванне прыносіць плён, калі асоба бачыць, наколькі больш добрае дзеянне з'яўляецца карысным для яе самой. Сёння

часта застаецца без водгуку просьба, якая патрабуе намаганняў і выпрачэнняў, без выразнага паказвання дабра, якое можна такім чынам атрымаць.

266. Неабходным з'яўляецца развіццё навыкаў. Набытыя ў дзіцячым узросце звычкі таксама адыгрываюць станоўчую ролю і спрыяюць таму, каб прысвоеныя вялікія каштоўнасці пераносіліся на здаровыя і стабільныя знешнія паводзіны. Хтосьці можа мець сяброўскія пачуцці і добрае стаўленне да іншых, але калі на працягу доўгага часу ён не прызвычаіўся па патрабаванні дарослых казаць „калі ласка“, „ці магу?“, „дзякуй“, то яго добрае ўнутранае стаўленне з цяжкасцю будзе пераходзіць да гэтых выразаў. Умацаванне волі і практыкаванне пэўных дзеянняў будуюць маральныя паводзіны, але без свядомага, добраахвотнага і належна ацэненага практыкавання некаторых добрых паводзінаў немагчыма завершыць гэты працэс. Матывы ці сімпатыі да нейкай каштоўнасці не становяцца цнотай без гэтых адпаведна абгрунтаваных дзеянняў.

267. Свабода з'яўляецца чымсьці цудоўным, але яе можна згубіць. Маральнае выхаванне дапамагае развіваць свабоду шляхам пастаноў, матывацый, практычнага прымянення, імпульсаў, узнагародаў, прыкладу, узораў, сімвалаў, разважанняў, заахвоты, карэкціроўкі спосабу дзеяння і дыялогаў, якія дапамагаюць асобам развіваць тыя трывалыя ўнутраныя прынцыпы, якія могуць спрыяць спантаннаму здзяйсненню дабра. Цнота з'яўляецца перакананнем, якое ператварылася ва ўнутраны і пастаянны прынцып дзеяння. Жыццё цнотамі будуе свабоду, умацоўвае яе і выхоўвае, не дазваляючы стаць нявольнікам антыгуманных і антыграмадскіх кампульсіўных схільнасцяў. Сама годнасць

чалавека патрабуе, каб кожны, „узрушаны і натхнёны знутры, (...) дзейнічаў паводле свядомага і свабоднага выбару, гэта значыць асабіста“[293].

## Каштоўнасць санкцый як імпульса

268. Неабходна таксама звярнуць увагу дзіцяці ці падлетка на тое, што дрэнныя дзеянні маюць свае наступствы. Трэба абудзіць здольнасць ставіць сябе ў сітуацыю іншай асобы і выяўляць скруху з прычыны яе цярпення ад учыненага ёй зла. Некаторыя санкцыі — адносна агрэсіўных антыграмадскіх паводзінаў — могуць часткова адпавядаць гэтай мэце. Неабходна рашуча накіроўваць дзіця да таго, каб яно прасіла прабачэння і выпраўляла шкоды, учыненыя іншым. Калі выхаваўчы працэс дае свой плён у сталай асабістай свабодзе, тады само дзіця ў адпаведны момант будзе з удзячнасцю прызнаваць, што для яго было карысным расці ў гэтай сям’і і прымаць патрабаванні выхаваўчага працэсу.

269. Напамін з’яўляецца імпульсам, калі адначасова ацэньваюцца і прызнаюцца намаганні, а дзіця разумее, што яго бацькі захоўваюць цярплівы давер. Дзіця, атрымліваючы напамін з любоўю, адчувае, што знаходзіцца ў сферы зацікаўленасці, заўважае, што з’яўляецца кімсьці, бачыць, што бацькі прызнаюць яго магчымасці. Гэта не патрабуе таго, каб бацькі былі беззаганнымі, але каб маглі ў пакоры прызнаць свае абмежаванні і паказаць свае асабістыя намаганні для таго, каб быць лепшымі. Аднак сведчанне, якога патрабуюць дзеці ад бацькоў, заключаецца ў тым, каб

[293] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 17.

яны не паддаліся злосці. Дзіця, якое здзяйсняе дрэнны ўчынак, павінна атрымаць напамін, але не як вораг ці хтосьці, на каго мы выкідваем сваю агрэсію. Больш за тое, дарослая асоба павінна прызнаць, што некаторыя правіны падыктаваны слабасцю і абмежаваннямі ўзросту. Таму няспынны крык, які не дапамагае дзіцяці заўважыць розную сур'ёзнасць дзеянняў, а выклікае расчараванне і раздражненне, шкодны: „бацькі, не раздражняйце дзяцей вашых“ (*Эф* 6, 4; пар. *Клс* 3, 21).

270. Важна, каб дысцыпліна не калечыла жаданне, але была імпульсам да таго, каб стала заўсёды ісці. Як спалучыць дысцыпліну з унутраным дынамізмам? Што зрабіць, каб дысцыпліна была канструктыўным абмежаваннем працэсу, які павінна прыняць дзіця, а не мурам, які б яго знішчаў, ці выхаваннем, якое б яму перашкаджала? Трэба ўмець знайсці раўнавагу паміж дзвюма аднолькава шкоднымі крайнасцямі. Адна з іх — намаганне будаваць свет паводле жаданняў дзіцяці, якое вырастае, адчуваючы сябе суб'ектам правоў, але не абавязкаў. Другая — скіраванне яго да жыцця без усведамлення сваёй годнасці, непаўторнай тоеснасці і сваіх правоў, у мучэнні ад абавязкаў і прымусу ажыццяўляць жаданні іншых.

## Цярплівы рэалізм

271. Маральнае выхаванне заключаецца ў тым, каб прасіць дзіця ці падлетка толькі аб тым, што не з'яўляецца для яго непрапарцыянальнай ахвярнасцю, каб патрабаваць толькі такога высілку, які не будзе траўміраваць або змушаць толькі да прымусовых дзеянняў. Нармальны шлях заключаецца ў малых кроках, якія могуць быць зразуметыя, прынятыя і ацэненыя

і якія вядуць да прапарцыянальных вырачэнняў. Патрабуючы зашмат, мы нічога не атрымаем. Асоба, як толькі зможа вызваліцца з-пад уціску, праўдападобна перастане рабіць дабро.

272. Этычнае выхаванне часам абуджае пагарду, абумоўленую пачуццём адкінутасці, расчаравання, эмацыянальнымі недахопамі або дрэнным прыкладам бацькоў. Этычныя каштоўнасці зацямняюцца скажонымі вобразамі бацькі і маці ці слабасцю дарослых. Таму трэба дапамагчы моладзі ў стварэнні аналогій: каштоўнасці асабліва рэалізуюць вельмі прыкладныя асобы, але яны рэалізуюць іх таксама недасканала і ў рознай ступені. Паколькі супраціў моладзі цесна звязаны з адмоўным досведам, трэба адначасова ёй дапамагчы прайсці шлях аздараўлення зраненанага ўнутранага свету, каб яна магла атрымаць зразуменне і паяднацца з асобамі і грамадствам.

273. Калі мы прапануем каштоўнасці, трэба ісці крок за крокам, дасягаючы прагрэсу рознымі спосабамі, у залежнасці ад узросту і канкрэтных магчымасцяў асобаў, без імкнення выкарыстоўваць неэластычныя і нязменныя метады. Каштоўны ўклад псіхалогіі і педагагічных навук указвае на неабходнасць паступовага працэсу дзеля дасягнення перамен у паводзінах, але таксама свабода патрабуе накіраванасці і стымулаў, бо пакінутая сама сабе не можа гарантаваць сталення. Свабода, змешчаная ў канкрэтным кантэксце, рэальная, з’яўляецца абмежаванай і абумоўленай. Гэта не чыстая магчымасць цалкам спантаннага выбару дабра. Не заўсёды адпаведна адрозніваюцца дзеянні „дабравольныя“ і „свабодныя“. Хтосьці можа жадаць чагосьці дрэннага з вялікай сілай волі, але з прычыны непераадольнага запалу або дрэннага

выхавання. У гэтым выпадку яго рашэнне з'яўляецца абсалютна дабравольным, не супярэчыць яго волі, аднак не з'яўляецца свабодным, бо адмаўленне ад гэтага зла стала б для яго амаль немагчымым. Так адбываецца ў выпадку заўзятага наркамана. Калі ён хоча наркотыку, то з усіх сілаў, але знаходзіцца ў такой залежнасці, што ў дадзеную хвіліну не можа прыняць іншага рашэння. Таму яго рашэнне з'яўляецца дабравольным, але несвабодным. Няма сэнсу „дазволіць яму свабодна выбіраць“, бо на самай справе ён не можа выбраць, а доступ да наркотыкаў толькі павялічвае яго залежнасць. Ён патрабуе дапамогі іншых, а таксама працэсу выхавання.

## Сямейнае жыццё як выхаванне

274. Сям'я з'яўляецца першай школай чалавечых каштоўнасцяў, у якой можна навучыцца добра карыстацца свабодай. Ёсць схільнасці, якія развіліся ў дзяцінстве, закараніліся глыбока ў асобе і застаюцца на ўсё жыццё як пазітыўныя эмоцыі адносна нейкай каштоўнасці або як спантаннае адкідванне пэўных паводзінаў. Многія асобы дзейнічаюць на працягу жыцця, трымаючыся адпаведнага спосабу, таму што лічаць яго каштоўным, бо набылі яго з дзяцінства, быццам шляхам осмасу: „так мяне навучылі“, „гэта прышчэплена мне“. У сямейным асяроддзі можна таксама вучыцца крытычна ацэньваць паведамленні розных сродкаў сацыяльнай камунікацыі. На жаль, часта тэлевізійныя праграмы або некаторыя формы рэкламы ўплываюць негатыўна і аслабляюць каштоўнасці, атрыманыя ў сямейным жыцці.

275. У цяперашнюю эпоху, у якой пануе неспакой і тэхналагічны прагрэс, надзвычай важным заданнем

сем'яў з'яўляецца выхаванне здольнасці чакання. Не маецца на ўвазе тое, каб забараняць дзецям гульні на электронных прыладах, але неабходнасць знайсці спосаб выхаваць у іх здольнасць бачыць іншую логіку і не выкарыстоўваць лічбавую хуткасць ва ўсіх сферах жыцця. Адтэрміноўка не азначае адмову ад жадання, але адкладванне яго задавальнення. Калі дзеці або падлеткі непрызвычаеныя да таго, што некаторыя рэчы могуць пачакаць, то становяцца грубымі, падпарадкоўваючы ўсё заспакаенню сваіх часовых патрэбаў, і вырастаюць з заганаю: „хачу ўсё і адразу". Гэта вялікае ашуканства, якое не спрыяе свабодзе, але атручвае яе. Калі ж выхоўваем так, каб навучыць адкладваць некаторыя рэчы і чакаць адпаведнай хвіліны, то вучым быць гаспадаром самога сябе, незалежным ад сваіх імпульсаў. Таму, калі дзіця адчувае, што можа адказваць за сябе, то павялічваецца яго самаацэнка. Адначасова гэта вучыць яго шанаваць свабоду іншых. Зразумела, гэта не азначае патрабавання ад дзяцей, каб яны дзейнічалі як дарослыя асобы, але нельга таксама быць абыякавымі да іх здольнасці ўзрастаць у сталай адказнай свабодзе. У здаровай сям'і гэта адбываецца звычайным чынам, праз вымаганні сумеснага сямейнага жыцця.

276. Сям'я — гэта асяродак асноўнай сацыялізацыі, бо з'яўляецца першым месцам, дзе мы вучымся адносінам з іншымі, узаемна слухаць, дзяліцца, падтрымліваць, шанаваць, дапамагаць, узаемадзейнічаць. Мэта выхавання — абудзіць адчуванне свету і грамадства як „сямейнага асяродка", выхаванне ўмення „быць" па-за межамі свайго дому. У кантэксце сям'і мы вучымся знаходзіць блізкасць, вучымся заступніцтву, вітанню адзін аднаго. Тут ламаецца першае кола смяротнага эгаізму, каб прызнаць, што мы жывём побач з іншымі,

якія заслугоўваюць на нашую ўвагу, нашую зычлівасць, нашую любоў. Няма грамадскай повязі без гэтага першага штодзённага вымярэння, амаль мікраскапічнага: быць разам у блізкасці, сустракацца ў розныя поры дня, перажываць за ўсё, што датычыць нас усіх, спяшацца з узаемнай дапамогай у малых штодзённых справах. Сям'я павінна кожны дзень знаходзіць новыя спосабы пашырэння ўзаемнай павагі.

277. У хатнім асяроддзі можна таксама паразважаць над спажывецкімі звычкамі, каб разам паклапаціцца пра супольны дом: „Сям'я адыгрывае галоўную ролю ў інтэгральнай экалогіі, бо з'яўляецца асноўным грамадскім суб'ектам, у якім змяшчаюцца два асноўныя прынцыпы чалавечай цывілізацыі на зямлі: прынцып супольнасці і прынцып плоднасці“[294]. Цяжкія хвіліны сямейнага жыцця таксама могуць мець вялікае выхаваўчае значэнне. Адбываецца так, напрыклад, калі прыходзіць хвароба: „Перад абліччвам хваробы ў сям'і ўзнікаюць цяжкасці, прычынаю якіх становіцца людская слабасць. [...] Выхаванне, якое не грунтуецца на спачуванні людской хваробе, вядзе да закамянеласці сэрца. У выніку дзеці становяцца «нячулымі» да цярпенняў іншых, няздольныя супрацьстаяць цярпенню і абмежаванням“[295].

278. Выхаваўчая сустрэча паміж бацькамі і дзецьмі можа мець палёгку або перашкоды з боку самых перадавых тэхналогій камунікацыі і забаў. Калі яны добра выкарыстоўваюцца, могуць дапамагаць у з'яднанні членаў сям'і нягледзячы на адлегласць. Кантакты могуць быць частымі і дапамагаць у вырашэнні

[294] *Катэхеза* (30 верасня 2015): *L'Osservatore Romano*, 1 ottobre 2015, p. 8.
[295] *Катэхеза* (10 чэрвеня 2015): *L'Osservatore Romano*, 11 giugno 2015, p. 8.

цяжкасцяў[296]. Аднак павінна быць ясным, што яны не падмяняюць больш асабісты і глыбокі дыялог, які патрабуе фізічнага кантакту ці прынамсі таго, каб пачуць голас іншай асобы. Ведаем, што часам гэтыя сродкі аддаляюць, а не збліжаюць, як, напрыклад, тады, калі падчас ежы кожны займаецца сваім сотавым тэлефонам або калі адзін з сужэнцаў засынае, чакаючы другога, які праводзіць цэлыя гадзіны за нейкімі электроннымі прыладамі. Таксама і гэта павінна быць прадметам дыялогу і пагадненняў у сям'і, якія падкрэсліваюць першынство сустрэчы яе членаў без пераходу да неразумных забарон. Аднак нельга ігнараваць пагрозаў новых форм камунікацыі для дзяцей і моладзі, якія часам становяцца бязвольнымі, адарванымі ад рэальнага свету. Гэты „тэхналагічны аўтызм" дазваляе больш лёгка маніпуляваць імі з боку тых, хто хоча ўвайсці ў глыбіню іх жыцця з эгаістычнымі інтарэсамі.

279. Нядобра таксама, калі бацькі становяцца усемагутнымі істотамі для сваіх дзяцей, якія толькі ім могуць верыць, бо гэта перашкаджае належнаму працэсу сацыялізацыі і эмацыянальнага сталення. Каб зрабіць эфектыўным пашырэнне айцоўства і мацярынства ў больш шырокай рэчаіснасці, „хрысціянскія супольнасці пакліканы падтрымліваць выхаваўчую місію сям'і"[297], асабліва праз пачатковую катэхезу. Каб аблегчыць комплекснае выхаванне, неабходна „аднаўленне запавету паміж сям'ёй і хрысціянскай супольнасцю"[298]. Сінод пажадаў падкрэсліць значэнне каталіцкіх школ, якія „адыгрываюць жыццёва важную ролю, дапама-

[296] Пар. *Relatio finalis* 2015, 67.

[297] *Катэхеза* (20 мая 2015): *L'Osservatore Romano,* 21 maggio 2015, p. 8.

[298] *Катэхеза* (9 верасня 2015): *L'Osservatore Romano*, 10 settembre 2015, p. 8.

гаючы бацькам у іхнім абавязку выхавання дзяцей. [...] Трэба падтрымліваць каталіцкія школы ў іх місіі дапамагаць вучням развівацца як сталыя дарослыя, якія могуць убачыць свет вачыма любові Езуса і якія разумеюць жыццё як пакліканне да служэння Богу“[299]. Таму „трэба станоўча падкрэсліць свабоду Касцёла ў навучанні сваёй дактрыне, а таксама права педагогаў выказваць супраціў па меркаваннях сумлення“[300].

## „Так“ сексуальнаму выхаванню

280. Другі Ватыканскі Сабор падкрэсліў, што дзецям і моладзі неабходна даваць „станоўчае і разумнае сексуальнае выхаванне“, „па меры іхняга ўзрастання“, „выкарыстоўваючы сучасныя дасягненні ў псіхалогіі, педагогіцы і дыдактыцы“[301]. Мы павінны задаць сабе пытанне, ці нашыя выхаваўчыя асяродкі адказалі на гэты заклік. Цяжка думаць пра сексуальнае выхаванне ў час, калі існуе тэндэнцыя баналізаваць і збядняць сексуальнасць. Яе можна зразумець толькі ў кантэксце выхавання да любові, да ўзаемнага дару з сябе. Праз гэта мова сексуальнасці не падлягае сумнай з’яве збяднення, але становіцца больш глыбокай. Палавую цягу можна выхоўваць у працэсе самапазнання і развіцця здольнасці панаваць над сабой, што можа дапамагчы адкрыць каштоўныя здольнасці да радасці і любоўнай сустрэчы.

281. Сексуальнае выхаванне дае веды з улікам таго, што дзеці і моладзь не дасягнулі яшчэ поўнай сталасці. Інфармацыя павінна паступаць у адпаведны час

[299] *Relatio finalis* 2015, 68.
[300] *Тамсама*, 58.
[301] Другі Ват. Сабор, Дэкларац. *Gravissimum educationis*, 1.

і адпаведна этапу жыцця. Не трэба без развіцця крытычнага мыслення насычаць іх інфармацыяй адносна безлічы прапаноў, бескантрольнай парнаграфіі і патоку стымулаў, якія могуць скалечыць сексуальнасць. Трэба дапамагчы маладым людзям зразумець, што іх бамбардзіруюць пасланнямі, якія не спрыяюць іх дабру і сталасці. Трэба дапамагчы ім распазнаць і знайсці станоўчыя ўплывы тады, калі яны пачынаюць аддаляцца ад усяго, што скажае іх здольнасць любіць. Падобна і мы павінны зразумець, што існуе „неабходнасць у новай і больш адпаведнай мове для ўвядзення дзяцей і моладзі ў тэматыку, звязаную з сексуальнасцю“[302].

282. Сексуальнае выхаванне мае таксама вялікую вартасць тады, калі фарміруе здаровую сціпласць, хоць некаторыя думаюць, што гэта рыса мінулых часоў. Гэта натуральная абарона асобы, якая ахоўвае свой унутраны свет і асцерагаецца, каб не ператварыцца выключна ў прадмет. Без сціпласці мы можам звесці свае пачуцці і сексуальнасць да апантанай канцэнтрацыі толькі на палавых органах, што знявечыць нашую здольнасць любіць, прывядзе яе да хваравітых станаў і розных формаў сексуальнага гвалту, у выніку чаго да нас будуць адносіцца бесчалавечна або мы будзем наносіць шкоду іншым.

283. Часта сексуальнае выхаванне засяроджваецца на заахвочванні да „бяспекі“, імкнучыся да „бяспечнага сексу“. Гэтыя выразы кажуць пра негатыўныя адносіны да натуральнай пракрэацыйнай мэты сексуальнасці, быццам бы магчымае дзіця з’яўляецца ворагам, ад якога трэба бараніцца. Так распаўсюджваецца эгаістычная агрэсія, а не спагада. Неадказным

[302] *Relatio finalis* 2015, 56.

з'яўляецца кожнае заахвочванне падлеткаў забаўляцца сваім целам і сваімі жаданнямі, быццам бы яны ўжо дасягнулі сталасці, каштоўнасцяў, узаемных абавязацельстваў і мэт, уласцівых сужэнству. Такім чынам, іх заахвочваюць бесклапотна выкарыстоўваць іншую асобу як прадмет эксперыментаў, каб кампенсаваць недахопы і вялікія абмежаванні. Наадварот, важна навучыць іх шляху, які вядзе праз розныя праявы любові, узаемнага клопату, пашаны разам з чулай апекай і з багатым значэннем адносінаў. Усё гэта рыхтуе да поўнага і шчодрага дару з сябе, які выявіцца пасля заключэння сужэнства ў дары цела. Сексуальнае з'яднанне ў сужэнстве будзе тады знакам цалкавітага аддання, узбагачанага ўсім папярэднім шляхам.

284. Нельга ашукваць маладых людзей, каб яны блыталі ўзроўні, бо „сексуальная цяга на кароткі час стварае ілюзію саюзу, аднак без любові гэты «саюз» пакідае іх чужымі, як былі дагэтуль“[303]. Мова цела патрабуе цярплівага вывучэння, якое дазваляе інтэрпрэтаваць і выхоўваць свае жаданні, каб сапраўды ўзаемна даць сябе ў дар. Калі ёсць спроба даць усё і адразу, тады магчыма, што нічога не будзе дадзена. Адна рэч, разумець слабасць, якая вынікае з узросту або бязладдзя, а другая — заахвочваць моладзь да далейшай нясталасці ў любові. Але хто сёння гаворыць аб гэтым? Хто ў стане сёр'ёзна ўспрымаць маладых людзей? Хто дапаможа ім грунтоўна падрыхтавацца да цудоўнай і шчодрай любові? Занадта лёгка трактуецца сексуальнае выхаванне.

285. Сексуальнае выхаванне павінна таксама вучыць шанаваць і ацэньваць адметнасці, паказваючы

[303] Erich Fromm, *The Art of Loving*, New York 1956, p. 54 (trad. it.: *L'arte di amare*, Milano 1978, 72-73).

кожнаму шлях да пераадолення замкнёнасці ў сваіх абмежаваннях, каб адкрыцца і прыняць іншую асобу. Акрамя зразумелых цяжкасцяў, якія можа мець кожны, трэба дапамагчы ў акцэптацыі свайго цела, якім яно было створана, бо „логіка панавання над уласным целам перамяняецца часам у далікатную логіку панавання над стварэннем. [...] Таксама ацэньванне ўласнага цела ў яго жаноцкасці і мужнасці неабходна для распазнання сябе ў сустрэчы з іншымі, адрознымі ад нас. Такім чынам можна з радасцю прыняць спецыфічны дар іншай асобы як справы Бога Стварыцеля і ўзаемна ўзбагаціцца“[304]. Толькі пазбыўшыся боязі перад разнастайнасцю, можна вызваліцца ад іманэнцыі ўласнага быцця і самалюбавання. Сексуальнае выхаванне павінна дапамагчы прыняць сваё цела такім чынам, каб асоба не імкнулася „да размывання палавога адрознення, бо тады страціць сваю тоеснасць“[305].

286. Не можам таксама забываць, што на фарміраванне спосабу існавання асобы, як жанчыны і мужчыны, уплываюць не толькі біялагічныя ці генетычныя фактары, але таксама розныя элементы, звязаныя з тэмпераментам, гісторыяй сям'і, культурай, набытым досведам, атрыманым выхаваннем, уплывам сяброў, сям'і і асобаў, якімі захапляемся, а таксама іншымі канкрэтнымі абставінамі, якія патрабуюць намаганняў для прыстасавання. Гэта праўда, што мы не можам аддзяліць мужчынскае і жаночае ў справе, створанай Богам, якая з'яўляецца першаснай адносна ўсіх нашых рашэнняў і досведаў, і дзе існуюць біялагічныя элементы, якіх нельга ігнараваць. Аднак праўдай з'яўляецца

[304] Энц. *Laudato si'* (24 мая 2015), 155.
[305] *Катэхеза* (15 красавіка 2015): *L´Osservatore Romano*, 16 aprile 2015, p. 8.

таксама тое, што мужчынскае і жаночае не з’яўляецца чымсьці неэластычным. Таму, напрыклад, магчыма, што мужнасць мужа зможа эластычна дастасавацца да працоўнай сітуацыі жонкі. Прыняцце хатніх абавязкаў ці нейкіх аспектаў выхавання дзяцей не робіць яго менш мужным і не азначае нейкага паражэння, капітуляцыі або сораму. Трэба дапамагчы дзецям прыняць як нармальную рэч гэтыя слушныя „замены“, якія не прыніжаюць годнасці бацькі. Неэластычнасць становіцца празмернай маніфестацыяй таго, што мужчынскае або жаночае, і не выхоўвае ў дзяцей і моладзі ўзаемнасці, якая рэалізуецца ў сапраўдных умовах сужэнства. Гэтая неэластычнасць можа ў сваю чаргу перашкодзіць развіццю здольнасцяў кожнага да такой ступені, што будзе лічыцца чымсьці зусім не мужчынскім прысвячэнне сябе мастацтву або танцам, а мала жаночым выкананне функцый кіраўніка. Дзякуй Богу, усё змянілася, але ў некаторых месцах неадпаведныя канцэпцыі надалей уплываюць на абмежаванне абгрунтаванай свабоды і калечаць сапраўднае развіццё выразнай тоеснасці дзяцей, а таксама іх патэнцыял.

## Перадаванне веры

287. Выхаванне дзяцей павінна ахопліваць працэс перадавання веры, які сустракаецца з цяжкасцямі з увагі на сучасны стыль жыцця, гадзіны працы, а таксама складанасць сённяшняга свету, у якім многія асобы жывуць у шалёным тэмпе, каб нейкім чынам выжыць[306]. Але нягледзячы на гэта сям’я павінна застацца месцам, у якім мы вучымся заўважаць матывы

[306] Пар. *Relatio finalis* 2015, 13-14.

і прыгажосць веры, малітвы, а таксама служэння іншым. Распачынаецца гэта з хросту, праз які, як сказаў св. Аўгустын, маці, якія выхоўваюць сваіх дзяцей, „супрацоўнічаюць [з Касцёлам] у гэтым святым нараджэнні“[307]. Затым распачынаецца працэс развіцця гэтага новага жыцця. Вера — гэта дар Бога, атрыманы праз хрост, а не вынік дзеяння чалавека, аднак бацькі з'яўляюцца прыладамі Бога, якія дапамагаюць у яе сталенні і развіцці. Таму „прыгожа, калі маці вучаць малых дзяцей пасылаць пацалункі Езусу або Маці Божай. Колькі ж у гэтым пяшчоты! У такія моманты сэрца дзяцей становіцца месцам малітвы“[308]. Перадаванне веры прадугледжвае, што бацькі рэальна адчуваюць давер да Бога, шукаюць Яго, адчуваюць патрэбу ў Ім, бо толькі такім чынам „з пакалення ў пакаленне будуць хваліць Яго справы і абвяшчаць Яго магутнасць“ (пар. *Пс* 145 (144), 4) і „айцец дзецям абвяшчае Яго вернасць“ (пар. *Іс* 38, 19). Для гэтага неабходна нашая малітва аб дзеянні Бога ў сэрцах, там, куды мы не можам дасягнуць. Гарчычнае зерне, вельмі маленькае насенне становіцца вялікім дрэвам (пар. *Мц* 13, 31-32), і праз гэта мы бачым дыспрапорцыю паміж дзеяннямі і іх вынікам. Тады прызнаём, што не з'яўляемся ўладальнікамі дару, але яго клапатлівымі распарадчыкамі. Аднак дзякуючы нашаму творчаму высілку мы можам супрацоўнічаць з ініцыятывай Бога. Таму „трэба паклапаціцца аб тым, каб цанілі сужэнства, маці і айцоў, як актыўных суб'ектаў катэхезы [...]. Вялікай дапамогай з'яўляецца сямейная катэхеза як эфектыўны метад фарміравання маладых бацькоў, каб яны ўсвядомілі місію евангелізатараў уласнай сям'і“[309].

[307] *De sancta virginitate*, 7, 7: *PL* 40, 400.
[308] *Катэхеза* (26 жніўня 2015): *L´Osservatore Romano*, 27 agosto 2015, p. 8.
[309] *Relatio finalis* 2015, 89.

288. Выхаванне ў веры ўмее дастасавацца да кожнага дзіцяці, бо набытыя інструменты ці рэцэпты часам не дзейнічаюць. Дзеці патрабуюць сімвалаў, жэстаў, апавяданняў. Падлеткі часта перажываюць крызіс у адносінах да інстытуцый ці норм. Таму неабходна абуджаць іх асабісты досвед веры і даваць ім выразнае сведчанне, што ўжо прыцягвае сваёй прыгажосцю. Бацькі, якія жадаюць падтрымліваць веру сваіх дзяцей, павінны заўважаць змены, якія ў іх адбываюцца, ведаючы, што духоўны вопыт не можа навязвацца, але павінен быць дабравольным. Важна, каб дзеці бачылі, што для іх бацькоў малітва сапраўды з'яўляецца важнай. Таму хвіліны сямейнай малітвы і праяўленні народнай пабожнасці могуць мець большую евангелізацыйную моц, чым розныя катэхезы і ўсялякія прамовы. Хачу асабліва падзякаваць усім маці, якія няспынна моляцца, як св. Моніка, за дзяцей, якія адышлі ад Хрыста.

289. Перадаванне веры дзецям, у сэнсе яе больш лёгкага выяўлення і развіцця, дазваляе сям'і стаць прыладаю евангелізацыі і спантанна пачаць перадаваць яе ўсім, хто становіцца ёй блізкім, таксама па-за сямейным асяроддзем. Дзеці, якія вырастаюць у місійных сем'ях, часта становяцца місіянерамі, калі бацькі здольныя перажываць гэтае заданне так, каб іншыя лічылі іх блізкімі і прыяцелямі і каб дзеці раслі ў такім жа стаўленні да свету, не адмаўляючыся ад сваёй веры і сваіх перакананняў. Памятайма, што сам Езус еў і піў з грэшнікамі (пар. *Мк* 2, 16; *Мц* 11, 19), мог затрымацца, каб паразмаўляць з самаранкай (пар. *Ян* 4, 7-26), і прыняць ноччу Нікадэма (пар. *Ян* 3, 1-21), дазволіў, каб яго ногі намасціла чужаложніца (пар. *Лк* 7, 36-50), і не ўхіляўся ад дотыку хворых (пар. *Мк* 1,40-45; 7, 33). Тое ж рабілі Яго апосталы, якія не пагарджалі тымі,

хто быў замкнёны ў малых групах выбраных асобаў, адрэзаных ад жыцця людзей. Хоць улады пераследвалі іх, усе ім сімпатызавалі (пар. *Дз* 2, 47; 4, 21.33; 5, 13).

290. „Такім чынам сям'я становіцца суб'ектам пастырскай дзейнасці дзякуючы непасрэднаму абвяшчэнню Евангелля і перайманню разнастайных формаў сведчання: салідарнасці з беднымі, прыняцце разнастайнасці асобаў, аховы стварэння, маральнай і матэрыяльнай салідарнасці з іншымі сем'ямі, асабліва з найбольш патрабуючымі, актыўнасці ў пашырэнні агульнага дабра, таксама праз перамену несправядлівых грамадскіх структур, распачынаючы з тэрыторыі, на якой жыве, практыкуючы ўчынкі міласэрнасці для цела і душы“[310]. Усё гэта трэба змясціць у кантэксце самага каштоўнага пераканання хрысціянаў — любові Айца, які падтрымлівае нас і прычыняецца да нашага развіцця; любові, прадстаўленай у абсалютным дары Езуса Хрыста, які жыве сярод нас і робіць нас здольнымі справіцца разам з усімі бурамі і ўсімі этапамі жыцця. Таксама ў сэрцы кожнай сям'і, у кожным зручным і нязручным моманце павінна гучаць *керыгма*, каб асвятляць дарогу. Каб усе мы змаглі сказаць, зыходзячы з таго, што дасведчылі ў сваіх сем'ях: „І мы пазналі, і паверылі ў любоў, якую мае да нас Бог“ (*1 Ян* 4, 16). Толькі на падставе гэтага досведу сямейнае пастырства зможа прычыніцца да таго, каб сем'і былі адначасова хатнімі Касцёламі і евангельскай закваскай у грамадстве.

[310] *Тамсама*, 93.

## РАЗДЗЕЛ VIII

# СПАДАРОЖНІЧАЦЬ, РАСПАЗНАЦЬ І ІНТЭГРАВАЦЬ ТОЕ, ШТО СЛАБОЕ

291. Хоць Касцёл разумее, як сцвердзілі айцы Сінода, што кожны разрыў сужэнства „супярэчыць волі Бога, аднак усведамляе таксама слабасць многіх сваіх дзяцей“[311]. Асветлены позіркам Езуса Хрыста, Касцёл „з любоўю звяртаецца да тых, хто прымае ўдзел у яго жыцці няпоўным чынам, прызнаючы, што ласка Бога дзейнічае таксама і ў іх жыцці, даючы ім адвагу здзяйсняць дабро, клапаціцца з любоўю адно аб адным і служыць супольнасці, у якой жывуць і працуюць“[312]. З іншага боку, такая пастава ўмацоўваецца ў кантэксце *Юбілейнага Года*, прысвечанага міласэрнасці. Хоць заўсёды прапануе дасканаласць і заахвочвае да больш поўнага адказу Богу, „Касцёл павінен уважліва і клапатліва спадарожнічаць сваім найслабейшым дзецям, якія спазналі рану і страту любові, вяртаючы ім надзею і давер як святло маяка ці ўзнесенай сярод людзей паходні, каб асвятліць тых, хто згубіў дарогу ці знаходзіцца ў самым цэнтры буры“[313]. Не забывайма, што часта Касцёл падобны да палявога шпіталя.

[311] *Relatio Synodi* 2014, 24.
[312] *Тамсама*, 25.
[313] *Тамсама*, 28.

292. Хрысціянскае сужэнства, будучы адлюстраваннем адзінства паміж Хрыстом і Яго Касцёлам, у поўні рэалізуецца праз еднасць мужчыны і жанчыны, якія аддаюцца адно аднаму ўзаемна ў выключнай любові і дабравольнай вернасці, належаць адно аднаму аж да смерці і адкрытыя на перадаванне жыцця, асвячаныя сакрамэнтам, які дае ім ласку, каб яны станавіліся хатнім Касцёлам і рошчынай новага жыцця для грамадства. Іншыя формы саюзаў радыкальна супярэчаць гэтаму ідэалу, хоць некаторыя з іх рэалізуюць яго прынамсі часткова і аналагічна. Айцы Сінода сцвердзілі, што Касцёл не забывае ацэньваць „канструктыўныя элементы ў сітуацыях, якія яшчэ або ўжо не адпавядаюць“ яго вучэнню аб сужэнстве[314].

## Паступовасць у пастырстве

293. Айцы разглядалі таксама канкрэтную сітуацыю грамадзянскага шлюбу або, улічваючы пэўныя агаворкі, тую, дзе мае месца толькі сумеснае пражыванне: „Калі саюз дасягае значнай стабільнсці праз пасрэдніцтва грамадскай сувязі, адзначаецца глыбокім пачуццём, адказнасцю за патомства, здольнасцю перамагаць перашкоды, то ён можа разглядацца як нагода, якую трэба падтрымліваць і якая прывядзе да сакрамэнту сужэнства“[315]. З іншага боку непакоіць тое, што шмат маладых людзей не давяраюць сужэнству, ведучы сумеснае сужыццё і адкладаючы сужэнскую згоду на неакрэслены час, а іншыя спыняюць ужо прынятыя абавязацельствы і тут жа ствараюць новы

[314] Пар. *тамсама*, 41. 43; *Relatio finalis* 2015, 70.
[315] *Relatio Synodi* 2014, 27.

саюз. Асобы, якія „належаць да Касцёла, патрабуюць міласэрнай і падбадзёрваючай пастырскай зацікаўленасці“[316]. Сапраўды, пастыр павінен не толькі прапагандаваць хрысціянскае сужэнства, але таксама мець „пастырскае распазнаванне сітуацыі ўсіх тых, хто ўжо не жыве ў гэтай рэчаіснасці“, каб „распачаць пастырскі дыялог з такімі асобамі, каб пазнаць элементы іх жыцця, якія могуць прывесці да большага адкрыцця на Евангелле сужэнства ва ўсёй яго паўнаце“[317]. У пастырскім распазнаванні трэба „вызначыць элементы, якія могуць спрыяць евангелізацыі, а таксама чалавечаму і духоўнаму ўзрастанню“[318].

294. „Выбар грамадзянскага шлюбу або, у іншых выпадках, сумеснага пражывання без шлюбу вельмі часта не матывуецца прадузятасцю або непрыняццем сакрамэнтальнага саюзу, але культурнай сітуацыяй або выпадковымі абставінамі“[319]. Такія сітуацыі дазваляюць ацаніць тыя знакі любові, якія ў нейкай меры адлюстроўваюць любоў Бога[320]. Мы ведаем, што „пастаянна ўзрастае лічба тых, хто пасля доўгага сумеснага жыцця просяць аб удзяленні сакрамэнту сужэнства ў Касцёле. Само толькі сужыццё з’яўляецца часта выбарам, які вынікае з агульнага спосабу мыслення, насуперак інстытуцыям і прыняццю канчатковых абавязацельстваў, і таксама з чакання бяспечнага існавання (пастаянная праца і заробак). У некаторых краінах ёсць шмат нефармальных саюзаў не толькі таму, што адкідваюцца каштоўнасці сям’і і сужэнства, але

[316] *Тамсама*, 26.
[317] *Тамсама*, 41.
[318] *Тамсама*.
[319] *Relatio finalis* 2015, 71.
[320] Пар. *тамсама*.

перадусім таму, што заключэнне сужэнства ўспрымаецца як раскоша з увагі на сацыяльныя ўмовы, і таму матэрыяльная беднасць штурхае да жыцця ў нефармальных (фактычных) саюзах“[321]. Аднак трэба супастаўляць усе гэтыя сітуацыі канструктыўна, як спробу пераменіць іх у магчымасць ісці да паўнаты сужэнства і сям'і ў святле Евангелля. Маецца на ўвазе прыняцце і суправаджэнне сям'і з цярплівасцю і далікатнасцю[322]. Менавіта так робіць Езус адносна самаранкі (пар. *Ян* 4, 1-26); прамовіў да яе прагненне сапраўднай любові, каб вызваліць яе ад усяго, што зацямняла яе жыццё, і прывесці яе да Евангелля, поўнага радасці.

295. У сувязі з гэтым Ян Павел II прапанаваў г. зв. „закон паступовасці“, разумеючы, што чалавек „пазнае, любіць і здзяйсняе маральнае дабро ў адпаведнасці з этапамі свайго развіцця“[323]. Гэта не „паступовасць закону“, але паступовасць у разважлівым выкананні свабодных чынаў суб'ектамі, якія не ў стане зразумець, ацаніць або ў поўні рэалізаваць патрабаванні закону. Бо закон — гэта таксама дар Бога, які указвае дарогу, дар для ўсіх без выключэння, якім можна жыць дзякуючы сіле ласкі, хоць кожны чалавек развіваецца „павольна праз паступовае ўключэнне дароў Бога і патрабаванняў Яго канчатковай і самай дасканалай Любові ва ўсё асабістае і грамадскае жыццё чалавека“[324].

[321] *Relatio Synodi* 2014, 42.
[322] *Тамсама*, 43.
[323] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 34: *AAS* 74 (1982), 123.
[324] *Тамсама*, 9: 90.

## Распазнаванне
## г. зв. „нестандартных“ сітуацый[325]

296. Сінод разгледзіў розныя сітуацыі слабасці і недасканаласці. У сувязі з гэтым хачу нагадаць тое, што жадаў выразна прадставіць усяму Касцёлу, каб мы не паблыталі дарог: „Ва ўсёй гісторыі Касцёла мы бачым дзве логікі: спіхванне на перыферыю і ўключэнне [...]. Дарога Касцёла, пачынаючы з Ерузалемскага Сабору, з'яўляецца заўсёды дарогай Езуса: дарогай міласэрнасці і інтэграцыі [...]. Дарога Касцёла — гэта не асуджэнне на вечнасць нікога; гэта ахвяраванне міласэрнасці Бога ўсім людзям, якія шчырым сэрцам аб гэтым просяць [...]. Сапраўдная любоў заўсёды незаслужаная, безумоўная і бескарыслівая!“[326]. Таму „трэба пазбягаць асуджэння, якое не зважае на складанасць розных сітуацый, і абавязкова трэба звяртаць увагу на тое, як людзі жывуць і церпяць з прычыны свайго становішча“[327].

297. Маецца на ўвазе ўключэнне ўсіх. Трэба дапамагчы кожнаму знайсці яго спосаб удзелу ў касцёльнай супольнасці, каб ён адчуваў сябе аб'ектам „незаслужанай, безумоўнай і бескарыслівай“ міласэрнасці. Ніхто не можа быць асуджаны назаўжды, бо гэта не логіка Евангелля! Я не маю на ўвазе толькі разведзеных, якія жывуць у новых шлюбах, але ўсіх, незалежна ад сітуацыі, у якой яны знаходзяцца. Зразумела, што той, хто выдае аб'ектыўны грэх за частку

[325] Пар. *Катэхеза* (24 чэрвеня 2015): *L'Osservatore Romano*, 25 giugno 2015, p. 8.

[326] *Гамілія падчас св. Імшы з новымі кардыналамі* (15 лютага 2015): *AAS* 107 (2015),

[327] *Relatio finalis* 2015, 51.

хрысціянскага ідэалу, ці хоча дыктаваць штосьці супярэчнае вучэнню Касцёла, не можа патрабаваць, каб яму дазволілі навучаць катэхізісу ці прапаведаваць, бо тут існуе штосьці, што аддзяляе ад супольнасці (пар. *Мц* 18, 17). Ён павінен нанова пачуць Евангелле і заклік да навяртання. Але і для такой асобы можа існаваць нейкі спосаб удзелу ў жыцці супольнасці: у сацыяльнай працы, у малітоўных сустрэчах або ў тым, што можа паходзіць з яго ініцыятывы, з улікам меркавання пастыра. У дачыненні да розных, гэтак званых „нестандартных“сітуацый, айцы Сінода дасягнулі агульнай згоды, якую я падтрымліваю: „Каб па-пастырску падысці да асобаў, якія заключылі толькі грамадзянскі шлюб, да разведзеных, якія жывуць у новых сужэнскіх саюзах, ці тых, якія толькі жывуць разам, Касцёл абавязаны паказаць ім Божую педагогіку ласкі ў іх жыцці і дапамагчы ім у поўні рэалізаваць план Бога“[328], што заўсёды магчыма з дапамогай Духа Святога.

298. Разведзеныя асобы, якія жывуць у новым шлюбе, могуць, напрыклад, апынуцца ў вельмі розных сітуацыях, якія не павінны класіфікавацца або характарызавацца вельмі жорстка, без належнага асабістага і пастырскага распазнавання. Чымсьці іншым з’яўляецца другі шлюб, які з часам умацаваўся, з новымі дзецьмі, з праверанай вернасцю, велікадушнай ахвярнасцю, хрысціянскай актыўнасцю, усведамленнем няправільнасці сваёй сітуацыі і немагчымасцю зрабіць крок назад без адчування ў сумленні, што можна набыць новую віну. Касцёл прызнае сітуацыі, „калі мужчына і жанчына, якія па сур’ёзных прычынах — напрыклад, выхаванне дзяцей — не

[328] *Relatio Synodi* 2014, 25.

могуць разысціся“[329]. Існуе таксама сітуацыя асобаў, якія зрабілі вялікі высілак дзеля ўратавання першага сужэнства і былі несправядліва пакінуты, або „тых, хто заключыў новы шлюб дзеля выхавання дзяцей, часта будучы ў сумленні суб’ектыўна ўпэўненымі, што папярэдняе сужэнства, беспаваротна знішчанае, ніколі не было сапраўдным“[330]. Іншая справа — новы шлюб, заключаны пасля нядаўняга разводу, з усімі наступствамі цярпення і знішчэння, якое закранае дзяцей і цэлыя сем’і, або сітуацыя кагосьці, хто шматразова не выконваў сваіх сямейных абавязацельстваў. Павінна быць ясна, што гэта не ідэал, які прапануе Евангелле для сужэнства і сям’і. Айцы Сінода сцвердзілі, што пастыры заўсёды павінна рабіць „адпаведнае адрозненне“[331] і „добра распазнаць сітуацыю“[332]. Мы ведаем, што „не маем простых адказаў“[333].

299. Я прымаю разважанні многіх айцоў Сінода, якія пажадалі сцвердзіць, што „ахрышчаныя асобы, якія развяліся і заключылі новы грамадзянскі шлюб, павінны больш прыцягвацца рознымі спосабамі да хрысціянскай супольнасці, пазбягаючы розных нагодаў для згаршэння. Ключом пастырскага суправаджэння з’яўляецца логіка інтэграцыі, каб яны не толькі

[329] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 84: *AAS* 74 (1982), 186. У такіх сітуацыях многія, ведаючы і прымаючы магчымасць заставацца ў шлюбе „як брат і сястра“, якую прапануе ім Касцёл, адкрываюць, што калі няма пэўных праяў інтымнасці, „то вернасць нярэдка выпрабоўваецца, а дабро патомства ставіцца пад пагрозу“ (Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 51).

[330] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 84: *AAS* 74 (1982), 186

[331] *Relatio Synodi* 2014, 26.

[332] Пар. *тамсама*, 45.

[333] Бэнэдыкт XVI, *Прамова падчас VII Сусветнай сустрэчы сем’яў, Мілан (2 чэрвеня 2012): Insegnamenti VIII, 1 (2012), 691.*

ведалі, што належаць да цела Хрыста, якім з'яўляецца Касцёл, але каб маглі мець радасны і плённы досвед гэтага. Яны ахрышчаны, з'яўляюцца братамі і сёстрамі, Дух Святы разлівае ў іх дары і харызмы дзеля агульнага дабра. Іх удзел можа выяўляцца ў розных касцёльных паслугах: таму трэба распазнаць, якія з розных форм выключэння, практыкаваных сёння ў літургічнай, пастырскай, адукацыйнай, а таксама ў інстытуцыянальнай сферы, можна адмяніць. Яны не толькі не павінны адчуваць сябе экскамунікаванымі, але могуць жыць і развівацца як жывыя члены Касцёла, адчуваючы, што ён з'яўляецца для іх як маці, якая заўсёды прымае, клапоціцца з любоўю і падтрымлівае іх на дарозе жыцця і Евангелля. Гэтая інтэграцыя неабходна таксама з увагі на клопат і хрысціянскае выхаванне іх дзяцей, якія павінны быць прызнаныя як самыя важныя"[334].

300. Беручы пад увагу незлічоную разнастайнасць канкрэтных сітуацый, пералічаных вышэй, можна зразумець, што не трэба чакаць ад Сінода і гэтай адгартацыі новых агульных норм кананічнага тыпу, якія можна было б стасаваць да ўсіх выпадкаў. Магчымым ёсць толькі новае заахвочванне да адказнага асабістага і пастырскага распазнавання індывідуальных сітуацый, калі трэба прызнаць, што, паколькі „ступень адказнасці неаднолькавая ў кожным выпадку"[335], то наступствы або вынікі дадзенай нормы неабавязкова павінны быць аднолькавымі[336]. Заданне святароў —

[334] *Relatio finalis* 2015, 84.

[335] *Тамсама*, 51.

[336] Нават, калі маецца на ўвазе сакрамэнтальная дысцыпліна, бо пасля распазнавання можна сцвердзіць, што ў дадзенай сітуацыі няма сур'ёзнай віны. Выкарыстоўваецца тут тое, пра што я сказаў у іншым дакуменце: пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 44. 47.

„спадарожнічаць зацікаўленым асобам на шляху распазнавання, згодна з вучэннем Касцёла і ўказаннямі біскупа. У гэтым працэсе карысным будзе выкананне рахунку сумлення на працягу хвіліны разважання і скрухі. Разведзеныя асобы, якія заключылі новы саюз, павінны задаць сабе пытанне, як яны паводзілі сябе адносна сваіх дзяцей, калі сужэнства перажывала крызіс; ці былі спробы паяднання; у якой сітуацыі знаходзіцца пакінуты сужэнец; якія наступствы маюць новыя адносіны для рэшты сям'і і супольнасці вернікаў; які прыклад яны даюць маладым людзям, што рыхтуюцца да сужэнства. Шчырае разважанне можа ўмацаваць давер да Божай міласэрнасці, у якой нікому няма адмовы“[337]. Маецца на ўвазе працэс суправаджэння і распазнавання, які „накіроўвае гэтых вернікаў да зразумення сваёй сітуацыі перад Богам. Шчырая размова са святаром дапаможа сфарміраваць правільную ацэнку таго, што перашкаджае больш поўна ўдзельнічаць у жыцці Касцёла, а таксама зрабіць крокі, якія дапамогуць у гэтым і паспрыяюць развіццю. Зважаючы на тое, што ў самім законе няма паступовасці (пар. *Familiaris consortio*, 34), то распазнаванне заўсёды павінна браць пад увагу патрабаванні евангельскай праўды і любові, якую прапануе Касцёл. Каб так сталася, неабходна запэўніць неабходныя ўмовы для пакоры, далікатнасці, любові да Касцёла і яго вучэння, у больш шырокім шуканні Божай волі і жаданні даць на яе больш дасканалы адказ“[338]. Такія паставы маюць фундаментальнае значэнне ў тым, каб пазбегнуць памылковых перакананняў, што нейкі святар можа хутка згадзіцца на „выключэнні“, або, што ёсць людзі, якія могуць атрымаць сакрамэнтальныя

[337] *Relatio finalis* 2015, 85.
[338] *Тамсама*, 86.

прывілеі за паслугі. Калі маем дачыненне з адказнай і стрыманай асобай, якая не ставіць свае жаданні вышэй за агульнае дабро Касцёла, а таксама з пастырам, які здольны распазнаць сур'ёзнасць пытання, то няма пагрозы, што нейкае распазнаванне прывядзе да меркавання, што Касцёл падтрымлівае падвойную маральнасць.

## Змякчальныя акалічнасці ў пастырскім распазнаванні

301. Каб добра зразумець, чаму магчымым і неабходным з'яўляецца канкрэтнае распазнаванне ў некаторых сітуацыях, названых „нестандартнымі“, існуе штосьці, што заўсёды трэба браць пад увагу, каб ніхто не атаясамліваў гэтага з намаганнямі мінімалізаваць патрабаванні Евангелля. Касцёл мае грунтоўныя разважанні на тэму змякчальных умоў і абставінаў. Таму нельга сказаць, што кожны, хто знаходзіцца ў г. зв. „нестандартнай“ сітуацыі, жыве ў стане смяротнага граху, пазбаўлены асвячальнай ласкі. Абмежаванні не залежаць толькі ад магчымага няведання нормы. Суб'ект, хоць і добра ведае норму, можа мець вялікія цяжкасці ў разуменні „каштоўнасцяў, змешчаных у маральнай норме“[339], або можа апынуцца ў пэўных умовах, якія не дазваляюць яму дзейнічаць інакш і прыняць іншыя рашэнні без новай віны. Як добра заўважылі айцы Сінода, „могуць існаваць фактары, якія абмяжоўваюць здольнасць прымаць рашэнні“[340]. Св. Тамаш Аквінскі прызнаў, што хтосьці, маючы ласку і міласэрнасць,

[339] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 33: *AAS* 74 (1982), 121.
[340] *Relatio finalis* 2015, 51.

можа аднак не практыкаваць адну з цнотаў[341]. Таму, нават маючы ўсе тэалагальныя маральныя цноты, не сведчыць выразна пра існаванне ніводнай з іх, бо знешняе дзеянне гэтай цноты сустракаецца з перашкодамі: „калі кажуць, што некаторыя святыя не мелі нейкіх цнотаў, аднак, яны мелі звычку ўсіх цнотаў“[342].

302. Зважаючы на гэтыя ўмовы, *Катэхізіс Каталіцкага Касцёла* станоўча выказваецца: „Віна і адказнасць за дзеянне могуць быць зменшаны, а нават зняты па прычыне невуцтва, няўвагі, прымусу, страху, прызвычаення, неапанаваных пачуццяў, а таксама па прычыне іншых псіхічных і грамадскіх фактараў“[343]. У іншым параграфе зноў згадваюцца акалічнасці, якія змяншаюць маральную адказнасць, і вельмі падрабязна гаворыцца пра „пачуццёвую нясталасць, набытыя звычкі, стан боязі або іншыя псіхічныя ці грамадскія фактары“[344]. Таму негатыўная ацэнка аб'ектыўнай сітуацыі не сведчыць пра адказнасць ці віну дадзенай асобы[345]. У кантэксце гэтых перакананняў лічу вельмі адпаведным тое, што сцвердзілі многія айцы Сінода: „У пэўных абставінах людзі сустракаюцца з сур'ёзнымі цяжкасцямі, каб дзейнічаць інакш. [...] Пастырскае

[341] Пар. *Summa Theologiae* I-II, q. 65, a. 3, ad 2; *De malo*, q. 2, a. 2.

[342] *Тамсама*, ad 3.

[343] N. 1735.

[344] Пар. *тамсама*, 2352; Кангрэгацыя Веравучэння, Дэкларацыя аб эўтаназіі, *Iura et bona* (5 мая 1980), II: *AAS* 72 (1980), 546. Ян Павел II, крытыкуючы катэгорыю „фундаментальнага бачання“, прызнаваў, што „несумненна могуць узнікнуць вельмі складаныя і неясныя псіхалагічныя сітуацыі, якія аказваюць уплыў на суб'ектыўную віну грэшніка“ (Апост. адгарт. *Reconciliatio et paenitentia* [2 снежня 1984], 17: *AAS* 77 [1985], 223).

[345] Пар. Папская Рада па інтэрпрэтацыі юрыдычных тэкстаў, *Dichiarazione sull'ammissibilità alla Comunione dei divorziati risposati* (24 чэрвеня 2000), 2.

распазнаванне, зважаючы на правільна сфарміраванае сумленне асобаў, павінна адчуваць адказнасць за такія сітуацыі. Таксама наступствы здзейсненых чынаў не абавязкова павінны быць аднолькавымі ў кожным выпадку“[346].

303. Усведамляючы значэнне канкрэтных умоў, можам дадаць, што сумленне чалавека павінна шырэй уключацца ў практыку Касцёла ў тых сітуацыях, якія аб’ектыўна адыходзяць ад нашага разумення сужэнства. Зразумела, мы павінны заахвочваць да сталасці асветленага і сфарміраванага сумлення, якому спадарожнічае адказнае і сур’ёзнае разуменне пастыра, і прапанаваць штораз большы давер да ласкі. Аднак сумленне можа прызнаць не толькі тое, што дадзеная сітуацыя аб’ектыўна не адпавядае агульным пастулатам Евангелля, але можа таксама шчыра і сумленна прыняць тое, што ў дадзеную хвіліну з’яўляецца велікадушным адказам, які можна даць Богу, і адкрыць з нейкай маральнай упэўненасцю, што гэта дар, якога патрабуе сам Бог сярод канкрэтных складаных абмежаванняў, хоць гэта яшчэ не цалкам аб’ектыўны ідэал. У любым выпадку памятайма, што гэтае распазнанне дынамічнае і заўсёды павінна быць адкрытым на новыя этапы развіцця і новыя рашэнні, якія дазваляюць больш поўна рэалізаваць ідэал.

## Нормы і разуменне

304. Было б недастатковым разважаць толькі, ці дзеянне дадзенай асобы адпавядае ці не адпавядае нейкаму закону ці агульнай норме, бо гэтага недастат-

[346] *Relatio finalis* 2015, 85.

кова для разумення і гарантыі поўнай вернасці Богу ў канкрэтным жыцці чалавека. Горача прашу, каб мы памяталі тое, чаму вучыў св. Тамаш Аквінскі, і стараліся прымяняць гэта ў пастырскім распазнаванні: „Хоць існуе нейкая неабходнасць у агульных прынцыпах, аднак, чым больш сягаем да дэталяў, тым лягчэй парушаем. [...] Што да сферы дзеянняў, калі гаворка ідзе пра дэталі, не ўсе маюць тую самую праўду ці слушнасць, толькі калі гаворка ідзе пра агульныя прынцыпы. Ды і тыя, якія маюць тую самую праўду і слушнасць, не ўсім вядомыя ў аднолькавай ступені. [...] Чым больш сягаем да дэталяў, тым больш памнажаюцца спосабы парушэнняў“[347]. Сапраўды, агульныя нормы з’яўляюцца нейкім дабром, якое ніколі нельга ігнараваць ці занядбоўваць, але ў сваіх фармуліроўках яны не могуць ахапіць абсалютна ўсе канкрэтныя сітуацыі. Таксама трэба сказаць, што менавіта таму тое, што з’яўляецца часткай практычнага разумення канкрэтнай сітуацыі не можа ўзносіцца да ўзроўню нормы. Гэта не толькі прывяло б да нязноснай казуістыкі, але пашкодзіла б каштоўнасцям, якія павінны ахоўвацца з асаблівай старанnасцю[348].

305. У сувязі з гэтым пастыр не можа быць задаволены, карыстаючыся толькі маральным законам адносна асобаў, якія жывуць у „нестандартных“ сітуацыях, быццам яны каменне, якое кідаецца ў жыццё асобаў. Так здараецца ў выпадку закрытых сэрцаў, якія часта хаваюцца нават за вучэнне Касцёла, каб „сесці

[347] *Summa Theologiae* I-II, q. 94, art. 4.

[348] Звяртаючыся да агульнай знаёмсці нормы, а таксама да асаблівай знаёмасці практычнага разумення св. Тамаш сцвярджае, што „калі існуе толькі адно з двух пазнанняў, то лепш было б, каб было гэта пазнанне канкрэтнай рэчаіснасці, якое бліжэй да дзеяння“ (*Sententia libri Ethicorum,* VI, 6 [ed. Leonina, t. XLVII, 354]).

на пасадзе Майсея і судзіць, часам з пачуццём перавагі і павярхоўна, цяжкія выпадкі і зраненыя сем'і"[349]. У гэтым жа сэнсе выказалася Міжнародная Тэалагічная Камісія: „Натуральны закон не можа прадстаўляцца як збор ужо прынятых правіл, якія абавязваюць *a priori* маральнага суб'екта, гэта крыніца натхнення для яго надзвычай асабістых намаганняў у прыняцці рашэння"[350]. З увагі на ўмовы і змякчальныя фактары становіцца магчымым, што сярод нейкай аб'ектыўнай сітуацыі граху асоба, якая суб'ектыўна не мае віны ці не цалкам вінаватая, можа жыць у Божай ласцы, можа любіць, а таксама можа ўзрастаць у жыцці ласкі і любові, атрымліваючы для гэтага дапамогу Касцёла[351]. Распазнаванне павінна дапамагчы знайсці магчымыя шляхі, каб даць адказ Богу і развівацца сярод складанасцяў. Жывучы перакананнем, што ўсё белае або чорнае, мы нярэдка закрываем дарогу для ласкі і ўзрастання, а таксама занядбоўваем высілкі ў імкненні да святасці, якія прыносяць хвалу Богу. Нагадаем, што „маленькі крок сярод вялікіх чалавечых магчымасцяў можа больш падабацца Богу, чым знешне правільнае жыццё чалавека, які праводзіць дні без змагання з сур'ёзнымі цяжкасцямі"[352]. Канкрэтнае пастырства распарадчыкаў і супольнасцяў не можа ігнараваць гэтага.

[349] *Прамова на заканчэнне XIV Звычайнага Агульнага Сходу Сінода Біскупаў* (24 кастрычніка 2015): *L'Osservatore Romano,*26-27 ottobre 2015, p. 13.

[350] *In cerca di un'etica universale: nuovo sguardo sulla legge naturale* (2009), 59.

[351] У некаторых выпадках гэта магла б быць дапамога сакрамэнтаў. Таму „святарам нагадваю, што канфесіянал не павінен быць камерай катаванняў, але месцам міласэрнасці Пана" (Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* [24 лістапада 2013], 44). Таксама падкрэсліваю, што Эўхарыстыя — „гэта не ўзнагарода для дасканалых, але шчодры лек і ежа для слабых" (*тамсама*, 47).

[352] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 44.

306. У любых абставінах асобы, якія маюць цяжкасці ў больш поўным жыцці Божым законам, павінны пачуць запрашэнне прайсці *via caritatis.* Братэрская любоў з’яўляецца першым законам хрысціянаў (пар. *Ян* 15, 12; *Гал* 5, 14). Не забывайма абяцання Святога Пісання: „Перш за ўсё, майце шчырую любоў адзін да аднаго, таму што любоў закрывае мноства грахоў“ (*1 П* 4, 8). „Адкупі свае грахі справядлівасцю, а сваё беззаконне — міласэрнасцю да ўбогіх“ (*Дан* 4, 24). „Вада гасіць палаючы агонь, а міласціна закрывае грахі“ (*Сір* 3, 30). Падобна навучае св. Аўгустын: „Пры небяспецы пажару мы бяжым шукаць вады, каб яго пагасіць, [...] таксама, калі б з нашай саломы ўзнікла полымя граху і з гэтай прычыны мы былі б узрушаныя, то калі будзе ў нас магчымасць здзейсніць справу міласэрнасці, радуймася гэтай справе, быццам крыніцы, дадзенай нам для таго, каб пагасіць пажар“[353].

## Логіка пастырскай міласэрнасці

307. Каб пазбегнуць усялякіх памылковых інтэрпрэтацый, трэба памятаць, што Касцёл ніякім чынам не можа адмовіцца ад прапановы поўнага ідэалу сужэнства, ад Божага плану ва ўсёй прыгажосці: „Маладых ахрышчаных людзей трэба заахвочваць, каб яны не вагаліся прыняць багацце, якое іх планам любові дае сакрамэнт сужэнства. Няхай будуць умацаваныя падтрымкаю, што дае ласка Хрыста і магчымасць поўнага ўдзелу ў жыцці Касцёла“[354]. Абыякавасць, розныя формы рэлятывізму ці празмерная павага, з якой ён прапануецца, супярэчаць вернасці Евангеллю

[353] *De catechizandis rudibus*, I, 14, 22: *PL* 40, 327; пар. Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 193.
[354] *Relatio Synodi* 2014, 26.

і з’яўляюцца недахопам любові Касцёла да самых маладых. Разуменне выключных сітуацый ніколі не азначае хавання святла больш поўнага ідэалу ці прапанаванне чагосьці меншага за тое, што Езус прапануе чалавеку. Сёння больш важным за пастырства няўдач з’яўляецца пастырская дзейнасць, скіраваная на ўмацаванне сужэнства, што прадухіляе разводы.

308. Аднак паводле нашага разумення, на падставе змякчальных абставінаў — псіхалагічных, гістарычных, а нават біялагічных — вынікае, што „не змяншаючы вартасці евангельскага ідэалу, неабходна з міласэрнасцю і цярплівасцю спадарожнічаць магчымым этапам узрастання асобаў, якія фарміруюцца з дня ў дзень“, робячы „месца для міласэрнасці Пана, які заахвочвае нас рабіць магчымае дабро“[355]. Я разумею тых, хто жадае больш рыгарыстычнага пастырства, не пакідаючы месца ніякай блытаніне. Аднак шчыра веру, што Езус Хрыстус прагне Касцёла, які б звяртаў увагу на дабро, якое Дух Святы распаўсюджвае сярод слабасці: Маці, якая адначасова паказвае выразна аб’ектыўнае вучэнне і дзеля „дасягнення найбольшага дабра не баіцца запэцкацца вулічным брудам“[356]. Пастыры, якія прапануюць вернікам поўны ідэал Евангелля і вучэнне Касцёла, павінны таксама дапамагаць ім прыняць логіку спачування слабым і пазбягання праследу ці празмерна суровых і нецярплівых асуджэнняў. Тое самае Евангелле заклікае нас, каб мы не судзілі і не асуджалі (пар. *Мц* 7, 1; *Лк* 6, 37). Езус „чакае, што мы адмовімся ад пошуку асабістых ці калектыўных сродкаў, якія дазволяць нам захаваць

[355] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 44.
[356] *Тамсама*, 45.

дыстанцыю да сутнасці чалавечай пакуты. Хоча, каб мы сапраўды захацелі ўвайсці ў канкрэтнае жыццё іншых і пазналі моц пяшчоты. Калі так паступаем, то жыццё заўсёды цудоўна ўскладняецца“[357].

309. Невыпадкова, што гэтыя разважанні адбываюцца ў кантэксце Юбілейнага Года Міласэрнасці, бо перад абліччам самых розных сітуацый, якія ўплываюць на сям'ю, місіяй Касцёла застаецца „абвяшчэнне міласэрнасці Бога, жывога сэрца Евангелля, каб такім чынам дастукацца да сэрца і розуму кожнага чалавека. Абранніца Хрыста набывае аўчарню Божага Сына, які выходзіў насустрач усім, не абмінаючы нікога“[358]. Добра ведае, што Езус прадстаўляў сябе як пастыра ста авечак, а не дзевяноста дзевяці. Хоча іх усіх. Зыходзячы з гэтага стане магчымым, што „да ўсіх, як веруючых, так і тых, хто знаходзіцца здалёк, [...] дойдзе бальзам міласэрнасці, як знак Божага Валадарства, якое ўжо прысутнічае сярод нас“[359].

310. Мы не можам забываць, што „міласэрнасць — гэта не толькі чын Айца, але крытэрый, які дазваляе зразумець, кім з'яўляюцца Яго сапраўдныя дзеці. Мы пакліканы жыць міласэрнасцю, бо гэта мы спачатку спазналі міласэрнасць“[360]. Гэта не рамантычная прапанова або слабы адказ на любоў Бога, якая заўсёды прагне падтрымліваць людзей, бо „архітравам, на якім абапіраецца жыццё Касцёла, з'яўляецца міласэрнасць. Усё ў пастырскай дзейнасці Касцёла павінна быць прасякнута чуласцю, скіраванай да вернікаў; у тым,

[357] *Тамсама*, 270.
[358] Булла *Misericordiae Vultus* (11 красавіка 2015), 12.
[359] *Тамсама*, 5.
[360] *Тамсама*, 9.

што ён абвяшчае і пра што сведчыць перад светам, не павінна неставаць міласэрнасці“[361]. Гэта праўда, што часам мы „паводзім сябе як кантралёры ласкі, а не як пасрэднікі. Але Касцёл — не мытня, а бацькоўскі дом, дзе ёсць месца для кожнага з яго нялёгкім жыццём“[362].

311. Вучэнне маральнай тэалогіі не павінна ігнараваць гэтыя разважанні, бо паколькі праўдай з'яўляецца тое, што мы павінны клапаціцца аб інтэгральнасці маральнага вучэння Касцёла, аднак заўсёды трэба звяртаць асаблівую ўвагу на тое, каб паказаць і заахвоціць да самых узнёслых і цэнтральных каштоўнасцяў Евангелля[363], асабліва першынства любові як адказу на бескарыслівую ініцыятыву любові Бога. Часам нам вельмі цяжка адвесці месца ў пастырстве для бескарыслівай любові Бога[364]. Гэтым мы ставім шмат умоў для міласэрнасці і пазбаўляем яе канкрэтнага сэнсу і рэальнага значэння, а гэта найгоршы спосаб разбаўлення Евангелля. Слушна, напрыклад, што міласэрнасць не выключае справядлівасці і праўды, але перш трэба сказаць, што міласэрнасць — гэта паўната справядлівасці і найвыразнейшая маніфестацыя Божай праўды. Таму трэба заўсёды таксама прызнаваць „неадэкватнай кожную тэалагічную канцэп-

[361] *Тамсама*, 10.

[362] Апост. адгарт. *Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 47.

[363] Пар. *тамсама*, 36-37.

[364] Магчыма з увагі на дробязі, укрытыя за вялікім жаданнем быць вернымі праўдзе, некаторыя святары патрабуюць ад пэнітэнтаў пастанаўлення выправіцца без ніякай хвейнасці. Так міласэрнасць знікае ў пошуках гіпатэтычна чыстай справядлівасці. Таму варта нагадаць навучанне св. Яна Паўла II, які сцвердзіў, што прадбачанне новага падзення „не прадвырашае аб праўдзівасці пастанаўлення“ (*Lettera al Card. William W. Baum in occasione del corso sul foro interno organizzato dalla Penitenzeria Apostolica* [22 сакавіка 1996], 5: *Insegnamenti* XIX, 1 [1996], 589).

цыю, якая ў выніку ставіць пад сумніў усемагутнасць Бога, асабліва Яго міласэрнасць“[365].

312. Гэта стварае для нас кантэкст і клімат, які перашкаджае развіццю халоднай кабінетнай маральнасці ў вырашэнні найбольш далікатных пытанняў і змяшчае нас у кантэксце пастырскага распазнавання, поўнага міласэрнай любові, якая заўсёды гатовая зразумець, прабачыць, спадарожнічаць, чакаць і якая перадусім спрыяе інтэграцыі. Гэтая логіка павінна дамінаваць у Касцёле, каб „адчуць адкрытасць сэрца для ўсіх тых, хто жыве на самых разнастайных жыццёвых перыферыях“[366]. Заахвочваю верных, якія жывуць у цяжкіх сітуацыях, з даверам распачынаць размову са сваімі пастырамі, а таксама свецкімі асобамі, аддданымі Пану. Хоць не заўсёды знойдуць у іх падтрымку сваіх ідэй і жаданняў, аднак напэўна атрымаюць святло, якое дазволіць ім лепш зразумець тое, што адбываецца, і змогуць адкрыць шлях асабістага сталення. Заахвочваю таксама пастыраў выслухоўваць з любоўю і спакоем, са шчырым жаданнем дайсці да сутнасці драмы асобаў і зразумець іх пункт гледжання, каб дапамагчы ім жыць лепш і распазнаць сваё месца ў Касцёле.

[365] Міжнародная Тэалагічная Камісія, *La speranza della salvezza per i bambini che muoiono senza battesimo* (19 aprile 2007), 2.
[366] Булла *Misericordiae Vultus* (11 красавіка 2015), 15.

## РАЗДЗЕЛ IX

# СУЖЭНСКАЯ І СЯМЕЙНАЯ ДУХОЎНАСЦЬ

313. Любоў набывае розныя формы ў залежнасці ад стану жыцця, да якога кожны быў пакліканы. Больш за палову стагоддзя назад Другі Ватыканскі Сабор, кажучы пра апостальства свецкіх, падкрэсліў духоўнасць, якая вынікае з сямейнага жыцця. Заўважыў, што „сужэнства і сям'я (...) павінны вызначаць своеасаблівыя рысы духоўнасці свецкіх"[367], а „сямейныя клопаты (...) не павінны заставацца па-за сферай іх духоўнага жыцця"[368]. Акрамя таго варта затрымацца коратка на апісанні некалькіх асноўных рыс, уласцівых гэтай адмысловай духоўнасці, якая развіваецца ў дынаміцы адносінаў у сямейным жыцці.

### ДУХОЎНАСЦЬ НАДПРЫРОДНАЙ ЕДНАСЦІ

314. Мы заўсёды казалі пра прабыванне Бога ў сэрцы асобы, якая жыве Яго ласкай. Сёння мы можам сказаць, што Найсвяцейшая Тройца заўсёды прысутнічае

[367] ДРУГІ ВАТ. САБОР, Дэкрэт *Apostolicam actuositatem*, 4.
[368] Пар. *тамсама.*

ў святыні сужэнскай еднасці. Як жыве ў хвале свайго народу (пар. *Пс* 22, 4), так прабывае таксама глыбока ў сужэнскай любові, якая аддае хвалу Богу.

315. Пан жыве ў сапраўднай і канкрэтнай сям'і, з усімі яе цярпеннямі, змаганнямі, радасцямі і штодзённымі пастановамі. Жывучы ў сям'і, цяжка прыкідвацца і падманваць, не можам надзяваць маскі. Калі гэтую сапраўднасць ажыўляе любоў, то Пан валадарыць са сваёй радасцю і спакоем. Духоўнасць сямейнай любові складаецца з мноства праўдзівых і канкрэтных чынаў. Бог мае сваё жыллё ў гэтай разнастайнасці дароў і сустрэч, якія садзейнічаюць узрастанню еднасці. Гэтае адданне лучыць „каштоўнасці чалавечыя і боскія“[369], бо яно поўнае любові Бога. Канчаткова сужэнская духоўнасць з'яўляецца духоўнасцю повязяў, у якой жыве Божая любоў.

316. Добра пераҗытая сямейная еднасць — гэта сапраўдная дарога да святасці ў штодзённым жыцці і дарога містычнага развіцця, сродак унутранага з'яднання з Богам. Братэрскія і супольнасныя вымаганні сямейнага жыцця з'яўляюцца нагодай да штораз большага адкрыцця сэрца, а гэта штораз паўней дазваляе сустрэцца з Панам. Божае слова кажа, што той, „хто ненавідзіць брата свайго, той жыве ў цемры“ (*1 Ян* 2, 11), „трывае ў смерці“ (*1 Ян* 3, 14) і „не мае Бога“ (*1 Ян* 4, 8). Мой папярэднік Бэнэдыкт XVI сказаў, што „закрыванне вачэй на бліжняга робіць чалавека сляпым таксама і на Бога“[370], і што любоў па сутнасці з'яўляецца „адзіным святлом, якое можа заўсёды асвячаць цемру“[371].

[369] Другі Ват. Сабор, Паст. канст. *Gaudium et spes*, 49.
[370] Бэнэдыкт XVI, Энц. *Deus caritas est* (25 снежня 2005), 16.
[371] *Тамсама*, 39.

Толькі „калі мы любім адзін аднаго, Бог жыве ў нас, і любоў Ягоная ў нас дасканалая“ (*1 Ян* 4, 12). Паколькі „чалавечая асоба мае прыроднае структуральнае грамадскае вымярэнне“[372] і „асноўным і першапачатковым праяўленнем грамадскага вымярэння асобы з'яўляецца сужэнства і сям'я“[373], то духоўнасць рэалізуецца канкрэтна ў сямейнай супольнасці. Таму асобы, якія маюць глыбокае духоўнае жаданне не павінны адчуваць, што сям'я аддаляе іх ад развіцця ў жыцці Духам Святым, але што гэта дарога, якую выкарыстаў Пан, каб прывесці іх да вяршыняў містычнага з'яднання.

### З'яднаныя на малітве ў святле Пасхі

317. Калі сям'я здольная засяродзіцца на Хрысце, то Ён яднае і асвятляе ўсё сямейнае жыццё. Цярпенні і праблемы перажываюцца ў еднасці з крыжом Пана, а ўціск, які Ён зведаў, дапамагае ім перажыць самыя цяжкія хвіліны. У горкія для сям'і дні ёсць месца на з'яднанне з самотным Езусам, што можа прадухіліць распад. Сем'і паступова, „з дапамогаю ласкі Духа Святога, дасягаюць сваёй святасці праз сужэнскае жыццё, прымаючы таксама ўдзел у крыжы Хрыста, які перамяняе цяжкасці і цярпенні ў ахвяру любові“[374]. Больш за тое, хвіліны радасці, адпачынку і свята, а таксама сексуальнасці перажываюць як удзел у паўнаце жыцця Ягонага ўваскрасення. Праз розныя штодзённыя жэсты сужэнцы ствараюць „тэалагальную прастору, у якой можна адчуць містычную прысутнасць уваскрослага Пана“[375].

[372] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Christifideles laici* (30 снежня 1988), 40.
[373] *Тамсама.*
[374] *Relatio finalis 2015,* 87.
[375] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Vita consecrata* (25 сакавіка 1996), 42: *AAS* 88 (1996), 416.

318. Сямейная малітва — гэта прывілеяваны сродак выяўлення і ўмацавання гэтай пасхальнай веры[376]. Кожны дзень можна знайсці некалькі хвілінаў, каб з'яднацца з жывым Панам, сказаць Яму аб тым, што нас турбуе, памаліцца ў патрэбах сям'і, памаліцца за кагосьці, хто перажывае цяжкі перыяд, звярнуцца па дапамогу любіць, дзякаваць за жыццё і розныя даброты, прасіць Маці Божую, каб Яна аберагала нас пад сваім мяцярынскім плашчом. Гэтая хвіліна малітвы можа прынесці сям'і вельмі шмат дабра. Для многіх сем'яў скарбам духоўнасці з'яўляюцца розныя праявы народнай пабожнасці. Супольная дарога малітвы дасягае сваёй кульмінацыі ў супольным удзеле ва Эўхарыстыі, асабліва ў кантэксце нядзельнага адпачынку. Езус стукае ў дзверы сям'і, каб дзяліць з ёю эўхарыстычную Вячэру (пар. *Ап* 3, 20). Там сужэнцы заўсёды могуць замацаваць пасхальны запавет, які злучыў іх і які адлюстроўвае запавет Бога з чалавецтвам, замацаваны на крыжы[377]. Эўхарыстыя — гэта сакрамэнт Новага Запавета, у якім адбываецца Хрыстовая справа адкуплення (пар. *Лк* 22, 20). Такім чынам можна заўважыць глыбокія повязі паміж сужэнскім жыццём і Эўхарыстыяй[378]. Эўхарыстычны спажытак з'яўляецца моцаю і натхненнем кожны дзень перажываць сужэнскі запавет як „хатні Касцёл"[379].

[376] Пар. *Relatio finalis 2015,* 87.

[377] Пар. Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 57: *AAS* 74 (1982), p. 150.

[378] Не забывайма, што запавет Бога з Яго народам прадстаўлены як заручыны (пар. *Эзх* 16, 8.60; *Іс* 62, 5; *Ос* 2, 21-22), а Новы Запавет таксама прадстаўлены як сужэнства (пар. *Ап* 19, 7; 21, 2; *Эф* 5, 25).

[379] Другі Ват. Сабор, Дагм. канст. *Lumen gentium*, 11.

319. У сужэнстве ёсць таксама адчуванне цалкавітай прыналежнасці да адной толькі асобы. Сужэнцы прымаюць выклікі і жаданне разам састарыцца і дагарэць, адлюстроўваючы такім чынам вернасць Бога. Гэтае станоўчае рашэнне, якое вызначае стыль жыцця, з'яўляецца „ўнутраным патрабаваннем запавету сужэнскай любові“[380], бо „таму, хто не адважыцца палюбіць назаўсёды, цяжка будзе сапраўды любіць нават адзін дзень“[381]. Аднак гэта не мела б духоўнага значэння, калі б меўся на ўвазе толькі закон, што прымаецца маўкліва. Гэта прыналежнасць сэрцаў там, дзе бачыць толькі Бог (пар. *Мц* 5, 28). Кожную раніцу пасля абуджэння перад Богам аднаўляецца гэтае абяцанне вернасці, незалежна ад таго, што на працягу дня здарыцца. І кожны, ідучы спаць, чакае, што абудзіцца, каб працягваць гэтую прыгоду, і спадзяецца на дапамогу Пана. Так кожны з сужэнцаў з'яўляецца для другога знакам і прыладаю блізкасці Пана, які не пакідае нас адных: „Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку“ (*Мц* 28, 20).

320. Ёсць такі момант, калі любоў сужэнцаў дасягае найбольшага вызвалення і становіцца абшарам слушнай аўтаноміі: калі кожны адкрывае, што яго другая палова яму не належыць, але мае больш важнага валадара, свайго адзінага Пана. Ніхто не можа распараджацца найбольш асабістай і таямнічай інтымнасцю

[380] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 11: *AAS* 74 (1982), p. 93.

[381] Той жа, *Homélie à l'occasion de l'Eucharistie célébrée pour les familles à Córdoba — Argentine* (8 красавіка 1987), 4 : *Insegnamenti*10/1 (1987), pp. 1161-1162.

каханай асобы, і толькі Ён можа займаць цэнтральнае месца ў яе жыцці. У той жа час прынцып духоўнага рэалізму прычыняецца да таго, што сужэнец не патрабуе, каб другая асоба цалкам задавальняла яго патрэбы. Неабходна, каб духоўная дарога кожнага, як справядліва заўважаў Дзітрых Банхофер, дапамагала яму „расчаравацца“ у іншым[382] і не чакаць ад гэтай асобы таго, што ўласціва толькі любові Бога. Гэта патрабуе ўнутранага вырачэння. Выключная прастора, якую кожны з сужэнцаў пакідае для сваіх асабістых адносінаў з Богам, дазваляе не толькі лячыць раны сумеснага жыцця, але таксама знайсці у любові Бога сэнс свайго існавання. Мы кожны дзень павінны маліцца аб гэтым дзеянні Духа Святога, каб гэтая ўнутраная свабода стала магчымай.

## Духоўнасць апекі, суцяшэння і заахвоты

321. „Хрысціянскія сужэнцы адно для другога, для сваіх дзяцей і іншых родных з'яўляюцца супрацоўнікамі ласкі і сведкамі веры“[383]. Бог заклікае іх пераказваць жыццё і апекавацца ім. Таму сям'я „заўсёды была найбліжэйшым «шпіталем»“[384]. Будзем жа апекавацца адзін адным, падтрымліваць і заахвочваць сябе ўзаемна, і разумець гэта як частку нашай сямейнай духоўнасці. Сужэнскае жыццё з'яўляецца ўдзелам у плённай справе Бога, а сужэнцы адзін для аднаго — гэта няспынная правакацыя Духа Святога. Божая любоў аб'яўляецца ў „жывых і канкрэтных словах, якімі мужчына і жанчына выяўляюць сваю сужэнскую

[382] Пар. *Gemeinsames Leben*, Müchen 1973, p. 18.

[383] Другі Ват. Сабор, Дэкрэт *Apostolicam actuositatem*, 11.

[384] *Катэхеза* (10 чэрвеня 2015): *L'Osservatore Romano,* éd. en langue française, 11 juin 2015, p. 2.

любоў“[385]. Такім чына абое з'яўляюцца ўзаемным адлюстраваннем Божай любові, якая суцішае словам, позіркам, дапамогай, пяшчотай, абдымкамі. Таму таксама „жаданне стварыць сям'ю — гэта пастанова быць часткай мараў Бога, рашэнне марыць разам з Ім, мужнасць, каб удзельнічаць у Яго будаванні свету, мужнасць у стварэнні разам з Ім гэтай гісторыі, у будаванні свету, у якім ніхто не будзе адчуваць сябе самотным“[386].

322. Усё жыццё сям'і — гэта міласэрная „паша“. Кожны клапатліва малюецца і пішацца ў жыцці іншай асобы: „Вы — наш ліст, напісаны ў сэрцах нашых, [...] напісаны не чарнілямі, але Духам Бога жывога“ (*2 Кар* 3, 2-3). Кожны з'яўляецца рыбаком людзей (пар. *Лк* 5, 10), які ад імя Езуса закідвае сеткі (пар. *Лк* 5, 5) да іншых, або земляробам, які працуе на гэтай урадлівай глебе, якой з'яўляюцца яго блізкія, заахвочваючы іх да таго, што ў іх найлепшае. Сужэнская плоднасць з'яўляецца прамоцыяй, бо „кахаць якую-небудзь істоту — гэта значыць чакаць ад яе чагосьці, што нельга акрэсліць ці прадбачыць, гэта адначасова даваць ёй магчымасць адказаць на гэтае чаканне“[387]. Гэта аддаванне пашаны Богу, бо гэта Ён пасеяў шмат добрых рэчаў у іншых людзях, спадзеючыся, што дзякуючы ім яны ўзрастуць.

323. Бачыць каханую асобу вачыма Бога і распазнаваць у ёй Хрыста — гэта глыбокі духоўны досвед,

[385] Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 12: *AAS* 74 (1982), p. 93.

[386] *Прамова падчас свята сям'і і малітоўнага чування,* Філадэльфія (26 верасня 2015): *L'Osservatore Romano,* éd. en langue française, 8 octobre 2015, p. 12.

[387] Gabriel Marcel, *Homo viator: prolégomènes à une métaphysique de l'espérance*, (Aubier Edition Montaigne) Paris 1944, p. 63.

які патрабуе бескарыслівай гатоўнасці, якая дазваляе ацаніць яе годнасць. Можна быць цалкам прысутным для іншай асобы, калі хтосьці аддае сябе, не пытаючыся „навошта“, забываючы пра ўсё навокал. Таму каханая асоба заслугоўвае на пэўную ўвагу. Езус быў прыкладам, бо калі хтосьці прыходзіць паразмаўляць з Ім, Ён глядзіць на яго з любоўю (пар. *Мк* 10, 21). Ніхто пры Ім не адчуваў сябе забытым, таму што Яго словы і жэсты выражалі пытанне: „Што хочаш, каб Я зрабіў табе?“ (*Мк* 10, 51). Гэта адбываецца ў штодзённым жыцці сям'і. У ёй мы памятаем, што асоба, якая жыве з намі, заслугоўвае на ўсё, бо мае бясконцую годнасць, з'яўляецца аб'ектам вялікай любові Айца. Так квітнее чулы клопат, здольны „абудзіць у іншым радасць з таго, што яго любяць. Асабліва выяўляецца ён у далікатным доглядзе тых, хто абмежаваны, асабліва, калі гэта становіцца бачным“[388].

324. Пад натхненнем Духа Святога сям'я не толькі прымае жыццё, нараджаючы яго ў сваім улонні, але таксама адкрываецца, выходзіць па-за свае межы, каб адарыць сваімі дабротамі таксама іншых, каб атуліць іх апекай і клапаціцца аб іх шчасці. Гэтая адкрытасць асабліва выяўляецца ў гасціннасці[389], да якой вельмі пераканаўча заахвочвае Божае слова: „Не забывайцеся таксама пра гасціннасць, бо праз яе некаторыя, не ведаючы, гасцінна прынялі Анёлаў“ (*Гбр* 13, 2). Калі сям'я запрашае на гасціну і выходзіць насустрач іншым, асабліва ўбогім і пакінутым, яна з'яўляецца „сімвалам, сведчаннем і ўдзельнікам мацярынства

[388] *Relatio finalis 2015,* 88.

[389] Пар. Ян Павел II, Апост. адгарт. *Familiaris consortio* (22 лістапада 1981), 44 : *AAS* 74 (1982), p. 136.

Касцёла“[390]. Грамадская любоў, як адлюстраванне Найсвяцейшай Тройцы, ёсць, па-сутнасці, тым, што яднае духоўны сэнс сям'і і яе місію па-за яе межамі, бо робіць бачным *керыгму* з усімі яе патрабаваннямі адносна супольнасці. Сям'я жыве адмысловай духоўнасцю, будучы адначасова хатнім Касцёлам і жывым арганізмам дзеля перамянення свету[391].

* * *

325. Словы Настаўніка (пар. *Мц* 22, 30) і св. Паўла (пар. *1 Кар* 7, 29-31) пра сужэнства невыпадкова былі змешчаны ў кантэксце апошняга і канчатковага вымярэння нашай экзістэнцыі, да якога мы павінны зноў вярнуцца. Праз гэта сужэнцы змогуць распазнаць сэнс дарогі, па якой ідуць. І як ужо шмат разоў мы нагадвалі ў гэтай адгартацыі, няма ніводнай дасканалай сям'і, сфарміраванай раз і назаўсёды, бо яна патрабуе паступовага развіцця сваёй здольнасці любіць. Ёсць сталы заклік, які паходзіць з поўнай еднасці Найсвяцейшай Тройцы, незвычайнай еднасці паміж Хрыстом і Яго Касцёлам, той прыгожай супольнасці, якой з'яўляецца Сям'я з Назарэта, і з беззаганнга братэрства паміж святымі ў небе. Сузіранне паўнаты, якой мы яшчэ не дасягнулі, дазваляе нам перагледзець гістарычны шлях, якім мы крочым як сям'я, каб перастаць патрабаваць ад міжчалавечых адносінаў такой дасканаласці, бескарыслівасці інтэнцый і вынікаў, якія можна знайсці толькі ў канчатковым валадарстве. Акрамя гэтага, сузіранне паўнаты не дазваляе нам

[390] *Тамсама*, 49 : *AAS* 74 (1982), p. 141.

[391] Наконт грамадскіх аспектаў сям'і, пар. Папская Рада «Iustitia et Pax», *Кампендый сацыяльнага вучэння Касцёла*, 248-254.

сурова асуджаць тых, хто жыве ва ўмовах вялікай слабасці. Мы ўсе пакліканы няспынна імкнуцца да таго, што пераўзыходзіць нас, таксама да пераадольвання нашых абмежаванняў, і кожная сям'я павінна жыць гэтым няспынным заклікам. Сем'і, пойдзем наперад і не будзем стамляцца! Мы маем абяцанне, што большае ячшэ перад намі. Не будзем губляць надзеі з прычыны нашых абмежаванняў, але не будзем таксама адмаўляцца ад імкнення да паўнаты любові і еднасці, абяцаных нам.

*Малітва да Святой Сям'і*

Езус, Марыя і Юзаф,
у вас мы сузіраем
бляск сапраўднай любові,
да вас звяртаемся з даверам.

Святая Сям'я з Назарэта,
учыні таксама нашыя сем'і
асяродкам еднасці і Вячэрнікам малітвы,
праўдзівай школай Евангелля
і маленькім хатнім Касцёлам.

Святая Сям'я з Назарэта,
няхай больш ніколі ў нашых сем'ях ніхто не зведвае
насілля, замкнёнасці і падзелаў:
калі хтосьці паранены ці згоршаны,
няхай неадкладна атрымае суцяшэнне і аздараўленне.

Святая Сям'я з Назарэта,
адары кожнага разуменнем
сакральнага і непарушнага характару сям'і,
яе прыгажосці ў Божых намерах.

Езус, Марыя і Юзаф,
пачуйце, выслухайце нашыя просьбы!

Амэн.

*У Рыме, у святога Пятра, у Юбілейным Годзе Міласэрнасці, 19 сакавіка 2016 года, ва ўрачыстасць Святога Юзафа, у чацвёрты год майго Пантыфікату.*



*Францішак*

ЗМЕСТ

Радасць любові . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

РАЗДЗЕЛ I
У СВЯТЛЕ СЛОВА

Ты і твая жонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Сыны твае, як аліўкавыя парасткі . . . . . . . . . . . . . . 13
Шлях крыві і пакуты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Праца рук тваіх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Чуласць абдымкаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

РАЗДЗЕЛ II
РЭАЛЬСНАСЦЬ І ПРАБЛЕМЫ СЯМ'І

Сучасная сітуацыя сям'і . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Некаторыя праблемы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

РАЗДЗЕЛ III
ПОЗІРК, СКІРАВАНЫ НА ЕЗУСА:
ПАКЛІКАННЕ СЯМ'І

Езус прымае і даводзіць да паўнаты Божы план . . . . . . . . . 46
Сям'я ў дакументах Касцёла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Сакрамэнт сужэнства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Зярняты Слова і недасканалыя сітуацыі . . . . . . . . . . 55
Перадаванне жыцця і выхаванне дзяцей . . . . . . . . . . 58
Сям'я і Касцёл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

РАЗДЗЕЛ IV
ЛЮБОЎ У СУЖЭНСТВЕ

Наша штодзённая любоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
*Цярплівасць* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
*Ласкавасць* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
*Аздараўленне ад зайздрасці* . . . . . . . . . . . . . . . . 68

*Без пыхлівасці і гонару* ........ 69
*Не бессаромная* ........ 71
*Шчодрасць* ........ 72
*Без унутранага гвалту* ........ 73
*Прабачэнне* ........ 75
*Радавацца з іншымі* ........ 76
*Усё прабачае* ........ 77
*Давер* ........ 79
*Спадзяецца* ........ 80
*Усё церпіць* ........ 81

Узрастаць у сужэнскай любові ........ 82
*Усё жыццё, усё супольнае* ........ 84
*Радасць і прыгажосць* ........ 86
*Сужэнства з любові* ........ 89
*Любоў, якая адкрывае і ўзрастае* ........ 91
*Дыялог* ........ 93

Гарачая любоў ........ 96
*Свет пачуццяў* ........ 96
*Бог любіць радасць сваіх дзяцей* ........ 98
*Эратычнае вымярэнне любові* ........ 100
*Гвалт і маніпуляцыя* ........ 102
*Сужэнства і цнатлівасць* ........ 105

Трансфармацыя любові ........ 109

РАЗДЗЕЛ V
ЛЮБОЎ, ЯКАЯ СТАНОВІЦЦА ПЛЁННАЙ

Прыняць новае жыццё ........ 113
*Любоў у чаканні, тыповым для цяжарнасці* ........ 115
*Любоў маці і бацькі* ........ 117

Больш шырокае разуменне плоднасці ........ 122
*Распазнанне цела* ........ 126

Жыццё ў больш шырокай сям'і ........ 128
*Быць дзецьмі* ........ 128
*Пажылыя людзі* ........ 130

*Быць братам* ........ 132
*Вялікае сэрца* ........ 133

РАЗДЗЕЛ VI
НЕКАТОРЫЯ ПАСТЫРСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Сённяшняе абвяшчэнне Евангелля сям'і ........ 135

Суправаджэнне нарачоных
на шляху падрыхтоўкі да сужэнства ........ 139
*Падрыхтоўка ўрачыстасці* ........ 144

Суправаджэнне ў першыя гады
сужэнскага жыцця ........ 147
*Элементы дапамогі* ........ 152

Развеяць крызісы, трывогі і цяжкасці ........ 156
*Праблема крызісаў* ........ 157
*Старыя раны* ........ 161
*Суправаджаць пасля распаду і разводу* ........ 162
*Некаторыя складаныя сітуацыі* ........ 167

Калі смерць выпускае сваё джала ........ 170

РАЗДЗЕЛ VII
УМАЦАВАЦЬ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ

Дзе знаходзяцца дзеці? ........ 175
Этычнае выхаванне дзяцей ........ 177
Каштоўнасць санкцый як імпульса ........ 180
Цярплівы рэалізм ........ 181
Сямейнае жыццё як выхаванне ........ 183
„Так“ сексуальнаму выхаванню ........ 187
Перадаванне веры ........ 191

РАЗДЗЕЛ VIII
СПАДАРОЖНІЧАЦЬ, РАСПАЗНАЦЬ
І ІНТЭГРАВАЦЬ ТОЕ, ШТО СЛАБОЕ

Паступовасць у пастырстве ........ 196
Распазнаванне г. зв. „нестандартных“ сітуацый ........ 199

Змякчальныя акалічнасці
ў пастырскім распазнаванні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Нормы і разуменне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
Логіка пастырскай міласэрнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209

## РАЗДЗЕЛ IX
## СУЖЭНСКАЯ І СЯМЕЙНАЯ ДУХОЎНАСЦЬ

Духоўнасць надпрыроднай еднасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
З'яднаныя на малітве ў святле Пасхі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 217
Духоўнасць выключнай і вольнай любові . . . . . . . . . . . . . . . 219
Духоўнасць апекі, суцяшэння і заахвоты . . . . . . . . . . . . . . . 220

*Малітва да Святой Сям'і* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 224

Выданне здзейснена пры падтрымцы
Ордэну Меншых Братоў Капуцынаў у Беларусі

Духоўна-асветніцкае выданне

ПАСЛЯСІНАДАЛЬНАЯ
АПОСТАЛЬСКАЯ АДГАРТАЦЫЯ
*AMORIS LAETITIA*
СВЯТОГА АЙЦА ФРАНЦІШКА
ДА БІСКУПАЎ, ПРЭЗБІТЭРАЎ І ДЫЯКАНАЎ,
ДА КАНСЭКРАВАНЫХ АСОБАЎ,
ДА ХРЫСЦІЯНСКІХ СУЖЭНЦАЎ
І ЎСІХ СВЕЦКІХ ВЕРНІКАЎ

Пераклад на беларускую мову
Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў
і афіцыйных дакументаў Касцёла
Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў
пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

Падпісана да друку 01.09.2016 г. Фармат 84x108 1/32.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 12,18. Ул.-выд. арк. 10,26.
Наклад 150 асобнікаў. Зак. № 276.

УП «ВЫДАВЕЦТВА „ПРО ХРЫСТО„».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/145 ад 21.01.2014.
Пл. Свабоды, 9, п. 2, 220030 г. Мінск.
http://pro-christo.catholic.by; e-mail: pro-christo@catholic.by

Паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Інфармацыйна-вылічальны цэнтр
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/41 ад 29.01.2014.
Вул. Кальварыйская, 17-201а, 220004, г. Мінск.

П 19 **Паслясінадальная** апостальская адгартацыя *Amoris laetitia* Святога Айца Францішка / Пер. на бел. мову. — Мінск : «Про Хрысто», 2016. – 232 с.

ISBN 978-985-7074-52-5

Паслясінадальная апостальская адгартацыя Святога Айца Францішка прысвечана пытанням сям'і. Яна змяшчае плён працы апошніх двух Сінодаў пра сям'ю, дадаючы іншыя разважанні ў гэтай сферы, якія будуць вызначаць напрамкі пастырскай дзейнасці, а таксама натхняць, стымуляваць і падтрымліваць сем'і ў іх ахвярнасці і пераадоленні цяжкасцяў.

УДК 272
ББК 86.375

ISBN 978-985-7074-52-5

9 789857 074525